

Treaty Series

Treaties and international agreements
registered
or filed and recorded
with the Secretariat of the United Nations

VOLUME 3043 **2015** **I. No. 52764**

Recueil des Traités

Traités et accords internationaux
enregistrés
ou classés et inscrits au répertoire
au Secrétariat de l'Organisation des Nations Unies

UNITED NATIONS • NATIONS UNIES

Treaty Series

Treaties and international agreements
registered
or filed and recorded
with the Secretariat of the United Nations

VOLUME 3043

Recueil des Traités

Traités et accords internationaux
enregistrés
ou classés et inscrits au répertoire
au Secrétariat de l'Organisation des Nations Unies

United Nations • Nations Unies
New York, 2022

Copyright © United Nations 2022
All rights reserved
Manufactured in the United Nations

Print ISBN: 978-92-1-910024-4
e-ISBN: 978-92-1-001474-8
ISSN: 0379-8267
e-ISSN: 2412-1495

Copyright © Nations Unies 2022
Tous droits réservés
Imprimé aux Nations Unies

TABLE OF CONTENTS

I

Treaties and international agreements
registered in July 2015
No. 52764

No. 52764. Multilateral:

Treaty on the Eurasian Economic Union (with annexes). Astana, 29 May 2014 3

TABLE DES MATIÈRES

I

Traités et accords internationaux
enregistrés en juillet 2015
Nº 52764

Nº 52764. Multilatéral :

Traité relatif à l'Union économique eurasienne (avec annexes). Astana, 29 mai 2014 3

NOTE BY THE SECRETARIAT

Under Article 102 of the Charter of the United Nations, every treaty and every international agreement entered into by any Member of the United Nations after the coming into force of the Charter shall, as soon as possible, be registered with the Secretariat and published by it. Furthermore, no party to a treaty or international agreement subject to registration which has not been registered may invoke that treaty or agreement before any organ of the United Nations. The General Assembly, by resolution 97 (I), established regulations to give effect to Article 102 of the Charter (see text of the regulations, vol. 859, p. VIII; https://treaties.un.org/Pages/Resource.aspx?path=Publication/Regulation/Page1_en.xml).

The terms "treaty" and "international agreement" have not been defined either in the Charter or in the regulations, and the Secretariat follows the principle that it acts in accordance with the position of the Member State submitting an instrument for registration that, so far as that party is concerned, the instrument is a treaty or an international agreement within the meaning of Article 102. Registration of an instrument submitted by a Member State, therefore, does not imply a judgement by the Secretariat on the nature of the instrument, the status of a party or any similar question. It is the understanding of the Secretariat that its acceptance for registration of an instrument does not confer on the instrument the status of a treaty or an international agreement if it does not already have that status, and does not confer upon a party a status which it would not otherwise have.

*

* *

Disclaimer: All authentic texts in the present Series are published as submitted for registration by a party to the instrument. Unless otherwise indicated, the translations of these texts have been made by the Secretariat of the United Nations, for information.

NOTE DU SECRÉTARIAT

Aux termes de l'Article 102 de la Charte des Nations Unies, tout traité ou accord international conclu par un Membre des Nations Unies après l'entrée en vigueur de la Charte sera, le plus tôt possible, enregistré au Secrétariat et publié par lui. De plus, aucune partie à un traité ou accord international qui aurait dû être enregistré mais ne l'a pas été ne pourra invoquer ledit traité ou accord devant un organe de l'Organisation des Nations Unies. Par sa résolution 97 (I), l'Assemblée générale a adopté un règlement destiné à mettre en application l'Article 102 de la Charte (voir texte du règlement, vol. 859, p. IX; https://treaties.un.org/Pages/Resource.aspx?path=Publication/Regulation/Page1_fr.xml).

Les termes « traité » et « accord international » n'ont été définis ni dans la Charte ni dans le règlement, et le Secrétariat a pris comme principe de s'en tenir à la position adoptée à cet égard par l'État Membre qui a présenté l'instrument à l'enregistrement, à savoir que, en ce qui concerne cette partie, l'instrument constitue un traité ou un accord international au sens de l'Article 102. Il s'ensuit que l'enregistrement d'un instrument présenté par un État Membre n'implique, de la part du Secrétariat, aucun jugement sur la nature de l'instrument, le statut d'une partie ou toute autre question similaire. Le Secrétariat considère donc que son acceptation pour enregistrement d'un instrument ne confère pas audit instrument la qualité de traité ou d'accord international si ce dernier ne l'a pas déjà, et qu'il ne confère pas à une partie un statut que, par ailleurs, elle ne posséderait pas.

*

* *

Déni de responsabilité : Tous les textes authentiques du présent Recueil sont publiés tels qu'ils ont été soumis pour enregistrement par l'une des parties à l'instrument. Sauf indication contraire, les traductions de ces textes ont été établies par le Secrétariat de l'Organisation des Nations Unies, à titre d'information.

I

Treaties and international agreements

registered in

July 2015

No. 5276

Traités et accords internationaux

enregistrés en

juillet 2015

N° 52764

No. 52764

Multilateral

Treaty on the Eurasian Economic Union (with annexes). Astana, 29 May 2014

Entry into force: *1 January 2015, in accordance with article 113*

Authentic texts: *Belarusian, Kazakh and Russian*

Registration with the Secretariat of the United Nations: *Eurasian Economic Commission, 24 July 2015*

Only the authentic Belarusian text of the Treaty and its Annexes is published in volumes 3042 and 3043. The other authentic texts of the Treaty and its Annexes are published in volumes 3044 to 3052 as follows: Kazakh: volumes 3044 to 3046; Russian: volumes 3046 to 3048. The translations are published in volumes 3049 to 3052 as follows: English courtesy translation: volumes 3049 and 3050; French translation: volumes 3051 and 3052.

Multilatéral

Traité relatif à l'Union économique eurasienne (avec annexes). Astana, 29 mai 2014

Entrée en vigueur : *1er janvier 2015, conformément à l'article 113*

Textes authentiques : *biélorusse, kazakh et russe*

Enregistrement auprès du Secrétariat de l'Organisation des Nations Unies : *Commission économique eurasienne, 24 juillet 2015*

Seul le texte authentique biélorusse du Traité et de ses annexes est publié dans les volumes 3042 et 3043. Les autres textes authentiques du Traité et de ses annexes sont publiés dans les volumes 3044 à 3048 comme suit : kazakh : volumes 3044 à 3046; russe : volumes 3046 à 3048. Les traductions sont publiées dans les volumes 3049 à 3052 comme suit : traduction de courtoisie anglaise : volumes 3049 et 3050; traduction française : volumes 3051 et 3052.

[BELARUSIAN TEXT – TEXTE BIÉLORUSSE]

[Continued from ANNEX 16 of Volume 3042 -- Suite de l'annexe 16 du volume 3042.]

Дадатак № 1
да Пратакола аб гандлі паслугамі, заснаванні, дзейнасці і ажыццяўленні інвестыцый

Парадак
гандлю паслугамі электрасувязі

1. Гэты Парадак прымяняецца да мер дзяржаў-членаў, якія рэгулююць ажыццяўленне дзейнасці ў галіне электрасувязі.

2. Гэты Парадак не прымяняецца да дзейнасці ў галіне паштовай сувязі.

3. Нішто ў гэтым парадку не тлумачыцца як тое, што патрабуе ад любой з дзяржаў-членаў (альбо якое патрабуе ад дзяржавы-члена абавязаць пастаўшчыкоў паслуг, якія знаходзяцца пад яго юрысдыкцыяй) устанаўліваць асаблівыя патрабаванні ў дачыненні да сетак электрасувязі, якія не маюць далучэння да сеткі электрасувязі агульнага карыстання.

4. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Парадку, азначаюць наступнае:

«сетка электрасувязі агульнага карыстання» – тэхналагічная сістэма, якая ўключае ў сябе сродкі і лініі сувязі, прызначаная для платнага аказання паслуг электрасувязі любому карыстальніку паслугамі электрасувязі на тэрыторыі дзяржавы-члена ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена;

«універсальныя паслугі электрасувязі» – пералік паслуг электрасувязі, устаноўлены дзяржавай-членам, аказанне якіх любому карыстальніку паслугамі электрасувязі ў любым населеным пункце

з установленымі якасцю і ўзроўнем коштаў, якія забяспечваюць даступнасць гэтых паслуг, з'яўляецца абавязковым для аператараў універсальнага абслугоўвання;

«паслугі электрасувязі» – дзейнасць па прыёме, апрацоўцы, захоўванню, перадачы і дастаўцы паведамленняў электрасувязі.

5. Кожная дзяржава-член забяспечвае, каб інфармацыя аб умовах доступу да сетак электрасувязі агульнага карыстання і паслугах электрасувязі з'яўлялася агульнадаступнай (уключаючы інфармацыю аб умовах аказання паслуг, у тым ліку аб тарыфах (цэнах) спецыфікацыі тэхнічных злучэнняў з такімі сеткамі, аб органах, адказных за падрыхтоўку і прыняцце стандартаў, якія закранаюць такі доступ і выкарыстанне, умовах, якія датычацца далучэння канцавога абсталявання або іншай апаратуры, а таксама патрабаванняў да апавяшчэння, рэгістрацыі або ліцэнзавання і любых іншых дазвольных працэдурах, калі такія неабходны).

6. Дзейнасць па аказанню паслуг электрасувязі ажыццяўляецца на падставе выдадзеных ўпаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў ліцэнзій у рамках, установленых у іх тэрытарыяльных межах, з захаваннем тэрмінаў і з выкарыстаннем нумарацыі, прысвоенай кожнаму аператару электрасувязі ў парадку, установленым заканадаўствам дзяржаў-членаў.

7. Пры ажыццяўленні дзейнасці па аказанню паслуг электрасувязі з выкарыстаннем радыёчастотнага спектру акрамя ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці на тэрыторыі дзяржавы-члена неабходна атрыманне рашэння ўпаўнаважанага органа дзяржавы-члена аб выдзяленні адпаведных палос радыёчастот, радыёчастотных каналаў або радыёчастот для эксплуатацыі радыёэлектроннага сродка

і прысваенні (прызначэнні) адпаведных радыёчастот і (або) радыёчастотных каналаў.

8. Вылучэнне палос радыёчастот, радыёчастотных каналаў або радыёчастот, прысваенне (прызначэнне) радыёчастот або радыёчастотных каналаў, выдача дазволаў на права выкарыстання радыёчастотнага спектру ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржаў-членаў.

9. Плацяжы, звязаныя з вылучэннем і выкарыстаннем радыёчастотнага спектру, збіраюцца ў парадку і памерах, устаноўленых заканадаўствам дзяржаў-членаў.

10. Дзяржавы-члены прымаюць усе неабходныя меры, уключаючы прававыя і адміністрацыйныя, для забеспячэння недыскрымінацыйнага, роўнага доступу да сетак і паслуг электрасувязі.

11. Далучэнне да сеткі электрасувязі агульнага карыстання аператара электрасувязі незалежна ад яго становішча на рынку паслуг электрасувязі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці на ўмовах, не менш спрыяльных, чым тыя, якія прадугледжаны для іншых аператараў электрасувязі дзяржаў-членаў, якія дзейнічаюць у супастаўных умовах.

12. Дзяржавы-члены маюць права ўводзіць і прымяняць дзяржаўнае рэгуляванне тарыфаў на асобныя віды паслуг электрасувязі. Фарміраванне тарыфаў на паслугі электрасувязі павінна грунтавацца на патрабаваннях заканадаўства дзяржавы-члена.

Дзяржавы-члены гарантуюць асобам любой з дзяржаў-членаў аказанне паслуг па тарыфах краіны знаходжання пры ўмове

заключэння дагавора на аказанне паслуг электрасувязі з аператарамі краіны знаходжання.

13. У дачыненні да тых відаў паслуг электрасувязі, тарыфы на якія не падлягаюць дзяржаўнаму рэгуляванню, дзяржавы-члены забяспечваюць наяўнасць і эфектыўнае прымяненне канкурэнтнага заканадаўства, якое перашкаджае скажэнню ўмоў канкурэнцыі паміж пастаўшчыкамі, а таксама атрымальнікамі паслуг электрасувязі дзяржаў-членаў.

14. Да 1 студзеня 2020 года Саветам Камісіі павінен быць зацверджаны адзіны падыход да ўстанаўлення дзяржавамі-членамі цэнаўтварэння на паслугі па пропуску тэлефоннага трафіку.

15. Дзяржавы-члены прымаюць усе неабходныя меры для забеспячэння аператарамі электрасувязі дзяржаў-членаў бесперашкоднага пропуску трафіку, уключаючы транзітны, на падставе міжаператарскіх дагавораў, а таксама з улікам тэхнічных магчымасцяў сетак.

16. Дзяржавы-члены гарантуюць непрымяненне субсідзіравання паслуг мясцовай і міжгародняй электрасувязі за кошт завяршэння міжнароднага вызаву на сваёй тэрыторыі.

17. Размеркаванне і выкарыстанне рэсурсаў радыёчастотнага спектру, а таксама рэсурсу нумарацыі ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

18. Дзяржавы-члены гарантуюць аказанне універсальных паслуг электрасувязі на сваёй тэрыторыі на аснове адзіных прынцыпаў і правілаў, прадугледжаных рэкамендацыямі міжнародных арганізацый у гэтай галіне. Кожная дзяржава-член мае права самастойна вызначаць абавязацельствы па аказанню універсальнай паслугі. Гэтыя абавязацельствы не будуць разглядацца як

антыканкурэнтныя пры ўмове, што яны будуць ажыццяўляцца на аснове адкрытасці, недыскрымінацыйнасці і нейтральнасці з пункту гледжання канкурэнцыі і не будуць больш цяжкімі, чым гэта неабходна для тыпу універсальнай паслугі, вызначанай гэтай дзяржавай-членам.

19. Рэгулюючыя органы дзяржаў-членаў незалежныя ад аператараў электрасувязі і не падсправаздачныя ім. Рашэнні такіх органаў павінны насіць бесстаронні характар у адносінах да ўсіх удзельнікаў дадзенага рынку.

Дадатак № 2
да Пратакола аб гандлі паслугамі, заснаванні,
дзейнасці і ажыццяўленні інвестыцый

Пералік
захоўваемых дзяржавамі-членамі «гарызантальных» абмежаванняў у дачыненні да ўсіх сектараў і відаў дзейнасці

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
	I.Рэспубліка Беларусь	
1. Умовы і парадак доступу , уключаючы абмежаванні да доступу да субсідый і іншых мер дзяржаўнай падтрымкі, устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і прымяняюцца ў поўнай меры, але без шкоды да палажэнняў Раздзелаў XXIV і XXV Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор)	пункты 23 і 26	Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь, законы Рэспублікі Беларусь аб рэспубліканскім бюджэце на адпаведны год, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 2006 года № 182 «Аб удасканаленні прававога рэгулявання парадку аказання дзяржаўнай падтрымкі юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам», нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў
2. Зямельныя ўчасткі могуць знаходзіцца ў замежных юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў толькі на праве арэнды	пункты 23 і 26	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2007 года № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў», Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі

Volume 3043, I-52764

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
3. Працэдура адбору канцэсіянера і пералік істотных умоў канцэсійнага пагаднення ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць або права валодання і карыстання аб'ектам канцэсіі на аснове канцэсійнага дагавора, у тым ліку вызначэнне яго ўмоў	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 63-З «Аб канцэсіях», Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 жніўня 2009 г. № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 53-З «Аб інвестыцыях»
4. Прыярытэт у прадастаўленні жывёльнага свету ў карыстанне на канкрэтнай тэрыторыі або акваторыі аддаецца юрыдычным асобам і грамадзянам Рэспублікі Беларусь	пункты 23 і 26	Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2007 г. № 257-З «Аб жывёльным свеце»
5. Землеўпарадкаванне (мерапрыемствы па інвентарызацыі зямель, планаванню землекарыстання, устанаўленню (аднаўленні) і замацаванню межаў аб'ектаў землеўпарадкавання, правядзенню іншых землеўпарадкавальных мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання і аховы зямель) ажыццяўляецца толькі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі (якія ўваходзяць у сістэму) спецыяльна ўпаўнаважанаму органу дзяржаўнага кіравання	пункты 16, 17, 23, 26 і 31	Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 169-З «Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы», Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2007 г. № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў»
6. Тэхнічная інвентарызацыя і дзяржаўная	пункты 16, 17, 23, 26 і 31	Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 169-З

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
рэгістрацыя нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй ажыццяўляюцца толькі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі (якія ўваходзяць у сістэму) спецыяльна ўпаўнаважанаму органу дзяржаўнага кіравання		«Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы», Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2002 г. № 133-З «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй»
7. Ацэнка дзяржаўнай маёмасці для ажыццяўлення з ёй здзелак і (або) іншых юрыдычна значных дзеянняў ажыццяўляецца дзяржаўнымі арганізацыямі, арганізацыямі, доля дзяржаўнай уласнасці ва ўстаўным фондзе якіх складае больш за 50%, якія ажыццяўляюць ацэначную дзейнасць, а таксама арганізацыямі, падпарадкаванымі (якія ўваходзяць у сістэму) спецыяльна ўпаўнаважанаму органу дзяржаўнага кіравання	пункты 16, 17, 23, 26 і 31	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2006 г. № 615«Аб ацэначнай дзейнасці»
8. Геадэзічныя і картаграфічныя работы, вынікі якіх маюць агульнадзяржаўнае, міжгаліновае прызначэнне, ажыццяўляюцца толькі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі (якія ўваходзяць у сістэму) спецыяльна ўпаўнаважанаму органу дзяржаўнага кіравання	пункты 16, 17, 23, 26 і 31	Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 169-З «Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы, і відах дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы»

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
	II. Рэспубліка Казахстан	
1. Умовы і парадак доступу , уключаючы абмежаванні такога доступу да субсідый і іншых мер дзяржаўнай падтрымкі, устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Казахстан і органамі ўлады і прымяняюцца ў поўнай меры, але без шкоды да палажэнняў Раздзелаў XXIV і XXV Дагавора	пункты 23 і 26	Бюджэтны кодэкс Рэспублікі Казахстан, законы Рэспублікі Казахстан аб рэспубліканскім бюджэце на адпаведны год, нарматыўныя прававыя акты Рэспублікі Казахстан, рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў
2. У прыватнай уласнасці замежных асоб не могуць знаходзіцца зямельныя ўчасткі, прызначаныя для вядзення таварнай сельскагаспадарчай вытворчасці і лесаразвядзення. Права часовага выплатнага землекарыстання для вядзення сялянскай або фермерскай гаспадаркі і таварнай сельскагаспадарчай вытворчасці прадастаўляецца замежным асобам на тэрмін да 10 гадоў	пункты 23 і 26	Зямельны Кодэкс Рэспублікі Казахстан
3. Не дапускаецца прадастаўленне зямельных участкаў, размешчаных у пагранічнай зоне і пагранічнай паласе Рэспублікі Казахстан, у прыватную ўласнасць замежным асобам і замежным юрыдычным асобам.	пункты 23 і 26	Зямельны Кодэкс Рэспублікі Казахстан, Закон Рэспублікі Казахстан ад 21 верасня 1994 г. № 156-XIII "Аб транспарце ў Рэспубліцы Казахстан», Закон Рэспублікі Казахстан ад 16 студзеня 2013 № 70-V «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Казахстан»

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
Зямельныя ўчасткі сельскагаспадарчага прызначэння, якія непасрэдна прымыкаюць (трохкіламетровая зона) да ахоўнай зоны Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Казахстан, прадастаўляюцца толькі грамадзянам і юрыдычным асобам Рэспублікі Казахстан на праве часовага землекарыстання да іх дэлімітацыі і дэмаркацыі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам Рэспублікі Казахстан аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Казахстан		
4. Права пастаяннага землекарыстання не можа належаць замежным землекарыстальнікам	пункты 23 і 26	Зямельны Кодэкс Рэспублікі Казахстан
5. У дачыненні да кантрактаў на нетракарыстанне паміж Урадам Рэспублікі Казахстан і нетракарыстальнікам, заключаных у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Казахстан ад 24 чэрвеня 2010 г. № 291-IV «Аб нетрах і нетракарыстанні» да даты ўступлення ў сілу Дагавора, прымяняюцца ўмовы такіх кантрактаў[1]	пункты 16, 17, 23, 26, 31, 33 і 35	Закон Рэспублікі Казахстан ад 24 чэрвеня 2010 г. № 291-IV «Аб нетрах і нетракарыстанні», Закон Рэспублікі Казахстан «Аб нетрах і нетракарыстанні» ад 27 студзеня 1996 г., Закон Рэспублікі Казахстан «Аб нафце» ад 28 чэрвеня 1995 г.

[1] Гэтыя выключэнні захоўваюцца і прымяняюцца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных пратаколам аб далучэнні Рэспублікі Казахстан да СГА.

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
6. У дачыненні да кантрактаў на нетракарыстанне паміж Урадам Рэспублікі Казахстан і нетракарыстальнікам, заключаных у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Казахстан ад 24 чэрвеня 2010 г. № 291-IV «Аб нетрах і нетракарыстанні» пасля ўступлення ў сілу Дагавора[2]: 6.1. Рэспубліка Казахстан захоўвае права патрабаваць ад інвестараў у адпаведнасці з інвестыцыйным кантрактам закупкі паслуг у юрыдычных асоб Рэспублікі Казахстан: 6.1.1. у дачыненні да разведкі і здабычы цвёрдых карысных выкапняў – не больш за 50% ад усіх закупляемых такім інвестарам паслуг у сувязі з рэалізацыяй інвестыцыйнага кантракту 6.1.2. у дачыненні да разведкі і здабычы вуглевадароднай сыравіны: 6.1.2.1. да 1 студзеня 2016 г. - не больш за 70% ад усіх закупляемых такім інвестарам паслуг у сувязі з рэалізацыяй інвестыцыйнага кантракту	пункты 16, 17, 23, 26, 31, 33 и 35	Закон Рэспублікі Казахстан ад 24 чэрвеня 2010 г. № 291-IV «Аб нетрах і нетракарыстанні», Закон Рэспублікі Казахстан «Аб нетрах і нетракарыстанні» ад 27 студзеня 1996 г., Закон Рэспублікі Казахстан «Аб нафце» ад 28 чэрвені 1995 г.

[2] Гэтыя выключэнні захоўваюцца і прымяняюцца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных пратаколам аб далучэнні Рэспублікі Казахстан да СГА.

[3] Кантракты з юрыдычнай асобай Рэспублікі Казахстан не будуць прымацца да ўвагі, калі гэта асоба не ажыццяўляе ўзгоднены від дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан. Паняцце "юрыдычная асоба Рэспублікі Казахстан" уключае таксама індывідуальных прадпрымальнікаў.

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
6.1.2.2. з 1 студзеня 2016 да даты далучэння Рэспублікі Казахстан да СГА – не больш за 60% ад усіх закупляемых інвестарам паслуг у сувязі з рэалізацыяй інвестыцыйнага кантракту		
6.1.2.3. з даты далучэння Рэспублікі Казахстан да СГА – не больш за 50% ад усіх закупляемых такім інвестарам паслуг у сувязі з рэалізацыяй інвестыцыйнага кантракту		
6.2. на працягу 6 гадоў пасля ўступлення Рэспублікі Казахстан у СГА пры правядзенні інвестарам конкурсу на прыцягненне субпадрадчыка інвестар ўмоўна памяншае на 20% кошт конкурснай заяўкі, прадстаўленай юрыдычнай асобай Рэспублікі Казахстан, калі па меншай меры 75% кваліфікаваных працаўнікоў гэтага субпадрадчыка з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Казахстан, пры ўмове , што юрыдычная асоба Рэспублікі Казахстан адказвае стандартам і якасным характарыстыкам, устаноўленым у конкурснай дакументацыі		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
6.3. па заканчэнні 6 гадоў з моманту ўступлення Рэспублікі Казахстан у СГА пры правядзенні інвестарам конкурсу на прыцягненне субпадрадчыка інвестар ўмоўна памяншае на 20% кошт конкурснай заяўкі, прадстаўленай юрыдычнай асобай Рэспублікі Казахстан, калі на меншай меры 50% кваліфікаваных працаўнікоў гэтага субпадрадчыка з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Казахстан, пры ўмове, што юрыдычная асоба Рэспублікі Казахстан адказвае стандартам і якасным характарыстыкам, устаноўленым у конкурснай дакументацыі		
6.4. пры ўстанаўленні ўмоў правядзення конкурсу на прадастаўленне права нетракарыстання Рэспубліка Казахстан не будзе ўстанаўліваць мінімальнае казахстанскае ўтрыманне ў кадрах або паслугах, якое перавышае 50%, з улікам наступнага:		
6.4.1. казахстанскае ўтрыманне ў кадрах, якія прыцягваюцца інвестарам, якому было дадзена права нетракарыстання (далей – інвестар), будзе разлічвацца як прапорцыя ў роўных долях на аснове колькасці кіраўнікоў, менеджэраў і		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
спецыялістаў, у адпаведнасці са значэннем гэтых тэрмінаў, вызначаным для мэт уезду і часовага знаходжання асоб, якія пераводзяцца ў рамках ўнутрыкарпаратыўнага пераводу, у Пераліку спецыфічных абавязацельстваў Рэспублікі Казахстан у рамках СГА па доступу на рынак паслуг (далей – кваліфікаваныя работнікі), якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Казахстан		
6.4.2. казахстанскае ўтрыманне ва ўсіх паслугах, якія аказваюцца інвестару, вызначаецца як доля агульнай гадавой сумы плацяжоў (выдаткаў) за аказанне паслуг па ўсіх кантрактах, якія былі аплачаны юрыдычным асобам Рэспублікі Казахстан.[3] Аднак сума, выплачаная юрыдычнай асобе Рэспублікі Казахстан, павінна быць зменшана на любую суму, якая была выплачана за аказанне паслуг на аснове дагавора субпадраду на любым узроўні арганізацыям, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Казахстан		
6.4.3. пры вызначэнні пераможца конкурсу на прадастаўленне права нетракарыстання Рэспубліка Казахстан не павінна ўлічваць той факт, што патэнцыяльны інвестар		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
можа прапанаваць ўзровень казахстанскага ўтрымання ў кадрах і паслугах больш за 50%		
6.5. Рэспубліка Казахстан захоўвае права патрабаваць ад інвестараў у адпаведнасці з інвестыцыйным кантрактам закупкі тавараў у парадку і на ўмовах, прадугледжаных пунктам 5 раздзела II пераліку да дадатку № 28 да Дагавора		
7. У дачыненні да закупак Фондам нацыянальнага дабрабыту «Самрук – Казына» і арганізацый, 50 % і болей галасуючых акцый (доляй удзелу), якімі прама ці ўскосна валодае Фонд нацыянальнага дабрабыту «Самрук – Казына», а таксама ў кампаніях, якія прама ці ўскосна належаць дзяржаве (доля дзяржавы ў якіх складае 50 % і болей), у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Казахстан ад 1 лютага 2012 г. № 550-IV «Аб фондзе нацыянальнага дабрабыту», і пастановай Урада Рэспублікі Казахстан ад 28 мая 2009 г. № 787 «Аб зацвярджэнні	пункты 16, 17, 23, 26, 31, 33 і 35	Закон Рэспублікі Казахстан ад 1 лютага 2012 № 550 -IV «Аб фондзе нацыянальнага дабрабыту», пастанова Урада Рэспублікі Казахстан ад 28 мая 2009 г. № 787 «Аб зацвярджэнні Тыпавых правіл закупак тавараў, работ і паслуг, якія ажыццяўляюцца нацыянальным кіраўніком холдынгу, нацыянальнымі холдынгамі, нацыянальнымі кампаніямі і арганізацыямі, пяцьдзесят і больш адсоткаў акцый (доляй ўдзелу) якіх прама ці ўскосна належаць нацыянальнаму ўпраўляючаму холдынгу, нацыянальнаму холдынгу, нацыянальнай кампаніі»

Volume 3043, I-52764

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
Тыпавых правіл закупак тавараў, работ і паслуг, якія ажыццяўляюцца нацыянальным кіраўніком холдынгу, нацыянальнымі холдынгамі, нацыянальнымі кампаніямі і арганізацыямі, 50 і больш працэнтаў акцый (доляй ўдзелу) якіх прама ці ўскосна належаць нацыянальнаму ўпраўляючаму холдынгу, нацыянальнаму холдынгу, нацыянальнай кампаніі», выключэнне ў дачыненні да мясцовага ўтрымання захоўваецца і ўжываецца на ўмовах і ў парадку, прадугледжаным пунктам 6 раздзела II пераліку да дадатку № 28 да Дагавора[4]		
8. Дзяржаўны орган мае права адмовіць у выдачы дазволу заяўніку на здзяйсненне здзелак па выкарыстанню стратэгічных рэсурсаў і (або) выкарыстанню, набыццю стратэгічных аб'ектаў Рэспублікі Казахстан, калі гэта можа пацягнуць за сабой канцэнтрацыю правоў у адной асобы або групы асоб з адной краіны. Захаванне	пункты 15, 16, 23, 26, 31 і 33	Закон Рэспублікі Казахстан ад 6 студзеня 2012 № 527-IV«Аб нацыянальнай бяспецы», Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 № 461 «Аб рынку каштоўных папер»

[4] Гэтыя выключэнні захоўваюцца і прымяняюцца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных пратаколам аб далучэнні Рэспублікі Казахстан да СГА.

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
дадзенай умовы абавязкова і ў дачыненні да здзелак з афіляванымі асобамі. У мэтах забеспячэння нацыянальнай бяспекі Урадам Рэспублікі Казахстан ўстанаўліваюцца абмежаванні на пераход і ўзнікненне права ўласнасці на стратэгічныя рэсурсы (аб'екты) Рэспублікі Казахстан. У тым ліку ў мэтах рэалізацыі адпаведнага рашэння (акта) Урада Рэспублікі Казахстан эмітэнт, кантрольны пакет акцый якога прама ці ўскосна належыць нацыянальнаму кіраўніку холдынгу, пры размяшчэнні акцый на арганізаваным рынку каштоўных папер не мае права прадаваць акцыі замежным грамадзянам і (або) юрыдычным асобам, а таксама асобам без грамадзянства		
9. Працэдура адбору канцэсіянера і пералік істотных умоў канцэсійнага пагаднення ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан. Захоўваецца права назначаць выключнага канцэсіянера. Асобныя правы і абавязкі канцэдэнта могуць ажыццяўляцца ўпаўнаважанымі канцэдэнтамі	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Закон Рэспублікі Казахстан ад 7 ліпеня 2006 № 167-3 «Аб канцэсіях»

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
10. Могуць уводзіцца абмежаванні ў дачыненні да дзейнасці ў межах кантынентальнага шэльфа Рэспублікі Казахстан	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Закон Рэспублікі Казахстан ад 24 чэрвеня 2010 г. № 291-IV «Аб нстрах і нетракарыстанні»
11. Прыярытэт у прадастаўленні жывёльнага свету ў карыстанне на канкрэтнай тэрыторыі або акваторыі аддаецца юрыдычным асобам і грамадзянам Рэспублікі Казахстан	пункты 23 і 26	Закон Рэспублікі Казахстан ад 9 ліпеня 2004 г. № 593-II «Аб ахове, аднаўленні і выкарыстанні жывёльнага свету»
	III. Расійская Федэрацыя	
1. Умовы і парадак доступу, уключаючы абмежаванні такога доступу да субсідый і іншых мер дзяржаўнай падтрымкі, устанаўліваюцца федэральнымі, рэгіянальнымі і муніцыпальнымі органамі дзяржаўнай улады і прымяняюцца ў поўнай меры, але без шкоды для палажэнняў разделаў XXIV и XXV Дагавора	пункты 23 і 26	Бюджэтны кодэкс Расійскай Федэрацыі, Федэральны закон «Аб федэральнам бюджэце» на адпаведны год, нарматыўныя прававыя акты Расійскай Федэрацыі, суб'ектаў Расійскай Федэрацыі і муніцыпальных установ
2. Замежная ўласнасць на сельскагаспадарчыя землі і землі прыгранічных тэрыторый забараняецца і можа быць абмежавана для іншых тыпаў зямель. Арэнда зямельных участкаў дазволена на перыяд да 49 гадоў	пункты 23 і 26	Зямельны кодэкс Расійскай Федэрацыі, Федэральны закон ад 24 ліпеня 2002 г. № 101-ФЗ «Аб абароце зямель сельскагаспадарчага прызначэння»

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
3. Расійскія юрыдычныя асобы, ва ўстаўным (складачным) капітале якіх доля замежных асоб (альбо іх сукупная доля) складае больш чым 50%, могуць валодаць зямельнымі ўчасткамі сельскагаспадарчага прызначэння выключна на праве арэнды. Тэрмін такой арэнды не можа перавышаць 49 гадоў	пункты 23 і 26	Зямельны кодэкс Расійскай Федэрацыі, Федэральны закон ад 24 ліпсня 2002 г. № 101-ФЗ «Аб абароце зямель сельскагаспадарчага прызначэння»
4. Аперацыі з землямі традыцыйнага пражывання і ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці карэнных малакольскасных народаў і малых этнічных груп, а таксама зямельнымі ўчасткамі, якія знаходзяцца на прыгранічных тэрыторыях і на іншых устаноўленых асабліва тэрыторыях Расійскай Федэрацыі, могуць быць абмежаваны або забаронены ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай Федэрацыі	пункты 23 і 26	Зямельны кодэкс Расійскай Федэрацыі, Федэральны закон ад 1 лютага 1993 г № 4730-1 «Аб дзяржаўнай граніцы Расійскай Федэрацыі»
5. У дачыненні да гандлю паслугамі праз спосабы пастаўкі паслуг, указаныя у абзацах другім і трэцім падпункта 22 пункта 6 дадатку № 16 да Дагавора, юрыдычныя асобы Расійскай Федэрацыі маюць пераважнае права на ўдзел у рэалізацыі пагаднення аб падзеле	пункт 23	Федэральны закон ад 30 снежня 1995 года № 225-ФЗ «Аб пагадненнях аб падзеле прадукцыі»

Volume 3043, I-52764

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
прадукцыі ў якасці падрадчыкаў, пастаўшчыкоў, перавозчыкаў або ў іншай якасці па пагадненнях (кантрактах) з інвестарамі		
6. Заснаванне асобамі любой іншай дзяржавы-члена юрыдычных асоб, адкрыццё філіялаў і прадстаўніцтваў, рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка на тэрыторыі закрытай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай установы ў Расійскай Федэрацыі, набыццё асобамі любой іншай дзяржавы-члена долі ўдзелу ў капітале юрыдычных асоб, зарэгістраваных на тэрыторыі закрытай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай установы, а таксама дзейнасць юрыдычных асоб, зарэгістраваных на тэрыторыі закрытай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай установы (у тым ліку з замежным капіталам), філіялаў і прадстаўніцтваў, можа быць абмежавана або забаронена ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай Федэрацыі	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Федэральны закон ад 14 ліпеня 1992 г. № 3297-1 «Аб закрытай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай установе»

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
7. Могуць уводзіцца абмежаванні ў дачыненні да дзейнасці ў межах кантынентальнага шэльфа Расійскай Федэрацыі	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Федэральны закон ад 30 лістапада 1995 № 187-ФЗ «Аб кантынентальным шэльфе Расійскай Федэрацыі»
8. Прыярытэт у прадастаўленні жывёльнага свету ў карыстанне на канкрэтнай тэрыторыі або акваторыі аддаецца грамадзянам Расійскай Федэрацыі	пункты 23 і 26	Федэральны закон ад 24 красавіка 1995 № 52-ФЗ «Аб жывёльным свеце»
9. У дачыненні да заключэння пагадненняў аб падзеле прадукцыі, якія былі заключаны да 1 студзеня 2012 г. (далей – пагадненне)[5]:	пункты 23 і 26	Федэральны закон ад 30 снежня 1995 г № 225-ФЗ «Аб пагадненнях аб падзеле прадукцыі»
умовамі аўкцыёну на заключэнне пагаднення павінен быць прадугледжаны ўдзел расійскіх юрыдычных асоб у рэалізацыі пагадненняў у долях, вызначаных Урадам Расійскай Федэрацыі		
пагадненнем прадугледжваюцца абавязацельствы інвестара па:		
прадастаўленню расійскім юрыдычным асобам пераважнага права на ўдзел у работах па пагадненню ў якасці		

[5] Гэтыя абмежаванні захоўваюцца і прымяняюцца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных Пратаколам ад 16 снежня 2011 года аб далучэнні Расійскай Федэрацыі да Маракешскага пагаднення аб заснаванні Сусветнай гандлевай арганізацыі ад 15 красавіка 1994 г.

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
падрадчыкаў, пастаўшчыкоў, перавозчыкаў або ў іншай якасці на падставе дагавораў (кантрактаў) з інвестарамі прыцягненню работнікаў – грамадзян Расійскай Федэрацыі, колькасць якіх павінна складаць не менш чым 80% саставу ўсіх прыцягнутых работнікаў, прыцягненню замежных рабочых і спецыялістаў толькі на пачатковых этапах работ па пагадненню або пры адсутнасці рабочых і спецыялістаў – грамадзян Расійскай Федэрацыі адпаведнай кваліфікацыі набыцці неабходных для геалагічнага вывучэння, здабычы, транспарціроўкі і перапрацоўкі карысных выкапняў тэхналагічнага абсталявання, тэхнічных сродкаў і матэрыялаў расійскага паходжання ў аб'ёме не менш за 70% агульнага кошту набытых (у тым ліку па дагаворах арэнды, лізінгу і на іншых падставах) у кожным каляндарным годзе для выканання работ па пагадненні абсталявання, тэхнічных сродкаў і матэрыялаў, затраты на набыццё і выкарыстанне якіх пакрываюцца інвестару кампенсацыйнай прадукцыяй. Пры гэтым		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
абсталяванне, тэхнічныя сродкі і матэрыялы лічацца расійскага паходжання пры ўмове, што яны выраблены расійскімі юрыдычнымі асобамі і (або) грамадзянамі Расійскай Федэрацыі на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі з вузлоў, дэталяў, канструкцый і камплектуючых, не менш чым на 50% у вартасным выражэнні выраблены х на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі расійскімі юрыдычнымі асобамі і (або) грамадзянамі Расійскай Федэрацыі.		
Дзяржавы-члены павінны прадугледжваць ў пагадненні ўмову, што не менш за 70% тэхналагічнага абсталявання ў вартасным выражэнні для здабычы карысных выкапняў, іх транспарціроўкі і перапрацоўкі (калі гэта прадугледжваецца пагадненнем), набытага і (або) выкарыстоўваемага інвестарам для выканання работ па пагадненню, павінна быць расійскага паходжання. Дадзенае палажэнне не распаўсюджваецца на выкарыстанне аб'ектаў магістральнага трубаправоднага транспарту, будаўніцтва і набыццё якіх не прадугледжаны пагадненнем		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
10. Працэдура адбору канцэсіянера і пералік істотных умоў канцэсійнага пагаднення ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі. Захоўвасцца права прызначаць выключнага канцэсіянера. Асобныя правы і абавязкі канцэдэнта могуць ажыццяўляцца ўпаўнаважанымі канцэдэнтамі	пункты 15 – 17, 23, 26, 31 і 33	Федэральны закон ад 21 ліпеня 2005 г № 115-ФЗ «Аб канцэсійных пагадненнях»
11. Здзелка, здзяйсняемая асобай любой іншай дзяржавы-члена, і якая цягне за сабой устанаўленне кантролю над расійскімі гаспадарчымі таварыствамі, якія ажыццяўляюць хоць бы адзін з відаў дзейнасці, якія маюць стратэгічнае значэнне для забеспячэння абароны краіны і бяспекі дзяржавы, патрабуе атрымання дазволу ўпаўнаважанага органа Расійскай Федэрацыі ў парадку , які вызначаецца нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай Федэрацыі	пункты 15, 16, 23, 26, 31 і 33	Федэральны закон ад 29 красавіка 2008 г. № 57-ФЗ «Аб парадку ажыццяўлення замежных інвестыцый у гаспадарчыя таварыствы, якія маюць стратэгічнае значэнне для забеспячэння абароны краіны і бяспекі дзяржавы»
Замежныя дзяржавы, міжнародныя арганізацыі, а таксама асобы, якія знаходзяцца пад іх кантролем, у тым ліку створаныя на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, не маюць права здзяйсняць		

Абмежаванне	Падставы для прымянення абмежавання (пункты дадатку №16 да Дагавора)	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)
здзелкі, якія цягнуць за сабой устанаўленне кантролю над расійскімі гаспадарчымі таварыствамі, якія ажыццяўляюць хоць бы адзін з відаў дзейнасці, якія маюць стратэгічнае значэнне для абароны краіны і бяспекі дзяржавы		
Замежныя інвестары або група асоб абавязаны прадстаўляць ва ўпаўнаважаны орган інфармацыю аб набыцці 5 або больш працэнтаў акцый (доляў), якія складаюць устаўныя капіталы гаспадарчых таварыстваў, якія ажыццяўляюць хоць бы адзін з відаў дзейнасці, якія маюць стратэгічнае значэнне для забеспячэння абароны краіны і бяспекі дзяржавы		
12. Зямельныя ўчасткі ў межах марскога порта не могуць знаходзіцца ва ўласнасці замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, замежных арганізацый	пункты 23 і 26	Федэральны закон ад 8 лістапада 2007 года № 261-ФЗ «Аб марскіх партах ў Расійскай Федэрацыі і аб унясенні змяненняў у асобныя заканадаўчыя акты Расійскай Федэрацыі»

ДАДАТАК № 17

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

па фінансавых паслугах

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з артыкулам 70 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) і прымяняецца да мер дзяржаў-членаў, якія закранаюць гандаль фінансавымі паслугамі, а таксама заснаванне і (або) дзейнасць пастаўшчыкоў фінансавых паслуг.

2. Палажэнні гэтага Пратакола не выкарыстоўваюцца для пастаўляемых паслуг і дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў мэтах выканання функцый дзяржаўнай улады на некамерцыйнай аснове і не на ўмовах канкурэнцыі, а таксама ў дачыненні да прадстаўлення субсідый.

3. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«дзяржаўная ўстанова» – орган дзяржаўнай улады, альбо нацыянальны (цэнтральны) банк дзяржавы-члена, або арганізацыя дзяржавы-члена, якая належыць дзяржаве-члену або кантралюецца гэтай дзяржавай-членам, якая ажыццяўляе выключна паўнамоцтвы, дэлегаваныя органам дзяржаўнай улады гэтай дзяржавы-члена або нацыянальным (цэнтральным) банкам такой дзяржавы-члена;

«дзейнасць» – дзейнасць юрыдычных асоб, філіялаў, прадстаўніцтваў, заснаваных у разуменні гэтага Пратакола;

«заканадаўства дзяржавы-члена» – законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты дзяржавы-члена, нарматыўныя акты нацыянальнага (цэнтральнага) банка дзяржавы-члена;

«крэдытная арганізацыя» – юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая для атрымання прыбытку як асноўнай мэты сваёй дзейнасці на падставе ліцэнзіі, выдадзенай упаўнаважаным органам дзяржавы-члена па рэгуляванні банкаўскай дзейнасці, мае права ажыццяўляць банкаўскія аперацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой яна зарэгістравана;

«ліцэнзія» – спецыяльны дазвол (дакумент), што выдаецца ўпаўнаважаным органам дзяржавы-члена, які і прадстаўляе яго ўладальніку права ажыццяўляць на тэрыторыі дзяржавы-члена пэўны від дзейнасці;

«мера дзяржавы-члена» – заканадаўства дзяржавы-члена, а таксама рашэнне, дзеянне або бяздзейнасць упаўнаважанага органа дзяржавы-члена або службовай асобы ўпаўнаважанага органа дзяржавы-члена.

У выпадку прыняцця (выдання) ўпаўнаважаным органам дзяржавы-члена афіцыйнага дакумента, які мае рэкамендацыйны характар, такая рэкамендацыя можа быць прызнана мерай для мэт гэтага Пратакола ў выпадку, калі будзе даказана, што на практыцы пераважная частка адрасатаў гэтай рэкамендацыі прытрымліваюцца яе;

«нацыянальны рэжым» – прадстаўленне асобам і фінансавым паслугам іншай дзяржавы-члена пры гандлі фінансавымі паслугамі рэжыму не менш спрыяльнага, чым рэжым, які прадстаўляецца пры аналагічных абставінах сваім уласным асобам і фінансавым паслугам на сваёй тэрыторыі;

«агульны фінансавы рынак» – фінансавы рынак дзяржаў-членаў, які адпавядае наступным крытэрыям:

гарманізаваныя патрабаванні да рэгулявання і нагляду ў сферы фінансавых рынкаў дзяржаў-членаў;

узаемнае прызнанне ліцэнзій у банкаўскім і страхавым сектарах, а таксама ў сектары паслуг на рынку каштоўных папер, выдадзеных упаўнаважанымі органамі адной дзяржавы-члена, на тэрыторыях іншых дзяржаў-членаў;

ажыццяўленне дзейнасці па прадстаўленні фінансавых паслуг на ўсёй тэрыторыі Саюза без дадатковага заснавання ў якасці юрыдычнай асобы;

адміністрацыйнае супрацоўніцтва паміж упаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў, у тым ліку шляхам абмену інфармацыяй;

«пастаўка/гандаль фінансавымі паслугамі» – аказанне фінансавых паслуг, якое ўключае ў сябе вытворчасць, размеркаванне, маркетынг, продаж і дастаўку паслуг, і якое ажыццяўляецца наступнымі спосабамі:

з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена;

на тэрыторыі адной дзяржавы-члена асобай гэтай дзяржавы-члена асобе іншай дзяржавы-члена (спажыўцу паслуг);

пастаўшчыком фінансавых паслуг адной дзяржавы-члена шляхам заснавання і дзейнасці на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена;

«пастаўшчык фінансавых паслуг» – любая фізічная або юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая пастаўляе фінансавыя паслугі, за выключэннем дзяржаўных устаноў;

«прафесійны ўдзельнік рынку каштоўных папер» – юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая мае права ажыццяўляць прафесійную

дзейнасць на рынку каштоўных папер у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой яна зарэгістравана;

«рэжым найбольшага спрыяння» – прадстаўленне асобам і фінансавым паслугам іншай дзяржавы-члена пры гандлі фінансавымі паслугамі рэжыму не менш спрыяльнага, чым рэжым, які прадстаўляецца пры аналагічных абставінах асобам і фінансавым паслугам трэціх краін;

«сектар фінансавай паслугі» – увесь сектар фінансавай паслугі, які уключае ўсе яе падсектары, а ў дачыненні да выключэнняў з абавязкаў, абмежаванняў і ўмоў дзяржавы-члена, адзін або некалькі альбо ўсе падсектары асобнай фінансавай паслугі;

«страхавая арганізацыя» – юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая мае права ажыццяўляць страхавую (перастраховачную) дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой яна зарэгістравана;

«тэст на эканамічную мэтазгоднасць» – выдача дазволу на заснаванне і (або) дзейнасць альбо пастаўку паслугі ў залежнасці ад наяўнасці неабходнасці і патрэбы рынку шляхам эканамічнай ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці пастаўшчыка паслуг на адпаведнасць мэтам эканамічнага планавання канкрэтнай галіны;

«упаўнаважаны орган» – орган дзяржавы-члена, які валодае ў адпаведнасці з заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена паўнамоцтвамі па ажыццяўленні рэгулявання і (або) нагляду і кантролю фінансавага рынку, фінансавых арганізацый (асобных сфер фінансавага рынку);

«заснаванне»:

стварэнне і (або) набыццё юрыдычнай асобы (удзел у капітале створанай або заснаванай юрыдычнай асобы) любой арганізацыйна-

прававой формы і формы ўласнасці, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой такая юрыдычная асоба ствараецца або засноўваецца;

набыццё кантролю над юрыдычнай асобай дзяржавы-члена, які выяўляецца ў атрыманні магчымасці непасрэдна або праз трэціх асоб вызначаць рашэнні, што прымаюцца такой юрыдычнай асобай, у тым ліку шляхам распараджэння галасамі, якія прыпадаюць на галасуючыя акцыі (долі), шляхам удзелу ў савеце дырэктароў (наглядальным савеце) і іншых органах кіравання такой юрыдычнай асобай;

адкрыццё філіяла;

адкрыццё прадстаўніцтва;

«фінансавыя паслугі» – паслугі фінансавага характару, якія ўключаюць у сябе наступныя віды паслуг:

1) страхавыя паслугі і паслугі, якія адносяцца да страхавых:

а) страхаванне (сустрахаванне): страхаванне жыцця, страхаванне іншае, чым страхаванне жыцця;

б) перастрахаванне;

в) страхавое пасрэдніцтва, такое як брокерскае і агенцкае пасрэдніцтва;

г) дапаможныя паслугі па страхаванню, такія як кансультатыўныя, актуарныя паслугі, паслугі па ацэнцы рызыкі і паслугі па ўрэгуляванні прэтэнзій;

2) банкаўскія паслугі:

а) прыём ад насельніцтва ўкладаў (дэпазітаў) і іншых грашовых сродкаў, якія падлягаюць выплаце;

б) выдача пазык, крэдытаў, пазык ўсіх відаў, уключаючы спажывецкі крэдыт, залогавы крэдыт, факторынг і фінансаванне камерцыйных аперацый;

в) фінансавы лізінг;

г) усе віды паслуг па плацяжах і грашовых пераводах;

д) гандаль за свой кошт і за кошт кліентаў, на біржы і пазабіржавым рынку, альбо іншым чынам: замежнай валютай; дэрыватывамі, у тым ліку, ф'ючэрсамі і апцыёнамі; інструментамі, якія маюць дачыненне да валютных курсаў і працэнтных ставак, уключаючы здзелкі «своп» і форвардныя здзелкі;

е) кансультатыўныя, пасрэдніцкія і іншыя дапаможныя фінансавыя паслугі ва ўсіх відах дзейнасці, названых у гэтым падпункце, уключаючы даведачныя і аналітычныя матэрыялы, звязаныя з аналізам крэдытных умоў;

3) паслугі на рынку каштоўных папер:

а) гандаль фінансавымі інструментамі за свой кошт і за кошт кліентаў, на біржы і пазабіржавым рынку, альбо іншым чынам;

б) удзел у эмісіі (выпуску) усіх відаў каштоўных папер, уключаючы гарантаванне і размяшчэнне, у якасці агента (дзяржаўнага або прыватнага), і аказанне паслуг, якія адносяцца да такой эмісіі (выпуску);

в) брокерскія аперацыі на фінансавым рынку;

г) кіраванне такімі актывамі, як грашовыя сродкі ці каштоўныя паперы, усе віды кіравання калектыўнымі інвестыцыямі, кіраванне актывамі і інвестыцыйнымі партфелямі пенсійных фондаў, папячыцельства, паслугі па захоўванню і траставыя паслугі;

д) клірынгавыя паслугі па фінансавых актывах, уключаючы каштоўныя паперы, дэрыватывы і іншыя фінансавыя інструменты;

е) прадстаўленне і перадача фінансавай інфармацыі, апрацоўка фінансавых дадзеных і прадстаўленне і перадача адпаведнага праграмнага забеспячэння пастаўшчыкамі іншых фінансавых паслуг;

ж) кансультатыўныя, пасрэдніцкія і іншыя дапаможныя фінансавыя паслугі ва ўсіх відах дзейнасці, названых у гэтым падпункце, уключаючы даследаванні і рэкамендацыі па прамых і партфельных інвестыцыях, рэкамендацыі па пытаннях набыцця, рэарганізацыі і стратэгіі карпарацый.

Іншыя паняцці ў гэтым Пратаколе выкарыстоўваюцца ў значэнні, названым у Пратаколе аб гандлі паслугамі, заснаванні, дзейнасці і інвестыцыях (дадатак № 16 да Дагавора).

4. Кожная дзяржава-член прадстаўляе пастаўшчыкам фінансавых паслуг (юрыдычным асобам іншых дзяржаў-членаў) нацыянальны рэжым і рэжым найбольшага спрыяння ў дачыненні да аказання самастойна, праз пасрэдніка або ў якасці пасрэдніка ў адпаведнасці з умовамі, названымі ў індывідуальных нацыянальных пераліках дзяржаў-членаў у дадатку № 1 да гэтага Пратакола, з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена наступных відаў фінансавых паслуг:

1) страхаванне рызык, якія адносяцца да:

міжнародных марскіх перавозак і камерцыйных паветраных перавозак, камерцыйных касмічных запускаў і фрахту (уключаючы спадарожнікі), у дачыненні да якіх такое страхаванне закранае поўнасцю або часткова: тавары, якія транспартуюцца, транспартныя сродкі, якія перавозяць тавар, і грамадзянска-прававую адказнасць, якая ўзнікае ў сувязі з перавозкай;

тавараў, якія перамяшчаюцца ў рамках міжнароднага транзіту;

2) перастрахаванне, а таксама такія дапаможныя страхавыя паслугі, як кансультацыйныя паслугі, актуарныя паслугі, ацэнка рызыкі і ўрэгуляванне прэтэнзій;

3) прадстаўленне, перадача фінансавай інфармацыі, апрацоўка фінансавых дадзеных і адпаведнага праграмнага забеспячэння пастаўшчыкоў іншых фінансавых паслуг;

4) кансультатыўныя і іншыя дапаможныя паслугі, уключаючы прадстаўленне даведачных матэрыялаў (акрамя пасрэдніцтва і паслуг, звязаных з аналізам крэдытных гісторый, даследаванні і рэкамендацыі па прамым і партфельным інвестыцыям, рэкамендацыі па пытаннях набыцця, рэарганізацыі і стратэгіі карпарацый) у дачыненні да паслуг на рынку каштоўных папер і банкаўскіх паслуг.

5. Кожная дзяржава-член дазваляе асобам гэтай дзяржавы-члена на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена спажываць фінансавыя паслугі, названыя ў падпунктах 1 – 4 пункты 4 гэтага Пратакола.

6. Кожная дзяржава-член дае асобам іншай дзяржавы-члена ў дачыненні да заснавання і (або) дзейнасці на сваёй тэрыторыі пастаўшчыкоў фінансавых паслуг, як яны вызначаны ў пункце 3 гэтага Пратакола, нацыянальны рэжым, з улікам абмежаванняў, прадугледжаных індывідуальным нацыянальным пералікам для кожнага з дзяржаў-членаў у дадатку № 2 да гэтага Пратакола.

7. Кожная дзяржава-член дае асобам іншай дзяржавы-члена ў дачыненні да заснавання і (або) дзейнасці на сваёй тэрыторыі пастаўшчыкоў фінансавых паслуг, як яны вызначаны ў пункце 3 гэтага Пратакола, рэжым найбольшага спрыяння.

8. Пытанні гандлю фінансавымі паслугамі з трэцімі дзяржавамі, дзейнасці юрыдычных асоб, у капітале якіх удзельнічае дзяржава, правоў спажыўцоў фінансавых паслуг, удзелу ў прыватызацыі, абароны правоў інвестараў, плацяжоў і пераводаў, абмежаванняў у дачыненні да плацяжоў і пераводаў, кампенсацыі страты, гарантый інвестараў, у тым ліку пры экспрапрыяцыі, пераходу правоў

інвестараў і парадку вырашэння інвестыцыйных спрэчак рэгулююцца Пратаколам аб гандлі паслугамі, заснаванні, дзейнасці і інвестыцыях (дадатак № 16 да Дагавора).

9. Палажэнне гэтага Пратакола прымяняецца да юрыдычных асоб, філіялаў, прадстаўніцтваў, якія былі заснаваны на дату ўступлення ў сілу Дагавора і якія працягваюць існаваць, а таксама якія былі заснаваны пасля ўступлення Дагавора ў сілу.

10. У сектарах, пералічаных у пункце 4 гэтага Пратакола, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных у дадатку № 1 да гэтага Пратакола, ні адна з дзяржаў-членаў не прымяняе і не ўводзіць у дачыненні да фінансавых паслуг і пастаўшчыкоў фінансавых паслуг іншай дзяржавы-члена ў сувязі з гандлем паслугамі абмежаванні ў адносінах да:

колькасці пастаўшчыкоў фінансавых паслуг у форме квоты, манаполіі, тэсту на эканамічную мэтазгоднасць або ў любой іншай колькаснай форме;

аперацый любога пастаўшчыка фінансавых паслуг у форме квоты, тэсту на эканамічную мэтазгоднасць або ў любой іншай колькаснай форме.

У сектарах, пералічаных у пункце 4 гэтага Пратакола, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных у дадатку № 1 да гэтага Пратакола, ні адна з дзяржаў-членаў не ўводзіць і не прымяняе ў дачыненні да пастаўшчыка фінансавых паслуг іншай дзяржавы-члена патрабаванні ўстановы ў якасці ўмовы для гандлю фінансавымі паслугамі.

11. За выключэннем абмежаванняў, прадугледжаных індывідуальным нацыянальным пералікам для кожнай з дзяржаў-членаў у дадатку № 2 да гэтага Пратакола ні адна з дзяржаў-членаў на

сваёй тэрыторыі не ўжывае і не ўводзіць у дачыненні да пастаўшчыкоў фінансавых паслуг іншай дзяржавы-члена ў сувязі з заснаваннем і (або) дзейнасцю пастаўшчыкоў фінансавых паслуг, абмежаванняў у адносінах да:

1) формы ўстановы, у тым ліку арганізацыйна-прававой формы юрыдычнай асобы;

2) колькасці юрыдычных асоб, якія засноўваюцца, філіялаў або прадстаўніцтваў у форме квоты, тэсту на эканамічную мэтазгоднасць або ў любой іншай форме;

3) набытага аб'ёму долі ў капітале юрыдычнай асобы або ступені кантролю над юрыдычнай асобай;

4) аперацый заснаванай юрыдычнай асобы, філіяла, прадстаўніцтва, у ходзе ажыццяўлення імі дзейнасці ў форме квоты, тэсту на эканамічную мэтазгоднасць або ў любой іншай колькаснай форме.

12. Пытанні ўезду, выезду, знаходжання і працоўнай дзейнасці фізічных асоб рэгулююцца раздзелам XXVI Дагавора з улікам абмежаванняў, указаных у індывідуальным нацыянальным пераліку для кожнай дзяржавы-члена ў дадатку № 2 да гэтага Пратакола.

13. У дачыненні да фінансавых паслуг, указаных у індывідуальным нацыянальным пераліку ў дадатку № 1 да гэтага Пратакола і абмежаванняў у дачыненні да ўстановы і (або) дзейнасці, названых у індывідуальным нацыянальным пераліку ў дадатку № 2 да гэтага Пратакола, кожная дзяржава-член забяспечвае, каб усе меры гэтай дзяржавы-члена, якія ўплываюць на гандаль фінансавымі паслугамі, ўжываліся разумным, аб'ектыўным і непрадузятым чынам.

14. Калі патрабуецца дазвол на пастаўку фінансавых паслуг, упаўнаважаныя органы дзяржавы-члена на працягу разумнага

перыяду часу пасля прадстаўлення заяўкі, якая палічана аформленай адпаведна патрабаванням заканадаўства дзяржавы-члена і правілах рэгулявання, інфармуюць заяўніка аб рашэнні з нагоды заявы. Па запыту заяўніка ўпаўнаважаныя органы дзяржавы-члена падаюць інфармацыю аб ходзе разгляду заяўкі без залішняй затрымкі.

15. Для забеспячэння такога становішча, каб меры, якія адносяцца да кваліфікацыйных патрабаванняў і працэдур, тэхнічных стандартаў і патрабаванняў ліцэнзавання, не стваралі неапраўданых бар'ераў у гандлі фінансавымі паслугамі, дзяржавы-члены маюць права распрацоўваць любыя неабходныя правілы праз адпаведныя органы, якія яны могуць стварыць. Гэтыя правілы сярод іншага павінны прадугледжваць, каб патрабаванні, якія змяшчаюцца ў іх:

1) засноўваліся на аб'ектыўных і галосных умовах, такіх як кампетэнтнасць і здольнасць пастаўляць паслугу;

2) не былі больш цяжкімі, чым гэта неабходна для забеспячэння якасці паслугі;

3) у выпадку працэдур ліцэнзавання – не былі самі па сабе абмежаваннем на пастаўку паслугі.

16. Да ўступлення ў сілу правілаў, распрацаваных у адпаведнасці з пунктам 15 гэтага Пратакола, для сектараў фінансавых паслуг, указаных у індывідуальных нацыянальных пераліках ў дадатку № 1 да гэтага Пратакола, дзяржавы-члены не прымяняюць ліцэнзійныя або кваліфікацыйныя патрабаванні і тэхнічныя стандарты, якія анулююць або скарачаюць выгады, якія прадастаўляюцца згодна з умовамі, названымі ў індывідуальных нацыянальных пераліках у дадатку № 1 да гэтага Пратакола.

Пры гэтым ліцэнзійныя або кваліфікацыйныя патрабаванні і тэхнічныя стандарты, якія прымяняюцца дзяржавай-членам, павінны

адпавядаць крытэрыям, названым у падпунктах 1 – 3 пункта 15 гэтага Пратакола, і маглі б разумна чакацца ад гэтай дзяржавы-члена на дату падпісання Дагавора.

17. Калі дзяржава-член прымяняе ліцэнзаванне ў дачыненні да заснавання і (або) дзейнасці пастаўшчыкоў фінансавых паслуг, то такая дзяржава-член забяспечвае, каб:

1) назвы ўпаўнаважаных органаў дзяржавы-члена, якія адказваюць за выдачу ліцэнзій на ажыццяўленне дзейнасці, былі апублікаваныя ці іншым чынам даведзены да агульнага ведама;

2) ліцэнзійныя працэдуры не з'яўляліся самі па сабе абмежаваннем на заснаванне або дзейнасць і каб ліцэнзійныя патрабаванні, напрамую звязаныя з правам на ажыццяўленне дзейнасці, не з'яўляліся самі па сабе неабгрунтаваным бар'ерам для дзейнасці;

3) усе ліцэнзійныя працэдуры і патрабаванні былі ўсталяваны ў заканадаўстве дзяржавы-члена, і каб заканадаўства дзяржавы-члена, якое ўсталёўвае або прымяняе ліцэнзійныя працэдуры або патрабаванні, друкавалася да даты яго ўступлення ў сілу;

4) любыя зборы, якія збіраюцца ў сувязі з прадстаўленнем і разглядам заявы на выдачу ліцэнзіі, не з'яўляліся самі па сабе абмежаваннем для заснавання і дзейнасці і засноўваліся на затратах ліцэнзуючага органа дзяржавы-члена, звязаных з разглядам заявы і выдачай ліцэнзіі;

5) па заканчэнні перыяду часу, установленага заканадаўствам дзяржавы-члена на прыняцце рашэння аб выдачы (адмове у выдачы) ліцэнзіі, і па патрабаванню заяўніка адпаведны ўпаўнаважаны орган дзяржавы-члена, які адказвае за выдачу ліцэнзій, інфармаваў заяўніка аб стане разгляду яго заявы, а таксама пра тое, ці лічыцца гэтая заява

належна запоўненай. У любым выпадку заяўніку будзе прадстаўлена магчымасць унесці тэхнічныя выпраўленні ў заяву. Заява не будзе лічыцца належна запоўненай да таго часу, пакуль не будуць атрыманы ўся інфармацыя і дакументы, названыя ў адпаведным заканадаўстве дзяржавы-члена;

6) па пісьмовым патрабаванні заяўніка, якому было адмоўлена ў прыёме заявы, упаўнаважаны орган дзяржавы-члена, які адказвае за выдачу ліцэнзій і адмовіў у прыёме заявы, пісьмова інфармаваў заяўніка аб прычынах такой адмовы. Аднак гэта палажэнне не павінна тлумачыцца як патрабаванне ад ліцэнзуючага органа дзяржавы-члена раскрываць інфармацыю, раскрыццё якой перашкаджае выкананню заканадаўства дзяржавы-члена ці іншым чынам супярэчыць грамадскім інтарэсам ці істотным інтарэсам бяспекі;

7) у выпадку, калі было адмоўлена ў прыёме заявы, заяўнік мог падаць новую заяву, у якой ён мог бы паспрабаваць ліквідаваць любыя праблемы, якія мелі месца для выдачы ліцэнзіі;

8) ліцэнзія, якая выдаецца, дзейнічала на ўсёй тэрыторыі дзяржавы-члена.

18. Парадак і тэрміны выдачы ліцэнзій на ажыццяўленне дзейнасці на рынках фінансавых паслуг на тэрыторыі дзяржавы-члена ўстанаўліваюцца заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой плануецца ажыццяўленне такой дзейнасці.

19. Нішто ў гэтым Пратаколе не перашкаджае дзяржаве-члену прымаць прудэнцыйная меры, уключаючы абарону інтарэсаў інвестараў, укладчыкаў, страхавальнікаў, выгаданабытчыкаў і асоб, перад якімі пастаўшчык паслуг нясе фідуцыарную адказнасць, або меры для забеспячэння цэласнасці і стабільнасці фінансавай сістэмы. Калі такія меры не адпавядаюць палажэнням гэтага Пратакола, яны не

павінны выкарыстоўвацца дзяржавай-членам у якасці сродку ўхілення ад выканання абавязкаў, прынятых гэтай дзяржавай-членам у адпаведнасці з гэтым Дагаворам.

20. Нішто ў гэтым Пратаколе не павінна тлумачыцца як патрабаванне да дзяржавы-члену раскрываць інфармацыю, якая адносіцца да рахункаў індывідуальных кліентаў, ці іншую якую-небудзь канфідэнцыяльную інфармацыю, або інфармацыю, якая знаходзіцца ў распараджэнні дзяржаўных устаноў.

21. Дзяржавы-члены на аснове міжнародных прынцыпаў і стандартаў альбо найлепшай міжнароднай практыкі і не ніжэй найлепшых стандартаў і практыкі, якія ўжо прымяняюцца ў дзяржавах-членах, ажыццяўляюць выпрацоўку гарманізаваных патрабаванняў у сферы рэгулявання фінансавага рынку ў наступных сектарах паслуг:

банкаўскі сектар;

страхавы сектар;

сектар паслуг на рынку каштоўных папер.

22. У банкаўскім сектары дзяржавы-члены гарманізуюць патрабаванні па рэгуляванні і наглядзе крэдытных арганізацый, кіруючыся ў сваіх дзеяннях найлепшай міжнароднай практыкай і Асноватворнымі прынцыпамі эфектыўнага банкаўскага нагляду Базельскага камітэта па банкаўскім наглядзе, у тым ліку ў дачыненні да:

1) паняцця «крэдытная арганізацыя» і юрыдычнага статусу крэдытнай арганізацыі;

2) парадку і ўмоў раскрыцця інфармацыі крэдытнымі арганізацыямі, банкаўскімі групамі і іх афіляванымі асобамі, банкаўскімі холдынгамі;

3) патрабаванняў да бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці на аснове Міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці;

4) парадку і ўмоў стварэння крэдытнай арганізацыі, у прыватнасці ў адносінах да:

патрабаванняў да ўстаноўчых дакументаў;

парадку дзяржаўнай рэгістрацыі крэдытнай арганізацыі ў форме юрыдычнай асобы (філіяла);

вызначэння мінімальнага памеру ўстаўнага капіталу крэдытнай арганізацыі, парадку яго фарміравання і спосабаў яго аплаты;

патрабаванняў да прафесійнай кваліфікацыі і дзелавой рэпутацыі кіруючых работнікаў крэдытнай арганізацыі;

парадку і ўмоў выдачы ліцэнзіі на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый, у тым ліку ў дачыненні да патрабаванняў да дакументаў, неабходных для атрымання ліцэнзіі на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый;

5) падстаў для адмовы ў рэгістрацыі крэдытнай арганізацыі і выдачы ёй ліцэнзіі на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый;

6) парадку, працэдуры і ўмоў ліквідацыі (у тым ліку прымусовай ліквідацыі) або рэарганізацыі крэдытнай арганізацыі;

7) падстаў для адклікання ў крэдытнай арганізацыі ліцэнзіі на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый;

8) парадку і асаблівасцяў рэарганізацыі крэдытных арганізацый у форме зліцця, далучэння і пераўтварэння;

9) забеспячэння фінансавай надзейнасці крэдытнай арганізацыі, у тым ліку вызначэння іншых, акрамя банкаўскіх аперацый, відаў дзейнасці, дазволеных для крэдытных арганізацый, прудэнцыйных нарматываў, абавязковых рэзерваў і спецыяльных правізій;

10) парадку ажыццяўлення ўпаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў нагляду за дзейнасцю крэдытных арганізацый, банкаўскіх холдынгаў і банкаўскіх груп;

11) памеру, парадку і ўмоў прымянення санкцый да крэдытных арганізацый і банкаўскіх холдынгаў;

12) патрабаванняў да дзейнасці і забеспячэнню фінансавай надзейнасці банкаўскіх груп і банкаўскіх холдынгаў;

13) стварэння і функцыянавання сістэмы страхавання ўкладаў насельніцтва (уключаючы сумы выплат кампенсацый па ўкладах);

14) працэдур фінансавага аздараўлення і банкруцтва крэдытных арганізацый (уключаючы рэгламентаванне правоў крэдытораў, парадак задавальнення патрабаванняў);

15) пераліку аперацый, якія прызнаюцца банкаўскімі;

16) пераліку і статусу арганізацый, якія маюць права ажыццяўляць асобныя тэхналагічныя часткі банкаўскіх аперацый.

23. У страхавым сектары дзяржавы-члены гарманізуюць патрабаванні па рэгуляванню і нагляду прафесійных удзельнікаў страхавога рынку, кіруючыся ў сваіх дзеяннях найлепшай міжнароднай практыкай і Асноватворнымі прынцыпамі страхавога нагляду Міжнароднай асацыяцыі страхавых наглядаў і, у тым ліку ў дачыненні да:

1) паняцця «прафесійны ўдзельнік страхавога рынку» і юрыдычнага статусу прафесійнага ўдзельніка страхавога рынку;

2) забеспячэння фінансавай устойлівасці прафесійнага ўдзельніка страхавога рынку, у тым ліку ў дачыненні да:

страхавых рэзерваў, дастатковых для выканання абавязацельстваў па страхаванню, сустрахаванню, перастрахаванню, ўзаемнаму страхаванню;

складу і структуры актываў, якія прымаюцца для пакрыцця страхавых рэзерваў;

мінімальнага ўзроўню і парадку фарміравання ўстаўнага і ўласнага капіталаў;

умоў і парадку перадачы страхавога партфеля;

3) патрабаванняў да бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці на аснове Міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці;

4) парадку і ўмоў стварэння і ліцэнзавання страхавой дзейнасці;

5) парадку ажыццяўлення ўпаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў нагляду за дзейнасцю прафесійных удзельнікаў страхавога рынку;

6) памеру, парадку і ўмоў прымянення санкцый да ўдзельнікаў і (або) прафесійных удзельнікаў страхавога рынку за парушэнні на фінансавым рынку;

7) патрабаванняў да прафесійнай кваліфікацыі і дзелавой рэпутацыі кіруючых працаўнікоў прафесійных удзельнікаў страхавога рынку;

8) падстаў для адмовы ў выдачы ліцэнзіі на ажыццяўленне страхавой дзейнасці;

9) парадку, працэдуры і ўмоў ліквідацыі прафесійнага ўдзельніка страхавога рынку, у тым ліку прымусовай ліквідацыі (банкруцтва);

10) падстаў для адклікання ў прафесійнага ўдзельніка страхавога рынку ліцэнзіі на ажыццяўленне страхавой дзейнасці, а таксама анулявання, абмежавання або прыпынення дзеяння такой ліцэнзіі;

11) парадку і асаблівасцяў рэарганізацыі прафесійнага ўдзельніка страхавога рынку ў форме зліцця, далучэння або пераўтварэння;

12) патрабаванняў да складу страхавых груп і страхавых холдынгаў і іх фінансавай надзейнасці.

24. У сектары паслуг на рынку каштоўных папер дзяржавы-члены гарманізуюць патрабаванні па наступных відах дзейнасці:

брокерская дзейнасць на рынку каштоўных папер;

дылерская дзейнасць на рынку каштоўных папер;

дзейнасць па кіраванню каштоўнымі паперамі, фінансавымі інструментамі, кіраванне актывамі і інвестыцыйнымі партфелямі пенсійных фондаў і калектыўнымі інвестыцыямі;

дзейнасць па вызначэнню ўзаемных абавязкаў (клірынгу);

дэпазітарная дзейнасць;

дзейнасць па вядзенню рэестра ўладальнікаў каштоўных папер;

дзейнасць па арганізацыі гандлю на рынку каштоўных папер.

25. Дзяржавы-члены гарманізуюць патрабаванні па рэгуляванню і нагляду рынку каштоўных папер, кіруючыся ў сваіх дзеяннях найлепшай міжнароднай практыкай і прынцыпамі Міжнароднай арганізацыі камісій па каштоўных паперах, Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, у тым ліку ў дачыненні да:

1) вызначэння парадку фарміравання і аплаты ўстаўнага капіталу, а таксама патрабаванняў да дастатковасці ўласнага капіталу;

2) парадку і ўмоў выдачы ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці на рынку каштоўных папер, уключаючы патрабаванні да дакументаў, неабходных для атрымання такой ліцэнзіі;

3) патрабаванняў да прафесійнай кваліфікацыі і дзелавой рэпутацыі кіруючых працаўнікоў прафесійных удзельнікаў рынку каштоўных папер;

4) падстаў для адмовы ў выдачы ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці на рынку каштоўных папер, а таксама анулявання, абмежавання або прыпынення дзеяння такой ліцэнзіі;

5) патрабаванняў да бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці на аснове Міжнародных стандартаў фінансавай справаздачнасці, а таксама патрабаванняў да арганізацыі ўнутранага ўліку і ўнутранага кантролю;

6) працэдуры, парадку і ўмоў ліквідацыі (у тым ліку прымусовай ліквідацыі) або рэарганізацыі прафесійнага ўдзельніка рынку каштоўных папер;

7) падстаў для адклікання ў прафесійнага ўдзельніка рынку каштоўных папер ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці на рынку каштоўных папер;

8) памеру, парадку і ўмоў прымянення санкцый да ўдзельнікаў і (або) прафесійных удзельнікаў рынку каштоўных папер за парушэнні на фінансавым рынку;

9) парадку ажыццяўлення ўпаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў нагляду за дзейнасцю суб'ектаў (удзельнікаў) рынку каштоўных папер;

10) патрабаванняў, што падаюцца да дзейнасці прафесійных удзельнікаў рынку каштоўных папер;

11) патрабаванняў да працэдуры эмісіі (парадку выпуску) каштоўных папер эмітэнта;

12) патрабаванняў да размяшчэння і абарачэння каштоўных папер замежных эмітэнтаў на рынках каштоўных папер дзяржаў-членаў;

13) патрабаванняў да аб'ёму і якасці, а таксама перыядычнасці апублікавання інфармацыі;

14) забеспячэння магчымасці размяшчэння і абарачэння каштоўных папер эмітэнтаў дзяржаў-членаў на ўсёй тэрыторыі Саюза пры ўмове рэгістрацыі эмісіі (выпуску) каштоўных папер органам дзяржавы рэгістрацыі эмітэнта, які рэгуліруе гэтую дейнасць;

15) патрабаванняў у вобласці раскрыцця інфармацыі эмітэнтамі, процідзеяння неправамернаму выкарыстанню інсайдарскай інфармацыі і маніпуліраванню на рынку каштоўных папер.

26. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць выпрацоўку гарманізаваных патрабаванняў да правядзення аўдыту на аснове Міжнародных стандартаў аўдыту.

27. Дзяржавы-члены распрацоўваюць механізмы ўзаемадзеяння ўпаўнаважаных органаў дзяржаў-членаў у сферы рэгулявання, кантролю і нагляду за дзейнасцю на сваіх фінансавых рынках, у тым ліку ў банкаўскім сектары, страхавым сектары і сектары паслуг на рынку каштоўных папер.

Дзяржавы-члены абменьваюцца інфармацыяй, у тым ліку канфідэнцыяльнай, у адпаведнасці з міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

28. Кожная дзяржава-член забяспечвае, каб заканадаўства гэтай дзяржавы-члена, якое закранае або можа закранаць пытанні, адлюстраваныя ў гэтым Пратаколе, было апублікавана ў афіцыйнай крыніцы, а па магчымасці, на спецыяльна выдзеленым сайце ў сетцы Інтэрнэт такім чынам, каб любая асоба, правы і (або) абавязкі якой

могуць быць закрануты такім заканадаўствам дзяржавы-члена, мела магчымасць азнаёміцца з ім.

Апублікаванне такога заканадаўства павінна ўключаць у сябе тлумачэнне мэт прыняцця такога заканадаўства і быць выканана ў тэрмін, які забяспечвае прававую пэўнасць і абгрунтаваныя чаканні асоб, правы і (або) абавязкі якіх могуць быць закрануты гэтым заканадаўствам дзяржавы-члена, але ў любым выпадку да даты яго ўступлення у сілу.

29. Кожная дзяржава-член засноўвае механізм, які забяспечвае прадстаўленне адказаў на пісьмовыя запыты любой асобы, якія маюць дачыненне да дзейснага і (або) планаванага заканадаўства актаў па пытаннях, якія ахопліваюцца гэтым Пратаколам. Адказы на запыты павінны быць прадстаўлены такой зацікаўленай асобе не пазней чым праз 30 каляндарных дзён з дня атрымання пісьмовага запыту.

30. Дзяржавы-члены ў мэтах папярэджання сістэмных рызык на фінансавых рынках ажыццяўляюць гарманізацыю свайго заканадаўства ў дачыненні да патрабаванняў да ажыццяўлення дзейнасці рэйтынгавых агенцтваў у адпаведнасці з прынцыпамі празрыстасці, падсправаздачнасці і адказнасці.

31. Дзяржава-член можа прызнаваць прудэнцыйная меры любой іншай дзяржавы-члена пры вызначэнні ўжывання ёю мер, якія адносяцца да пастаўкі фінансавых паслуг. Такое прызнанне, якое можа быць дасягнута з дапамогай гарманізацыі заканадаўства дзяржаў-членаў ці іншым чынам, можа грунтавацца на пагадненні або дамоўленасці з зацікаўленай дзяржавай-членам або можа быць прадстаўлена ў аднабаковым парадку.

32. Дзяржава-член, якая з'яўляецца ўдзельнікам Пагаднення або дамоўленасці аб прызнанні прудэнцыйных мер іншай дзяржавы-

члена, як будучых, так і дзеючых, дае іншым дзяржавам-членам магчымасць весці перагаворы аб іх далучэнні да такіх пагадненняў ці дамоўленасцей, якія, маглі б змяшчаць правілы, кантроль, механізм ажыццяўлення такіх правіл, і, калі магчыма, працэдуры, звязаныя з абменам інфармацыяй паміж удзельнікамі такіх пагадненняў і дамоўленасцей.

33. Гарманізацыя канкрэтных патрабаванняў да ажыццяўлення дзейнасці на фінансавых рынках дзяржаў-членаў павінна ажыццяўляцца пры ўмове, што існуючыя адрозненні не будуць перашкаджаць эфектыўнаму функцыянаванню ў рамках Саюза агульнага фінансавага рынку.

34. Нішто ў гэтым Пратаколе не перашкаджае дзяржаве-члену прымаць або ўжываць ніжэйпералічаныя меры пры ўмове, што такія меры не будуць прымяняцца спосабам, які стварае сродкі адвольнай або неапраўданай дыскрымінацыі паміж асобамі дзяржаў-членаў у дачыненні да гандлю паслугамі, заснаванню і (або) дзейнасці, а менавіта:

1) неабходныя для абароны грамадскай маралі або падтрымання грамадскага парадку. Выключэнні згодна меркаванням грамадскага парадку могуць быць выкарыстаны толькі ў тых выпадках, калі існуе рэальная і досыць сур'ёзная пагроза ў дачыненні да аднаго з карэнных інтарэсаў грамадства;

2) неабходныя для абароны жыцця або здароўя людзей, жывёл або раслін;

3) неабходныя для захавання законаў або правілаў, якія адпавядаюць палажэнням гэтага Пратакола, уключаючы тыя, якія маюць дачыненне да:

прадухілення нядобрасумленнай практыкі, якая ўводзіць у зман, або наступстваў невыканання грамадзянска-прававых дагавораў;

абароны ад умяшання ў прыватнае жыццё асобных асоб пры апрацоўцы і распаўсюджванні звестак асабістага характару і абароны прыватнасці звестак аб асабістым жыцці і рахункаў;

4) несумяшчальныя з пунктамі 4 і 6 гэтага Пратакола ў частцы прадстаўлення нацыянальнага рэжыму, пры ўмове, што адрозненне ў рэжыме, які фактычна прадастаўляецца, прадыктавана імкненнем забяспечыць справядлівае або эфектыўнае падаткаабкладанне або спагнанне падаткаў з асоб іншай дзяржавы-члена ў дачыненні да гандлю паслугамі;

5) несумяшчальныя з пунктамі 4 і 7 гэтага Пратакола пры ўмове, што адрозненне ў дачыненні да рэжыму з'яўляецца вынікам пагадненняў па пытаннях падаткаабкладання, у тым ліку пагадненняў аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання, удзельнікам якога з'яўляецца адпаведная дзяржава-член.

35. Нішто ў гэтым Пратаколе не павінна тлумачыцца як перашкода для дзяржавы-члена прымаць любыя меры, якія яна лічыць неабходнымі для абароны яе найважнейшых інтарэсаў у вобласці абароны або яе нацыянальнай бяспекі.

36. Дзяржавы-члены забяспечваюць паэтапнае скарачэнне выключэнняў і абмежаванняў, указаных у іх індывідуальных нацыянальных пераліках у дадатках № 1 і 2 да гэтага Пратакола.

37. Дзяржавы-члены спыняюць прымяненне мер, якія адзначаны ў іх індывідуальных нацыянальных пераліках у дадатках № 1 і 2 да гэтага Пратакола, у дачыненні да тых сектараў фінансавых паслуг, у якіх дзяржавамі-членамі былі выкананы ўмовы гарманізацыі заканадаўства і ўзаемнага прызнання ліцэнзій.

ДАДАТАК № 1
да Пратакола па фінансавых паслугах

ПЕРАЛІК

падсектараў фінансавых паслуг, у якіх дзяржавамі-членамі ў адпаведнасці з пунктам 4 Пратакола па фінансавых паслугах (дадатак № 17 да Дагавору аб Еўразійскім эканамічным саюзе) прадстаўляецца нацыянальны рэжым і прымаюцца абавязкі ў адпаведнасці з пунктам 10 дадзенага Пратакола

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежаванняў	Апісанне абмежаванняў	Падстава для прымянення абмежаванняў (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежаванняў
I. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ				
1. Страхаванне рызыкаў, звязаных з:	няма абмежаванняў	–	–	–
міжнароднымі марскімі перавозкамі				
міжнароднымі камерцыйнымі паветранымі перавозкамі				
міжнароднымі камерцыйнымі касмічнымі запускамі				
міжнародным страхаваннем, якое				

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
пакрывае палкам або часткова:				
міжнародную перавозку фізічных асоб				
міжнародную перавозку экспартных (імпартных) грузаў і перавозячых іх транспартных сродкаў, уключаючы адказнасць, якая вынікае з гэтага				
перавозку тавараў міжнародным транспартам				
адказнасць пры трансгранічным перамяшчэнні індывідуальных транспартных сродкаў толькі пасля				

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
далучэння да міжнароднай сістэмы дагавораў і страхавых сертыфікатаў «Зялёная карта»				
2. Перастрахаванне і рэтрацэсія	няма абмежаванняў	–	–	–
3. Паслугі страхавых агентаў і страхавых брокераў	абмежаванне	не дазваляецца страхавое пасрэдніцтва, звязанае з заключэннем і размеркаваннем страхавых кантрактаў ад імя замежных страхоўшчыкаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (за выключэннем сектараў, пералічаных у пункце 1 гэтага пераліку, а таксама за выключэннем ажыццяўлення страхавымі брокерамі пасрэдніцкай дзейнасці па перастрахаванню)	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 года № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	–
4. Дапаможныя паслугі страхавання, якія уключаюць кансультатыўныя і актуарныя паслугі, ацэнку	няма абмежаванняў	–	–	–

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
рызыкі і паслугі па ўрэгуляванню прэтэнзій				
		II. РЭСПУБЛІКА КАЗАХСТАН		
1 . Страхаванне рызыкаў, звязаных з: міжнароднымі марскімі перавозкамі міжнароднымі камерцыйнымі паветранымі перавозкамі міжнароднымі камерцыйнымі касмічнымі запускамі міжнародным страхаваннем, якое пакрывае цалкам або часткова: міжнародную перавозку фізічных	абмежаванне	няма абмежаванняў, за выключэннем наступнага выпадку: страхаванне размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан маёмасных інтарэсаў юрыдычнай асобы або яе адасобленых падраздзяленняў і маёмасных інтарэсаў фізічнай асобы, якая з'яўляецца рэзідэнтам Рэспублікі Казахстан, можа ажыццяўляцца толькі страхавой арганізацыяй – рэзідэнтам Рэспублікі Казахстан. Забараняецца ажыццяўляць плацяжы і пераводы грошай, звязаныя з аплатай страхавых прэмій (узносаў) на карысць нерэзідэнтаў Рэспублікі Казахстан, ад фізічных і юрыдычных асоб – рэзідэнтаў Рэспублікі Казахстан. Дагаворы абавязковага страхавання павінны знаходзіцца на ўласным утрыманні	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
асоб		страхоўшчыкаў – рэзідэнтаў Рэспублікі Казахстан		
міжнародную перавозку экспартных (імпартных) грузаў і перавозячых іх транспартных сродкаў, уключаючы адказнасць, якая вынікае з гэтага				
перавозку тавараў міжнародным транспартам				
адказнасць пры трансгранічным перамяшчэнні індывідуальных транспартных сродкаў толькі пасля далучэння да міжнароднай сістэмы дагавораў і страхавых сертыфікатаў				

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
«Зялёная карта»				
2. Перастрахаванне і рэтрацэсія	абмежаванне	сукупны памер страхавых прэмій, налічаных перастраховачным арганізацыям-нерэзідэнтам Рэспублікі Казахстан па дзеючых дагаворах перастрахавання, за выпікам камісійных узнагароджанняў, налічаных для атрымання ад іх перастрахоўшчыкам (цедэнт), не перавышае 60% (з моманту ўступлення ў СГА – 85%) ад сукупнага памеру страхавых прэмій, налічаных для атрымання па дзеючым дагаворам страхавання (перастрахавання). Дагаворы абавязковага страхавання павінны знаходзіцца на ўласным утрыманні страхоўшчыкаў альбо перадавацца ў перастрахаванне перастрахоўшчыкам – рэзідэнтам Рэспублікі Казахстан	Пастанова праўлення Агенцтва Рэспублікі Казахстан па рэгуляванню і нагляду фінансавага рынку і фінансавых арганізацый ад 22 жніўня 2008 г. № 131 «Аб зацвярджэнні інструкцыі аб нарматыўных значэннях і методыцы разлікаў прудэнцыйных нарматываў страхавой (перастраховачнай) арганізацыі, формах і тэрмінах прадстаўлення справаздач аб выкананні прудэнцыйных	не вызначаны

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежаванняў	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежаванняў (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежаванняў
			нарматываў»	
3. Паслугі страхавых агентаў і страхавых брокераў	абмежаванне	няма абмежаванняў, за выключэннем наступнага выпадку: пасрэдніцкая дзейнасць па заключэнню дагавора страхавання ад імя страхавой арганізацыі - нерэзідэнта Рэспублікі Казахстан, за выключэннем дагавора страхавання грамадзянска-прававой адказнасці ўладальнікаў аўтатранспартных сродкаў, якія выязджаюць за межы Рэспублікі Казахстан, на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан не дапускаецца, калі міжнародныя дагаворы, ратыфікаваныя Рэспублікай Казахстан, не прадугледжана іншае	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
4. Дапаможныя паслугі страхавання, уключаючы кансультатыўныя і актуарная паслугі, ацэнку рызыкі і паслугі па ўрэгуляванню прэтэнзій	няма абмежаванняў	–	–	–

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежаванняў	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
III. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ				
1. Страхаванне рызыкаў, звязаных з: міжнародцымі марскімі перавозкамі міжнароднымі камерцыйнымі паветранымі перавозкамі міжнароднымі камерцыйнымі касмічнымі запускамі міжнародным страхаваннем, якое пакрывае цалкам або часткова: міжнароднуюперавозку фізічных асоб міжнароднуюперавозку багажу,	няма абмежаванняў	–	–	–

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
перавозку экспартных (імпартных) грузаў і перавозячых іх транспартных сродкаў, уключаючы адказнасць, якая вынікае з гэтага				
перавозку тавараў міжнародным транспартам				
адказнасць пры трансграничным перамяшчэнні індывідуальных транспартных сродкаў толькі пасля далучэння да міжнароднай сістэмы дагавораў і страхавых сертыфікатаў «Зялёная карта»				

Сектар (падсектар)	Наяўнасць абмежаванняў	Апісанне абмежаванняў	Падстава для прымянення абмежаванняў (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежаванняў
2. Перастрахаванне і рэтрацэсія	няма абмежаванняў	–	–	–
3. Паслугі страхавых агентаў і страхавых брокераў	абмежаванне	не дазваляецца страхавое пасрэдніцтва, звязанае з заключэннем і размеркаваннем страхавых кантрактаў ад імя замежных страхоўшчыкаў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі (за выключэннем сектараў, пералічаных у пункце 1 гэтага пераліку)	Закон Расійскай Федэрацыі ад 27 лістапада 1992 № 4015-I «Аб арганізацыі страхавой справы ў Расійскай Федэрацыі»	–
4. Дапаможныя паслугі страхавання, якія уключаюць кансультатыўныя і актуарная паслугі, ацэнку рызыкі і паслугі па ўрэгуляванню прэтэнзій	няма абмежаванняў	–	–	–

ДАДАТАК № 2
да Пратакола па фінансавых паслугах

ПЕРАЛІК

абмежаванняў у дачыненні да заснавання і (або) дзейнасці, якія захоўваюцца дзяржавамі-членамі

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
I. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ			
1. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 Пратакола па фінансавых паслугах (дадатак № 17 да Дагавору аб Еўразійскім эканамічным саюзе) (далей – дадатак № 17)	у выпадку калі квота замежных інвестараў ва ўстаўных фондах страхавых арганізацый Рэспублікі Беларусь перавышае 30%, Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь спыняе рэгістрацыю страхавых арганізацый з замежнымі інвестыцыямі і (або) выдачу такім арганізацыям ліцэнзій на ажыццяўленне страхавой дзейнасці	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «Аб страхавой дзейнасці», пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 верасня 2006 г № 1174 «Аб устанаўленні квоты замежных інвестараў ва ўстаўных фондах страхавых арганізацый Рэспублікі Беларусь»	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	страхавая арганізацыя абавязана атрымаць папярэдні дазвол Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь на павелічэнне памеру свайго ўстаўнага фонду за кошт сродкаў замежных інвестараў і (або) страхавых арганізацый, якія з'яўляюцца даччынымі (залежнымі) гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да гэтых замежных інвестараў, на адчужэнне доляў у яе ўстаўным фондзе (акцый), якія складаюць 5% і больш устаўнага фонду страхавой арганізацыі, на адчужэнне доляў у яе ўстаўным фондзе (акцый) у карысць замежных інвестараў і (або) страхавых арганізацый, якія з'яўляюцца даччынымі (залежнымі) гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да дадзеных замежных інвестараў. Беларускія ўдзельнікі страхавых арганізацый Рэспублікі Беларусь абавязаны атрымліваць папярэдні дазвол Міністэрства фінансаў на адчужэнне доляў ва ўстаўных фондах (акцый), якія належаць ім, ва ўласнасць (гаспадарчае веданне, аператыўнае кіраванне) замежных інвестараў і (або) страхавых арганізацый, якія з'яўляюцца даччынымі (залежнымі) гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да гэтых замежных інвестараў. У папярэднім дазволе адмаўляецца ў наступных выпадках: пры здзяйсненні названых дзеянняў будзе перавышана квота ўдзелу замежнага капіталу ва ўстаўных фондах страхавых	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	арганізацый Рэспублікі Беларусь		
	юрыдычная асоба, якой страхоўшчык, удзельнік страхоўшчыка мае намер ажыццявіць адчужэнне доляў ва ўстаўным фондзе (акцый), якія належаць яму, ажыццяўляе дзейнасць менш за 3 гады і не мае прыбытку па выніках ажыццяўлення сваёй дзейнасці ў апошнія 3 гады;		
	існуе неабходнасць забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (у тым ліку ў эканамічнай сферы), абароны інтарэсаў нацыянальных страхавых арганізацый		
	страхавыя арганізацыі, якія з'яўляюцца даччынымі (залежнымі) гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў і (або) маюць долю замежных інвестараў у сваіх устаўных фондах больш за 49%, могуць ствараць адасобленыя падраздзяленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама з'яўляцца заснавальнікамі (удзельнікамі) іншых страхавых арганізацый пасля атрымання папярэдняга дазволу Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь. У папярэднім дазволе адмаўляецца, калі перавышана квота ўдзелу замежнага капіталу ва ўстаўных фондах страхавых арганізацый Рэспублікі Беларусь	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	
	страхавыя арганізацыі, якія з'яўляюцца даччынымі або залежнымі гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў, не могуць ажыццяўляць у Рэспубліцы Беларусь страхаванне жыцця (за выключэннем заключэння дагавораў	Указ Прэзідэнта	

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	страхавання жыцця з фізічнымі асобамі), абавязковае страхаванне (у тым ліку абавязковае дзяржаўнае страхаванне), маёмаснае страхаванне, звязанае з ажыццяўленнем паставак, аказаннем паслуг або выкананнем работ для дзяржаўных патрэб, а таксама страхаванне маёмасных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Аплата замежнымі інвестарамі доляў ва ўстаўных фондах (акцый) страхавых арганізацый і страхавых брокераў ажыццяўлецца выключна грашовымі сродкамі	Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 года № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	
2. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	страхавымі агентамі, страхавымі брокерамі могуць з'яўляцца толькі беларускія асобы	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 года № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
3. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	ўдзел замежнага капіталу ў банкаўскай сістэме Рэспублікі Беларусь абмежаваны 50%. Стварэнне крэдытных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі патрабуе атрымання папярэдняга дазволу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь спыняе дзяржаўную рэгістрацыю банкаў з замежнымі інвестыцыямі пры дасягненні устаноўленага памеру (квоты) ўдзелу замежнага капіталу ў банкаўскай сістэме Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь мае права прымаць	Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2000 г. № 441-З, пастанова Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2008 г. № 129 «Аб памеры (квоце) удзелу замежнага капіталу ў банкаўскай сістэме	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	любыя меры для захавання дадзенага абмежавання. Пры разглядзе пытання аб выдачы дазволу ўлічваецца ўзровень выкарыстання квоты ўдзелу замежнага капіталу ў банкаўскай сістэме Рэспублікі Беларусь, а таксама фінансавае становішча і дзелавая рэпутацыя заснавальнікаў-нерэзідэнтаў	Рэспублікі Беларусь»	
4. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	ліцэнзія на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы фінансавых паслуг у Рэспублікі Беларусь выдаецца юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь, створаным у арганізацыйна-прававой форме, устаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь	Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2000 г. № 441-З	не вызначаны
5. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	функцыі кіраўніка, яго намеснікаў, галоўнага бухгалтара страхавой арганізацыі могуць выконвацца толькі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, а таксама замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, і толькі на падставе працоўных дагавораў	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 г. № 530 «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
6. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	дзейнасць, на ажыццяўленне якой патрабуецца ліцэнзія, можа ажыццяўляцца толькі юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь або індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку ў Рэспубліцы Беларусь. Віды дзейнасці, якая падлягае ліцэнзаванню, вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь	Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450 «Палажэнне аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці»	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	II. РЭСПУБЛІКА КАЗАХСТАН		
1. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	доля ўпаўнаважанага органа ў капітале арганізатара таргоў можа складаць больш за 50% ад агульнай колькасці галасуючых акцый арганізатара таргоў	Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 года № 461-II «Аб рынку каштоўных папер»	не вызначаны
2. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	дзейнасць, на ажыццяўленне якой патрабуецца ліцэнзія, можа ажыццяўляцца толькі юрыдычнымі асобамі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі Рэспублікі Казахстан. Віды дзейнасці, якая падлягае ліцэнзаванню Рэспублікі Казахстан, вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан	Закон Рэспублікі Казахстан ад 11 студзеня 2007 № 214-III «Аб ліцэнзаванні»	не вызначаны
3. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	банкі ствараюцца ў форме акцыянерных таварыстваў	Закон Рэспублікі Казахстан ад 31 жніўня 1995 г. № 2444 «Аб банках і банкаўскай дзейнасці ў Рэспубліцы Казахстан»	не вызначаны
4. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	адкрыццё філіялаў банкаў-нерэзідэнтаў у Рэспубліцы Казахстан забараняецца	Закон Рэспублікі Казахстан ад 31 жніўня 1995 г. № 2444 «Аб банках і банкаўскай дзейнасці ў Рэспубліцы	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
		Казахстан»	
5. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	страхавая (перастраховачная) арганізацыя павінна быць заснавана ў форме акцыянернага таварыства	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
6. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	адкрыццё філіялаў страхавых арганізацый-нерэзідэнтаў у Рэспубліцы Казахстан забараняецца	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
7. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	арганізацыйна-прававой формай страхавога брокера з'яўляецца таварыства з абмежаванай адказнасцю або акцыянернае таварыства	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
8. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	добраахвотны назапашвальны пенсійны фонд ствараецца ў форме акцыянернага таварыства	Закон Рэспублікі Казахстан ад 21 чэрвеня 2013 № 105-V «Аб пенсійным забеспячэнні ў Рэспубліцы Казахстан»	не вызначаны
9. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	адкрыццё філіялаў і прадстаўніцтваў накапляльных пенсійных фондаў - нерэзідэнтаў Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Казахстан забараняецца	Закон Рэспублікі Казахстан ад 21 чэрвеня 2013 г. № 105-V «Аб	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
		пенсійным забеспячэнні ў Рэспубліцы Казахстан»	
10. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	цэнтральны дэпазітарый з'яўляецца адзінай арганізацыяй на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан, якая ажыццяўляе дэпазітарную дзейнасць. Цэнтральны дэпазітарый ствараецца ў форме акцыянернага таварыства	Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 года № 461-II «Аб рынку каштоўных папер»	не вызначаны
11. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	прафесійны ўдзельнік рынку каштоўных папер - юрыдычная асоба, створаная ў арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства (за выключэннем трансфер-агента)	Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 № 461-II «Аб рынку каштоўных папер»	не вызначаны
12. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	фондавая біржа - юрыдычная асоба, створаная ў арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства	Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 № 461-II «Аб рынку каштоўных папер»	не вызначаны
13. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	банкаўскім холдынгам - нерэзідэнтам Рэспублікі Казахстан, які прама валодае 25% або больш размешчаных (за вылікам прывілеяваных і выкупленых банкам) акцый банка або які мае магчымасць галасаваць прама 25% або больш галасуючых акцый банка, можа з'яўляцца толькі фінансавая арганізацыя - нерэзідэнт Рэспублікі Казахстан, якая падлягае кансалідацыйнаму нагляду ў краіне свайго месцазнаходжання	Закон Рэспублікі Казахстан ад 31 жніўня 1995 г. № 2444 «Аб банках і банкаўскай дзейнасці ў Рэспубліцы Казахстан»	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
14. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	адзіны назапашвальны пенсійны фонд з'яўляецца адзінай арганізацыяй на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан, якая ажыццяўляе дзейнасць па прыцягненню абавязковых пенсійных узносаў, абавязковых прафесійных пенсійных узносаў	Закон Рэспублікі Казахстан ад 21 чэрвеня 2013 г. № 105-V «Аб пенсійным забеспячэнні ў Рэспубліцы Казахстан»	не вызначаны
15. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	адзіны рэгістратар з'яўляецца адзінай арганізацыяй на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан, якая ажыццяўляе дзейнасць па вядзенню сістэмы рэестраў трымальнікаў каштоўных папер	Закон Рэспублікі Казахстан ад 2 ліпеня 2003 № 461-II «Аб рынку каштоўных папер»	не вызначаны
16. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	страхавым холдынгам - нерэзідэнтам Рэспублікі Казахстан, які прама валодае 25% або больш размешчаных (за вылікам прывілеяваных і выкупленых страхавой (перастраховачнай) арганізацыяй) акцый страхавой (перастраховачнай) арганізацыі або мае магчымасць галасаваць прама 25% або больш галасуючых акцый страхавой (перастраховачнай) арганізацыі, можа з'яўляцца толькі фінансавая арганізацыя	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 года № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
17. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	фонд гарантавання страхавых выплат з'яўляецца адзінай арганізацыяй на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан, якая гарантуе ажыццяўленне страхавых выплат страхавальнікам (застрахаваным, выгаданабывальнікам) пры прымусовай ліквідацыі страхавой арганізацыі па дагаворах абавязковага страхавання	Закон Рэспублікі Казахстан ад 3 чэрвеня 2003 г. № 423-II «Аб Фондзе гарантавання страхавых выплат"	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
18. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	арганізацыя, якая ажыццяўляе абавязковае гарантаванне дэпазітаў, з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая будзе створана ў арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства. Заснавальнікам, адзіным акцыянерам арганізацыі, якая ажыццяўляе абавязковае гарантаванне дэпазітаў, з'яўляецца упаўнаважаны орган	Закон Рэспублікі Казахстан ад 7 ліпеня 2006 № 169-III «Аб абавязковым гарантаванні дэпазітаў, размешчаных у банках другога ўзроўню Рэспублікі Казахстан»	не вызначаны
19. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	крэдытнае бюро з дзяржаўным удзелам з'яўляецца адзінай спецыялізаванай некамерцыйнай арганізацыяй, створанай у арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства, у якую пастаўшчыкі пастаўляюць інфармацыю, неабходную для фарміравання крэдытных гісторый у абавязковым парадку	Закон Рэспублікі Казахстан ад 6 ліпеня 2004 г. № 573-II «Аб крэдытных бюро і фарміраванні крэдытных гісторый ў Рэспубліцы Казахстан»	не вызначаны
20. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	фарміраванне і вядзенне базы дадзеных па дагаворах страхавання ажыццяўляе некамерцыйная арганізацыя, створаная ў арганізацыйна-прававой форме акцыянернага таварыства з доляй ўдзелу дзяржавы	Закон Рэспублікі Казахстан ад 18 снежня 2000 г. № 126-II «Аб страхавой дзейнасці»	не вызначаны
	III. РАСІЙСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ		
1. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку	страхавыя арганізацыі, якія з'яўляюцца даччынымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў (асноўных арганізацый) або якія маюць долю замежных інвестараў у сваім устаўным	Федэральны закон ад 27 лістапада 1992 № 4015-I «Аб арганізацыі	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
№ 17	капітале больш за 49%, не могуць ажыццяўляць у Расійскай Федэрацыі страхаванне жыцця, здароўя і маёмасці грамадзян за кошт сродкаў, што выдзяляюцца на гэтыя мэты з адпаведнага бюджэту федэральным органам выканаўчай улады (страхавальнікам), страхаванне, звязанае з ажыццяўленнем закупак тавараў, работ, паслуг для забеспячэння дзяржаўных і муніцыпальных патрэб, а таксама страхаванне маёмасных інтарэсаў дзяржаўных арганізацый і муніцыпальных арганізацый.	страхавога справы ў Расійскай Федэрацыі»	
	Страхавыя арганізацыі, якія з'яўляюцца даччынымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў (асноўных арганізацый) або якія маюць долю замежных інвестараў у сваім устаўным капітале больш за 51%, таксама не могуць ажыццяўляць у Расійскай Федэрацыі страхаванне маёмасных інтарэсаў, звязаных з дажыццем грамадзян да пэўнага ўзросту ці тэрміну або надыходам іншых падзеяў у жыцці грамадзян, а таксама з іх смерцю, і абавязковае страхаванне грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Страхавая арганізацыя, якая з'яўляецца даччыным таварыствам у адносінах да замежнага інвестара (асноўнай арганізацыі) або якая мае долю замежных інвестараў у сваім устаўным капітале больш за 49%, мае права ажыццяўляць у Расійскай Федэрацыі страхавую дзейнасць, калі замежны інвестар (асноўная арганізацыя) не менш за 5 гадоў з'яўляецца страхавой		да 22 жніўня 2017 г.

Найўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	арганізацыяй і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам адпаведнай дзяржавы. Заканадаўствам Расійскай Федэрацыі ўстаноўлены граничны памер (квота) удзелу замежнага капіталу ва ўстаўных капіталах страхавых арганізацый, які роўны 50%. Інфармацыя аб памеры (квоце) удзелу замежнага капіталу страхавых арганізацый, аб увядзенні або спыненні прадугледжаных абзацамі пятым і сёмым гэтага пункта абмежаванняў на замежныя інвестыцыі падлягае апублікаванню ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Расійскай Федэрацыі. У выпадку, калі памер (квота) удзелу замежнага капіталу ва ўстаўных капіталах страхавых арганізацый перавышае 50%, орган страхавога нагляду спыняе выдачу ліцэнзій на ажыццяўленне страхавой дзейнасці страхавым арганізацыям, якія з'яўляюцца дачкінымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў (асноўных арганізацый) або якія маюць долю замежных інвестараў у сваім устаўным капітале больш за 49%. Страхавая арганізацыя павінна атрымаць папярэдні дазвол органа страхавога нагляду на павелічэнне памеру свайго ўстаўнага капіталу за кошт сродкаў замежных інвестараў і (або) іх дачкінных таварыстваў, на адчужэнне на карысць замежных інвестараў (у тым ліку на продаж замежным інвестарам) сваіх акцый (доляў ва ўстаўным капітале), а расійскія акцыянеры (удзельнікі) абавязаны атрымаць папярэдні дазвол органа страхавога нагляду на адчужэнне акцый (доляў ва ўстаўным		

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	капітале) страхавой арганізацыі, якія належаць ім, ў карысць замежных інвестараў і (або) іх дачыных таварыстваў. Калі устаноўлены памер (квота) удзелу замежнага капіталу ва ўстаўных капіталах страхавых арганізацый будзе перавышаны, орган страхавога нагляду адмаўляе ў папярэднім дазволе страхавым арганізацыям, якія з'яўляюцца дачынымі таварыствамі ў адносінах да замежных інвестараў (асноўных арганізацый) або якія маюць долю замежных інвестараў у сваім устаўным капітале больш за 49% або становяцца такімі ў выніку названых здзелак. Аплата акцый (доляў ва ўстаўных капіталах) страхавых арганізацый, якія належаць замежным інвестарам, ажыццяўляецца выключна ў грашовай форме ў валюце Расійскай Федэрацыі. Нягледзячы на палажэнні гэтага пункта, страхавыя арганізацыі, якія атрымалі ліцэнзіі на ажыццяўленне страхавой дзейнасці да далучэння Расіі да СГА, могуць працягваць ажыццяўленне гэтай дзейнасці ў адпаведнасці з умовамі, на якіх ліцэнзія была выдадзена		
2. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	страхавымі агентамі, страхавымі брокерамі могуць з'яўляцца толькі грамадзяне Расійскай Федэрацыі (дадзенае абмежаванне не распаўсюджваецца на страхавых агентаў – фізічных асоб, якія не зарэгістраваны ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў)	Федэральны закон ад 27 лістапада 1992 г. № 4015-I «Аб арганізацыі страхавой справы ў Расійскай Федэрацыі»	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
3. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	ўдзел замежнага капіталу ў банкаўскай сістэме Расійскай Федэрацыі абмежаваны 50%. Для мэт кантролю за квотай замежнага ўдзелу ў банкаўскай сістэме Расійскай Федэрацыі папярэдні дазвол Цэнтральнага банка патрабуецца на: стварэнне крэдытнай арганізацыі з замежным удзелам, у тым ліку даччыныя і залежныя таварыства павелічэнне ўстаўнага капіталу крэдытнай арганізацыі за кошт сродкаў нерэзідэнта (нерэзідэнтаў) адчужэнне акцый (доляў) крэдытнай арганізацыі на карысць нерэзідэнтаў	Міжнародныя абавязкі Расійскай Федэрацыі, якія маюць дачыненне да паслуг і якія вынікаюць з Пратакола ад 16 снежня 2011 аб далучэнні Расійскай Федэрацыі да Марракешскаму пагадненню аб заснаванні сусветнай гандлёвай арганізацыі ад 15 красавіка 1994	не вызначаны
4. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	ліцэнзія на ажыццяўленне дзейнасці ў сферы фінансавых паслуг у Расійскай Федэрацыі выдаецца юрыдычным асобам Расійскай Федэрацыі, створаным у арганізацыйна-прававой форме, устаноўленай заканадаўствам Расійскай Федэрацыі	Федэральны закон ад 1 снежня 1990 г. № 395 -I «Аб банках і банкаўскай дзейнасці», Федэральны закон ад 22 красавіка 1996 г. № 39- ФЗ «Аб рынку каштоўных папер», Федэральны закон ад 27 лістапада 1992 № 4015 -I «Аб арганізацыі страхавой справы ў Расійскай Федэрацыі», Федэральны	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
		закон ад 7 лютага 2011 № 7- ФЗ «Аб клірынгу і клірынгавай дзейнасці», Федэральны закон ад 21 лістапада 2011 г. № 325-ФЗ «Аб арганізаваных таргах», Федэральны закон ад 7 мая 1998 г. № 75- ФЗ «Аб недзяржаўных пенсійных фондах», Федэральны закон ад 29 лістапада 2001 г № 156-ФЗ «Аб інвестыцыйных фондах», Федэральны закон ад 14 сакавіка 2013 года № 29- ФЗ «Аб уносенні змяненняў у асобныя заканадаўчыя акты Расійскай Федэрацыі»	
5. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	ў дачыненні да крэдытных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі дзейнічаюць абмежаванні ў наступных выпадках: калі асоба, якая ажыццяўляе функцыі адміасобнага выканаўчага органа расійскай крэдытнай арганізацыі, з'яўляецца замежным	Загад Банка Расіі ад 23 красавіка 1997 № 02-195 «Аб увядзенні ў дзеянне Палажэння «Аб асаблівасцях рэгістрацыі	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	грамадзянінам або асобай без грамадзянства, калегіяльны выканаўчы орган такой крэдытнай арганізацыі не менш чым на 50% павінен быць сфарміраваны з грамадзян Расійскай Федэрацыі. Колькасць работнікаў, якія з'яўляюцца грамадзянамі Расійскай Федэрацыі, павінна складаць не менш за 75% ад агульнай колькасці работнікаў расійскай крэдытнай арганізацыі з замежнымі інвестыцыямі	крэдытных арганізацый з замежнымі інвестыцыямі і аб парадку атрымання папярэдняга дазволу Банка Расіі на павелічэнне ўстаўнага капіталу зарэгістраванай крэдытнай арганізацыі за кошт сродкаў нерэзідэнтаў»	
6. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	колькасць замежнага персаналу прадстаўніцтва замежнай крэдытнай арганізацыі, як правіла, не павінна перавышаць 2 чалавек. У выпадку, калі прадстаўніцтву патрабуецца большая колькасць акрэдытаваных супрацоўнікаў, неабходнасць у гэтым павінна быць абгрунтавана ў пісьмовай заяве на імя старшыні Банка Расіі, на падставе якога прымаецца рашэнне	Загад Банка Расіі ад 7 кастрычніка 1997 г. № 02-437 «Аб парадку адкрыцця і дзейнасці ў Расійскай Федэрацыі прадстаўніцтваў замежных крэдытных арганізацый»	не вызначаны
7. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	кіраўнікі (у тым ліку аднаасобны выканаўчы орган) і галоўны бухгалтар суб'екта расійскай страхавой справы (юрыдычнай асобы) павінны пастаянна пражываць на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі	Закон Расійскай Федэрацыі ад 27 лістапада 1992 г. № 4015-I «Аб арганізацыі страхавой справы ў Расійскай	да 1 студзеня 2015 г.

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
		Федэрацыі»	
8. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	дзейнасць, на ажыццяўленне якой патрабуецца ліцэнзія, можа ажыццяўляцца толькі юрыдычнымі асобамі Расійскай Федэрацыі або індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку ў Расійскай Федэрацыі. Віды дзейнасці, якая падлягае ліцэнзаванню, вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі	федэральны закон ад 4 мая 2011 г № 99-ФЗ «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці» (і заканадаўства, якое рэгулюе віды дзейнасці, пералічаныя ў пункце 2 артыкула 1 гэтага Федэральнага закона), Федэральны закон ад 1 снежня 1990 г. № 395-I «Аб банках і банкаўскай дзейнасці»	не вызначаны
9. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	доля кожнага акцыянера (звязанай групы асоб) ва ўстаўным капітале арганізатара гандлю не можа перавышаць 10%, за выключэннем выпадкаў, калі акцыянерам (звязанай групай асоб) з'яўляецца ўпаўнаважаны орган або інфраструктурныя арганізацыі фінансавага рынку Расійскай Федэрацыі, якія ўваходзяць у адну холдынгавую групу	–	не вызначаны
10. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	вядзенне страхавых гісторый ў Расійскай Федэрацыі ажыццяўляецца адзінай арганізацыяй, якая засноўвае і ажыццяўляе дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам	–	не вызначаны

Наяўнасць абмежавання	Апісанне абмежавання	Падстава для прымянення абмежавання (нарматыўны прававы акт)	Тэрмін дзеяння абмежавання
	Расійскай Федэрацыі		
11. Абмежаванне па пунктах 6 і 11 дадатку № 17	арганізацыя, якая атрымала статус цэнтральнага дэпазітарыя, з'яўляецца адзінай арганізацыяй на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, якая ажыццяўляе функцыі цэнтральнага дэпазітарыя цэнтральны дэпазітарый ствараецца ў форме акцыянернага таварыства.	Федэральны закон ад 7 снежня 2011 № 414-ФЗ «Аб цэнтральным дэпазітарыі»	не вызначаны

ДАДАТАК № 18

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб парадку спагнання ўскосных падаткаў і механізме кантролю за іх уплатай пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг

I. Агульныя палажэнні

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з артыкуламі 71 і 72 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і вызначае парадак спагнання ўскосных падаткаў і механізм кантролю за іх уплатай пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

"аўдытарскія паслугі" – паслугі па правядзенню аўдыту бухгалтарскага ўліку, падатковай і фінансавай справаздачнасці;

"бухгалтарскія паслугі" - паслугі па пастаноўцы, вядзенню, аднаўленню бухгалтарскага ўліку, састаўленню і (або) прадстаўленню падатковай, фінансавай і бухгалтарскай справаздачнасці;

"рухомая маёмасць" – рэчы, якія не адносяцца да нерухомай маёмасці, да транспартных сродкаў;

"дызайнерскія паслугі"паслугі па праектаванню мастацкіх форм, знешняга віду вырабаў, фасадаў будынкаў, інтэр'ераў памяшканняў; мастацкае канструяванне;

"імпарт тавараў" – увоз тавараў падаткаплацельшчыкамі (плацельшчыкамі) на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена;

"інжынірынгавыя паслугі" – інжынерна-кансультацыйныя паслугі па падрыхтоўцы працэсу вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), падрыхтоўцы будаўніцтва і эксплуатацыі прамысловых, інфраструктурных, сельскагаспадарчых і іншых аб'ектаў, а таксама перадпраектныя і праектныя паслугі (падрыхтоўка тэхніка-эканамічных абгрунтаванняў, праектна-канструктарскія распрацоўкі, тэхнічныя выпрабаванні і аналіз вынікаў такіх выпрабаванняў);

"кампетэнтныя органы" – міністэрства фінансаў, эканомікі, падатковыя і мытныя органы дзяржаў-членаў;

"кансультацыйныя паслугі" – паслугі па прадастаўленню растлумачэнняў, рэкамендацый і іншых форм кансультацый, уключаючы вызначэнне і (або) адзнаку праблем і (або) магчымасцей асобы, па кіраўніцкіх, эканамічных, фінансавых (у тым ліку падатковых і бухгалтарскіх) пытаннях, а таксама па пытаннях планавання, арганізацыі і ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, кіравання персаналам;

"ускосныя падаткі" – падатак на дабаўленую вартасць (далей – ПДВ) і акцызы (акцызны падатак або акцызны збор);

"маркетынгавыя паслугі" – паслугі, звязаныя з даследаваннем, аналізам, планаваннем і прагназаваннем у сферы вытворчасці і звароту тавараў (работ, паслуг) у мэтах вызначэння мер па стварэнню неабходных эканамічных умоў вытворчасці і звароту тавараў (работ, паслуг), уключаючы характарыстыку тавараў (работ, паслуг), выпрацоўку цэнавай стратэгіі і стратэгіі рэкламы;

"падаткаплацельшчык (плацельшчык)" – падаткаплацельшчык (плацельшчык) падаткаў, збораў і пошлін дзяржаў-членаў (далей – падаткаплацельшчык);

"навукова-даследчыя работы" – правядзенне навуковых даследаванняў, абумоўленых тэхнічным заданнем заказчыка;

"нерухомая маёмасць" – зямельныя ўчасткі, участкі нетраў, адасобленыя водныя аб'екты і ўсё, што моцна звязана з зямлёй, гэта значыць аб'екты, перамяшчэнне якіх без несуразмернага ўрону іх прызначэнню немагчыма, у тым ліку лясы, шматгадовыя насаджэнні, будынкі, збудаванні, трубаправоды, лініі электраперадачы, прадпрыемства як маёмасныя комплексы і касмічныя аб'екты;

"нулявая стаўка" – абкладанне ПДВ па стаўцы ў памеры нуль працэнтаў з правам на вылік (залік) адпаведных сум ПДВ;

"вопытна-канструктарскія і вопытна-тэхналагічныя (тэхналагічныя) работы" – распрацоўка ўзору новага вырабу, канструктарскай дакументацыі на яго або новай тэхналогіі;

"работа" – дзейнасць, вынікі якой маюць матэрыяльнае выяўленне і могуць быць рэалізаваны для задавальнення патрэбнасцей юрыдычных і (або) фізічных асоб;

"рэкламныя паслугі" – паслугі па стварэнню, распаўсюджванню і размяшчэнню інфармацыі, прызначанай для нявызначанага круга асоб і прызванай фарміраваць або падтрымліваць інтарэс да юрыдычнай або фізічнай асобы, тавараў, таварных знакаў, работ, паслуг, з дапамогай любых сродкаў і ў любой форме;

"тавар" – любая рухомая і нерухомая маёмасць, транспартныя сродкі, усе віды энергіі, якія рэалізуюцца або прызначаныя для рэалізацыі;

"транспартныя сродкі" – марскія і паветраныя судны, судны ўнутранага плавання, судны змешанага (рака – мора) плавання; адзінкі

чыгуначнага або трамвайнага рухомага саставу; аўтобусы; аўтамабілі, уключаючы прычэпы і паўпрычэпы; грузавыя кантэйнеры; кар'ерныя самазвалы;

"паслуга" – дзейнасць, вынікі якой не маюць матэрыяльнага выяўлення, рэалізуюцца і спажываюцца ў працэсе ажыццяўлення гэтай дзейнасці, а таксама перадача, прадастаўленне патэнтаў, ліцэнзій, гандлёвых марак, аўтарскіх праў або іншых правоў;

"паслугі па апрацоўцы інфармацыі" – паслугі па ажыццяўленню збору і абагульненню інфармацыі, сістэматызацыі інфармацыйных масіваў (дадзеных) і прадастаўленню ў распараджэнне карыстальніка вынікаў апрацоўкі гэтай інфармацыі;

"эксперт тавараў" – вываз тавараў, якія рэалізуюцца падаткаплацельшчыкам, з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена;

"юрыдычныя паслугі" – паслугі прававога характару, у тым ліку прадастаўленне кансультацый і растлумачэнняў, падрыхтоўка і прававая экспертыза дакументаў, прадстаўленне інтарэсаў заказчыкаў у судах.

II. Парадак прымянення ўскосных падаткаў пры экспарце тавараў

3. Пры экспарце тавараў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой вывезены тавары, прымяняюцца нулявая стаўка ПВК і (або) вызваленне ад уплаты акцызаў пры прадстаўленні ў падатковы орган дакументаў, прадугледжаных пунктам 4 гэтага Пратакола.

Пры экспарце тавараў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена падаткаплацельшчык мае права на падатковыя вылікі (залікі), ў парадку, аналагічным, прадугледжанаму заканадаўствам дзяржавы-члена, які прымяняецца ў дачыненні да тавараў, якія экспартаваны з тэрыторыі гэтай дзяржавы-члена за межы Саюза.

Месца рэалізацыі тавараў вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым пунктам.

У выпадку рэалізацыі тавару падаткаплацельшчыкам адной дзяржавы-члена падаткаплацельшчыку другой дзяржавы-члена, калі перавозка (транспарціроўка) тавару пачата за межамі Саюза і завершана ў другой дзяржаве-члене, месцам рэалізацыі тавару прызнаецца тэрыторыя дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой тавар змяшчаецца пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання.

4. Для пацвярджэння абгрунтаванасці прымянення нулявой стаўкі ПДВ і (або) вызвалення ад уплаты акцызаў падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой вывезены тавары, у падатковы орган адначасова з падатковай дэкларацыяй прадстаўляюцца наступныя дакументы (іх копіі):

1) дагаворы (кантракты), заключаныя з падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена або з падаткаплацельшчыкам дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Саюза (далей - дагаворы (кантракты), на падставе якіх ажыццяўляецца экспарт тавараў; у выпадку лізінгу тавараў або таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў) – дагаворы (кантракты) лізінгу, дагаворы (кантракты) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў); дагаворы

(кантракты) на выраб тавараў; дагаворы (кантракты) на перапрацоўку давальніцкай сыравіны;

2) выпіска банка, якая пацвярджае фактычнае паступленне выручкі ад рэалізацыі экспартаваных тавараў на рахунак падаткаплацельшчыка-экспарцёра, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

У выпадку, калі дагаворам (кантрактам) прадугледжаны разлік наяўнымі грашовымі сродкамі і такі разлік не супярэчыць заканадаўству дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартуюцца тавары, падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган выпіску банка (копію выпіскі), якая пацвярджае ўнясенне падаткаплацельшчыкам атрыманых сум на яго рахунак у банку, а таксама копіі прыходных касавых ордэраў, якія пацвярджаюць фактычнае паступленне выручкі ад пакупніка названных тавараў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартуюцца тавары.

У выпадку вывазу тавараў па дагаворы (кантракце) лізінгу, які прадугледжвае пераход права ўласнасці на іх да лізінгаатрымальніка, падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган выпіску банка (копію выпіскі), якая пацвярджае фактычнае паступленне лізінгавага плацяжу (у частцы пакрыцця першапачатковага кошту тавараў (прадметаў лізінгу) на рахунак падаткаплацельшчыка-экспарцёра, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

У выпадку ажыццяўлення знешнегандлёвых тавараабменных (бартэрных) аперацый, предастаўлення таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў) падаткаплацельшчык-экспарцёр прадстаўляе ў падатковы орган дакументы, якія пацвярджаюць імпарт тавараў, (выкананне работ, аказанне паслуг), атрыманых (набытых) ім па ўказаных аперацыях.

Дакументы, указаныя ў гэтым падпункце, не прадстаўляюцца ў падатковы орган, калі іх прадстаўленне не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена ў дачыненні да тавараў, экспартаваных з тэрыторыі дзяржавы-члена за межы Саюза;

3) заява аб увозе тавараў і ўплаце ўскосных падаткаў, састаўленая па форме, прадугледжанай асобным міжнародным міжведамасным дагаворам, з адзнакай падатковага органа дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, аб уплаце ўскосных падаткаў (вызваленні або іншым парадку выканання падатковых абавязацельстваў) (далей – заява) (на папяровым носьбіце ў арыгінале або ў копіі па меркаванню падатковых органаў дзяржаў-членаў) або пералік заяў (на папяровым носьбіце або ў электронным выглядзе з электронным (электронна-лічбавым) подпісам падаткаплацельшчыка).

Падаткаплацельшчык уключае ў пералік заяў рэквізіты і звесткі з тых заяў, інфармацыя аб якіх паступіла ў падатковы орган у форме, прадугледжанай асобным міжнародным міжведамасным дагаворам.

Форма пераліку заяў, парадак яе запаўнення і фармат вызначаюцца нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

У выпадку рэалізацыі тавараў, якія вывозяцца з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю гэтай другой дзяржавы-члена, і змяшчэнне іх пад мытныя працэдуры свабоднай мытнай зоны або свабоднага склада на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена, замест заявы ў падатковы орган першай дзяржавы-члена прадстаўляецца завераная мытным органам другой дзяржавы-члена копія мытнай дэкларацыі, у адпаведнасці з якой такія тавары змешчаны пад мытныя працэдуры свабоднай мытнай зоны або свабоднага склада;

4) транспартныя (таварасправаджальныя) і (або) іншыя дакументы, прадугледжаныя заканадаўствам дзяржавы-члена, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена. Указаныя дакументы не прадстаўляюцца, калі для асобных відаў перамяшчэння тавараў, у тым ліку перамяшчэння тавараў без выкарыстання транспартных сродкаў, афармленне гэтых дакументаў не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена;

5) іншыя дакументы, якія пацвярджаюць абгрунтаванасць прымянення нулявой стаўкі ПДВ і (або) вызваленні ад уплаты акцызаў, прадугледжаныя заканадаўствам дзяржавы-члена, с тэрыторыі якой экспартавана тавары.

Дакументы, прадугледжаныя гэтым пунктам, за выключэннем заявы (пераліку заяў), не прадстаўляюцца ў падатковы орган, калі непрадстаўленне дакументаў, якія пацвярджаюць абгрунтаванасць прымянення нулявой стаўкі ПДВ і (або) вызвалення ад уплаты акцызаў, адначасова з падатковай дэкларацыяй вынікае з заканадаўства дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары.

Дакументы, прадугледжаныя гэтым пунктам, не прадстаўляюцца з адпаведнай падатковай дэкларацыяй па акцызах, калі яны былі прадстаўленны з падатковай дэкларацыяй па ПДВ, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

Дакументы, прадугледжаныя падпунктамі 1, 2, 4, 5 і абзацам чацвёртым падпункта 3 гэтага пункта, могуць быць прадстаўлены ў электронным выглядзе ў парадку, які ўстаноўлены нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў. Фармат указаных

дакументаў, вызначаецца падатковымі органамі дзяржаў-членаў, або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

5. Дакументы, прадугледжаныя пунктам 4 гэтага Пратакола, прадстаўляюцца ў падатковы орган на працягу 180 каляндарных дзён з даты адгрузкі (перадачы) тавараў.

Пры непрадстаўленні гэтых дакументаў у вызначаны тэрмін сумы ўскосных падаткаў падлягаюць уплаце ў бюджэт за падатковы (справаздачны) перыяд, на які даводзіцца дата адгрузкі тавараў, або іншы падатковы (справаздачны) перыяд, устаноўлены заканадаўствам дзяржавы-члена, з правам на вылік (залік) адпаведных сум ПДВ згодна з заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары.

У мэтах вылічэння ПДВ пры рэалізацыі тавараў датай адгрузкі прызнаецца дата першага па часе састаўлення пярвічнага бухгалтарскага (уліковага) дакумента, аформленага на пакупніка тавараў (першага перавозчыка), або дата выпіскі іншага абавязковага дакумента, прадугледжанага заканадаўствам дзяржавы-члена для падаткаплацельшчыка ПДВ.

У мэтах вылічэння акцызаў па падакцызных таварах, вырабленых з уласнай сыравіны, датай адгрузкі тавараў прызнаецца дата першага па часе састаўлення пярвічнага бухгалтарскага (уліковага) дакумента, аформленага на пакупніка (атрымальніка) тавараў; па падакцызных таварах, вырабленых з давальніцкай сыравіны, датай адгрузкі прызнаецца дата падпісання акта прыёму-перадачы падакцызных тавараў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой выраблены падакцызныя тавары.

У выпадку няўплаты, няпоўнай уплаты ўскосных падаткаў, улаты такіх падаткаў з парушэннем тэрміну, устаноўленага гэтым

пунктам, падатковы орган спаганяе ўскосныя падаткі і пені ў парадку і памеры, устаноўленыя заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары, а таксама прымяняе спосабы забеспячэння выканання абавязацельстваў па ўплаце ўскосных падаткаў, пеняў і меры адказнасці, устаноўленыя заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена.

У выпадку прадстаўлення падаткаплацельшчыкам дакументаў, прадугледжаных пунктам 4 гэтага Пратакола, па сканчэнні тэрміну, устаноўленага гэтым пунктам, уплачаныя сумы ўскосных падаткаў падлягаюць выліку (заліку), вяртанню ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары. Сумы пеняў, штрафаў, уплачаныя за парушэнне тэрмінаў уплаты ўскосных падаткаў, вяртанню не падлягаюць.

6. Аб'ём тавараў, стаўкі акцызаў, дзеючыя на дату адгрузкі падакцызных тавараў, якія вывозяцца ў дзяржавы-члены, а таксама сумы акцызаў падлягаюць адлюстраванню ў адпаведнай падатковай дэкларацыі па акцызах.

7. Падатковы орган правярае абгрунтаванасць прымянення нулявой стаўкі ПДВ і (або) вызвалення ад уплаты акцызаў, падатковых вылікаў (залікаў) па ўказаных падатках, а таксама прымае (выносіць) адпаведнае рашэнне згодна з заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары.

У выпадку непрадстаўлення ў падатковы орган заявы падатковы орган мае права прыняць (вынесці) рашэнне аб пацвярджэнні абгрунтаванасці прымянення нулявой стаўкі ПДВ і (або) вызвалення ад уплаты акцызаў, падатковых вылікаў (залікаў) па прызначаных падатках у дачыненні да аперацый па рэалізацыі тавараў, экспартаваных з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена, пры наяўнасці ў падатковым органе адной дзяржавы-члена пацвярджэння у электронным выглядзе ад

падатковага органа другой дзяржавы-члена факта уплаты ўскосных падаткаў у поўным аб'ёме (вызвалення ад уплаты ўскосных падаткаў).

8. Калі прадстаўленыя падаткаплацельшчыкам звесткі аб перамяшчэнні тавараў і ўплаце ўскосных падаткаў не адпавядаюць дадзеным, атрыманым у рамках, установленага паміж падатковымі органамі дзяржаў-членаў, абмену інфармацыяй, падатковы орган спаганяе ўскосныя падаткі і пені ў парадку і памеры, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена, з тэрыторыі якой экспартаваны тавары, а таксама прымяняе спосабы забеспячэння выканання абавязацельстваў па ўплаце ўскосных падаткаў, пеняў і меры адказнасці, устаноўленыя заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена.

9. Палажэнні гэтага раздзела ў частцы ПДВ прымяняюцца таксама ў дачыненні да тавараў, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па дагаворах (кантрактах) аб іх вырабе, якія вывозяцца з тэрыторыі дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой выконваліся работы па іх вырабу, на тэрыторыю другой дзяржавы-члена. Да ўказаных тавараў не адносяцца тавары, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па перапрацоўцы давальніцкай сыравіны.

10. Падатковая база для абкладання акцызамі тавараў, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па дагаворы (кантракце) аб перапрацоўцы давальніцкай сыравіны, вызначаецца як аб'ём, колькасць (іншыя паказчыкі) падакцызных тавараў, якія выраблены з давальніцкай сыравіны, ў натуральным выражэнні, ў дачыненні да якіх устаноўлены цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, або як кошт падакцызных тавараў, якія выраблены з давальніцкай сыравіны, ў дачыненні да якіх устаноўлены адвалорныя стаўкі акцызаў.

11. Падатковая база па ПДВ пры экспарце тавараў пры змяненні яе ўбок павелічэння (змяншэння) з-за павелічэння (змяншэння) кошту рэалізаванага тавараў або змяншэння колькасці (аб'ёму) рэалізаваных

тавараў у сувязі з іх вяртаннем па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі карэкціруецца ў тым падатковым (справаздачным) перыядзе, у якім удзельнікі дагавора (кантракта) змянілі кошт (узгаднілі вяртанне) экспартаваных тавараў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

Пры вывазе тавараў (прадмстаў лізінгу) з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена па дагаворы (кантракце) лізінгу, які прадугледжвае пераход права ўласнасці на іх да лізінгаатрымальніка, па дагаворы (кантракце) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў), па дагаворы (кантракце) аб вырабе тавараў прымяняецца нулявая стаўка ПДВ і (або) вызваленне ад уплаты акцызаў (калі адпаведная аперацыя падлягае абкладанню акцызамі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена) пры прадстаўленні ў падатковы орган дакументаў, прадугледжаных у пункце 4 гэтага Пратакола.

Падатковая база па ПДВ пры вывазе з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена тавараў (прадметаў лізінгу) па дагаворы (кантракце) лізінгу, які прадугледжвае пераход права ўласнасці на іх да лізінгаатрымальніка, вызначаецца на дату, прадугледжаную дагаворам (кантрактам) лізінгу для уплаты кожнага лізінгавага плацяжу, у памеры часткі першапачатковага кошту тавараў (прадметаў лізінгу), якая даводзіцца на кожны лізінгавы плацеж.

Падатковыя вылікі (залікі) праводзяцца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам дзяржавы-члена, у частцы, якая даводзіцца на кошт тавараў (прадметаў лізінгу) па кожным лізінгавым плацяжы.

Падатковай базай па ПДВ пры вывазе з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена тавараў па

дагаворы (кантракце) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў) з'яўляецца кошт тавараў, якія перадаюцца (прадстаўляюцца), прадугледжаны дагаворам (кантрактам), пры адсутнасці кошту ў дагаворы (кантракце) – кошт, указаны ў таварасуправаджальных дакументах, пры адсутнасці кошту ў дагаворы (кантракце) і таварасуправаджальных дакументах – кошт тавараў, які адлюстраваны ва ўліку.

12. Для забеспячэння паўнаты ўплаты ўскосных падаткаў можа прымяняцца заканадаўства дзяржавы-члена, якое рэгулюе прынцыпы вызначэння кошту ў мэтах падаткаабкладання.

III. Парадак спагнання ўскосных падаткаў пры імпарце тавараў

13. Спагнанне ўскосных падаткаў па таварах, якія імпартуюцца на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена (за выключэннем выпадку, устаноўленага пунктам 27 гэтага Пратакола, і (або) змешчэнне пад мытныя працэдуры свабоднай мытнай зоны або свабоднага склада тавараў, якія імпартуюцца) ажыццяўляецца падатковым органам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, па месцы пастаноўкі на ўлік падаткаплацельшчыкаў – уласнікаў тавараў, уключаючы падаткаплацельшчыкаў, якія выкарыстоўваюць спецыяльныя рэжымы падаткаабкладання, у тым ліку з улікам асаблівасцей, прадугледжаных пунктамі 13.1 – 13.5 гэтага Пратакола.

Для мэт гэтага раздзела ўласнікам тавараў прызнаецца асоба, якая валодае правам уласнасці на тавары або пераход права ўласнасці на тавары да якой прадугледжваецца дагаворам (кантрактам).

13.1. Калі тавары набываюцца на падставе дагавора (кантракта) паміж падаткаплацельшчыкам адной дзяржавы-члена і падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена, уплата ўскосных падаткаў ажыццяўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў, або, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, – камісіянерам, давераным або агентам.

13.2. Калі тавары набываюцца на падставе дагавора (кантракта) паміж падаткаплацельшчыкам адной дзяржавы-члена і падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена, і пры гэтым тавары імпартуюцца з тэрыторыі трэцяй дзяржавы-члена, ускосныя падаткі ўплачваюцца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў.

13.3. Калі тавары рэалізуюцца падаткаплацельшчыкам адной дзяржавы-члена праз камісіянера, даверанага або агента падаткаплацельшчыку другой дзяржавы-члена і імпартуюцца з тэрыторыі першай або трэцяй дзяржавы-члена, уплата ўскосных падаткаў ажыццяўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў, або, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, – камісіянерам, давераным або агентам.

13.4. Калі падаткаплацельшчык адной дзяржавы-члена набывае тавары, раней імпартаваныя на тэрыторыю гэтай дзяржавы-члена падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена, ускосныя падаткі па якім не былі ўплачаны, уплата ўскосных падаткаў ажыццяўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў, або, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, – камісіянерам, давераным або агентам (у выпадку калі тавары будуць рэалізаваны

падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена праз камісіянера, даверанага або агента).

Калі падаткаплацельшчык адной дзяржавы-члена набывае тавары, раней імпартаваныя на тэрыторыю гэтай дзяржавы-члена камісіянерам, давераным або агентам (падаткаплацельшчыкам гэтай дзяржавы-члена) па дагаворы (кантракце) камісіі, даручэння або агенцкім дагаворы (кантракце) з падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена, ускосныя падаткі па якім не былі ўплачаны, то ўплата ўскосных падаткаў ажыццяўляецца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў, або, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена – камісіянерам, давераным або агентам, якія імпартавалі тавары.

13.5. Калі тавары набываюцца на падставе дагавора (кантракта) паміж падаткаплацельшчыкам першай дзяржавы-члена і падаткаплацельшчыкам дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Саюза, і пры гэтым тавары імпартуюцца з тэрыторыі другой дзяржавы-члена, ускосныя падаткі уплачваюцца падаткаплацельшчыкам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, – уласнікам тавараў, або, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена – камісіянерам, давераным або агентам (у выпадку калі тавары будуць рэалізаваны праз камісіянера, даверанага або агента).

14. Для мэтаў уплаты ПДВ падатковая база вызначаецца на дату прыняцця на ўлік у падаткаплацельшчыка імпартаваных тавараў (але не пазней тэрміну, устаноўленага заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартуюцца тавары) на аснове кошту набытых тавараў (у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па дагаворы (кантракце) аб іх вырабе), а таксама тавараў, атрыманых па дагаворы (кантракце) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў), тавараў, якія з'яўляюцца прадуктам перапрацоўкі

давальніцкай сыравіны, і акцызаў, якія падлягаюць уплаце па падакцызных таварах.

Коштам набытых тавараў (у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па дагаворы (кантракце) аб іх вырабе) з'яўляецца кошт здзелкі, які падлягае ўплаце пастаўшчыку за тавары (работы, паслугі) згодна з ўмовамі дагавора (кантракта).

Коштам тавараў, атрыманых па тавараабменным (бартэрным) дагаворы (кантракце), а таксама дагавору (кантракту) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў), з'яўляецца кошт тавараў, прадугледжаны дагаворам (кантрактам), пры адсутнасці кошту ў дагаворы (кантракце) – кошт, ўказаны ў таварасуправаджальных дакументах, пры адсутнасці кошту ў дагаворы (кантракце) і таварасуправаджальных дакументах – кошт тавараў, які адлюстраваны ва ўліку.

Для мэтаў вызначэння падатковай базы кошт тавараў (у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца вынікам выканання работ па дагаворы (кантракце) аб іх вырабе), выражаны ў замежнай валюце, пераразлічваецца ў нацыянальную валюту па курсу нацыянальнага (цэнтральнага) банка дзяржавы-члена на дату прыняцця тавараў да ўліку.

Падатковая база пры імпарце на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена прадуктаў перапрацоўкі давальніцкай сыравіны вызначаецца як кошт выкананых работ па перапрацоўцы давальніцкай сыравіны і акцызаў, якія падлягаюць уплаце па падакцызных прадуктах перапрацоўкі. Пры гэтым кошт выкананых работ па перапрацоўцы давальніцкай сыравіны, выражаны ў замежнай валюце, пераразлічваецца ў нацыянальную валюту па курсе нацыянальнага (цэнтральнага) банка дзяржавы-члена на дату прыняцця прадуктаў перапрацоўкі да ўліку.

15. Падатковая база пры ўвозе тавараў (прадметаў лізінгу) на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена па дагаворы (кантракце) лізінгу, які прадугледжвае пераход права ўласнасці на іх да лізінгаатрымальніка, вызначаецца ў памеры часткі кошту тавараў (прадметаў лізінгу), прадугледжанай на дату яе аплаты дагаворам (кантрактам) лізінгу (незалежна ад фактычнага памеру і даты ажыццяўлення плацяжу). Лізінгавы плацеж у замежнай валюце пералічваецца ў нацыянальную валюту па курсе нацыянальнага (цэнтральнага) банка дзяржавы-члена на дату, якая адпавядае моманту (даце) вызначэння падатковай базы.

16. Падатковай базай для абкладання акцызамі з'яўляецца аб'ём, колькасць (іншыя паказчыкі) імпартаваных падакцызных тавараў, у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца прадуктам перапрацоўкі давальніцкай сыравіны, у натуральным выяўленні, у дачыненні да якіх вызначаны цвёрдыя (спецыфічныя) стаўкі акцызаў, або кошт імпартаваных падакцызных тавараў, у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца прадуктам перапрацоўкі давальніцкай сыравіны, у дачыненні да якіх вызначаны адвалорныя стаўкі акцызаў.

Падатковая база для вылічэння акцызаў вызначаецца на дату прыняцця на ўлік падаткаплацельшчыкам імпартаваных падакцызных тавараў, у тым ліку тавараў, якія з'яўляюцца прадуктам перапрацоўкі давальніцкай сыравіны (але не пазней тэрміну, установленага заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны падакцызныя тавары).

17. Сумы ўскосных падаткаў, якія падлягаюць уплаце па таварах, імпартаваных на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена, вылічаюцца падаткаплацельшчыкам па падатковых стаўках, установленых

заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары.

18. Для забеспячэння паўнаты ўплаты ўскосных падаткаў можа прымяняцца заканадаўства дзяржавы-члена, якое рэгулюе прынцыпы вызначэння кошту ў мэтах падаткаабкладання.

19. Ускосныя падаткі, за выключэннем акцызаў па падакцызных таварах, якія маркіруюцца, выплачваюцца не пазней 20-го чысла месяца, які ідзе следам за месяцам:

прыняцця на ўлік імпартаваных тавараў;

тэрміну плацяжа, прадугледжанага дагаворам (кантрактам) лізінгу.

Уплата акцызаў па падакцызных таварах, якія маркіруюцца, праводзіцца ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам дзяржавы-члена.

20. Падаткаплацельшчык абавязаны прадставіць у падатковы орган адпаведную падатковую дэкларацыю па форме, устаноўленай заканадаўствам дзяржавы-члена, або па форме, зацверджанай кампетэнтным органам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, у тым ліку па дагаворы (кантракце) лізінгу, не пазней 20-го чысла месяца, які ідзе следам за месяцам прыняцця на ўлік імпартаваных тавараў (тэрміну плацяжа, прадугледжанаму дагаворам (кантрактам) лізінгу). Адначасова з падатковай дэкларацыяй падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган наступныя дакументы:

1) заяву на папяровым носьбіце (у чатырох экзэмплярах) і ў электронным выглядзе або заяву ў электронным выглядзе з электронным (электронна-лічбавым) подпісам падаткаплацельшчыка;

2) выпіску банка, якая пацвярджае фактычную ўплату ўскосных падаткаў па імпартаваных таварах, або іншы дакумент, які пацвярджае

выкананне падатковых абавязацельстваў па ўплаце ўскосных падаткаў, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена. Пры наяўнасці ў падаткаплацельшчыка залішне ўплачаных (спагнаных) сум падаткаў, збораў або сум ускосных падаткаў, якія падлягаюць вяртанню (заліку), як пры імпарце тавараў на тэрыторыю адной дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена, так і пры рэалізацыі тавараў (работ, паслуг) на тэрыторыі дзяржавы-члена, падатковы орган у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, прымае (выносіць) рашэнне аб іх заліку ў лік уплаты ўскосных падаткаў па імпартаваных таварах. У гэтым выпадку выпіска банка (яе копія), якая пацвярджае фактычную ўплату ўскосных падаткаў па імпартаваных таварах, не прадстаўляецца. Па дагаворы (кантракце) лізінгу ўказаныя ў гэтым падпункце дакументы прадстаўляюцца пры наступленні тэрміну плацяжа, прадугледжанага дагаворам (кантрактам) лізінгу;

3) транспартныя (таварасправаджальныя) і (або) іншыя дакументы, прадугледжаныя заканадаўствам дзяржавы-члена, якія пацвярджаюць перамяшчэнне тавараў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена на тэрыторыю другой дзяржавы-члена. Указаныя дакументы не прадстаўляюцца, калі для асобных відаў перамяшчэння тавараў, у тым ліку перамяшчэння тавараў без выкарыстання транспартных сродкаў, афармленне гэтых дакументаў не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена;

4) рахункі-фактуры, аформленыя ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена пры адгрузцы тавараў, у выпадку калі іх выстаўленне (выпіска) прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

Калі выстаўленне (выпіска) рахунка-фактуры не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена або тавары набываюцца ў

падаткаплацельшчыка дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Саюза, то замест рахунка-фактуры ў падатковы орган прадстаўляецца іншы дакумент (дакументы), выстаўлены (выпісаны) прадаўцом, які пацвярджае кошт імпартаваных тавараў;

5) дагаворы (кантракты), на падставе якіх набыты тавары, імпартаваныя на тэрыторыю дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена; у выпадку лізінгу тавараў (прадметаў лізінгу) – дагаворы (кантракты) лізінгу; у выпадку таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў) – дагаворы (кантракты) таварнага крэдыту (таварнай пазыкі, пазыкі ў выглядзе рэчаў); дагаворы (кантракты) аб вырабе тавараў; дагаворы (кантракты) на перапрацоўку давальніцкай сыравіны;

6) інфармацыйнае паведамленне (у выпадках, прадугледжаных пунктамі 13.2 – 13.5 гэтага Пратакола), прадстаўленае падаткаплацельшчыку адной дзяржавы-члена падаткаплацельшчыкам другой дзяржавы-члена, або падаткаплацельшчыкам дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Саюза (падпісанае кіраўніком (індывідуальным прадпрымальнікам) і заверанае пячаткай арганізацыі), які рэалізуе тавары, імпартаваныя з тэрыторыі трэцяй дзяржавы-члена, аб наступных звестках аб падаткаплацельшчыку трэцяй дзяржавы-члена і дагаворы (кантракце), заключаным з падаткаплацельшчыкам гэтай трэцяй дзяржавы-члена аб набыцці імпартаваных тавараў:

нумар, які ідэнтыфікуе асобу ў якасці падаткаплацельшчыка дзяржавы-члена;

поўную назву падаткаплацельшчыка (арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка) дзяржавы-члена;

месца знаходжання (жыхарства) падаткаплацельшчыка дзяржавы-члена;

нумар і дата дагавора (кантракта);

нумар і дата спецыфікацыі.

У выпадку калі падаткаплацельшчык дзяржавы-члена, у якога набываюцца тавары, не з'яўляецца ўласнікам тавараў, якія рэалізуюцца (з'яўляецца камісіянерам, давераным або агентам), то звесткі, указаныя ў абзацах другім – шостым гэтага падпункта, прадстаўляюцца таксама ў дачыненні да ўласніка тавараў, якія рэалізуюцца.

У выпадку прадстаўлення інфармацыйнага паведамлення на замежнай мове абавязкова наяўнасць перакладу на рускую мову.

Інфармацыйнае паведамленне не прадстаўляецца ў выпадку, калі звесткі, прадугледжаныя гэтым падпунктам, утрымліваюцца ў дагаворы (кантракце), прызначаным у падпункце 5 гэтага пункта;

7) дагаворы (кантракты) камісіі, даручэнні або агенцкі дагавор (кантракт) (у выпадку іх заключэння);

8) дагаворы (кантракты), на падставе якіх набыты тавары, імпартаваныя на тэрыторыю дзяржавы-члена з тэрыторыі другой дзяржавы-члена, па дагаворах (кантрактах) камісіі, даручэння або па агенцкім дагаворы (кантракце) (у выпадках, прадугледжаных пунктамі 13.2 – 13.5 гэтага Пратакола, за выключэннем выпадкаў, калі ўскосныя падаткі ўплачваюцца камісіянерам, давераным або агентам).

Дакументы, указаныя ў падпунктах 2 – 8 гэтага пункта, могуць быць прадстаўлены ў копіях, завераных у парадку, які ўстанаўліваецца заканадаўствам дзяржавы-члена або ў электронным выглядзе ў парадку, устаноўленым нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў. Фармат указаных дакументаў вызначаецца нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

Па дагаворы (кантракце) лізінгу пры першай уплаце ПДВ падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган дакументы, прадугледжаныя падпунктамі 1 – 8 гэтага пункта. У далейшым падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган адначасова з падатковай дэкларацыяй дакументы (іх копіі), прадугледжаныя падпунктамі 1 і 2 гэтага пункта.

Дакументы, указаныя ў гэтым пункце, за выключэннем заявы і інфармацыйнага паведамлення, не прадстаўляюцца ў падатковы орган, калі іх непрадстаўленне адначасова з падатковай дэкларацыяй вынікае з заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары.

21. Удакладненая (замест раней прадстаўленай) заява прадстаўляецца або на папяровым носьбіце (у чатырох экзэмплярах) і ў электронным выглядзе, або ў электронным выглядзе з электронным (электронна-лічбавым) подпісам падаткаплацельшчыка. Адначасова з удакладненай (замест раней прадстаўленай) заявай прадстаўляюцца дакументы, прадугледжаныя падпунктамі 2 – 8 пункта 20 гэтага Пратакола, калі яны не былі раней прадстаўлены ў падатковы орган.

Калі прадстаўленне ўдакладненай (замест раней прадстаўленай) заявы не вабіць за сабой унясення змяненняў у раней прадстаўленую падатковую дэкларацыю, то падаткаплацельшчык не прадстаўляе ўдакладненую (дадатковую) падатковую дэкларацыю, калі іншае не вызначана заканадаўствам дзяржавы-члена. Прадстаўленне такой ўдакладненай заявы не цягне за сабой аднаўлення раней прынятых да выліку сум ПДВ, якія былі уплачаны пры імпарце тавараў.

Удакладненая (замест раней прадстаўленай) заява не прадстаўляецца ў выпадках, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена.

22. У выпадках няўплаты, няпоўнай уплаты ўскосных падаткаў па імпартаваных таварах, уплаты такіх падаткаў у больш позні тэрмін у параўнанні з вызначаным пунктам 19 гэтага Пратакола, а таксама ў выпадках выяўлення фактаў непрадстаўлення падатковых дэкларацый, прадстаўлення іх з парушэннем тэрміну, установленага пунктам 20 гэтага Пратакола, або ў выпадках неадпаведнасці дадзеных, указаных у падатковых дэкларацыях, дадзеным, атрыманым у рамках абмену інфармацыяй паміж падатковымі органамі дзяржаў-членаў, падатковы орган спаганяе ўскосныя падаткі і пені ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыю якой імпартаваны тавары, а таксама прымяняе спосабы забеспячэння выканання абавязацельстваў па ўплаце ўскосных падаткаў, пеняў і меры адказнасці, устаноўленыя заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена.

23. Пры вяртанні імпартаваных тавараў у месяцы прыняцця іх на ўлік адлюстраванне ў падатковай дэкларацыі аперацый па імпарце гэтых тавараў не праводзіцца, калі вяртанне тавараў ажыццяўлена па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі.

Вяртанне тавараў па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі павінен быць пацверджаны ўзгодненай удзельнікамі дагавора (кантракта) прэтэнзіяй, а таксама дакументамі, якія адпавядаюць далейшаму здзяйсненню аперацый з такімі таварамі. Да такіх дакументаў могуць адносіцца акты прыёму-перадачы тавараў (у выпадку адсутнасці транспарціроўкі вернутых тавараў), транспартныя (таварасуправаджальныя) дакументы (у выпадку транспарціроўкі вернутых тавараў), акты знішчэння або іншыя дакументы. У выпадку частковага вяртання такіх тавараў указаныя дакументы (іх копіі) прадстаўляюцца ў падатковы орган адначасова з дакументамі, прадугледжанымі пунктам 20 гэтага Пратакола.

Пры вяртанні па ўказаннай прычыне імпартаваных тавараў па сканчэнні месяца, у якім тавары былі прыняты на ўлік, падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган адпаведную ўдакладненую (дадатковую) падатковую дэкларацыю і дакументы (іх копіі), указаныя ў абзацы другім гэтага пункта.

Дакументы, указаныя ў абзацы другім гэтага пункта, могуць быць прадстаўлены ў электронным выглядзе ў парадку, устаноўленым нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў. Фармат указаных дакументаў вызначаецца падатковымі органамі дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

У выпадку частковага вяртання па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі тавараў у падатковы орган прадстаўляецца ўдакладненая (замест раней прадстаўленай) заява без адлюстравання звестак аб часткова вернутых таварах. Указаная заява прадстаўляецца або на папяровым носьбіце (у чатырох экзэмплярах) і ў электронным выглядзе, або ў электронным выглядзе з электронным (электронна-лічбавым) подпісам падаткаплацельшчыка.

У выпадку поўнага вяртання па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі ўсіх тавараў, звесткі аб якіх былі адлюстравана ў раней прадстаўленай заяве, у падатковы орган удакладненая (замест раней прадстаўленай) заява не прадстаўляецца. Падаткаплацельшчык інфармуе падатковы орган аб рэквізітах раней прадстаўленай заявы, у якой былі адлюстравана звесткі аб поўнасцю вернутых таварах, па форме і ў парадку, якія вызначаны нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

Пры частковым або поўным вяртанні тавараў па прычыне неналежнай якасці і (або) камплектацыі аднаўленне сум ПДВ, раней

уплачаных пры імпарце гэтых тавараў і прынятых да выліку, праводзіцца ў падатковым перыядзе, у якім праведзена вяртанне тавараў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена.

24. Пры павелічэнні кошту імпартаваных тавараў у выпадку павелічэння іх кошту па сканчэнні месяца, у якім тавары былі прыняты падаткаплацельшчыкам да ўліку, падатковая база для мэтаў уплаты ПДВ павялічваецца на розніцу паміж зменены і папярэднім коштам імпартаваных тавараў. Уплата ПДВ і прадстаўленне падатковай дэкларацыі праводзяцца не пазней 20-го чысла месяца, які ідзе следам за месяцам, у якім удзельнікі дагавора (кантракта) змянілі кошт імпартаваных тавараў.

Розніца паміж зменены і папярэднім коштам набытых імпартаваных тавараў адлюстроўваецца ў падатковай дэкларацыі, адначасова з якой падаткаплацельшчык прадстаўляе ў падатковы орган:

заяву (з адлюстраваннем розніцы паміж зменены і папярэднім коштам) на папяровым носьбіце (у чатырох экзэмплярах) і ў электронным выглядзе, або ў электронным выглядзе з электронным (электронна-лічбавым) подпісам падаткаплацельшчыка;

дагавор (кантракт) або іншы дакумент, прадугледжаны ўдзельнікамі дагавора (кантракта), які пацвярджае павелічэнне кошту імпартаванага тавару, карэкціровачны рахунак-фактуру (у выпадку калі яго выстаўленне (выпіска) прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена). Указаныя дакументы могуць быць прадстаўлены ў копіях, завераных у парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, або ў электронным выглядзе ў парадку, устаноўленым нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў. Фармат

названых дакументаў вызначаецца нарматыўнымі прававымі актамі падатковых органаў дзяржаў-членаў або іншымі нарматыўнымі прававымі актамі дзяржаў-членаў.

забеспячэнне ўнутраных патрэб у электрычнай энергіі (магутнасці) дзяржавы-члена, праз электраэнергетычную сістэму якой плануецца ажыццяўленне міждзяржаўнай перадачы;

забеспячэнне міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) з адной часткі электраэнергетычнай сістэмы дзяржавы-члена ў іншую яе частку праз электраэнергетычную сістэму сумежнай дзяржавы-члена;

забеспячэнне міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычную сістэму дзяржавы-члена з электраэнергетычнай сістэмы адной дзяржавы-члена да электраэнергетычнай сістэмы іншай дзяржавы-члена;

забеспячэнне міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычную сістэму дзяржавы-члена ў

мэтах выканання абавязацельстваў у дачыненні да суб'ектаў электраэнергетыкі трэціх дзяржаў;

3) падчас міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) упаўнаважаныя арганізацыі дзяржаў-членаў кіруюцца прынцыпам аплочвання кошту міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) зыходзячы з заканадаўства дзяржавы-члена;

4) міждзяржаўная перадача электрычнай энергіі (магутнасці) у мэтах выканання абавязацельстваў у дачыненні да суб'ектаў электраэнергетыкі трэціх дзяржаў, рэгулюецца на двухбаковай аснове з улікам заканадаўства адпаведнай дзяржавы-члена.

8. У мэтах забеспячэння бесперашкоднай міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычныя сістэмы дзяржавамі-членамі ажыццяўляецца комплекс узгодненых падрыхтоўчых мерапрыемстваў, а менавіта:

да пачатку каляндарнага года пастаўкі электраэнергіі (магутнасці) упаўнаважаныя дзяржавамі-членамі арганізацыі заяўляюць аб планавых аб'ёмах электрычнай энергіі (магутнасці), якія мяркуюцца да міждзяржаўнай перадачы, для ўліку іх у нацыянальных прагнозных балансах вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці), у тым ліку з мэтай уліку такіх паставак падчас разліку тарыфаў паслуг суб'ектаў натуральных манаполій;

на падставе разлікаў планавага кошту міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) упаўнаважаныя дзяржавамі-членамі арганізацыі складаюць кантракты з мэтай выканання дасягнутых дамоўленасцей.

У мэтах забеспячэння бесперашкоднай міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычныя сістэмы дзяржаў-членаў, упаўнаважаныя органы дзяржаў-членаў

выкарыстоўваюць адзіную Метадалогію ажыццяўлення міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) паміж дзяржавамі-членамі, якая ўключае парадак вызначэння тэхнічных умоў і аб'ёмаў міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці), а таксама ўзгодненыя падыходы да цэнаўтварэння на паслугі, звязаныя з міждзяржаўнай перадачай электрычнай энергіі (магутнасці), пададзеную ў дадатку да гэтага Пратакола.

Вызначаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў арганізацыі забяспечваюць міждзяржаўную перадачу электрычнай энергіі (магутнасці) па тэрыторыі сваёй дзяржавы ў адпаведнасці з пададзенай вышэй Метадалогіяй.

9. Ажыццяўленне міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) і забеспячэнне эксплуатацыі аб'ектаў электрасеткавай гаспадаркі, неабходных для забеспячэння міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці), выконваюцца ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі і нарматыўна-тэхнічнымі дакументамі дзяржавы-члена, якая прадастаўляе паслугі, звязаныя з забеспячэннем міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці).

10. У выпадку адмовы ў міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) упаўнаважаныя дзяржавамі-членамі арганізацыі забяспечваюць прадастаўленне матэрыялаў, якія абгрунтоўваюць прычыны адмовы.

11. Цэнаўтварэнне (тарыфаўтварэнне) на паслугі суб'ектаў натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

Тарыфы на паслугі суб'ектаў натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі на агульным электраэнергетычным рынку дзяржаў-

членаў не павінны перавышаць аналагічныя ўнутраныя тарыфы для суб'ектаў унутранага рынку электрычнай энергіі.

12. Урэгуляванне адносін па міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) ажыццяўляецца з улікам іншых дзеючых міжнародных дагавораў.

Дадатак

да Пратакола аб забеспячэнні
доступу да паслуг суб'ектаў
натуральных манаполій у сферы
электраэнергетыкі, уключаючы
асновы цэнаўтварэння і
тарыфнай палітыкі

Метадалогія

ажыццяўлення міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) паміж дзяржавамі-членамі

1. Асноўныя палажэнні парадку падачы заявак і фарміравання гадавых прагнозных аб'ёмаў міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці), якія падлягаюць уключэнню ў прагнозныя балансы вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці), у тым ліку ўлічваемых пры разліку тарыфаў на паслугі суб'ектаў натуральных манаполій.

1.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.1.1. Гадавыя прагнозныя аб'ёмы міждзяржаўнай перадачы электрычнай энергіі (магутнасці) (далей – МДП) па нацыянальнай электрычнай сетцы Рэспублікі Беларусь вызначаюцца арганізацыяй, упаўнаважанай на яе ажыццяўленне, на падставе пададзенай заяўкі.

1.1.2. Заяўка на будучы каляндарны год падаецца не пазней за 1 красавіка папярэдняга года. У заяўцы падаецца гадавы аб'ём МДП і максімальнай магутнасці з разбіўкай па месяцах.

1.1.3. Падчас разгляду заяўкі ўпаўнаважаная арганізацыя Рэспублікі Беларусь кіруецца велічынёй наяўнай тэхнічнай магчымасці, вызначанай у адпаведнасці з гэтай Метадалогіяй.

У выпадку перавышэння пададзенай велічыні МДП велічыні наяўнай тэхнічнай магчымасці ў цэлым па годзе ці ў якім-небудзь месяцы года ўпаўнаважаная арганізацыя Рэспублікі Беларусь накіроўвае матываваную адмову арганізацыі, якая падала заяўку.

1.1.4. Заяўленыя аб'ёмы МДП, узгодненыя ўпаўнаважанай арганізацыяй Рэспублікі Беларусь, афармляюцца як дадатак да дагавора на перадачу электраэнергіі і ўлічваюцца пры разліку тарыфаў на паслугі па перадачы электраэнергіі.

1.1.5. Аб'ёмы электрычнай энергіі, якія мяркуюцца да МДП, могуць карэкціравацца па ўзгадненню ўпаўнаважаных арганізацый дзяржаў-членаў да 1 лістапада года, папярэдняга году планаванай МДП.

1.2. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

1.2.1. Гадавыя прагнозныя аб'ёмы МДП па нацыянальнай электрычнай сетцы Рэспублікі Казахстан вызначаюцца на падставе пададзенай упаўнаважанай на ажыццяўленне МДП арганізацыяй заяўкі сістэмнаму аператару Рэспублікі Казахстан на ажыццяўленне МДП.

1.2.2. Заяўка на будучы каляндарны год падаецца не пазней за 1 красавіка папярэдняга года. У заяўцы падаецца гадавы аб'ём МДП з разбіўкай па месяцах і ўказаннем пунктаў прыёму і пунктаў выдачы электраэнергіі на мяжы Рэспублікі Казахстан.

1.2.3. Падчас разгляду заяўкі сістэмны аператар Рэспублікі Казахстан кіруецца велічынёй наяўнай тэхнічнай магчымасці, вызначанай у адпаведнасці з гэтай Метадалогіяй. Пры перавышэнні пададзенай велічыні МДП велічыні наяўнай тэхнічнай магчымасці ў цэлым па годзе ці ў якім-небудзь месяцы года сістэмны аператар

Рэспублікі Казахстан накіроўвае матываваную адмову арганізацыі, якая падала заяўку.

1.2.4. Заяўленыя аб'ёмы МДП, узгодненыя сістэмным аператарам Рэспублікі Казахстан, афармляюцца як дадатак да дагавора на перадачу электраэнергіі і ўлічваюцца пры разліку тарыфаў на паслугі па перадачы электраэнергіі.

1.2.5. Пасля фарміравання прагнознага балансу электраэнергіі і магутнасці па Адзінай энергетычнай сістэме Рэспублікі Казахстан (далей – АЭС Казахстана) да 15 кастрычніка года, папярэдняга планаванаму, вызначаюцца і ўзгадняюцца з суб'ектамі аптовага рынку аб'ёмы пастаўкі электраэнергіі па двухбаковых міждзяржаўных дагаворах.

1.2.6. Аб'ёмы электрычнай энергіі, якія мяркуюцца да МДП, могуць карэкціравацца па прапанове суб'ектаў, упаўнаважаных на арганізацыю і ажыццяўленне МДП да 1 лістапада года, папярэдняга году планаванай пастаўкі.

1.3. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

1.3.1. У адпаведнасці з Парадкам фарміравання зборнага прагнознага балансу ў рамках АЭС Расіі па суб'ектах Расійскай Федэрацыі ўпаўнаважаная арганізацыя (арганізацыя па кіраванні адзінай нацыянальнай (агульнарасійскай) электрычнай сеткай (далей – АНЭС) Расійскай Федэрацыі) да 1 красавіка года, папярэдняга году планаванай пастаўкі, накіроўвае ўзгодненыя з упаўпаважанымі арганізацыямі дзяржаў-членаў, якія ажыццяўляюць кіраванне нацыянальнай электрычнай сеткай, прапановы ў Федэральную службу па тарыфах Расійскай Федэрацыі (ФСТ Расіі) і сістэмнаму аператару АЭС Расіі.

1.3.2. Узгодненыя прапановы разглядаюцца ФСТ Расіі і ўлічваюцца пры фарміраванні зборнага прагнознага балансу вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці) па суб'ектах Расійскай Федэрацыі на наступны каляндарны год у тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам Расійскай Федэрацыі.

1.3.3. Аб'ёмы электрычнай энергіі і магутнасці, якія мяркуюцца да МДП, зацверджаныя ў складзе паказчыкаў зборнага прагнознага балансу вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці) па суб'ектах Расійскай Федэрацыі на год пастаўкі, улічваюцца пры разліку цэн (тарыфаў) на паслугі натуральных манаполій у электраэнергетыцы.

1.3.4. Аб'ёмы электрычнай энергіі і магутнасці, якія мяркуюцца да МДП, могуць карэкціравацца па прапанове арганізацыі па кіраванні АНЭС пры ўмове наяўнасці ўзгаднення ўпаўнаважанымі органамі (арганізацыямі) дзяржаў-членаў да 1 лістапада года, папярэдняга году планаванай пастаўкі, з правядзеннем адпаведнай карэкціроўкі ўстаноўленых цэн (тарыфаў) на паслугі натуральных манаполій у электраэнергетыцы.

2. Парадак вызначэння тэхнічнай магчымасці і планаваных аб'ёмаў МДП на аснове планавання гадавых, месячных, сутачных і ўнутрысутачных рэжымаў працы электраэнергетычных сістэм, уключаючы палажэнні, якія вызначаюць функцыі і паўнамоцтвы каардынатара планавання

2.1. Тэрміналогія.

Для мэт раздзелу 2 гэтай Метадалогіі выкарыстоўваюцца наступныя паняцці:

Кантраляванае сячэнне – сукупнасць ліній электраперадачы (ЛЭП) і іншых элементаў электрычнай сеткі, вызначаных

дыспетчарскімі цэнтрамі сістэмных аператараў электраэнергетычных сістэм дзяржаў-членаў, пратокі магутнасці па якіх кантралююцца ў мэтах забеспячэння ўстойлівай працы, надзейнасці і жывучасці электраэнергетычных сістэм.

Максімальна дапушчальны пратак магутнасці – найбольшы пратак у сячэнні сеткі, які адказвае ўсім патрабаванням да звычайных рэжымаў.

Міждзяржаўнае сячэнне – вызначаная сістэмнымі аператарамі электраэнергетычных сістэм дзяржаў-членаў пункт ці група пунктаў пастаўкі, размешчаная на міждзяржаўнай(-ых) ЛЭП, якая(-ія) злучае(-юць) электраэнергетычныя сістэмы (асобныя энергараёны) суседніх дзяржаў, тэхналагічна абумоўленая задачамі планавання і кіравання электраэнергетычнымі рэжымамі паралельнай працы.

Іншыя выкарыстаныя паняцці маюць значэнне, вызначанае Пратаколам аб забеспячэнні доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі (дадатак № 21 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе).

2.2. Агульныя палажэнні.

2.2.1. Задачы, якія вырашаюцца на этапах планавання:

– гадавое планаванне: праверка тэхнічнай магчымасці рэалізацыі заяўленых аб'ёмаў паставак электраэнергіі (магутнасці) паміж дзяржавамі-члснамі і МДП паміж дзяржавамі-членамі, якія ўлічваюцца ў прагнозных балансах вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці) з улікам гадавых планавых графікаў рамонтаў электрасеткавага абсталявання, якія абмяжоўваюць сячэнні экспарту-імпарту, і іх карэкціроўка пры неабходнасці;

– месячнае планаванне: праверка тэхнічнай магчымасці рэалізацыі заяўленых аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі, улічаных у гадавых прагнозных балансах вытворчасці і спажывання электраэнергіі (магутнасці) з улікам месячных планавых графікаў рамонтаў электрасеткавага абсталявання, якія абмяжоўваюць яго сячэнні экспарту-імпарту, і іх карэкціроўка пры неабходнасці;

– сутачнае планаванне і ўнутрысутачная карэкціроўка рэжымаў: праверка тэхнічнай магчымасці рэалізацыі заяўленых на суткі наперад пагадзінных аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі з улікам рэальнай схемна-рэжымнай сітуацыі, планавага, нянланавага і аварыйнага адключэння электрасеткавага абсталявання, якое абмяжоўвае сячэнні экспарту-імпарту, аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі.

2.2.2. Планаванне (разлік рэалізоўнасці запланаваных аб'ёмаў МДП паміж дзяржавамі-членамі ажыццяўляецца паміж АЭС Расіі і АЭС Казахстана і паміж АЭС Расіі і Аб'яднанай энергетычнай сістэмай Беларусі (АЭС Беларусі) з выкарыстаннем разліковай мадэлі паралельна працуючых электраэнергетычных сістэм (далей – разліковая мадэль).

2.2.3. Разліковая мадэль уяўляе сабой матэматычную мадэль тэхналагічна ўзаемазлучаных частак АЭС Расіі, АЭС Казахстана і АЭС Беларусі ў аб'ёме, неабходным для планавання, і ўключае ў сябе апісанне:

– граф і параметраў схемы замяшчэння электрычнай сеткі;

– актыўных і рэактыўных вузлавых нагрузак;

– актыўнай і рэактыўнай генерацыі ў вузлах;

– мінімальнай і максімальнай актыўнай і рэактыўнай магутнасцей генерацыі;

– сеткавых абмежаванняў.

2.2.4. Разліковая мадэль фарміруецца на аснове ўзгодненай сістэмнымі аператарамі электраэнергетычных сістэм дзяржаў-членаў схемы замяшчэння, як правіла, для базавых рэжымаў, якія адпавядаюць узгодненым гадзінам зімовага максімуму і мінімуму нагрузак, і летняга максімуму і мінімуму нагрузак (базавыя разліковыя схемы). Для характэрных схемна-рэжымных сітуацый павінны падавацца максімальна дапушчальныя перагокі ў кантраляваных міждзяржаўных сячэннях, а таксама ва ўнутраных кантраляваных сячэннях, калі яны істотна ўплываюць на ажыццяўленне міждзяржаўных паставак (абменаў).

2.2.5. Каардынатарам планавання з'яўляецца сістэмны аператар АЭС Расіі.

2.2.6. Склад разліковых мадэляў і інфармацыі, якая падлягае актуалізацыі, для кожнай са стадый планавання, у тым ліку пералікі энергааб'ектаў і электраэнергетычных сістэм (эквівалентаў электраэнергетычных сістэм), якія ўключаюцца ў разліковую мадэль, парадак і часавы рэгламент іх фарміравання і актуалізацыі, фарматы і спосаб абмену дадзенымі для планавання гадавых, месячных, сутачных і ўнутрысутачных рэжымаў працы электраэнергетычных сістэм вызначаюцца дакументамі, якія зацвярджаюцца сістэмным аператарам АЭС Расіі і арганізацыяй па кіраванні АНЭС з арганізацыяй, якая выконвае функцыі сістэмнага аператара АЭС Беларусі, і сістэмным аператарам АЭС Казахстана.

2.3. Функцыі і паўнамоцтвы каардынатара планавання і астатніх сістэмных аператараў электраэнергетычных сістэм дзяржаў-членаў.

2.3.1. Каардынатар планавання ажыццяўляе:

– фарміраванне базавых разліковых мадэляў;

– арганізацыю інфармацыйнага абмену з арганізацыяй, якая выконвае функцыі сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана для мэт планавання;

– правядзенне разлікаў электраэнергетычных рэжымаў на аснове дадзеных, атрыманых ад арганізацыі, якая выконвае функцыі сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнага аператара АЭС Казахстана для мэт планавання;

– карэкціроўку міждзяржаўнага ператоку паміж электраэнергетычнымі сістэмамі (часткамі электраэнергетычных сістэм) дзяржаў-членаў у выпадку, калі падчас разліку выяўляюцца нерэалізоўнасць электрычных рэжымаў ці перавышэнне максімальна дапушчальных ператокаў у кантраляваных сячэннях разліковай мадэлі пры заяўленых аб'ёмах паставак і МДП, з улікам забеспячэння прынцыпаў прыярытэтнасці, вызначаных у падпункце 2 пункта 4 Пратакола аб забеспячэнні доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі (дадатак № 21 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе):

1) забеспячэнне ўнутраных патрэб дзяржавы-члена, праз электраэнергетычную сістэму якога плануецца ажыццяўленне МДП;

2) забеспячэнне МДП электрычнай энергіі (магутнасці) з адной часткі электраэнергетычнай сістэмы дзяржавы-члена ў іншую яе частку праз электраэнергетычную сістэму сумежнай дзяржавы-члена;

3) забеспячэнне МДП электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычную сістэму дзяржавы-члена з электраэнергетычнай

сістэмы адной дзяржавы-члена ў электраэнергетычную сістэму іншай дзяржавы-члена;

4) забеспячэнне МДП электрычнай энергіі (магутнасці) праз электраэнергетычную сістэму дзяржавы-члена ў мэтах выканання абавязацельстваў у дачыненні да суб'ектаў электраэнергетыкі трэціх дзяржаў, не ўваходзячых у Саюз;

5) давядзенне да арганізацыі, якая выконвае функцыі сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнага аператара АЭС Казахстана вынікаў пададзеных вышэй разлікаў.

2.3.2. У выпадку калі падчас разліку выяўляюцца нерэалізоўнасць электрычных рэжымаў ці перавышэнне максімальна дапушчальных ператокаў у кантраляваных сячэннях разліковай мадэлі, каардынатар планавання накіроўвае ў арганізацыю, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнаму аператару АЭС Казахстана і арганізацыю па кіраванні АНЭС велічыні неабходных карэкціровак велічынь сальда-ператокаў (балансаў) электраэнергетычных сістэм.

Арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана і арганізацыя па кіраванню АНЭС карэкціруюць аб'ёмы паставак электраэнергіі (магутнасці) па ўсіх дагаворах, у тым ліку МДП на аснове пададзенай вышэй прыярытэтнасці, або прымаюць іншыя меры па зняцці парушэнняў дапушчальных ператокаў у кантраляваных сячэннях, выяўленых па выніках разлікаў каардынатарам планавання.

Інфармацыя аб скарэкціраваных дагаворных аб'ёмах паставак электраэнергіі (магутнасці) па ўсіх дагаворах, у тым ліку МДП паміж дзяржавамі-членамі, даводзіцца арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам

АЭС Казахстана і арганізацыяй па кіраванні АНЭС да суб'ектаў унутраных рынкаў электрычнай энергіі дзяржаў-членаў па складзеных дагаворах.

2.3.3. Каардынатар планавання мае права ў выпадку неатрымання ад арганізацыі, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнага аператара АЭС Казахстана актуальных дадзеных для планавання або атрымання дадзеных, якія змяшчаюць тэхнічныя памылкі ці загадзя няпэўных дадзеных, выкарыстоўваць замяшчальную інфармацыю, змест і парадак ужывання якой вызначаюцца дакументамі, якія зацвярджаюцца арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі.

2.4. Гадавое планаванне.

2.4.1. Гадавое планаванне выконваецца ў тэрміны і ў парадку, якія вызначаюцца арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі.

2.4.2. Арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана і сістэмны аператар АЭС Расіі фарміруюць праекты графікаў рамонтаў электрасеткавага абсталявання на планаваны каляндарны год і прадстаўляюць іх каардынатару планавання. Каардынатар планавання ўзгадняе графік рамонтаў электрасеткавага абсталявання на планаваны каляндарны год і накіроўвае яго арганізацыі, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнаму аператару АЭС Казахстана і ў арганізацыю па кіраванні АНЭС. Пералік электрасеткавых аб'ектаў, рамонты якога падлягаюць

узгадненню ў рамках гадавога (а таксама месячнага) графіка рамонтаў, і часавы рэгламент яго фарміравання вызначаецца арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі.

2.4.3. Арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана перадаюць каардынатару планавання інфармацыю для гадавога планавання па адпаведнай нацыянальнай электраэнергетычнай сістэме (спажыванне, генерацыя, сальда ператокаў, рамонты сеткавага абсталявання), сфарміраваную імі зыходзячы з прагнозных балансаў электрычнай энергіі, магутнасці на гадзіну максімуму характэрнага працоўнага дня.

2.4.4. Вынікам планавання з'яўляецца ўдакладненае прагнознае значэнне сальда ператокаў АЭС Расіі – АЭС Казахстана і АЭС Расіі – АЭС Беларусі.

2.4.5. Каардынатар планавання выконвае разлік рэжымаў і дасылае арганізацыі, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнаму аператару АЭС Казахстана вынікі разлікаў.

2.5. Месячнае планаванне.

2.5.1. Месячнае планаванне выконваецца ў тэрміны і парадку, вызначаныя арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі, паводле той жа схемы, што і гадавое планаванне, з абменам дадзенымі і вынікамі ў месячным разрэзе.

2.6. Сутачнае і ўнутрысутачнае планаванне.

2.6.1. Сутачнае і ўнутрысутачнае планаванне выконваецца ў тэрміны і парадку, вызначаныя арганізацыяй, якая выконвае функцыю

сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі.

2.6.2. Штосутачна арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана падаюць каардынатару планавання дадзеныя для актуалізацыі разліковай мадэлі на планаваныя суткі (далей – суткі X) у выглядзе набораў 24 гадзінных актуалізаваных дадзеных (з 00:00 да 24:00 гадзін), якія ўключаць у сябе:

– планаваныя рамонты элементаў электрасеткавага абсталявання 220 кВ і вышэй электраэнергетычнай сістэмы;

– пагадзінныя графікі спажывання і генерацыі сумарна па электраэнергетычнай сістэме (у тым ліку па асобных энергараёнах, вызначаных арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі падчас фарміравання складу разліковай мадэлі);

– пагадзінныя графікі сальда ператокаў (за дадатнае сальда ператокаў электраэнергетычнай сістэмы прымаецца яе дэфіцыт).

– Арганізацыя па кіраванні АНЭС падае каардынатару планавання сумарныя значэнні ўзгодненых з арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам ЕЭС Казахстана пагадзінных графікаў аб'ёмаў паставак электраэнергіі паміж АЭС Расіі, АЭС Казахстана і АЭС Беларусі па ўсіх відах дагавораў, у тым ліку МДП паміж дзяржавамі-членамі.

2.6.3. У выпадку калі дадзеныя для актуалізацыі разліковай мадэлі не перададзены арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана каардынатару планавання, апошні выкарыстоўвае

замяшчальную інфармацыю, вызначаную арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана і сістэмным аператарам АЭС Расіі па ўзгадненні паміж імі падчас фарміравання складу разліковай мадэлі.

2.6.4. Каардынатар планавання ажыццяўляе актуалізацыю разліковай мадэлі і выкананне разлікаў электрычных рэжымаў.

2.6.5. Каардынатар планавання выконвае разлік рэжымаў і перадае арганізацыі, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмнаму аператару АЭС Казахстана вынікі разлікаў ва ўзгодненым фармаце.

2.6.6. У выпадку калі заяўленыя значэнні аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі не з'яўляюцца рэалізуемымі, арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана і арганізацыя па кіраванні АНЭС прымаюць меры па карэкціроўцы аб'ёмаў паставак і МДП з улікам прыярытэтнасці, вызначанай у пункце 2.3.1 гэтай Метадалогіі.

2.6.7. У выпадку калі ў выніку непрагназуемай змены электраспажывання і/ці схемна-рэжымных умоў і/ці пры змене ўмоў дагавораў пастаўкі патрабуецца карэкціроўка планавых аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі, на працягу аператыўных сутак, арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмны аператар АЭС Казахстана прадастаўляюць каардынатару планавання:

– дадзеныя для актуалізацыі разліковай мадэлі на бягучыя суткі ў выглядзе набораў гадзінных актуалізаваных дадзеных на пазасталыя гадзіны сутак X у аб'ёме, адпаведным інфармацыі, якая перадаецца для мэт планавання на суткі наперад;

– заяўку з прапанаваным аб'ёмам змены планавых аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі.

2.6.8. Для кожнага часавага этапу ўнутры сутак вызначаецца гранічны час падачы дадзеных ("час зачынення варот") і давядзення вынікаў разлікаў. Перадача дадзеных пасля "часу зачынення варот" не дапушчаецца. Каардынатар планавання ажыццяўляе актуалізацыю разліковай мадэлі і выкананне разлікаў электрычных рэжымаў на пазасталыя гадзіны сутак X.

2.6.9. Вынікам планавання з'яўляецца ўдакладнены планавы пагадзінны графік аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі на пазасталыя гадзіны сутак X. У выпадку немагчымасці выканання ўдакладненых планавых пагадзінных графікаў у выніку змены схемна-рэжымных умоў пасля часу ўнутрысутачнай карэкціроўкі рэжымаў, змена аб'ёмаў паставак і МДП паміж дзяржавамі-членамі дапушчаецца на ўмовах прадастаўлення аварыйнай дапамогі ці вымушаных паставак электраэнергіі паводле адпаведных спецыяльных дагавораў на пастаўку электраэнергіі паміж упаўнаважанымі гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў.

3. Пералік суб'ектаў дзяржаў-членаў, упаўнаважаных на арганізацыю і ажыццяўленне МДП з указаннем функцый, якія выконваюцца кожнай арганізацыяй у рамках забеспячэння МДП

3.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3.1.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь арганізацыя і ажыццяўленне МДП ускладаецца на арганізацыю, якая ажыццяўляе функцыю кіравання АЭС Беларусі і арганізацыю, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, з выкананнем пры гэтым наступных функцый:

– аказанне паслуг па перадачы электрычнай энергіі па перадавальнай электрычнай сетцы (арганізацыі, падпарадкаваныя арганізацыі, якая ажыццяўляе функцыю кіравання АЭС Беларусі, пры агульнай каардынацыі арганізацыі, якая ажыццяўляе функцыю кіравання АЭС Беларусі);

– аказанне паслуг па тэхнічнай дыспетчарызацыі МДП (арганізацыю, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі);

– узаемадзеянне з электраэнергетычнымі сістэмамі сумежных дзяржаў па кіраванні паралельнай працай і забеспячэнні ўстойлівасці (арганізацыя, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі).

3.2. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

3.2.1. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан арганізацыя і ажыццяўленне МДП ускладаецца на сістэмнага аператара з выкананнем наступных функцый:

– аказанне паслуг па перадачы электрычнай энергіі па Нацыянальнай электрычнай сетцы;

– аказанне паслуг па тэхнічнай дыспетчарызацыі водпуску ў сетку і спажывання электрычнай энергіі;

– аказанне паслуг па арганізацыі балансавання вытворчасці – спажывання электрычнай энергіі;

– узаемадзеянне з электраэнергетычнымі сістэмамі сумежных дзяржаў па кіраванні і забеспячэнні ўстойлівасці рэжымаў паралельнай працы.

3.3. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

3.3.1. Забеспячэнне МДП паміж дзяржавамі-членамі праз АЭС Расіі ў адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі падразумявае ажыццяўленне комплексу дзеянняў, звязаных з:

3.3.1.1. Аказаннем паслуг па аператыўна-дыспетчарскім кіраванні ў электраэнергетыцы, у тым ліку па кіраванні рэжымамі паралельнай працы АЭС Расіі і электраэнергетычных сістэм іншых дзяржаў-членаў, забеспячэнні замяшчэння электрычнай энергіі (магутнасці) і скаардынаванага планавання;

3.3.1.2. Аказаннем паслуг па перадачы (перамяшчэнні) электрычнай энергіі па адзінай нацыянальнай (агульнарасійскай) электрычнай сетцы, у тым ліку для забеспячэння МДП паміж дзяржавамі-членамі;

3.3.1.3. Асаблівасцямі абароту электрычнай энергіі і магутнасці на аптовым рынку электраэнергіі і магутнасці Расійскай Федэрацыі, у тым ліку ў выпадку неабходнасці забеспячэння ўзаемазлучанай і адначасовай пастаўкі роўных аб'ёмаў электрычнай энергіі (магутнасці) у АЭС Расіі і з яе праз розныя пункты пастаўкі, размешчаныя на мяжы (межах) Расійскай Федэрацыі з дзяржавамі-членамі.

3.3.2. МДП паміж дзяржавамі-членамі забяспечваецца наступнымі ўпаўнаважанымі арганізацыямі:

3.3.2.1. Сістэмным аператарам АЭС Расіі – у частцы арганізацыі і кіравання рэжымамі паралельнай працы АЭС Расіі з АЭС Казахстана і АЭС Беларусі;

3.3.2.2. Арганізацыяй па кіраванні АНЭС – у частцы аказання паслуг, звязаных з перамяшчэннем (з выкарыстаннем прынцыпу замяшчэння) электрычнай энергіі пры МДП паміж дзяржавамі-членамі праз АЭС Расіі і арганізацыі паралельнай працы

АЭС Расіі з АЭС Казахстана і АЭС Беларусі, у тым ліку ўзаемадзеяння з замежнымі ўпаўнаважанымі арганізацыямі па планаванні МДП (гадавое, месячнае, пагадзіннае), разнясення фактычных пагадзінных аб'ёмаў перамешчанай праз дзяржаўную мяжу Расійскай Федэрацыі і дзяржаў-членаў электраэнергіі з улікам скарэкціраваных планавых аб'ёмаў па камерцыйных кантрактах; вызначэння пагадзінных адхіленняў фактычных аб'ёмаў перамешчанай праз дзяржаўную мяжу паміж Расійскай Федэрацыяй і дзяржавамі-членамі ад планавых; ажыццяўлення камерцыйнага ўліку электраэнергіі ў пунктах пастаўкі, размешчаных на агульных межах дзяржаў-членаў;

3.3.2.3. Камерцыйным аператарам – арганізацыяй, якая ажыццяўляе функцыі па арганізацыі аптовага гандлю электрычнай энергіяй, магутнасцю і іншымі дапушчанымі да абароту на аптовым рынку таварамі і паслугамі;

3.3.2.4. Арганізацыяй, якая ажыццяўляе функцыі па аказанні паслугі па разліку патрабаванняў і абавязацельстваў удзельнікаў аптовага рынку;

3.3.2.5. Камерцыйным агентам – удзельнікам аптовага рынку электраэнергіі і магутнасці, якія ажыццяўляюць экспартна-імпартныя аперацыі, у частцы арганізацыі доступу да ўдзелу аб'ёмаў электрычнай энергіі (магутнасці), заяўленых для забеспячэння МДП паміж дзяржавамі-членамі, у адносінах на аптовым рынку электраэнергіі і магутнасці і ўрэгулявання адносін, звязаных з адхіленнямі фактычнага сальда ператоку ад планавага.

4. Пералік складнікаў, якія ўключаюцца ў тарыфы суб'ектаў натуральных манаполій пры ажыццяўленні МДП

4.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

4.1.1. Затраты $З_{сет}$ на паслугі па МДП па перадавальнай сетцы Рэспублікі Беларусь (далей – ПС), якія ўключаюцца ў тарыфы суб'ектаў натуральных манаполій падчас ажыццяўлення МДП паміж дзяржавамі-членамі, разлічваюцца паводле формулы:

$З_{сет} = З (1+ІФ) (1+ПР) (1+П)$, дзе:

З – агульныя затраты на ўтрыманне і эксплуатацыю ПС, якія адносяцца на МДП паміж дзяржавамі-членамі, вызначаныя ва ўстаноўленым упаўнаважаным дзяржаўным органам парадку;

ІФ – доля адлічэнняў у інавацыйны фонд;

ПР – доля адлічэнняў на прыбытак, вызначаная ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку;

П – доля адлічэнняў на падаткі;

Агульныя затраты З уключаюць: затраты на эксплуатацыйна-рамонтнае абслугоўванне; заработную плату; амартызацыю; іншыя грашовыя затраты (дапаможныя матэрыялы, энергія з боку, адлічэнні на сацыяльнае страхаванне і інш.); затраты на кампенсацыю страт электрычнай энергіі.

4.1.2. Тарыф на паслугі па МДП па сетках АЭС Беларусі разлічваецца паводле формулы:

$T = \frac{З_{сет}}{Э_т}$, дзе:

Т – тарыф на паслугі па МДП па сетках АЭС Беларусі;

$Э_т$ – сумарны аб'ём МДП паміж дзяржавамі-членамі па сетках АЭС Беларусі.

4.2. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

4.2.1. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан тарыф на паслугі па перадачы электрычнай энергіі, у тым ліку МДП паміж дзяржавамі-членамі, які прымяняецца для спажыўцоў, якія ажыццяўляюць перадачу электрычнай энергіі, у тым ліку МДП, па

сетках нацыянальнай электрычнай сеткі (далей – НЭС), разлічваецца паводле формулы:

$T = \frac{Z+P}{W_{сум}}$ (тэнгэ/кВт.гадз), дзе:

Т – тарыф на паслугі па перадачы электрычнай энергіі, у тым ліку МДП паміж дзяржавамі-членамі, які прымяняецца для спажыўцоў, якія ажыццяўляюць перадачу электрычнай энергіі, у тым ліку МДП, па сетках НЭС (тэнгэ/кВт.гадз);

Z – агульныя затраты НЭС Рэспублікі Казахстан на паслугі па перадачы электрычнай энергіі, у тым ліку МДП, вызначаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку (млн. тэнгэ);

Р – узровень прыбытку, неабходнага для эфектыўнага функцыянавання НЭС падчас аказання паслуг па перадачы электрычнай энергіі, у тым ліку МДП, вызначаны ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Казахстан парадку (млн. тэнгэ);

$W_{сум}$ – заяўлены па дагаворах і кантрактах сумарны аб'ём перадачы электрычнай энергіі НЭС (млн. квт.гадз).

4.2.2. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан пры разліку тарыфу на паслугі па перадачы электрычнай энергіі па НЭС у тарыфны прыбытак уключаюцца агульныя затраты на паслугі па перадачы электрычнай энергіі па НЭС і ўзровень прыбытку, неабходнага для эфектыўнага функцыянавання падчас аказання паслуг па перадачы электрычнай энергіі (вызначаецца зыходзячы з задзейнічанасці актываў).

Затраты, якія ўключаюцца ў тарыф на паслугі па перадачы электрычнай энергіі, вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан.

4.3. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

4.3.1. Агульныя палажэнні.

У адпаведнасці з заканадаўствам Расійскай Федэрацыі тарыф на аказанне паслуг па перадачы электрычнай энергіі па АНЭС устанаўліваюцца ў выглядзе 2 ставак: стаўкі на ўтрыманне электрычных сетак і стаўкі на кампенсацыю страт электрычнай энергіі ў АНЭС.

Аналагічна складнікі расходаў, якія ўключаюцца ў тарыф на аказанне паслуг па МДП паміж дзяржавамі-членамі праз АЭС Расіі, падраздзяляюцца на складнік расходаў тарыфу на паслугі па МДП паміж дзяржавамі-членамі на ўтрыманне аб'ектаў АНЭС і складнік расходаў тарыфу на паслугі па МДП паміж дзяржавамі-членамі на кампенсацыю страт электрычнай энергіі і магутнасці ў АНЭС.

4.3.2. Вызначэнне расходаў, якія ўключаюцца ў тарыфы суб'ектаў натуральных манаполій падчас ажыццяўлення МДП паміж дзяржавамі-членамі.

4.3.2.1. Пералік складнікаў расходаў тарыфу на паслугі па МДП паміж дзяржавамі-членамі на ўтрыманне аб'ектаў АНЭС.

Па стаўцы на ўтрыманне аб'ектаў АНЭС аплачваецца магутнасць, заяўленая да МДП паміж дзяржавамі-членамі, вызначаная ў "пункце выхаду" ператоку электраэнергіі з электраэнергетычнай сістэмы дзяржавы, па электрычных сетках якой ажыццяўляецца МДП паміж дзяржавамі-членамі.

Падчас разліку стаўкі на ўтрыманне аб'ектаў АНЭС улічваюцца наступныя ўстаноўленыя нацыянальным рэгулюючым органам на адпаведны разліковы перыяд эканамічна абгрунтаваныя расходы:

– аперацыйныя расходы;

– непадкантрольныя расходы;

– зварот інвеставанага капіталу (амартызацыйныя адлічэнні) на інвестыцыі;

– даход на інвеставаны капітал.

4.3.2.2. Пералік складальнікаў расходаў тарыфу на паслугі па МДП паміж дзяржавамі-членамі на кампенсацыю страт электрычнай энергіі і магутнасці ў АНЭС.

Расходы на кампенсацыю страт электрычнай энергіі і магутнасці ў АНЭС вызначаюцца зыходзячы з нарматыўных страт электрычнай энергіі ў АНЭС, паменшаных на аб'ём страт электрычнай энергіі, улічаных у раўнаважных цэнах на электрычную энергію, і цэн куплі электрычнай энергіі і магутнасці, якія склаліся на аптовым рынку па выніках кожнага разліковага перыяду па ГКП, якая адпавядае "пункту выхаду" пратоку электраэнергіі з электраэнергетычнай сістэмы дзяржавы, па электрычных сетках якой ажыццяўляецца МДП паміж дзяржавамі-членамі з улікам кошту паслуг інфраструктурных арганізацый адпаведнага нацыянальнага рынку.

5. Пералік складнікаў, звязанных з ажыццяўленнем МДП, якія не ўключаюцца у тарыфы суб'ектаў натуральных манаполій

5.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У Рэспубліцы Беларусь сістэмныя затраты $З_{сіст}$ уключаюць зацверджаныя ўпаўнаважаным дзяржаўным органам затраты на падтрыманне рэзерву генерыруючых магутнасцей для забеспячэння МДП паміж дзяржавамі-членамі, вызначаныя з улікам долі магутнасці МДП у агульнай велічыні магутнасці, якая перадаецца па сетках АЭС Беларусі, а таксама на паслугі па тэхнічнай дыспетчарызацыі МДП паміж дзяржавамі-членамі.

5.2. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

Падчас фарміравання тарыфу на паслугі па МДП паміж дзяржавамі-членамі не ўлічваюцца расходы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Казахстан.

5.3. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

У мэтах забеспячэння замяшчэння электрычнай энергіі (магутнасці) аб'ёмы электраэнергіі, якія падлягаюць МДП паміж дзяржавамі-членамі, павінны ўлічвацца на аптовым рынку падчас падачы цанавых заявак, правядзення канкурэнтнага адбору цанавых заявак на суткі наперад, вызначэння рыначных цэн і долі сістэмных расходаў, звязаных з узаемазлучанай і адначасовай пастаўкай роўных аб'ёмаў электрычнай энергіі (магутнасці) у розных пунктах пастаўкі на мяжы (межах) АЭС Расіі. Сістэмныя расходы складаюцца з наступных складнікаў:

5.3.1. Складнік, звязаны з кампенсацыяй кошту нагрузачных страт электрычнай энергіі і сістэмных абмежаванняў падчас ажыццяўлення МДП паміж дзяржавамі-членамі праз АЭС Расіі (розніца вузлавых цэн):

$S_m^1 = \sum_{h \in m}(\max[(\lambda_h^{вых} - \lambda_h^{увах}); 0] \times V_h^{МДП})$, дзе:

$\lambda_h^{вых}$ – цана, якая склалася ў выніку канкурэнтнага адбору цанавых заявак на суткі наперад у гадзіну h месяца m на сячэнні экспарту-імпарту, якое адпавядае "пункту выхаду" ператоку электраэнергіі з АЭС Расіі ў рамках МДП;

$\lambda_h^{увах}$ – цана, якая склалася ў выніку канкурэнтнага адбору цанавых заявак на суткі наперад у гадзіну h месяца m на сячэнні экспарту-імпарту, якое адпавядае "пункту уваходу" ператоку электраэнергіі ў АЭС Расіі ў рамках МДП;

$V_h^{МДП}$ – аб'ём МДП праз АЭС Расіі ў гадзіну h месяца т.

5.3.2. Складнік, звязаны з неабходнасцю наяўнасці рэзерву генерыруючых магутнасцей для рэалізацыі рэжымаў працы АЭС Расіі, якія забяспечваюць МДП:

$S_m^2 = \text{Пік}_m \times (К^{рэз}_{план.ЗСП_i} - 1) \times Ц^{ЗСП_i}_{КАМ_папяр.}$, дзе:

Пік_m – пікавая магутнасць, якая адпавядае максімальнаму заяўленаму гадзіннаму аб'ёму МДП у месяцы m;

$К^{рэз}_{план.ЗСП_i}$ – планавы каэфіцыент рэзервіравання ў ЗСПі, які улічваецца сістэмным аператарам падчас правядзення канкурэнтнага адбору магутнасці на адпаведны год;

$Ц^{ЗСП_i}_{КАМ_папяр.}$ – папярэдняя цана канкурэнтнага адбору для спажыўцоў у ЗСПі на адпаведны год (вызначаецца сістэмным аператарам у адпаведнасці з правіламі аптовага рынку электрычнай энергіі і магутнасці);

ЗСПі – зона свабоднага ператоку, да якой аднесены пункты пастаўкі, якія адпавядаюць "пункту выхаду" электрычнай энергіі з АЭС Расіі падчас ажыццяўлення МДП.

Пры вызначэнні кошту МДП таксама ўлічваецца розніца паміж планавымі цэнамі для пакупнікоў, вызначаных па выніках канкурэнтнага адбору магутнасці, у зонах свабоднага ператоку (групах зон свабоднага ператоку), адпаведных пунктам "уваходу" і "выхаду" МДП.

6. Патрабаванні да дагаворнага афармлення МДП у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў

6.1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

МДП паміж дзяржавамі-членамі праз электраэнергетычную сістэму Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца пры ўмове ўзгаднення аб'ёмаў электрычнай энергіі і магутнасці, якія мяркуюцца да МДП у адпаведнасці з раздзелам 1 і пунктамі 2.4, 2.5 і 2.6 раздзелу 2 гэтай Метадалогіі і дагаворамі на МДП з упаўнаважанай арганізацыяй Рэспублікі Беларусь.

Кошт паслуг па МДП па кожным дагаворы вызначаецца паводле наступнай формулы:

$С_{МП} = З_{свт} + З_{сіст.}$.

6.2. На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

На тэрыторыі Рэспублікі Казахстан МДП паміж дзяржавамі-членамі ажыццяўляецца на падставе дагавораў на аказанне паслуг па перадачы электрычнай энергіі, якія складаюцца па тыпавой форме, якая зацвярджаецца Ўрадам Рэспублікі Казахстан.

Пры гэтым у дагаворах на ажыццяўленне МДП могуць улічвацца асаблівасці такой перадачы.

6.3. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

МДП паміж дзяржавамі-членамі праз ЕЭС Расіі ажыццяўляецца пры наяўнасці наступных дагавораў:

6.3.1. Дагавораў камерцыйнага агента з упаўнаважанай арганізацыяй ад Рэспублікі Беларусь ці Рэспублікі Казахстан у мэтах забеспячэння доступу да паслуг натуральных манаполій і ўзаемазлучанай і адначасовай пастаўкі роўных аб'ёмаў электрычнай энергіі (магутнасці), заяўленых для ажыццяўлення МДП, у розных пунктах пастаўкі на мяжы (межах) АЭС Расіі.

Кошт МДП паміж дзяржавамі-членамі праз АЭС Расіі ў месяцы m вызначаецца ў такіх дагаворах паводле наступнай формулы:

$Q_m^{МДП} = Q_m^{ФСК_МДП} + Q_m^{СА_МДП} + Q_m^{КО_МДП}$, дзе:

$Q_m^{ФСК_МДП}$ – кошт паслуг арганізацыі па кіраванні АНЭС, які аплачваецца ў адпаведнасці з расійскім заканадаўствам;

$Q_m^{СА_МДП}$ – кошт паслуг сістэмнага аператара, які аплачваецца ў адпаведнасці з расійскім заканадаўствам;

$Q_m^{\text{КО_МДП}}$ – кошт паслуг, звязаных з дзеяннямі на аптовым рынку электрычнай энергіі (магутнасці), якія суправаджаюць МДП праз АЭС Расіі, у месяцы m.

$Q_m^{\text{КО_МДП}} = S_m^1 + S_m^2 + Q_m^{\text{АТС_МДП}} + Q_m^{\text{ЦФР_МДП}} + Q_m^{\text{АГЕНТ_МДП}}$, дзе:

$Q_m^{\text{АТС_МДП}}$ – кошт паслугі камерцыйнага аператара па арганізацыі аптовага гандлю электрычнай энергіяй, магутнасцю і іншымі дапушчанымі да абароту на аптовым рынку таварамі і паслугамі ў месяцы m;

$Q_m^{\text{ЦФР_МДП}}$ – кошт комплекснай паслугі па разліку патрабаванняў і абавязацельстваў, якая вызначаецца Дагаворам аб далучэнні да гандлёвай сістэмы аптовага рынку ў месяцы m;

$Q_m^{\text{АГЕНТ_МДП}}$ – затраты камерцыйнага агента, якія вызначаюцца ў двухбаковым парадку ў дагаворах, якія заключаюцца камерцыйным агентам.

6.3.2. Дагавораў (тэхнічных пагадненняў) аб паралельнай працы электраэнергетычных сістэм паміж арганізацыямі дзяржаў-членаў, якія ажыццяўляюць функцыі па аператыўна-дыспетчарскім кіраванні ў электраэнергетыцы і па перадачы (перамяшчэнні) электрычнай энергіі па нацыянальнай электрычнай сетцы;

6.3.3. Дагавораў куплі-продажу электраэнергіі ў мэтах кампенсацыі велічынь адхіленняў фактычных ператокаў па сячэннях МДП ад планавых, якія ўзнікаюць пры перамяшчэнні электрычнай энергіі праз межы дзяржаў-членаў, паміж упаўнаважанымі гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў.

7. Парадак арганізацыі абмену дадзенымі камерцыйнага ўліку аб пагадзінных фактычных аб'ёмах міждзяржаўных ператокаў электрычнай энергіі паміж гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў.

7.1. Гэты Парадак вызначае асноўныя кірункі двухбаковага ўзаемадзеяння ў частцы атрымання пагадзінных дадзеных камерцыйнага ўліку; парадак вызначэння аператыўнага[1] пагадзіннага ператоку электрычнай энергіі па міждзяржаўных лініях электраперадачы (далей – МДЛЭП) паміж Рэспублікай Казахстан і Расійскай Федэрацыяй з улікам выкарыстання пагадзінных дадзеных камерцыйнага ўліку і ўзгодненых методык даразліку пададзеных дадзеных камерцыйнага ўліку да значэнняў у пунктах пастаўкі; парадак, які вызначае працэдуры абмену дадзенымі камерцыйнага ўліку і ўзгадненні дадзеных камерцыйнага ўліку, прыведзеных да значэнняў у пунктах пастаўкі.

Умовы і парадак фарміравання і абмену пагадзіннымі дадзенымі камерцыйнага ўліку электраэнергіі па МДЛЭП вызначаюцца ў адпаведнасці з двухбаковымі Пагадненнямі аб абмене дадзенымі пагадзінных велічынь ператокаў электраэнергіі па пунктах уліку на МДЛЭП.

7.2. Аператыўны абмен інфармацыяй.

Штосутачна (ці па ўзгадненні дзяржаў-членаў у іншы прамежак часу) адпаведныя гаспадарчыя суб'екты дзяржаў-членаў фарміруюць велічыні пагадзінных ператокаў электраэнергіі па МДЛЭП, абменьваюцца атрыманымі дадзенымі, выконваюць адпаведныя разлікі, праводзяць ацэнку адпаведнасці дадзеных.

[1] Пад аператыўным пагадзінным ператокам разумеюцца пагадзінныя дадзеныя камерцыйнага ўліку (паўгадзінныя ці пагадзінныя), атрыманыя ў дачыненні да ўсіх пунктаў уліку, уключаных у ператок з аўтаматызаваных сістэм камерцыйнага ўліку электраэнергіі (далей – АСКУЭ) з выкарыстаннем тэхнічных магчымасцей комплексаў камерцыйнага ўліку.

Для аператыўнага абмену інфармацыяй, якая змяшчае значэнні пагадзінных ператокаў электраэнергіі, якая перадаецца па МДЛЭП, выкарыстоўваюцца ўзгодненыя фарматы перадачы дадзеных.

7.3. Разлік пагадзінных значэнняў на пункт пастаўкі.

Разлік пагадзінных значэнняў на пункт пастаўкі выконваецца ў адпаведнасці з узгодненымі ў двухбаковых Пагадненнях методыкамі разліку фактычных аб'ёмаў перададзенай і атрыманай электрычнай энергіі.

8. Парадак вызначэння фактычнага сальда ператоку электраэнергіі па міждзяржаўных лініях электраперадачы дзяржаў-членаў

Гэты парадак, які вызначае фактычныя аб'ёмы электрычнай энергіі, якая перамяшчаецца праз міждзяржаўныя сячэнні, за каляндарны месяц, прызначаны для выкарыстання ўпаўнаважанымі арганізацыямі дзяржаў-членаў.

Фактычнае сальда ператокаў электрычнай энергіі, перамешчанай праз міждзяржаўныя сячэнні дзяржаў членаў, вызначаецца як алгебраічная сума прынятай (WП1_гран) і/ці аддадзенай (WA1_гран) колькасці электрычнай энергіі за кожны каляндарны месяц у кожным пункце пастаўкі (WСальда_гран).

Значэнні электрычнай энергіі, прыведзеныя да мытнай мяжы (да пункту пастаўкі) за каляндарны месяц па ўсіх уключаных у працу МДЛЭП у рэжымах "Прыём", "Аддача" і сальда разлічваюцца паводле формул:

$$WП1_гран = \sum W(фактП1)i,$$

$$WA2_гран = \sum W(фактA1)i,$$

$$WСальда_гран, = WП1_гран + WA1_гран,$$ дзе:

W(фактП1)i – фактычная колькасць прынятай электрычнай энергіі ў кожным пункце пастаўкі па і-ай МДЛЭП за каляндарны месяц. Для падстаноўкі ў формулу разліку сальда-ператоку значэнне бярэцца з улікам знака (кірунку ператоку);

W(фактА1)i– фактычная колькасць аддадзенай электрычнай энергіі ў кожным пункце пастаўкі па і-ай МДЛЭП за каляндарны месяц.

Для падстаноўкі ў формулу разліку сальда-ператоку значэнне бярэцца з улікам знака (кірунку ператоку);

R – колькасць МЛЭП на міждзяржаўным перасеку, уключаных у працу на працягу каляндарнага месяца.

9. Парадак разліку абъёмаў і коште адхіленняў фактычных ператокаў па міждзяржаўных перасеках ад планавых пры ажыццяўленні МДП у рамках Саюза

Фактычныя пастаўкі па міждзяржаўных перасеках уключаюць у сябе наступныя складнікі: аб'ёмы МДП, аб'ёмы камерцыйных дагавораў, якія заключаюцца гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў, аб'ёмы аварыйнай дапамогі і аб'ёмы, абумоўленыя адхіленнем фактычных значэнняў сальда-ператокаў ад планавых.

Разлік велічынь пагадзінных адхіленняў фактычнага сальда-ператоку ад запланаванага і вызначэнне аб'ёмаў адхіленняў у залежнасці ад іх ініцыятывы ажыццяўляецца арганізацыяй па кіраванні АНЭС, сістэмным аператарам АЭС Расіі, арганізацыяй, якая выконвае функцыю сістэмнага аператара АЭС Беларусі, сістэмным аператарам АЭС Казахстана на аснове наступных прынцыпаў:

– падчас ажыццяўлення МДП праз АЭС Расіі пагадзінныя велічыні аб'ёмаў МДП прымаюцца за роўныя адпаведным планавым значэнням, улічаным у сутачным дыспетчарскім графіку;

– фактычныя пагадзінныя аб'ёмы пастаўкі электраэнергіі па камерцыйных дагаворах у кожнай гадзіне разліковага перыяду прымаюцца за роўныя адпаведным планавым значэнням, улічаным у сутачным дыспетчарскім графіку з улікам узгодненых ва ўстаноўленым парадку карэкціровак;

– аб'ёмы пагадзінных адхіленняў, якія ўрэгулююцца ў рамках адносін з электраэнергетычнымі сістэмамі трэціх дзяржаў, (знешнее балансаванне), улічваюцца ў аб'ёмах адхіленняў у рамках Саюза. Парадак вызначэння аб'ёмаў знешняга балансавання ўзгадняецца сістэмнымі аператарамі (з удзелам арганізацыі па кіраванні АНЭС) сумежных электраэнергетычных сістэм дзяржаў-членаў;

– аб'ёмы аказання аварыйнай дапамогі вызначаюцца ўмовамі дагавораў куплі/продажу электраэнергіі падчас аказання аварыйнай дапамогі, якія заключаюцца паміж суб'ектамі ўнутраных нацыянальных рынкаў.

Аб'ёмы пагадзінных адхіленняў падлягаюць фінансаваму ўрэгуляванню паміж упаўнаважанымі гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў у адпаведнасці з дагаворамі, заключэнне якіх у забеспячэнне МДП для кожнай з дзяржаў-членаў прадугледжана часткай 6 гэтай Метадалогіі.

Зыходзячы з неабходнасці выканання ўмоў дагавораў (тэхнічных пагадненняў) аб паралельнай працы электраэнергетычных сістэм, у тым ліку ў частцы рэгулявання частаты ў электраэнергетычных сістэмах дзяржаў-членаў і падтрымання ўзгодненых сальда-ператокаў па міждзяржаўных сячэннях, кошт адхіленняў павінен кампенсаваць суб'ектам унутраных нацыянальных рынкаў электрычнай энергіі (магутнасці) абгрунтаваныя затраты, якія

яны нясуць у выніку ўдзелу ў адносінах па балансаванні сістэмы на нацыянальным рынку электрычнай энергіі (магутнасці).

Разлік кошту адхіленняў павінен праводзіцца з улікам адмысловага парадку ўліку аб'ёмаў куплі/продажу электраэнергіі (магутнасці) у мэтах тэхналагічнага забеспячэння паралельнай працы электраэнергетычных сістэм у аб'ёмах, якія не перавышаюць значэнняў, устаноўленых у дагаворах (тэхнічных пагадненнях) аб паралельнай працы электраэнергетычных сістэм ці іншых дагаворах, якія рэгулююць узаемаадносіны ў сферы электраэнергетыкі паміж дзяржавамі-членамі.

Выкарыстаныя ў разліку колькасныя і цанавыя параметры электраэнергіі і магутнасці, набытай і прададзенай у мэтах кампенсацыі адхіленняў, пацвярджаюцца справаздачнымі дакументамі арганізацый камерцыйнай інфраструктуры Расійскай Федэрацыі.

Падчас разліку кошту паставак па дагаворах паўторны ўлік аб'ёмаў электраэнергіі (магутнасці) не дапушчаецца.

ДАДАТАК № 22

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб правілах доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі

1. Гэты Пратакол у адпаведнасці з артыкуламі 79, 80 і 83 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) вызначае асновы супрацоўніцтва ў газавай сферы, прынцыпы і ўмовы забеспячэння доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі, для задавальнення патрэб дзяржаў-членаў.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

"унутраныя патрэбы ў газе" – аб'ёмы газу, неабходныя для спажывання на тэрыторыі кожнай з дзяржаў-членаў;

"газ" – гаручая сумесь газападобных вуглевадародаў і іншых газаў, здабытых і (ці) выпрацаваных на тэрыторыі дзяржаў-членаў, якая складаецца галоўным чынам з метану, транспартуецца ў сціснутым газападобным стане па газатранспартных сістэмах;

"газаздабыўныя дзяржавы-члены" – дзяржавы-члены, на тэрыторыі якіх спажываецца газу менш, чым здабываецца і вырабляецца;

“газаспажывальныя дзяржавы-члены” – дзяржавы-члены, на тэрыторыі якіх спажываецца газу больш, чым здабываецца і вырабляецца;

“газатранспартныя сістэмы” – збудаванні для транспартавання газу, якія ўключаюць магістральныя газаправоды і злучаныя з імі адзіным тэхналагічным працэсам аб’екты, акрамя газаразмеркавальных сетак;

“доступ да паслуг суб’ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу” – прадастаўленне права выкарыстання газатранспартных сістэм, якія кіруюцца суб’ектамі натуральных манаполій дзяржаў-членаў, для транспартавання газу;

“роўнадаходныя цэны на газ” – аптовыя цэны на газ, сфарміраваныя для задавальнення ўнутраных патрэб зыходзячы, у тым ліку, з наступных прынцыпаў:

для газаздабыўных дзяржаў-членаў фарміраванне рыначнай аптовай цаны ажыццяўляецца шляхам выліку з цаны продажу газу на знешнім рынку велічыні пошлін, збораў, падаткаў, іншых плацяжоў, якія спаганяюцца ў гэтых дзяржавах, і цаны транспартавання газу за межамі газаздабыўных дзяржаў-членаў з улікам розніцы ў кошце транспартавання газу на знешнім і ўнутраным рынках пастаўшчыка газу;

для газаспажывальных дзяржаў-членаў – рыначная аптовая цана, фарміраванне якой ажыццяўляецца вытворцам газаздабыўнай дзяржавы шляхам выліку з цаны продажу газу на знешнім рынку пошлін, збораў, падаткаў, іншых плацяжоў, а таксама кошту транспартавання газу за межамі газаздабыўнай дзяржавы-члена;

“паслугі па транспартаванню газу” – паслугі па перамяшчэнню газу па газатранспартных сістэмах;

"упаўнаважаныя органы" – дзяржаўныя органы, упаўнаважаныя дзяржавамі-членамі для кантролю рэалізацыі гэтага Пратакола.

3. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць паэтапнае фарміраванне агульнага рынку газу Саюза, а таксама забяспечваюць доступ да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах дзяржаў-членаў, зыходзячы з наступных асноўных прынцыпаў:

1) непрымяненне ва ўзаемным гандлі ўвазных і вывазных мытных збораў (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае значэнне);

2) першачарговае забеспячэнне ўнутраных патрэб у газе дзяржаў-членаў;

3) цэны і тарыфы на паслугі па транспартаванні газу для задавальнення ўнутраных патрэб дзяржаў-членаў вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў;

4) уніфікацыя норм і стандартаў на газ дзяржаў-членаў;

5) забеспячэнне экалагічнай бяспекі;

6) інфармацыйны абмен на аснове інфармацыі, якая ўключае ў сябе звесткі пра ўнутранае спажыванне газу.

4. Доступ да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу прадастаўляецца ў адпаведнасці з умовамі гэтага Пратакола толькі ў дачыненні да газу, які паходзіць з тэрыторыі дзяржаў-членаў. Палажэнні гэтага Пратакола не распаўсюджваюцца на адносіны доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу ў дачыненні да газу, які паходзіць з тэрыторый трэціх дзяржаў, і на адносіны ў сферы транспартавання газу з тэрыторыі і на тэрыторыю Саюза.

5. Умовай забеспячэння прадугледжанага гэтым Пратаколам доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах дзяржаў-членаў з'яўляецца рэалізацыя дзяржавамі-членамі комплексу мер, які ўключае ў сябе наступныя мерапрыемствы:

стварэнне сістэмы інфармацыйнага абмену на аснове інфармацыі, якая ўключае ў сябе звесткі пра ўнутранае спажыванне газу;

стварэнне механізмаў для падрыхтоўкі індыкатыўных (прагнозных) балансаў у адпаведнасці з гэтым Пратаколам;

уніфікацыя норм і стандартаў на газ дзяржаў-членаў;

падтрыманне рыначных цэн, якія забяспечваюць камерцыйную рэнтабельнасць продажу газу на тэрыторыях дзяржаў-членаў.

Завяршэнне выканання дзяржавамі-членамі пададзенага ў гэтым пункце комплексу мер афармляецца адпаведным пратаколам.

6. Дзяржавы-члены імкнуцца да дасягнення роўнадаходных цэн на газ на тэрыторыях усіх дзяржаў-членаў.

7. Пасля выканання ўсімі дзяржавамі-членамі комплексу мерапрыемстваў, пададзенага ў пункце 5 гэтага Пратакола, дзяржавы-члены ў межах наяўных тэхнічных магчымасцей, свабодных магутнасцей газатранспартных сістэм, з улікам узгодненага індыкатыўнага (прагнознага) балансу газу Саюза і на падставе грамадзянска-прававых дагавораў гаспадарчых суб'ектаў забяспечваюць доступ гаспадарчых суб'ектаў іншых дзяржаў-членаў да газатранспартных сістэм, размешчаных на тэрыторыях дзяржаў-членаў, для транспартавання газу, прызначанага для задавальнення ўнутраных патрэб дзяржаў-членаў, па наступных правілах:

гаспадарчым суб'ектам дзяржаў-членаў прадастаўляецца доступ да газатранспартнай сістэмы іншай дзяржавы-члена на роўных умовах, уключаючы тарыфы, з вытворцамі газу, якія не з'яўляюцца ўласнікамі газатранспартнай сістэмы дзяржавы-члена, па тэрыторыі якой ажыццяўляецца транспартаванне;

аб'ёмы, цэны і тарыфы на транспартаванне газу, а таксама камерцыйныя і іншыя ўмовы транспартавання газу па газатранспартных сістэмах вызначаюцца грамадзянска-прававымі дагаворамі паміж гаспадарчымі суб'ектамі дзяржаў-членаў у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

Дзяржавы-члены садзейнічаюць належнаму выкананню дзеючых дагавораў на транспартаванне газу па магістральных газаправодах паміж гаспадарчымі суб'ектамі, якія ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі іх дзяржаў.

8. У адпаведнасці з Метадалогіяй фарміравання індыкатыўных (прагнозных) балансаў газу, нафты і нафтапрадуктаў упаўнаважаныя органы дзяржаў-членаў распрацоўваюць з удзелам Камісіі і ўзгадняюць індыкатыўны (прагнозны) баланс газу Саюза (вытворчасць, спажыванне і пастаўкі для задавальнення ўнутраных патрэб, у тым ліку ўзаемныя), які складаецца на 5 гадоў і ўдакладняецца штогод да 1 кастрычніка.

З улікам узгодненага балансу газу дзяржавамі-членамі прадастаўляецца доступ да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання газу на ўнутраныя рынкі дзяржаў-членаў.

9. Дзяржавы-члены імкнуцца развіваць доўгатэрміновае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва ў наступных абласцях:

1) транспартаванне газу па тэрыторыях дзяржаў-членаў;

2) будаўніцтва, рэканструкцыя і эксплуатацыя газаправодаў, падземных сховішчаў газу і іншых аб'ектаў інфраструктуры газавага комплексу;

3) прадастаўленне сэрвісных паслуг, неабходных для задавальнення ўнутраных патрэб у газе дзяржаў-членаў.

10. Дзяржавы-члены забяспечваюць уніфікацыю нарматыўна-тэхнічных дакументаў, рэгламентуючых функцыянаванне газатранспартных сістэм, размешчаных на тэрыторыях дзяржаў-членаў.

11. Гэты Пратакол не закранае правоў і абавязацельстваў дзяржаў-членаў, якія вынікаюць з іншых міжнародных дагавораў, удзельнікамі якіх яны з'яўляюцца.

Да адносін дзяржаў-членаў у сферы транспартавання газу, не ўрэгуляваных Дагаворам, прымяняецца заканадаўства дзяржаў-членаў.

12. Палажэнні раздзелу XVIII Дагавора прымяняюцца да суб'ектаў натуральных манаполій, якія ажыццяўляюць транспартаванне газу, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым Пратаколам.

13. На перыяд да ўступлення ў сілу міжнароднага дагавора аб фарміраванні агульнага рынку газу Саюза, прадугледжанага пунктам 3 артыкула 83 Дагавора, дзейнічаюць двухбаковыя пагадненні, заключаныя паміж дзяржавамі-членамі ў галіне паставак газу, калі адпаведныя дзяржавы-члены не дамовяцца аб іншым.

ДАДАТАК № 23

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб парадку арганізацыі, кіравання, функцыянавання і развіцця агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў

1. Гэты Пратакол у адпаведнасці з артыкуламі 79, 80 і 84 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) вызначае асновы супрацоўніцтва ў нафтавай сферы, прынцыпы фарміравання агульнага рынку нафты і нафтапрадуктаў Саюза, а таксама прынцыпы забеспячэння доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання нафты і нафтапрадуктаў.

Пратакол распрацаваны з улікам палажэнняў Канцэпцыі фарміравання агульнага энергетычнага рынку дзяржаў-членаў Еўразійскай эканамічнай супольнасці ад 12 снежня 2008 года і ў мэтах эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу паліўна-энергетычных комплексаў дзяржаў-членаў, а таксама забеспячэння нацыянальных эканомік нафтай і нафтапрадуктамі.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

"доступ да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспартавання нафты і нафтапрадуктаў" – прадастаўленне права выкарыстання сістэм транспартавання нафты і нафтапрадуктаў, якія кіруюцца суб'ектамі натуральных манаполій дзяржаў-членаў, для транспартавання нафты і нафтапрадуктаў;

"нафта і нафтапрадукты" – тавары, вызначаныя ў адпаведнасці з адзінай Таварнай наменклатурай знешнеэканамічнай дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза і Адзіным мытным тарыфам Еўразійскага эканамічнага саюза;

"агульны рынак нафты і нафтапрадуктаў дзяржаў-членаў" – сукупнасць гандлёва-эканамічных адносін гаспадарчых суб'ектаў дзяржаў-членаў у сферы здабычы, транспартавання, пастаўкі, перапрацоўкі і збыту нафты і нафтапрадуктаў на тэрыторыях дзяржаў-членаў, неабходных для задавальнення патрэбнасцей у іх дзяржаў-членаў;

"індыкатыўныя (прагнозныя) балансы нафты і нафтапрадуктаў Саюза" – сістэма прагнозных паказчыкаў, вызначаных у метадалогіі фарміравання індыкатыўных (прагнозных) балансаў газу, нафты і нафтапрадуктаў;

"транспартаванне нафты і нафтапрадуктаў" – ажыццяўленне дзеянняў, накіраваных на перамяшчэнне нафты і нафтапрадуктаў любым спосабам, у тым ліку з выкарыстаннем трубаправоднага транспарту ад пункта яе прыёму ад адпраўшчыка да пункта здачы атрымальніку, уключаючы зліў, наліў, перавалку на іншы тып транспарту, захоўванне, змешванне.

3. Пры фарміраванні агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Саюза дзяржавы-члены зыходзяць з наступных асноўных прынцыпаў:

1) непрымяненне ва ўзаемным гандлі колькасных абмежаванняў і вывазных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае значэнне). Парадак аплаты вывазных мытных пошлін на нафту і нафтапрадукты пры вывазе іх за межы мытнай тэрыторыі Саюза вызначаецца асобнымі, у тым ліку двухбаковымі пагадненнямі дзяржаў-членаў;

2) прыярытэтнае забеспячэнне патрэбнасцей дзяржаў-членаў у нафце і нафтапрадуктах;

3) уніфікацыя норм і стандартаў на нафту і нафтапрадукты дзяржаў-членаў;

4) забеспячэнне экалагічнай бяспекі;

5) інфармацыйнае забеспячэнне агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Саюза.

4. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць комплекс наступных мер па фарміраванні агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Саюза, у тым ліку:

1) стварэнне сістэмы інфармацыйнага абмену на аснове мытнай інфармацыі, якая ўключае звесткі аб пастаўках, экспарце і імпарце нафты і нафтапрадуктаў усімі тыпамі транспарту;

2) стварэнне механізмаў кантролю, якія прадухіляюць парушэнне ўмоў гэтага Пратакола;

3) уніфікацыя норм або стандартаў на нафту і нафтапрадукты дзяржаў-членаў.

5. Названыя ў пункце 4 гэтага Пратакола меры рэалізуюцца шляхам падпісання дзяржавамі-членамі або ўпаўнаважанымі імі органамі методык або правіл у рамках адпаведных міжнародных дагавораў.

6. Дзяржавы-члены ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі паміж дзяржавамі-членамі ў межах наяўных тэхнічных магчымасцей забяспечваюць умовы:

1) гарантаванай магчымасці ажыццяўлення доўгатэрміновага транспартавання здабытай нафты і выпрабленых з яе нафтапрадуктаў па сістэме транспарту, якая дзейнічае на тэрыторыях дзяржаў-членаў, у тым ліку па сістэмах магістральных нафтаправодаў і нафтапрадуктаправодаў;

2) доступу да сістэм транспартавання нафты і нафтапрадуктаў, размешчаных на тэрыторыі кожнай з дзяржаў-членаў, для гаспадарчых суб'ектаў, зарэгістраваных на тэрыторыях дзяржаў-членаў, на тых жа ўмовах, што і для гаспадарчых суб'ектаў дзяржаў-членаў, па тэрыторыях якіх ажыццяўляецца транспартаванне нафты і нафтапрадуктаў.

7. Тарыфы на паслугі па транспартаванню нафты і нафтапрадуктаў па сістэмах транспартавання нафты і нафтапрадуктаў устанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам кожнай дзяржавы-члена.

Тарыфы на паслугі па транспартаванню нафты і нафтапрадуктаў устанаўліваюцца для гаспадарчых суб'ектаў дзяржаў-членаў на ўзроўні, які не перавышае тарыфы, устаноўленыя для гаспадарчых суб'ектаў дзяржавы-члена, па тэрыторыі якой ажыццяўляецца транспартаванне нафты і нафтапрадуктаў.

Устанаўленне тарыфаў на паслугі па транспартаванню нафты і нафтапрадуктаў для гаспадарчых суб'ектаў дзяржаў-членаў ніжэй за тарыфы, устаноўленыя для гаспадарчых суб'ектаў дзяржавы-члена, па тэрыторыі якой ажыццяўляецца транспартаванне нафты і нафтапрадуктаў, не з'яўляецца абавязацельствам для дзяржаў-членаў.

8. Упаўнаважаныя органы дзяржаў-членаў у адпаведнасці з метадалогіяй фарміравання індыкатыўных (прагнозных) балансаў газу, нафты і нафтапрадуктаў распрацоўваюць з удзелам Камісіі і ўзгадняюць:

штогод да 1 кастрычніка на наступны каляндарны год індыкатыўныя (прагнозныя) балансы нафты і нафтапрадуктаў Саюза;

доўгатэрміновыя індыкатыўныя (прагнозныя) балансы нафты і нафтапрадуктаў Саюза, якія пры неабходнасці могуць карэктавацца з

улікам фактычнай змены здабычы нафты, вытворчасці і спажывання нафтапрадуктаў дзяржаў-членаў.

Аб'ёмы і накірункі транспартавання нафты, здабытай на тэрыторыі адной з дзяржаў-членаў, па тэрыторыі іншай дзяржавы-члена штогод вызначаюцца пратаколамі паміж упаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў.

9. Рэгуляванне ўнутраных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў дзяржаў-членаў ажыццяўляецца нацыянальнымі органамі дзяржаў-членаў. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць мерапрыемствы па лібералізацыі рынкаў нафты і нафтапрадуктаў у адпаведнасці з заканадаўствам кожнай з дзяржаў-членаў.

10. Гэты Пратакол не закранае правоў і абавязацельстваў дзяржаў-членаў па іншых міжнародных дагаворах, удзельнікамі якіх яны з'яўляюцца.

11. Палажэнні раздзела XVIII Дагавора прымяняюцца да суб'ектаў натуральных манаполій, якія ажыццяўляюць транспартаванне нафты і нафтапрадуктаў, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым Пратаколам.

12. На перыяд да ўступлення ў сілу міжнароднага дагавора аб фарміраванні агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Саюза, прадугледжанага пунктам 3 артыкула 84 Дагавора, дзейнічаюць двухбаковыя пагадненні, заключаныя паміж дзяржавамі-членамі ў галіне паставак нафты і нафтапрадуктаў, вызначэння і парадку аплаты вывазных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае дзеянне), калі адпаведныя дзяржавы-члены не дамовяцца аб іншым.

ДАДАТАК № 24

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ
аб скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыцы

I. Агульныя палажэнні

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з артыкуламі 86 і 87 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе ў мэтах ажыццяўлення скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыкі.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«грамадзянская авіяцыя» – авіяцыя, якая выкарыстоўваецца ў мэтах забеспячэння патрэбаў насельніцтва і эканомікі;

«адзіная транспартная прастора» – сукупнасць транспартных сістэм дзяржаў-членаў, у рамках якой забяспечваюцца бесперашкодны рух пасажыраў, перамяшчэнне грузаў і транспартных сродкаў, іх тэхнічная і тэхналагічная сумяшчальнасць, якія заснаваны на гарманізаваным заканадаўстве дзяржаў-членаў у сферы транспарту;

«заканадаўства дзяржаў-членаў» – нацыянальнае заканадаўства кожнай з дзяржаў-членаў;

«агульны рынак транспартных паслуг» – форма эканамічных адносін, пры якіх ствараюцца роўныя і парытэтныя ўмовы аказання транспартных паслуг, асаблівасці функцыянавання рынку якіх па відах транспарту вызначаюцца гэтым Пратаколам, а таксама міжнароднымі дагаворамі ў рамках Саюза.

3. Рэалізацыя гэтага Пратакола ажыццяўляецца з улікам абавязацельстваў дзяржаў-членаў, якія былі прыняты кожнай з іх пры ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, а таксама ў рамках іншых міжнародных дагавораў.

II. Аўтамабільны транспарт

4. Міжнародныя аўтамабільныя перавозкі грузаў, якія выконваюцца перавозчыкамі, зарэгістраванымі на тэрыторыі адной з дзяржаў-членаў, ажыццяўляюцца на бездазвольнай аснове:

1) паміж дзяржавай-членам, на тэрыторыі якой перавозчыкі зарэгістраваныя, і іншай дзяржавай-членам;

2) транзітам праз тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў;

3) паміж іншымі дзяржавамі-членамі.

5. Дзяржавы-члены да 1 ліпеня 2015 г. прымаюць праграму паэтапнай лібералізацыі выканання перавозчыкамі, зарэгістраванымі на тэрыторыі адной з дзяржаў-членаў, аўтамабільных перавозак грузаў паміж пунктамі, якія размешчаны на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена, на перыяд з 2016 па 2025 гады з вызначэннем ступені і ўмоў гэтай лібералізацыі.

У дзяржавах-членах дапускаюцца розныя ўзроўні і хуткасці правядзення лібералізацыі аўтамабільных перавозак грузаў, якія ўказаны ў абзацы першым гэтага пункта.

6. Праграма паэтапнай лібералізацыі, якая змешчана ў пункце 5 гэтага Пратакола, зацвярджаецца Вышэйшым саветам.

7. Асаблівасці правядзення скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыкі па пытаннях рэгулявання паслуг грузавога аўтамабільнага транспарту ў рамках Саюза вызначаюцца міжнароднымі дагаворамі.

8. Дзяржавы-члены прымаюць узгодненыя меры па ліквідацыі перашкод (бар'ераў), якія ўплываюць на развіццё міжнародных аўтамабільных зносін і фарміраванне паслуг аўтамабільнага транспарту ў рамках Саюза.

9. Транспартны (аўтамабільны) кантроль ажыццяўляецца ў парадку згодна з дадаткам № 1 да гэтага Пратакола.

III. Паветраны транспарт

10. Развіццё паветранага транспарту ў Саюзе ажыццяўляецца ў рамках скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыкі, якая праводзіцца, шляхам паэтапнага фарміравання агульнага рынка паслуг паветранага транспарту.

Дзяржавы-члены каардынуюць намаганні на адзіным падыходзе да ўжывання стандартаў і рэкамендуемай практыцы Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (*ІКАО*).

11. Фарміраванне агульнага рынка паслуг паветранага транспарту засноўваецца на прынцыпах:

1) забеспячэння адпаведнасці міжнародных дагавораў і актаў, якія складаюць права Саюза, нормам і прынцыпам міжнароднага права ў галіне грамадзянскай авіяцыі;

2) гарманізацыі заканадаўства дзяржаў-членаў у адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі міжнароднага права ў галіне грамадзянскай авіяцыі;

3) справядлівай і добрасумленнай канкурэнцыі;

4) стварэння ўмоў для абнаўлення парка паветраных судоў, мадэрнізацыі і развіцця аб'ектаў наземнай інфраструктуры аэрапортаў

у адпаведнасці з патрабаваннямі і рэкамендуемай практыкай Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (*ICAO*);

5) забеспячэння бяспекі палётаў і авіяцыйнай бяспекі;

6) забеспячэння недыскрымінацыйнага доступу авіяцыйных кампаній дзяржаў-членаў да авіяцыйнай інфраструктуры;

7) расшырэння паветраных зносін паміж дзяржавамі-членамі.

12. Дзяржавы-члены прызнаюць, што кожная дзяржава-член валодае поўным і выключным суверэнітэтам на паветраную прастору над сваёй тэрыторыяй.

13. Палёты паветраных суднаў дзяржаў-членаў у рамках Саюза выконваюцца на аснове міжнародных дагавораў дзяржаў-членаў і (ці) дазволаў, якія выдаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржаў-членаў.

14. Палажэнні гэтай часткі прымяняюцца толькі ў адносінах да грамадзянскай авіяцыі.

IV. Водны транспарт

15. Развіццё воднага транспарту ў Саюзе ажыццяўляецца ў рамках скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыкі, якая праводзіцца.

16. Судны пад сцягам дзяржавы-члена маюць права ажыццяўляць перавозку грузаў, пасажыраў і іх багажу, буксіроўку паміж дзяржавай сцяга судна і іншай дзяржавай-членам на сумежных унутраных водных шляхах, транзітны праход па ўнутраных водных шляхах іншай дзяржавы-члена, за выключэннем перавозкі і буксіроўкі паміж партамі і перавозак у (з) партоў іншай дзяржавы-члены і трэцімі краінамі, у адпаведнасці з міжнародным дагаворам дзяржаў-членаў аб суднаходстве, які заключаны дзяржавамі-членамі для выканання гэтага Пратакола.

17. Судны, якія ажыццяўляюць плаванне па ўнутраных водных шляхах дзяржавы-члена, павінны быць зарэгістраваны ў рэестры суднаў дзяржавы-члена і знаходзіцца ў валоданні рэзідэнта дзяржавы-члена, які зарэгістраваў судна ў сваім рэестры суднаў.

V. Чыгуначны транспарт

18. Дзяржавы-члены, садзейнічаючы дальнейшаму развіццю ўзаемавыгадных эканамічных адносін, улічваючы неабходнасць забеспячэння доступу да паслуг чыгуначнага транспарту дзяржаў-членаў і ўзгодненых падыходаў да дзяржаўнага рэгулявання тарыфаў

на гэтыя паслугі, у выпадку калі такое рэгуляванне прадугледжана заканадаўствам дзяржаў-членаў, вызначаюць наступныя мэты:

1) паэтапнае фарміраванне агульнага рынку транспартных паслуг у сферы чыгуначнага транспарту;

2) забеспячэнне доступу спажыўцоў дзяржаў-членаў да паслуг чыгуначнага транспарту падчас ажыццяўлення перавозак па тэрыторыі кожнай дзяржавы-члена на ўмовах не менш спрыяльных, чым умовы, створаныя для спажыўцоў гэтай кожнай дзяржавы-члена;

3) захаванне балансу эканамічных інтарэсаў паміж спажыўцамі паслуг чыгуначнага транспарту і арганізацыямі чыгуначнага транспарту дзяржаў-членаў;

4) забеспяэнне ўмоў доступу арганізацый чыгуначнага транспарту адной дзяржавы-члена на ўнутраны рынак паслуг чыгуначнага транспарту іншай дзяржавы-члена;

5) забеспячэнне ўмоў доступу перавозчыкаў да паслуг інфраструктуры дзяржаў-членаў згодна з дадаткамі № 1 і 2 да Парадку рэгулявання доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі (дадатак № 2 да гэтага Пратакола).

19. Рэгуляванне доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі, ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным дадаткам № 2 да гэтага Пратакола, а таксама міжнароднымі дагаворамі.

Дадатак № 1

да Пратакола аб
скаардынаванай
(узгодненай) транспартнай
палітыцы

Парадак
ажыццяўлення транспартнага
(аўтамабільнага) кантролю
на знешняй мяжы Еўразійскага эканамічнага саюза

1. Гэты Парадак распрацаваны ў адпаведнасці з пунктам 9 Пратакола аб скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыцы (дадатак № 24 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе) і вызначае парадак ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы Саюза.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Парадку, азначаюць наступнае:

«вагавыя і габарытныя параметры транспартнага сродку» – значэнні масы, нагрузак на восі і габарытаў (па шырыні, вышыні і даўжыні) транспартнага сродку з грузам або без грузу;

«знешняя мяжа Саюза» – межы мытнай тэрыторыі Саюза, якія падзяляюць тэрыторыі дзяржаў-членаў і тэрыторыі дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Саюза;

«кантрольны пункт» – абсталяваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства дзяржавы-члена стацыянарны або перасовачны пункт (пост), а таксама пункт пропуску праз дзяржаўную мяжу, у якіх ажыццяўляецца транспартны (аўтамабільны) кантроль;

«органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю» – кампетэнтныя органы, упаўнаважаныя дзяржавай-членам на ажыццяўленне транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на тэрыторыі дзяржавы-члена;

«перавозчык» – юрыдычная або фізічная асоба, якая выкарыстоўвае на праве ўласнасці або на іншай законнай падставе транспартны сродак;

«транспартны сродак»:

пры перавозцы грузаў – грузавы аўтамабіль, грузавы аўтамабіль з прычэпам, аўтамабільны (седлавы) цягач або аўтамабільны (седлавы) цягач з паўпрычэпам, шасі;

пры перавозцы пасажыраў – аўтамабільны транспартны сродак, які прызначаны для перавозкі пасажыраў і багажу, які мае больш за 9 месцаў для сядзення, уключаючы месца вадзіцеля, у тым ліку з прычэпам для перавозкі багажу;

«транспартны (аўтамабільны) кантроль» – кантроль за ажыццяўленнем міжнародных аўтамабільных перавозак.

Іншыя паняцці, якія спецыяльна не вызначаны ў гэтым Парадку, выкарыстоўваюцца ў значэннях, якія ўстаноўлены міжнароднымі дагаворамі, у тым ліку міжнароднымі дагаворамі ў рамках Саюза.

3. Гэты Парадак вызначае адзіныя падыходы да ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю органамі транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы Саюза транспартных сродкаў, якія ўязджаюць (выязджаюць, рухаюцца транзітам) па тэрыторыі дзяржаў-членаў.

4. Транспартныя сродкі, якія рухаюцца да тэрыторыі адной дзяржавы-члена праз тэрыторыю іншай дзяржавы-члена, падлягаюць транспартнаму (аўтамабільнаму) кантролю ў кантрольных пунктах, размешчаных на знешняй мяжы Саюза, у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, праз тэрыторыю якой рухаюцца названыя транспартныя сродкі , і пунктамі 7 і 8 гэтага Парадку.

5. Праверка транспартных сродкаў, дакументаў, неабходных у мэтах транспартнага (аўтамабільнага) кантролю, і афармленне яго вынікаў выконваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, тэрыторыю якой яны перасякаюць на знешняй мяжы Саюза, і гэтым Парадкам.

6. Органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю ўзаемна прызнаюць дакументы, афармленыя імі па выніках транспартнага (аўтамабільнага) кантролю.

7. Орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю дзяржавы-члена, праз дзяржаўную мяжу якой ажыццяўляецца ўезд на мытную тэрыторыю Саюза, у кантрольных пунктах акрамя дзеянняў па транспартным (аўтамабільным) кантролю, якія прадугледжаны заканадаўствам названай дзяржавы-члена, ажыццяўляе:

1) праверку адпаведнасці вагавых і габарытных параметраў транспартнага сродку нормам, аналагічным тым, якія ўстаноўлены заканадаўствам іншых дзяржаў-членаў, па тэрыторыях якіх ажыццяўляецца праезд, а таксама дадзеных, названых у спецыяльных дазволах на перавозку буйнагабарытнага і (або) цяжкавагавага транспартнага сродку па тэрыторыях іншых дзяржаў-членаў;

2) праверку наяўнасці ў перавозчыка дазволаў на праезд па тэрыторыях іншых дзяржаў-членаў, па якіх ажыццяўляецца праезд, іх адпаведнасці тыпу перавозкі, якая выконваецца, і адпаведнасці характарыстык транспартнага сродку патрабаванням, якія прадугледжаны такімі дазволамі;

3) праверку наяўнасці ў перавозчыка спецыяльных дазволаў на перавозку буйнагабарытных і (або) цяжкавагавых грузаў, на праезд буйнагабарытнага і (або) цяжкавагавага транспартнага сродку, а таксама спецыяльных дазволаў на перавозку небяспечных грузаў па тэрыторыях іншых дзяржаў-членаў, па якіх ажыццяўляецца перавозка або праезд ;

4) праверку наяўнасці ў перавозчыка дазволаў (спецыяльных дазволаў) на перавозку ў трэція краіны (з трэціх краін) на тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў, па якіх ажыццяўляецца перавозка;

5) выдачу перавозчыку ўліковага талона па форме, кая ўзгоднена органамі транспартнага (аўтамабільнага) кантролю, у выпадку , калі ў адпаведнасці з заканадаўствам іншых дзяржаў-членаў ажыццяўленне перавозкі дапускаецца без дазволу на праезд па тэрыторыях іншых дзяржаў-членаў, а таксама ў выпадку, калі перавозка ажыццяўляецца ў адпаведнасці з шматбаковым дазволам.

8. Органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю пры выездзе транспартнага сродку праз знешнюю мяжу Саюза акрамя дзеянняў, названых у пункце 7 гэтага Парадку, у кантрольных пунктах ажыццяўляюць праверку:

1) наяўнасці ў перавозчыка квітанцыі аб выплаце збораў за праезд транспартнага сродку па аўтамабільных дарогах дзяржаў-членаў, па тэрыторыях якіх ажыццяўляўся праезд, калі выплата такога збору з'яўляецца абавязковай у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў;

2) наяўнасці ў перавозчыка (вадзіцеля) квітанцыі, якая пацвярджае аплату штрафу за парушэнне парадку выканання

міжнародных аўтамабільных перавозак па тэрыторыі дзяржавы-члена або рашэння судовых органаў аб задавальненні скаргі на пастанову аб накладанні на перавозчыка (вадзіцеля) адпаведнага адміністрацыйнага спагнання ў выпадку, калі ў дазволе на праезд па тэрыторыі адной з дзяржаў-членаў або, калі ўліковы талон мае адзнаку органа транспартнага (аўтамабільнага) кантролю аб накладанні на перавозчыка (вадзіцеля) такога штрафу;

3) наяўнасці допуску транспартных сродкаў перавозчыкаў дзяржаў-членаў да міжнародных аўтамабільных перавозак;

4) наяўнасці ў перавозчыка неабходных дакументаў у выпадку, калі атрымана паведамленне, названае ў пункце 9 гэтага Парадку, ад органа транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена.

9. Пры ўстанаўленні ў ходзе кантрольных дзеянняў, якія прадугледжаны пунктам 7 гэтага Парадку, неадпаведнасці кантраляваных параметраў транспартнага сродку, адсутнасці або неадпаведнасці дакументаў, прадугледжаных заканадаўствам дзяржаў-членаў, орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю адной дзяржавы-члена выдае вадзіцелю апавяшчэнне па форме, якая ўзгоднена органамі транспартнага (аўтамабільнага) кантролю дзяржаў-членаў, і якое змяшчае інфармацыю:

аб выяўленых неадпаведнасцях;

аб неабходнасці атрымання дакументаў, якія адсутнічаюць, да прыбыцця на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена;

аб бліжэйшым з улікам маршруту руху транспартнага сродку кантрольным пункце органа транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена, у якім перавозчык павінен прад'явіць доказы ліквідацыі неадпаведнасці кантраляваных параметраў транспартнага сродку і (або) дакументы, названыя ў паведамленні.

10. Інфармацыя аб выдачы апавяшчэння накіроўваецца органу транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена і ўносіцца ў інфармацыйную базу органа транспартнага (аўтамабільнага) кантролю, які выявіў неадпаведнасць.

11. У выпадку, калі органам транспартнага (аўтамабільнага) кантролю адной дзяржавы-члена перавозчыку выдадзена апавяшчэнне ў адпаведнасці з пунктам 9 гэтага Парадку, орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена ў кантрольным пункце мае права ажыццявіць праверку

выканання гэтага паведамлення і, пры наяўнасці падстаў, прымяніць да перавозчыка (вадзіцеля) меры ў адпаведнасці з заканадаўствам гэтай іншай дзяржавы-члена.

12. Выпуск транспартнага сродку з тэрыторыі Саюза не ажыццяўляецца да прад'яўлення перавозчыкам дакументаў, наяўнасць якіх прадугледжана пунктамі 7 і 8 гэтага Парадку.

13. Аб устанаўленні неадпаведнасці кантраляваных параметраў транспартнага сродку, адсутнасці або неадпаведнасці дакументаў, якія прадугледжаны заканадаўствам дзяржаў-членаў, орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю адной дзяржавы-члена пры выездзе праз знешнюю мяжу Саюза транспартнага сродку, які рухаецца з тэрыторыі гэтай дзяржавы на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена, інфармуе орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю гэтай іншай дзяржавы-члена.

14. Дзяржавы-члены на аснове ўзаемнасці прымаюць меры па гарманізацыі свайго заканадаўства, метадаў і тэхналогій ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы Саюза ў частцы:

1) патрабаванняў да вагавых параметраў транспартных сродкаў пры руху па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання, якія ўваходзяць у склад міжнародных транспартных калідораў;

2) стварэння сістэмы кантролю за паўнатой выплаты збораў за праезд транспартных сродкаў па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання іншай дзяржавы-члена;

3) выпрацоўкі механізму па ўрэгуляванню спрэчных сітуацый у выпадку іх узнікнення з перавозчыкамі трэціх краін;

4) выпрацоўкі механізму вяртання (затрымання) транспартных сродкаў у выпадку парушэння ўстаноўленых патрабаванняў аб выкананні ўмоў міжнароднай аўтамабільнай перавозкі па тэрыторыі Саюза.

15. Дазволы (спецыяльныя дазволы) з'яўляюцца несапраўднымі ў наступных выпадках:

1) такія дазволы былі аформлены або выкарыстоўваюцца з парушэннем заканадаўства дзяржавы-члена, кампетэнтныя органы якой іх выдалі;

2) вагавыя і (або) габарытныя параметры транспартнага сродку, названыя ў спецыяльным дазволе, не адпавядаюць вынікам узважвання і вымярэння габарытаў транспартнага сродку;

3) характарыстыкі транспартнага сродку не адпавядаюць характарыстыкам транспартнага сродку, якія прадугледжаны дазволам на праезд па тэрыторыях дзяржаў-членаў.

16. У выпадку ўстанаўлення ў ходзе кантрольных дзеянняў неадпаведнасці параметраў (характарыстык) транспартнага сродку параметрам (характарыстыкам), названым у дазволе, орган транспартнага (аўтамабільнага) кантролю адной дзяржавы-члена мае права запытваць у аператыўным парадку ў органа транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена пацверджанне сапраўднасці дазволу.

17. У мэтах рэалізацыі гэтага Парадку органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю:

1) заключаюць асобныя пратаколы, даводзяць да органаў транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншай дзяржавы-члена палажэнні нарматыўных прававых актаў сваіх дзяржаў, якія рэгламентуюць патрабаванні да ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю, інфармуюць адзін аднаго аб змяненнях, якія ўносяцца ў названыя акты, а таксама абменьваюцца ўзорамі дакументаў, якія неабходны для ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю ў адпаведнасці з гэтым Парадкам;

2) ўзаемна і рэгулярна абменьваюцца інфармацыяй, атрыманай у выніку транспартнага (аўтамабільнага) кантролю. Форма і парадак абмену названай інфармацыяй, а таксама яе склад, вызначаюцца органамі транспартнага (аўтамабільнага) кантролю;

3) арганізуюць вядзенне базы дадзеных аб транспартных сродках, якія рухаюцца транзітам праз тэрыторыю адной дзяржавы-члена да тэрыторыі іншай дзяржавы-члена, і ўзаемна абменьваюцца інфармацыяй, якая змяшчаецца ў гэтай базе.

18. Абмен інфармацыяй, атрыманай у выніку транспартнага (аўтамабільнага) кантролю, ажыццяўляецца ў электронным выглядзе.

19. Органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю могуць прадастаўляць атрыманую ў выніку транспартнага (аўтамабільнага) кантролю іншую інфармацыю аб транспартных сродках міжнароднай перавозкі, якія перамяшчаюць тавары.

20. У мэтах афармлення і ўліку вынікаў транспартнага (аўтамабільнага) кантролю і транспартных сродкаў органы транспартнага (аўтамабільнага) кантролю ўжываюць

інфармацыйныя рэсурсы, якія змяшчаюць звесткі аб выніках дадатковых дзеянняў па транспартным (аўтамабільным) кантролю, якія ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з пунктамі 7 - 9 гэтага Парадку, а таксама забяспечваюць узаемнае выкарыстанне гэтых інфармацыйных рэсурсаў.

21. Дзяржавы-члены ва ўстаноўленым парадку інфармуюць кампетэнтныя органы дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Саюза, аб змяненні парадку ажыццяўлення транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы Саюза.

Дадатак № 2

да Пратакола аб
скаардынаванай (узгодненай)
транспартнай палітыцы

Парадак
рэгулявання доступу да паслуг чыгуначнага
транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі

1. Гэты Парадак распрацаваны ў адпаведнасці з Пратаколам аб скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыцы (дадатак № 24 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор)), вызначае парадак рэгулявання доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі, і распаўсюджваецца на адносіны паміж арганізацыямі чыгуначнага транспарту, спажыўцамі, упаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў у сферы паслуг чыгуначнага транспарту.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Парадку, абазначаюць наступнае:

«доступ да паслуг чыгуначнага транспарту» – аказанне арганізацыямі чыгуначнага транспарту адной дзяржавы-члена паслуг спажыўцам другой дзяржавы-члена на ўмовах не менш спрыяльных, чым тыя, на якіх аказваюцца аналагічныя паслугі спажыўцам першай дзяржавы-члена;

«доступ да паслуг інфраструктуры» – магчымасць атрымання перавозчыкамі паслуг інфраструктуры ў адпаведнасці з правіламі згодна з дадаткамі № 1 і 2 да гэтага Парадку;

«інфраструктура» – інфраструктура чыгуначнага транспарту, якая ўключае магістральныя і станцыйныя пуці, аб'екты электразабеспячэння, сігналізацыі, сувязі, прылады, абсталяванне, будынкі, пабудовы, збудаванні і іншыя аб'екты, тэхналагічна неабходныя для яе фунцыянавання;

«арганізацыя чыгуначнага транспарту» – фізічная ці юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая аказвае паслугі чыгуначнага транспарту спажыўцам;

«перавозачны працэс» – сукупнасць арганізацыйна і тэхналагічна ўзаемазвязаных аперацый, якія выконваюцца падчас падрыхтоўкі, ажыццяўлення і завяршэння перавозак пасажыраў, грузаў, багажу, грузабагажу і паштовых адпраўленняў чыгуначным транспартам;

«перавозчык» –арганізацыя чыгуначнага транспарту, якая ажыццяўляе дзейнасць па перавозцы грузаў, пасажыраў, багажу,

грузабагажу і паштовых адпраўленняў, мае адпаведную ліцэнзію, валодае на праве ўласнасці ці на іншай законнай падставе рухомым саставам, уключаючы цягавыя транспартныя сродкі;

«спажывец» – фізічная або юрыдычная асоба дзяржавы-члена, якая карыстаецца або мае намер карыстацца паслугамі чыгуначнага транспарту;

«тарыф на паслугі чыгуначнага транспарту» – грашовае выражэнне кошту паслуг чыгуначнага транспарту;

«паслугі чыгуначнага транспарту» – паслугі (работы), якія аказваюцца (выконваюцца) арганізацыямі чыгуначнага транспарту спажыўцам, а менавіта:

перавозка грузаў і дадатковыя паслугі (работы), звязаныя з арганізацыяй і ажыццяўленнем перавозкі грузаў (у тым ліку парожняга рухомага саставу);

перавозка пасажыраў, багажу, грузабагажу, паштовых адпраўленняў і дадатковыя паслугі (работы), звязаныя з такой перавозкай;

паслугі інфраструктуры;

«паслугі інфраструктуры» – паслугі, звязаныя з выкарыстаннем інфраструктуры для ажыццяўлення перавозак і іншыя паслугі, названыя ў дадатку № 2 да гэтага Парадку;

3. Арганізацыі чыгуначнага транспарту незалежна ад прыналежнасці спажыўца да той ці іншай дзяржавы-члена, яе арганізацыйна-прававой формы забяспечваюць яму доступ да паслуг чыгуначнага транспарту з улікам гэтага Парадку і заканадаўства дзяржаў-членаў.

4. Дзяржавы-члены забяспечваюць доступ перавозчыкаў дзяржаў-членаў да паслуг інфраструктуры з захаваннем прынцыпаў і патрабаванняў, названых у дадатках № 1 і 2 да гэтага Парадку.

Палажэнні дадаткаў № 1 і 2 да гэтага Парадку не распаўсюджваюцца на адносіны паміж перавозчыкамі дзяржаў-членаў па аказанню паслуг па выкарыстанню лакаматываў і лакаматыўных брыгад на ўчастках інфраструктуры дзяржаў-членаў, якія аказваюцца на падставе дагавораў (пагадненняў), заключаных паміж такімі перавозчыкамі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

5. Парадак і ўмовы аказання іншых паслуг чыгуначнага транспарту ў рамках фарміравання агульнага рынку транспартных паслуг вызначаюцца пры неабходнасці міжнароднымі дагаворамі ў рамках Саюза.

6. Тарыфы на паслугі чыгуначнага транспарту і (або) іх гранічны ўзровень (гранічныя кошты) устанаўліваюцца (змяняюцца) ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў і міжнароднымі дагаворамі з забеспячэннем магчымасці дыферэнцыяцыі тарыфаў у

адпаведнасці з заканадаўствам сваёй дзяржавы-члена з захаваннем наступных прынцыпаў:

1) кампенсацыя эканамічна абгрунтаваных затрат, якія непасрэдна датычацца паслуг чыгуначнага транспарту;

2) забеспячэнне развіцця чыгуначнага транспарту ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў;

3) забеспячэнне траспарэнтнасці тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту, а таксама магчымасці дадатковага перагляду такіх тарыфаў і (або) іх гранічнага ўзроўню (гранічных коштаў) ў выпадку рэзкай змены эканамічных умоў з папярэднім інфармаваннем дзяржаў-членаў;

4) забеспячэнне публічнасці прыняцця рашэнняў аб устанаўленні тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту;

5) прымяненне гарманізаванага падыходу да вызначэння наменклатуры грузаў і правіл устанаўлення тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту, якія аказваюцца ва ўмовах натуральнай манаполіі;

6) вызначэнне валюты тарыфу на паслугі чыгуначнага транспарту ў кожнай дзяржаве-члене ў адпаведнасці з заканадаўствам сваёй дзяржавы-члена.

7. Устанаўленне (змяненне) тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту тарыфаў і (або) іх гранічнага ўзроўню (гранічных коштаў) адбываецца ў адпаведнасці з заканадаўствам сваёй дзяржавы-члена, з улікам гэтага Парадку.

8. Падчас перавозкі грузаў чыгуначным транспартам па тэрыторыях дзяржаў-членаў прымяняюцца ўніфікаваныя тарыфы паводле відаў зносін (экспартны, імпартны і ўнутрыдзяржаўны тарыфы).

9. Для павышэння канкурэнтназдольнасці чыгуначнага транспарту дзяржаў-членаў, стварэння спрыяльных умоў для ажыццяўлення перавозак грузаў чыгуначным транспартам, прыцягнення новых грузапатокаў, якія раней не ажыццяўляліся з дапамогай чыгуначнага транспарту, забеспячэння магчымасці выкарыстання незадзейнічаных або мала задзейнічаных маршрутаў перавозак грузаў па чыгунках, стымулявання росту аб'ёмаў перавозак грузаў па чыгунках дзяржаў-членаў, стымулявання ўкаранення новай тэхнікі і тэхналогій арганізацыям чыгуначнага транспарту даецца права прыняцца, зыходзячы з эканамічнай мэтазгоднасці, рашэнняў аб змяненні ўзроўню тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту па перавозцы грузаў у рамках гранічных ўзроўняў (гранічных коштаў), устаноўленых ці ўзгодненых упаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

10. Арганізацыі чыгуначнага транспарту рэалізуюць дадзенае ім права змянення ўзроўня тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту па перавозцы грузаў у рамках гранічных ўзроўняў (гранічных коштаў) у адпаведнасці з метадалогіяй (методыкамі, парадкам, правіламі, інструкцыямі ці іншымі нарматыўнымі актамі), якая зацвярджаецца (вызначаецца) упаўнаважанымі органамі дзяржаў-членаў у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў з захаваннем асноўнага прынцыпу недапушчальнасці стварэння пераваг для канкрэнтых таваравытворцаў дзяржаў-членаў.

11. Рашэнне аб змяненні ўзроўню тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту па перавозцы грузаў падлягае афіцыйнаму апублікаванню ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў, абавязковаму накіраванню ўпаўнаважаным органам дзяржаў-членаў і ў Камісію не пазней чым за 10 рабочых дзён да даты ўступлення іх у сілу.

12. У выпадку калі дзеяннямі арганізацый чыгуначнага транспарту, накіраванымі на змяненне ўзроўню тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту па перавозцы грузаў, парушаюцца правы і інтарэсы спажыўцоў, спажыўцы маюць права звярнуцца ў нацыянальны антыманапольны орган дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой спажывец знаходзіцца або пражывае, з заявай аб абароне сваіх парушаных правоў і інтарэсаў.

У выпадку калі арганізацыя чыгуначнага транспарту, дзеянні якой абскарджваюцца спажыўцом, знаходзіцца па месцы знаходжання ці пражывання спажыўца, нацыянальны антыманапольны орган дзяржавы-члена разглядае заяву спажыўца ў адпаведнасці з заканадаўствам сваёй дзяржавы.

У выпадку калі заява пададзена спажыўцом на дзеянні арганізацыі чыгуначнага транспарту, размешчанай не па месцы знаходжання або пражывання спажыўца, нацыянальны антыманапольны орган дзяржавы-члена, пасля вызначэння і прызнання абгрунтаванасці патрабаванняў, названых у заяве спажыўца, не пазней чым за 10 рабочых дзён накіроўвае ў Камісію зварот аб правядзенні расследавання, пра што напрацягу 3 рабочых дзён з даты накіравання звароту ў Камісію паведамляе спажыўцу і нацыянальнаму антыманапольнаму органу дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана арганізацыя чыгуначнага транспарту, якая дапусціла парушэнне пры змяненні ўзроўню тарыфаў на паслугі чыгуначнага транспарту па перавозцы грузаў у рамках гранічных ўзроўняў (гранічных коштаў).

Камісія на падставе названага звароту разглядае заяву спажыўца і прымае рашэнні ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

13. Падчас перавозак грузаў чыгуначным транспартам паміж дзяржавамі-членамі праз тэрыторыю іншай дзяржавы-члена і паміж тэрыторыямі дзяржавы-члена з удзелам чыгункі іншай дзяржавы-члена, а таксама падчас перавозак грузаў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена праз тэрыторыю іншай дзяржавы-члена ў трэція краіны праз марскія парты дзяржаў-членаў і ў адваротным пакірунку кожная з дзяржаў-членаў прымяняе ўніфікаваны тарыф кожнай дзяржавы-члена.

14. Падчас перавозкі грузаў з тэрыторыі адной дзяржавы-члена транзітам праз тэрыторыю іншай дзяржавы-члена ў трэція краіны і ў адваротным накірунку (за выключэннем перавозак грузаў праз марскія парты дзяржаў-членаў), а таксама падчас перавозак грузаў з трэціх краін у трэція краіны транзітам праз тэрыторыі дзяржаў-членаў праводзіцца скаардынаваная (узгодненая) тарыфная палітыка ў адпаведнасці з Канцэпцыяй устанаўлення ўзгодненай тарыфнай палітыкі на чыгуначным транспарце дзяржаў-членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў ад 18 кастрычніка 1996 года.

15. Дзяржавамі-членамі прызначаюцца ўпаўнаважаныя органы, адказныя за рэалізацыю гэтага Парадку.

16. Дзяржавы-члены інфармуюць адна другую і Камісію аб назначэнні і афіцыйнай назве сваіх упаўнаважаных органаў не пазней чым за 30 дзён з даты ўступлення ў сілу Дагавора.

Дадатак № 1 да Парадку
рэгулявання доступуда паслуг
чыгуначнага
транспарту,уключаючы
асновы тарыфнай палітыкі

Правілы
доступу да паслуг інфраструктуры чыгуначнага
транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза

I. Агульныя палажэнні

1. Гэтыя Правілы рэгулююць адносіны перавозчыкаў і аператараў інфраструктуры ў сферы прадастаўлення доступу да паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту на ўчастках інфраструктуры ў рамках Саюза.

2. Рэгуляванне адносін перавозчыкаў і аператараў інфраструктуры ў сферы прадастаўлення доступу да паслуг інфраструктуры ў межах тэрыторыі адной дзяржавы-члена, за выключэннем адносін, прадугледжаных у пункце 1 гэтых Правіл, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена.

II. Азначэнні

3. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых Правілах, азначаюць наступнае:

«графік руху цягнікоў» – нарматыўна-тэхнічны дакумент аператара інфраструктуры, які ўстанаўлівае арганізацыю руху цягнікоў усіх катэгорый на ўчастках інфраструктуры, графічна адлюстроўвае следаванне цягнікоў на маштабнай сетцы ва ўмоўныя суткі і падраздзяляецца на нарматыўны (на планавы год), варыянтны (у асобныя перыяды часу) і аператыўны (на бягучыя планавыя суткі);

«доўгатэрміновы дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры» – дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры, заключаны паміж аператарам інфраструктуры і перавозчыкам на перыяд не менш за 5 год;

«дадатковая заяўка» – заяўка на прадастаўленне доступу да паслуг інфраструктуры, якая паступіла ад перавозчыка для ажыццяўлення дадатковых перавозак у перыяд дзеяння нарматыўнага графіка руху цягнікоў;

«доступ да паслуг інфраструктуры» – магчымасць атрымання перавозчыкамі паслуг інфраструктуры для ажыццяўлення перавозак;

«нацыянальны (агульнасецявы) перавозчык» – перавозчык, які ажыццяўляе дзейнасць па перавозцы грузаў, пасажыраў, багажу, грузабагажу, паштовых адпраўленняў і забяспечвае рэалізацыю плану фарміравання цягнікоў на ўсёй інфраструктуры дзяржавы-члена, у тым ліку па спецыяльных і воінскіх перавозках. Статус нацыянальнага (агульнасецявога) перавозчыка вызначаецца заканадаўствам дзяржавы-члена;

«нітка графіку» – графічнае адлюстраванне на графіку руху цягнікоў маршруту следавання цягніка з указаннем пунктаў адпраўлення, назначэння і праследавання, часу адпраўлення, прыбыцця, тэхналагічных стаянак, сярэдніх часоў ходу, а таксама іншых тэхнічных і тэхналагічных параметраў цягніка;

«аператар інфраструктуры» – арганізацыя чыгуначнага транспарту, якая валодае інфраструктурай і выкарыстоўвае інфраструктуру на законных падставах і (або) аказвае паслугі інфраструктуры ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой знаходзіцца інфраструктура;

«план фарміравання цягнікоў» – нарматыўна-тэхнічны дакумент, зацверджаны аператарам інфраструктуры на падставе праектаў планаў фарміравання цягнікоў перавозчыкаў, які ўстанаўлівае катэгорыі і назначэнні цягнікоў, што фарміруюцца на чыгуначных станцыях з улікам прапускной здольнасці ўчасткаў інфраструктуры і перапрацоўчай здольнасці станцый;

«прапускная здольнасць участкаў інфраструктуры» – максімальная колькасць цягнікоў і пар цягнікоў, якія могуць быць прапушчаны па ўчастку інфраструктуры за разліковы перыяд часу (суткі) у залежнасці ад тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей інфраструктуры, рухомага саставу і спосабаў арганізацыі руху цягнікоў з улікам пропуску цягнікоў розных катэгорый;

«расклад руху цягнікоў» – дакумент, які змяшчае інфармацыю пра рух цягнікоў у пэўныя календарныя даты на падставе графіка руху цягнікоў;

«сертыфікат бяспекі» – дакумент, які пацвярджае адпаведнасць сістэмы кіравання бяспекай удзельніка перавозачнага працэсу правілам бяспекі на чыгуначным транспарце, выдадзены ва ўстаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена парадку;

«упаўнаважаны орган» – орган выканаўчай улады (дзяржаўнага кіравання) дзяржавы-члена, у кампетэнцыю якога ўваходзяць пытанні дзяржаўнага рэгулявання і (або) кіравання ў галіне чыгуначнага транспарту, вызначаны ў адпаведнасці з заканадаўствам кожнай з дзяржаў-членаў;

«участак інфраструктуры» – частка інфраструктуры чыгуначнага транспарту, якая прылягае да стыку двух сумежных інфраструктур

дзяржаў-членаў у межах устаноўленага аператарам інфраструктуры ўчастка курсіравання лакаматыва.

4. Іншыя паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых Правілах, разумеюцца ў значэннях, вызначаных у Пратаколе аб скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыцы, Парадку рэгулявання доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі, а таксама Правілах аказання паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – Правілы аказання паслуг).

III. Агульныя прынцыпы доступу да паслуг інфраструктуры

5. Доступ да паслуг інфраструктуры прадастаўляецца на ўчастках інфраструктуры і засноўваецца на прынцыпах:

1) роўнасці патрабаванняў да перавозчыкаў, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, з улікам тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей у межах прапускной здольнасці ўчасткаў інфраструктуры;

2) прымянення ў адносінах да перавозчыкаў адзінай коштавай (тарыфнай) палітыкі ў сферы паслуг інфраструктуры ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

3) даступнасці інфармацыі пра пералік паслуг інфраструктуры, парадак іх аказання, зыходзячы з тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей інфраструктуры, тарыфы, плату і зборы за гэтыя паслугі;

4) рацыянальнага планавання работ па рамонту, утрыманню і абслугоўванню інфраструктуры ў мэтах эфектыўнага выкарыстання яе прапускной здольнасці і забеспячэння бесперапынасці перавозачнага працэсу, цэласнасці і бяспекі тэхналагічных працэсаў;

5) абароны звестак, якія складаюць камерцыйную ці дзяржаўную тайну, што сталі вядомыя ў працэсе планавання, арганізацыі перавозачнай дзейнасці і аказання паслуг інфраструктуры;

6) прыярытэтнасці (чарговасці) прадастаўлення перавозчыкам доступу да паслуг інфраструктуры ва ўмовах абмежаванай прапускной здольнасці інфраструктуры ў адпаведнасці з нарматыўным графікам руху цягнікоў;

7) забеспячэння перавозчыкамі належнага тэхнічнага стану чынуначнага рухомага саставу, які яны выкарыстоўваюць.

6. Прынцып прыярытэтнасці (чарговасці) прадастаўлення перавозчыкам доступу да паслуг інфраструктуры рэалізуецца праз пасрэдніцтва наступных узроўняў адбору:

1) вызначэнне катэгорыі цягніка, прыярытэтнасць (чарговаць) якога вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена,

на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, ці актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

2) у выпадку ідэнтычнасці катэгорыі цягнікоў у залежнасці ад:

наяўнасці доўгатэрміновых дагавораў на аказанне паслуг інфраструктуры з улікам выканання абавязацельстваў па дагаворам па аб'ёмах перавозак;

інтэнсіўнасці выкарыстання перавозчыкам прававой магчымасці ўчасткаў інфраструктуры;

наяўнасці існуючага дагавора на аказанне паслуг інфраструктуры;

3) у выпадку ідэнтычнасці крытэрыяў, названых у падпунктах 1 і 2 гэтага пункта, ажыццяўленне конкурсных працэдур у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

IV. Умовы прадастаўлення доступу да паслуг інфраструктуры

7. Доступ да паслуг інфраструктуры прадастаўляецца аператарам інфраструктуры пры наяўнасці ў перавозчыкаў:

1) ліцэнзій на ажыццяўленне перавозачнай дзейнасці, выдадзеных упаўнаважаным органам дзяржавы-члена ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

2) сертыфікатаў бяспекі, выдадзеных упаўнаважаным органам дзяржавы-члена ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

3) у штаце кваліфікаваных працаўнікоў, задзейнічаных у арганізацыі, кіраванні і ажыццяўленні перавозачнага працэсу, маючых дакументы, якія пацвярджаюць іх кваліфікацыю і прафесійную падрыхтоўку ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

8. Доступ да паслуг інфраструктуры прадастаўлясцца зыходзячы з:

1) тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей інфраструктуры для арганізацыі руху цягнікоў і манеўравых перамяшчэнняў у межах участка інфраструктуры;

2) плана фарміравання грузавых цягнікоў і графіка руху цягнікоў;

3) наяўнасці прапускной здольнасці інфраструктуры і прапаноў перавозчыкаў па выкарыстанні ўчасткаў інфраструктуры і размеркавання аператарам інфраструктуры прапускной здольнасці

ўчасткаў інфраструктуры на падставе прынцыпаў доступу да паслуг інфраструктуры, вызначаных у раздзеле III гэтых Правіл;

4) адсутнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам джяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, забарон і абмежаванняў, якія перашкаджаюць ажыццяўленню чыгуначнай перавозкі;

5) наяўнасці ў перавозчыка ўзгадненняў з іншымі органамі і арганізацыямі ў выпадках, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

9. Права доступу да паслуг інфраструктуры па пэўных нітках графіку можа прадастаўляцца перавозчыкам на перыяд, які не перавышае тэрмін дзеяння раскладу руху цягнікоў, за выключэннем правоў, што выцякаюць з доўгатэрміновых дагавораў.

V. Прадастаўленне доступу да паслуг інфраструктуры

10. Прадастаўленне доступу да паслуг інфраструктуры ажыццяўляецца з улікам патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і ўключае наступныя этапы:

1) распрацоўка і апублікаванне аператарам інфраструктуры тэхнічнай спецыфікацыі ўчасткаў інфраструктуры;

2) падача перавозчыкам заяўкі на доступ да паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – заяўка) па форме згодна з дадаткам;

3) разгляд аператарам інфраструктуры заяўкі;

4) зацвярджэнне графіка руху цягнікоў і раскладу руху цягнікоў;

5) заключэнне дагавора на аказанне паслуг інфраструктуры ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

У выпадку калі перавозчык з'яўляецца адначасова аператарам інфраструктуры, якая плануецца для выкарыстання, падача заяўкі і заключэнне дагавора не патрабуюцца.

11. Прадастаўленне доступу да паслуг інфраструктуры па дадатковых перавозках, не прадугледжаных нарматыўным графікам руху цягнікоў, ажыццяўляецца на падставе дадатковых заявак у парадку, устаноўленым гэтымі Правіламі.

VI. Тэхнічная спецыфікацыя ўчасткаў інфраструктуры

12. Штогод, не пазней чым за 3 месяцы да даты пачатку прыёму заявак, аператар інфраструктуры складае, зацвярджае і публікуе тэхнічную спецыфікацыю ўчасткаў інфраструктуры ў парадку,

установленым актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

13. У тэхнічнай спецыфікацыі ўчасткаў інфраструктуры павінны быць адзначаны:

1) тэхнічныя характарыстыкі ўчасткаў інфраструктуры і станцый, неабходныя для арганізацыі руху цягнікоў і манеўравых перамяшчэнняў, з указаннем працягласці ўчасткаў інфраструктуры і віду цягі, нормаў вагі і даўжыні саставу цягнікоў, хуткасцей руху цягнікоў розных катэгорый;

2) праекты нітак графіка руху цягнікоў для міжнародных пасажырскіх зносін;

3) прагнозны час прыёму-перадачы (абмену) грузавых цягнікоў на кожным міждзяржаўным стыкавым пункце, вызначаным рашэннем Савета па чыгуначным транспарце дзяржаў-членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

4) прапускная здольнасць участкаў інфраструктуры, за выключэннем прапускной здольнасці ўчасткаў інфраструктуры, неабходнай нацыянальнаму (агульнасецявому) перавозчыку для выканання перавозак ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

14. Аператар інфраструктуры можа адзначыць у тэхнічнай спецыфікацыі ўчасткаў інфраструктуры іншыя звесткі і ўмовы для планавання перавозак і арганізацыі руху цягнікоў на ўчастках інфраструктуры.

VII. Падача і разгляд заяўкі

15. Перавозчык падае аператару інфраструктуры заяўку.

16. Тэрміны пачатку і заканчэння прыёму, разгляду заявак, фарміравання першапачатковага праекта нарматыўнага графіка руху цягнікоў, а таксама срокі падачы інфармацыі, прадугледжанай пунктамі 24 і 26 гэтых Правіл, устанаўліваюцца заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і (або) актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

17. Да заяўкі далучаюцца:

1) праект плануемых нітак графіка;

2) інфармацыя пра запланаваныя гадавыя аб'ёмы перавозак (з разбіўкай па кварталах і месяцах, а таксама па відах грузаў);

3) інфармацыя пра колькасць цягнікоў, запланаваных для перавозкі;

4) інфармацыя пра тыпы і характарыстыкі лакаматываў, прадугледжаных перавозчыкам для ажыццяўлення перавозак;

5) дакументы, якія пацвярджаюць адпаведнасць перавозчыка патрабаванням, устаноўленым пунктам 7 гэтых Правіл.

18. Заяўка, якая падаецца перавозчыкам аператару інфраструктуры на папяровых носьбітах, і далучаныя да яе дакументы:

павінны быць прашытыя, пранумераваныя і завераныя пячаткай перавозчыка, а таксама подпісам яго кіраўніка ці ўпаўнаважанай ім асобы;

прадстаўляюцца на рускай мове ці на мове дзяржавы па месцы юрыдычнай рэгістрацыі аператара інфраструктуры і не павінны змяшчаць выпраўленні ці дапаўненні, а ў выпадку іх падачы на іншай мове суправаджаюцца завераным ва ўстаноўленым парадку перакладам на рускую мову.

Дакументы, далучаныя да заяўкі, павінны ўяўляць сабой арыгіналы ці іх копіі. У выпадку падачы копій дакументаў кіраўнік або ўпаўнаважаная ім асоба, якія падпісваюць заяўку, павінны пісьмова пацвердзіць іх дакладнасць і паўнату.

19. Заяўка, якая мае электронны выгляд, падаецца ў адпаведнасці з пунктам 17 гэтых Правіл з улікам патрабаванняў электроннага дакументазвароту і павінна быць падпісана электронным лічбавым подпісам.

20. Заяўка падлягае рэгістрацыі аператарам інфраструктуры з выдачай перавозчыку дакумента, у якім падаецца парадкавы рэгістрацыйны нумар, дата прыёму заяўкі і пералік прынятых дакументаў.

21. Аператар інфраструктуры правярае атрыманыя заяўкі на адпаведнасць патрабаванням, устаноўленым пунктамі 17 – 19 гэтых Правіл.

22. У выпадку неадпаведнасці заяўкі патрабаванням, устаноўленым гэтымі Правіламі, аператар інфраструктуры на працягу 5 рабочых дзён ад дня атрымання заяўкі паведамляе перавозчыку ў пісьмовай форме пра адмову ў прыняцці заяўкі да разгляду з указаннем прычын адмовы.

23. У перыяд разгляду заявак (але не пазней чым за 1 месяц да заканчэння тэрміну разгляду заявак) аператар інфраструктуры мае права пры неабходнасці запытаць у перавозчыкаў дадатковыя звесткі (дадзеныя), неабходныя для фарміравання нарматыўнага графіка руху цягнікоў.

Запытаныя аператарам інфраструктуры дадатковыя звесткі (дадзеныя) павінны быць прадстаўлены перавозчыкам на працягу 5

рабочых дзён ад дня атрымання запыту ад аператара інфраструктуры з улікам захавання патрабаванняў да падачы і афармлення заяўкі.

24. Першапачатковы праект нарматыўнага графіка руху цягнікоў складаецца аператарам інфраструктуры з улікам прынятых да разгляду заявак перавозчыкаў і максімальнага выкарыстання прапускной здольнасці аператара інфраструктуры.

Аператар інфраструктуры інфармуе перавозчыка пра вынікі разгляду яго заяўкі ў тэрмін, вызначаны аператарам інфраструктуры.

25. У выпадку нязгоды перавозчыкаў з першапачатковым вынікам разгляду заяўкі аператар інфраструктуры можа арганізаваць каардынацыйныя працэдуры ўзгаднення, накіраваныя на вырашэнне рознагалоссяў (канфліктаў) паміж зацікаўленымі перавозчыкамі, шляхам правядзення перагавораў, падчас якіх аператар інфраструктуры мае права прапанаваць перавозчыку іншыя ніткі графіку, якія адрозніваюцца ад тых, на якія была пададзена заяўка.

26. Аператар інфраструктуры пасля правядзення ўсіх працэдур, прадугледжаных гэтым раздзелам, інфармуе перавозчыка пра ўзгодненне (неўзгодненне) заяўкі з улікам яе карэкціровак (пры наяўнасці).

VIII. Фарміраванне, распрацоўка і зацвярджэнне нарматыўнага графіка руху цягнікоў і раскладу руху цягнікоў

27. Нарматыўны графік руху цягнікоў і расклад руху цягнікоў распрацоўваюцца і зацвярджаюцца аператарам інфраструктуры на гадавы перыяд у парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, з улікам прынятых ад перавозчыкаў заявак і вынікаў праведзеных каардынацыйных працэдур узгаднення.

28. Нарматыўны графік руху цягнікоў фарміруецца аператарам інфраструктуры з улікам:

1) забеспячэння бяспекі руху цягнікоў;

2) найбольш эфектыўнага выкарыстання прапускной і правазной здольнасці ўчасткаў інфраструктуры і перапрацоўчай здольнасці чыгуначных станцый;

3) магчымасці правядзення работ па ўтрыманню і рамонту ўчасткаў інфраструктуры.

29. Распрацоўка нарматыўнага графіка руху цягнікоў ажыццяўляецца з улікам прынцыпу прыярытэтнасці (чарговасці).

30. Нарматыўны графік руху цягнікоў уводзіцца ў дзеянне з 00 гадзін 00 хвілін апошняй нядзелі мая каляндарнага году і спыняе дзеянне ў 24 гадзіны 00 хвілін апошняй суботы мая наступнага каляндарнага году.

31. Нарматыўны графік руху цягнікоў і расклад руху цягнікоў могуць карэктавацца для грузавых цягнікоў у парадку, устаноўленым аператарам інфраструктуры.

IX. Заключэнне дагавора на аказанне паслуг інфраструктуры

32. Дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры заключаецца пасля ўзгаднення аператарам інфраструктуры заяўкі, але не пазней чым за 10 каляндарных дзён да даты ўводу ў дзеянне нарматыўнага графіка руху цягнікоў.

33. Дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры заключаецца з улікам палажэнняў, прадугледжаных Правіламі аказання паслуг.

Дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры па дадатковых заяўках павінен быць заключаны не пазней чым за 1 месяц да пачатку каляндарнага месяца ажыццяўлення перавозак.

34. Аператар інфраструктуры мае права адмовіць перавозчыку ў заключэнні дагавора пры наяўнасці ў перавозчыка запазычанасці перад аператарам інфраструктуры за аказаныя паслугі інфраструктуры, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

X. Дадатковыя заяўкі

35. Дадатковая заяўка афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, прадугледжанымі пунктамі 17 – 19 гэтых Правіл.

36. Дадатковая заяўка падлягае рэгістрацыі аператарам інфраструктуры з выдачай перавозчыку дакумента, у якім даецца парадкавы рэгістрацыйны нумар, дата прыёму дадатковай заяўкі і пералік прынятых дакументаў.

37. Дадатковая заяўка падаецца не пазней чым за 2 месяцы да пачатку каляндарнага месяца ажыццяўлення перавозак.

38. Дадатковыя заяўкі разглядаюцца на адпаведнасць патрабаванням, устаноўленым гэтымі Правіламі, на працягу 1 месяца з моманту іх атрымання. Па выніках разгляду дадатковых заявак можа быць заключаны дагавор ці дадатковыя пагадненні да заключаных дагавораў.

39. На дадатковыя заяўкі перавозчыкаў аператар інфраструктуры можа разгледзець магчымасць выдзялення дадатковых нітак графіку.

40. Заяўкі, атрыманыя пазней за тэрмін, устаноўлены пунктам 16 гэтых Правіл, не ўлічваюцца падчас фарміравання нарматыўнага графіка руху цягнікоў і разглядаюцца як дадатковыя заяўкі.

41. Выдзяленне нітак графіка на дадатковыя заяўкі ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

42. Рызыкі частковага задавальнення ці адхілення дадатковых заявак нясуць перавозчыкі.

XI. Парадак падачы інфармацыі

43. Аператар інфраструктуры размяшчае на сваім афіцыйным сайце ў сетцы Інтэрнэт тэхнічную спецыфікацыю ўчасткаў інфраструктуры, пералік нарматыўных прававых актаў, а таксама акты аператара інфраструктуры, якія рэгламентуюць парадак доступу да паслуг інфраструктуры з улікам патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

44. Аператар інфраструктуры і перавозчыкі павінны выконваць патрабаванні заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, у тым ліку патрабаванні забеспячэння нацыянальнай бяспекі, з улікам абмежаванняў на распаўсюджванне інфармацыі, якая змяшчае звесткі, што адносяцца да дзяржаўнай тайны (дзяржаўным сакрэтам) ці да звестак абмежаванага распаўсюджвання.

XII. Парадак вырашэння спрэчак

45. Усе спрэчкі і рознагалоссі паміж перавозчыкам і аператарам інфраструктуры, якія ўзніклі падчас прымянення гэтых Правіл, вырашаюцца шляхам правядзення перагавораў.

46. У выпадку калі падчас перагавораў перавозчык і аператар не змогуць дасягнуць згоды, усе спрэчкі і рознагалоссі вырашаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

Дадатак

да Правіл доступу да паслуг
інфраструктуры чыгуначнага
транспарту ў рамках
Еўразійскага эканамічнага саюза

Форма

Заяўка
на доступ да паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту
ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза

ад «__»_____ ___ года №_____

на перыяд з_____ г. да _____ г.
Аператар інфраструктуры _____
_____
(назва, юрыдычны адрас, паштовы адрас)
Перавозчык_____
(назва, юрыдычны адрас, паштовы адрас)
Нумар і дата дагавора на аказанне паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (у выпадку наяўнасці)
_____
Гэтым пацвярджаю паўнату і дакладнасць наступных далучаных да заяўкі дакументаў (інфармацыі)* на _____ л. у __ экз.:
1) _____;
2) _____;
…) _____.

_____ _____
Подпіс перавозчыка М.П.

* Заўвага: далучаюцца дакументы (інфармацыя), прадугледжаныя пунктам 17 Правіл доступу да паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

Дадатак № 2
да Парадку рэгулявання
доступу да паслуг
чыгуначнага транспарту,
уключаючы асновы
тарыфнай палітыкі

Правілы
аказання паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза

I. Агульныя палажэнні

1. Гэтыя Правілы вызначаюць парадак і ўмовы аказання паслуг у межах участкаў інфраструктуры чыгуначнага транспарту дзяржаў-членаў у рамках планавання і арганізацыі перавозачнай дзейнасці, пералік такіх паслуг, адзіныя прынцыпы дыспетчарызацыі і размеркавання прапускной здольнасці інфраструктуры, істотныя ўмовы дагавораў на аказанне паслуг інфраструктуры, правы, абавязкі і адказнасць аператара інфраструктуры і перавозчыкаў.

II. Азначэнні

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых Правілах, азначаюць наступнае:

«пазачарговыя цягнікі» – цягнікі, не прадугледжаныя графікам руху цягнікоў (аднаўленчыя і пажарныя цягнікі, снегаачышчальнікі, лакаматывы без вагонаў, спецыяльны самаходны рухомы састаў), прызначаныя для ліквідацыі перашкод для руху цягнікоў, выканання непрадбачаных работ і адпаведнай перадыслакацыі транспартных сродкаў (парадак іх следавання вызначаецца заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, або актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура);

«дыспетчарызацыя перавозачнага працэсу» – працэс кантролю, кіраваннем руху цягнікоў і манеўравай работай у аператыўных умовах;

«манеўравыя перамяшчэнні» – аперацыі па змяненню састаўнасці цягніка (прычэпка (адчэпка) рухомага саставу), фарміраванне (расфарміраванне) саставаў, перастаноўка саставаў з парку ў парк, рух і пастаноўка лакаматыва ў састаў цягніка ці выключэнне лакаматыва з дадзенага саставу, падача вагонаў на пад'язныя пуці ці іх прыбіранне з такіх пуцей і іншыя аперацыі;

«пазаштатная сітуацыя» – абставіны, якія пагражаюць бяспецы руху цягнікоў у выніку няспраўнасці аб'ектаў інфраструктуры ці ствараюць перашкоды для пропуску цягнікоў;

«аператар інфраструктуры» – арганізацыя чыгуначнага транспарту, якая валодае інфраструктурай і выкарыстоўвае інфраструктуру на законных падставах і (або) аказвае паслугі інфраструктуры ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

«планаванне перавозак» – распрацоўка плана перавозак на аб'ектах (участках і станцыях) інфраструктуры на ўстаноўлены перыяд часу (год, месяц, суткі), у адпаведнасці з заключанымі дагаворамі на аказанне паслуг;

«сутачны план руху цягнікоў» – дакумент, складзены аператарам інфраструктуры для дыспетчарызацыі перавозачнага працэсу і арганізацыі руху цягнікоў у плануемыя суткі;

«тэхнічны план» – дакумент, складзены аператарам інфраструктуры на падставе зводнага плана перавозак, тэхнічных планаў перавозчыкаў і інфармацыі Савета па чыгуначным транспарце дзяржаў-членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

3. Іншыя паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых Правілах, разумеюцца ў значэннях, вызначаных у Пратаколе аб скаардынаванай (узгодненай) транспартнай палітыцы, Парадку рэгулявання доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі, а таксама ў Правілах доступу да паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – Правілы доступу).

III. Паслугі, якія аказваюцца аператарам інфраструктуры

4. Пералік паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту (далей – пералік паслуг) ўключае асноўныя паслугі, звязаныя з выкарыстаннем інфраструктуры для ажыццяўлення перавозак, згодна з дадаткам да гэтых Правіл.

5. Пералік аперацый (работ), якія ўваходзяць у склад паслуг інфраструктуры, вызначаецца з улікам тэхналагічных асаблівасцей перавозачнага працэсу і патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

6. Паслугі інфраструктуры, названыя ў дадатку да гэтых Правіл, прадастаўляюцца з захаваннем патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, у тым ліку ў частцы забеспячэння нацыянальнай бяспекі.

7. На падставе пагаднення з перавозчыкам аператар інфраструктуры мае права аказваць іншыя паслугі, не названыя ў

дадатку да гэтых Правіл, у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

IV. Парадак аказання паслуг інфраструктуры

8. Аказанне паслуг інфраструктуры прадугледжвае ўзаемадзеянне аператара інфраструктуры і перавозчыка ў рамках наступных працэсаў арганізацыі і ажыццяўлення перавозак:

1) тэхналагічнае планаванне і нарміраванне перавозак;

2) месячнае і аператыўнае планаванне перавозак;

3) ажыццяўленне перавозак у межах дагавора на аказанне паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту (далей – дагавор);

4) абмен дадзенымі паміж аператарам інфраструктуры і перавозчыкам.

9. Планаванне і нарміраванне перавозак, карэкціроўка аб'ёмаў перавозкі і графіка руху цягнікоў ажыццяўляюцца ў парадку, вызначаным у адпаведнасці з гэтымі Правіламі, Правіламі доступу, заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, а таксама актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

10. Падчас аператыўнага планавання аператар інфраструктуры і перавозчыкі выконваюць зацверджаны сутачны план руху цягнікоў (графік руху цягнікоў і ўзгоднены тэхнічны план, у тым ліку план абмену цягнікоў, выгонаў на міждзяржаўных стыкавых пунктах, вызначаных рашэннем Савета па чыгуначным транспарце дзяржаў-членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў).

11. Ажыццяўленне перавозкі ўяўляе сабой сукупнасць арганізацыйна і тэхналагічна ўзаемазвязаных аперацый аператара інфраструктуры і перавозчыкаў і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтымі Правіламі, заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

12. Выкарыстанне інфраструктуры ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтымі Правіламі з захаваннем норм, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, у тым ліку ў адпаведнасці з патрабаваннямі па бяспецы руху, а таксама актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

13. Утрыманне інфраструктуры ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

14. Адзінымі прынцыпамі дыспетчарызацыі перавозачнага працэсу і размеркавання прапускной здольнасці з'яўляюцца:

1) кіраванне рухам цягнікоў на ўчастках абслугоўвання інфраструктуры адным дыспетчарам;

2) выкананне тэхналагічных норм і нарматываў, якія змяшчаюцца ў графіку руху цягнікоў, тэхналагічных працэсаў і тэхнічных нормаў эксплуатацыйнай работы;

3) забеспячэнне бяспекі руху цягнікоў і аховы працы працаўнікоў;

4) прадастаўленне дыспетчарам прыярытэтаў руху.

15. Дыспетчарызацыя перавозачнага працэсу ажыццяўляецца аператарам інфраструктуры ці ўпаўнаважанай ім асобай у мэтах забеспячэння бяспечнага пропуску цягнікоў на інфраструктуры.

Дыспетчарызацыя перавозачнага працэсу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з графікам руху цягнікоў, зацверджаным сутачным планам руху цягнікоў і ў парадку, устаноўленым правіламі тэхнічнай эксплуатацыі, інструкцыямі па руху цягнікоў і манеўравай рабоце на станцыях, па сігналізацыі і сувязі, зацверджанымі заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і (або) актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

16. Працэсы прыёму, адпраўлення і пропуску цягнікоў, манеўравага перамяшчэння любога транспартнага сродку (рухомага саставу) ці самаходнай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца на ўчастку інфраструктуры, рэгулююцца аператарам інфраструктуры.

Распараджэнні (указанні) аператара інфраструктуры ў адносінах да названых працэсаў, у тым ліку якія датычацца патрабаванняў бяспекі руху цягнікоў, нарматываў графіка руху цягнікоў, тэхналагічных працэсаў працы лінейных падраздзяленняў інфраструктуры, абавязковыя для ўсіх удзельнікаў перавозачнага працэсу.

17. Для ажыццяўлення перавозачнага працэсу аператар інфраструктуры і перавозчыкі выкарыстоўваюць інфармацыйныя сістэмы аператара інфраструктуры для абмену інфармацыяй (дадзенымі) у аб'ёме, прадугледжаным заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

18. Дадатковая інфармацыя ў адносінах да асноўнай інфармацыі прадастаўляецца аператарам інфраструктуры перавозчыку на падставе асобных дагавораў.

19. Аператар інфраструктуры можа адмовіць перавозчыку ў аказанні паслуг інфраструктуры пры наяўнасці заключанага дагавора ў выпадку:

1) спынення ці ўводу абмежавання перавозкі, у тым ліку абмежавання ўвозу і (ці) вывазу грузаў, багажу і грузабагажу ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

2) немагчымасці аказання паслуг інфраструктуры ў выніку надыходу пазаштатных сітуацый;

3) ажыццяўлення перавозак пазачарговымі цягнікамі;

4) узнікнення пагрозы нацыянальнай бяспецы ці ўзнікнення надзвычайных сітуацый, абставін непераадольнай сілы, ваенных дзеянняў, блакады, эпідэміі ці іншых, не залежных ад аператара інфраструктуры і перавозчыкаў абставін, якія перашкаджаюць выкананню абавязацельстваў па дагавору;

5) устанаўлення іншага парадку аказання паслуг інфраструктуры упаўнаважаным органам па рашэнню ўрада дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

6) іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

20. У выпадку адмовы перавозчыку ў аказанні паслуг інфраструктуры ў выпадках, прадугледжаных пунктам 19 гэтых Правіл, аператар інфраструктуры паведамляе перавозчыку пра немагчымасць выканання абавязацельстваў у парадку, прадугледжаным дагаворам.

21. Аператар інфраструктуры прымае неабходныя меры па арганізаці пропуску цягнікоў, якія следуюць з адхіленнем ад графіка руху цягнікоў або не прадугледжаных гэтым графікам.

22. Факт аказання аператарам інфраструктуры паслуг інфраструктуры і іх фактычны аб'ём асобна па кожнаму віду паслуг згодна з пералікам паслуг пацвярджаюцца дакументамі, форма якіх устанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і (або) актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

V. Дагавор на аказанне паслуг інфраструктуры і яго істотныя ўмовы

23. Паслугі інфраструктуры аказваюцца на падставе дагавора, заключанага ў простай пісьмовай форме паміж аператарам інфраструктуры і перавозчыкам.

24. Дагавор не павінен змяшчаць нормы, якія супярэчаць прынцыпам і патрабаванням, устаноўленым Правіламі доступу і

гэтымі Правіламі, а таксама заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

25. У выпадку калі ў перыяд дзеяння дагавора будзе ўстаноўлена недакладнасць пададзенай перавозчыкам інфармацыі (за выключэннем прагнозных паказчыкаў), названай у пункце 17 Правіл доступу і прадугледжанай дагаворам, аператар інфраструктуры мае права скасаваць дагавор у парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

26. Забараняецца ўступка права патрабавання перавозчыка, якое выцякае з дагавора, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных пунктам 27 гэтых Правіл.

27. Пры немагчымасці выкарыстання правоў, якія выцякаюць з дагавора, перавозчык можа са згоды аператара інфраструктуры перадаць гэта права іншаму перавозчыку ў выпадку наяўнасці ў апошняга заключанага дагавора на ўмовах, прадугледжаных дагаворам.

28. Дагавор павінен змяшчаць наступныя істотныя ўмовы:

1) прадмет дагавора (аб'ём паслуг, доля прапускной здольнасці інфраструктуры (колькасць нітак графіка), участкі інфраструктруры);

2) умовы і тэрмін аказання паслуг інфраструктуры;

3) кошт паслуг (тарыфы, цэны, стаўкі збораў) ці парадак яго вызначэння;

4) парадак і ўмовы аплаты паслуг (парадак разлікаў, спосабы аплаты, валюта плацяжу);

5) адказнасць бакоў у адпаведнасці з дагаворам за прычыненне страт, невыкананне ці неналежнае выкананне абавязацельстваў па дагавору (няўстойкі, штрафы, кампенсацыя страт);

6) форс-мажорныя абставіны (абставіны непераадольнай сілы);

7) тэрмін дзеяння, падставы і парадак спынення дзеяння (скасавання) дагавора, уключаючы ўмовы спынення дзеяння (скасавання) дагавора.

29. Паміж аператарам інфраструктуры і перавозчыкам можа быць заключаны разавы дагавор у выпадку наяўнасці заключанага дагавора (ці дадатковае пагадненне да дагавора) ў выпадку падачы дадатковай заяўкі на дадатковую перавозку.

VI. Правы і абавязкі аператара інфраструктуры і перавозчыка

30. Перавозчык мае права:

1) накіроўваць аператару інфраструктуры прапановы наконт арганізацыі перавозак;

2) атрымліваць інфармацыю ў аб'ёме, неабходным для арганізацыі перавозак у адпаведнасці з гэтымі Правіламі і Правіламі доступу, з абавязковым захаваннем патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, у тым ліку патрабаванняў нацыянальнай бяспекі, з улікам абмежаванняў на распаўсюджанне інфармацыі, якая ўтрымлівае звесткі, аднесеныя да дзяржаўнай тайны (дзяржаўным сакрэтам) ці да звестак абмежаванага распаўсюджання;

3) атрымліваць доступ да паслуг інфраструктуры і паслугі інфраструктуры для ажыццяўлення перавозачнай дзейнасці, у тым ліку на шляху следавання цягніка ў адпаведнасці з умовамі дагавора;

4) рэалізоўваць іншыя правы, устаноўленыя заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і (або) у адпаведнасці з заключанымі дагаворамі.

31. Перавозчык абавязаны:

1) прадастаўляць аператару інфраструктуры звесткі і дакументы, неабходныя для аказання паслуг інфраструктуры;

2) забяспечваць адпаведнасць рухомага саставу патрабаванням бяспекі на чыгуначным транспарце, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

3) паведамляць аператару інфраструктуры пра інцыдэнты і абставіны, якія цягнуць (могуць пацягнуць) парушэнне патрабаванняў наконт бяспекі ў галіне чыгуначнага транспарту, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, а таксама прымаць меры па іх ліквідацыі (папярэджанню);

4) забяспечваць захаванне патрабаванняў наконт бяспекі руху і эксплуатацыі на чыгуначным транспарце, устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і актамі аператара інфраструктуры, якія не супярэчаць заканадаўству дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

5) забяспечваць абарону звестак, якія складаюць камерцыйную (службовую) тайну аператара інфраструктуры, што сталі вядомыя перавозчыку;

6) аплачваць паслугі інфраструктуры згодна з тарыфамі, устаноўленымі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, а таксама праводзіць іншыя належныя аператару інфраструктуры плацяжы ў аб'ёме, тэрмін і на ўмовах, прадугледжаных дагаворам;

7) кампенсаваць сумы не прадугледжаных асобнымі дагаварамі выдаткаў, панесеных аператарам інфраструктуры ў сувязі з перадыслакацыяй (перамяшчэннем) вагонаў (цягнікоў) і (або) адстоем рухомага саставу перавозчыкаў на станцыях;

8) паведамляць у пісьмовай форме аператару інфраструктуры пра адмову ў атрыманні паслуг, прадугледжаных дагаворам, у тэрмін, устаноўлены заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

9) забяспечваць узгадненне і захаванне ўмоў чыгуначнай перавозкі грузаў на асаблівых умовах, негабарытных грузаў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура;

10) забяспечыць перавозкі ва ўзгодненым аб'ёме і адпаведнасць іншых параметраў (умоў) чыгуначнай перавозкі правазным магчымасцям участкаў інфраструктуры чыгуначнага транспарту і (або) перапрацоўчым здольнасцям чыгуначных станцый на маршруце следавання грузу.

11) кампенсаваць прычынены ўрон аператару інфраструктуры і (або) трэцім асобам;

12) выконваць іншыя абавязкі, устаноўленыя дагаворам і заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

32. Аператар інфраструктуры мае права:

1) прымаць меры па забеспячэнню бяспекі руху, у тым ліку:

устанаўліваць часовыя і пастаянныя абмежаванні хуткасці руху цягнікоў на ўчастках інфраструктуры;

спыніць рух цягніка на станцыі, перагоне ў выпадках знаходжання сродкамі аўтаматычнага і візуальнага кантролю тэхнічных пяспраўнасцей і выяўлення камерцыйных бракаў рухомага саставу на ходзе цягніка, якія пагражаюць бяспецы руху;

выкарыстоўваць рэсурсы (рухомы састаў, персанал) перавозчыка падчас узнікнення сітуацый, якія перашкаджаюць руху цягнікоў, для ўзнаўлення працы інфраструктуры;

даваць перавозчыку распараджэнні (загады, прадпісанні, указанні, папярэджанні і інш.), якія датычацца забеспячэння патрабаванняў бяспекі руху цягнікоў, нарматываў графіка руху цягнікоў, плана і парадку фарміравання цягнікоў, тэхналагічных працэсаў працы станцый (лінейных падраздзяленняў) інфраструктуры;

2) патрабаваць на этапе заключэння дагавора ад перавозчыка сертыфікат бяспекі на чыгуначным транспарце, ліцэнзіі на ажыццяўленне ўсіх відаў дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, пры ажыццяўленні перавозак;

3) патрабаваць на этапе выканання дагавора ад перавозчыка дакументы, якія пацвярджаюць адпаведнасць патрабаванням сістэмы бяспекі чыгуначнага транспарту;

4) уносіць у аднабаковым парадку змяненні і дапаўненні ў дагавор у частцы карэкціроўкі вылучанай долі прапускной здольнасці (нітак графіка) ў выпадку выкарыстання перавозчыкам вылучанай долі прапускной здольнасці ўчастка інфраструктуры не ў поўным аб'ёме, чым установлена графікам руху цягнікоў;

5) прымаць рашэнні пра перадыслакацыю (перамяшчэнне) і адстой рухомага саставу перавозчыкаў на станцыі, дзе ёсць вольныя пуцявыя магчымасці для яго адстою, ці лакальнай інфраструктуры, у выпадку выкарыстання перавозчыкам інфраструктуры з парушэннем умоў дагавора;

6) адмовіць перавозчыку ў доступе да інфраструктуры па незалежных ад аператара інфраструктуры прычынах (па віне трэціх асоб, уключаючы суседнія (якія мяжуюць) чыгуначныя адміністрацыі і (або) уладальнікаў лакальных інфраструктур) без прызнання такіх фактаў парушэннем умоў дагавора;

7) прыняць у аднабаковым парадку рашэнне пра часовае спыненне аказання паслуг, звязаных з перавозкай у пэўных накірунках чыгуначных зносін, ці пра аказанне паслуг не ў поўным аб'ёме, у выпадку ўзнікнення надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, а таксама падчас увядзення надзвычайнага становішча і іных абставін, якія перашкаджаюць перавозцы;

8) абмежаваць доступ да інфраструктуры ў выпадку ўзнікнення пазаштатных сітуацый з адменай размеркаваных нітак графіка на тэрмін, неабходны для аднаўлення інфраструктуры;

9) рэалізоўваць іншыя правы, установленыя заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, і (або) заключанымі дагаворамі.

33. Аператар інфраструктуры абавязаны:

1) прымаць і разглядаць прапановы перавозчыкаў па арганізацыі перавозак, а таксама звесткі і дакументы, неабходныя для аказання паслуг інфраструктуры;

2) своечасова падаваць перавозчыкам інфармацыю ў аб'ёме, неабходным для арганізацыі перавозак у адпаведнасці з гэтымі Правіламі і Правіламі доступу, з абавязковым захаваннем патрабаванняў заканадаўства дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура, у тым ліку патрабаванняў забеспячэння нацыянальнай бяспекі, з улікам абмежаванняў, установленых на распаўсюджанне інфармацыі, якая ўтрымлівае звесткі, што адносяцца да дзяржаўнай тайны (дзяржаўным сакрэтам) ці да звестак абмежаванага распаўсюджвання;

3) размяркоўваць прапускную здольнасць інфраструктуры ў межах тэхнічнай і тэхналагічнай здольнасці інфраструктуры ў адпаведнасці з Правіламі доступу;

4) інфармаваць перавозчыка пра змены ў графіку руху цягнікоў, што цягне за сабой змяненні ўзгодненых тэрмінаў і ўмоў аказання паслуг, у тэрмін і парадку, прадугледжаных дагаворам;

5) паведамляць перавозчыку на ўмовах, вызначаных у дагаворы, пра аварыі, пашкоджанні на інфраструктуры і іншыя абставіны, якія могуць стварыць перашкоду перавозчыку для ажыццяўлення яго дзейнасці з выкарыстаннем інфраструктуры;

6) забяспечваць абарону звестак, якія складаюць камерцыйную (службовую) тайну перавозчыкаў, што сталі вядомыя аператару інфраструктуры падчас аказання паслуг інфраструктуры;

7) змяшчаць неабходныя тэхнічныя сродкі ў непашкоджаным выглядзе і прымаць меры, накіраваныя на папярэджанне і ліквідацыю перарываў у руху цягнікоў у сувязі з прыроднымі ці тэхнагеннымі аварыямі;

8) выконваць іншыя абавязкі, устаноўленыя дагаворам і заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

VII. Парадак вырашэння спрэчак

34. Усе спрэчкі і рознагалоссі паміж перавозчыкам і аператарам інфраструктуры, што ўзніклі падчас прымянення гэтых Правіл ці падчас аказання паслуг, вырашаюцца шляхам правядзення перагавораў.

35. У выпадку калі падчас перагавораў перавозчык і аператар інфраструктуры не змогуць дасягнуць узаемнай згоды, усе спрэчкі і рознагалоссі вырашаюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой размешчана інфраструктура.

Дадатак
да Правіл аказання паслуг
інфраструктуры чыгуначнага
транспарту ў рамках Еўразійскага
эканамічнага саюза

Пералік
паслуг інфраструктуры чыгуначнага транспарту

№ пп	Рэспубліка Беларусь	Рэспубліка Казахстан*	Расійская Федэрацыя**
1.	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для ажыццяўлення руху (праследавання) цягнікоў, уключаючы электразабеспячэнне цягавога рухомага саставу перавозчыка	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для ажыццяўлення руху (праследавання) цягнікоў	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для ажыццяўлення руху (праследавання) цягнікоў, уключаючы электразабеспячэнне цягавога рухомага саставу перавозчыка
2.	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для манеўравых перамяшчэнняў, уключаючы электразабеспячэнне цягавога рухомага саставу перавозчыка	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для манеўравых перамяшчэнняў	Прадастаўленне інфраструктуры і выкананне неабходных работ для манеўравых перамяшчэнняў, уключаючы электразабеспячэнне цягавога рухомага саставу перавозчыка
3.	Паслугі па тэхнічнаму і камерцыйнаму кантролю, накіраваныя на забеспячэнне бяспекі руху цягнікоў і захаванне грузаў, багажу і грузабагажу	—	Паслугі па тэхнічнаму і камерцыйнаму кантролю, накіраваныя на забеспячэнне бяспекі руху цягнікоў

* У тым ліку для ўчасткаў інфраструктуры прыналежнасці Рэспублікі Казахстан на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі;

** У тым ліку для ўчасткаў інфраструктуры прыналежнасці Расійскай Федэрацыі на тэрыторыі Рэспублікі Казахстан.

ДАДАТАК № 25

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ
аб парадку рэгулявання закупак

I. Агульныя палажэнні

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з раздзелам XXII Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) і вызначае парадак рэгулявання закупак.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў раздзеле XXII Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«вэб-партал» – адзіны афіцыйны сайт дзяржавы-члена ў сетцы Інтэрнэт, які прадстаўляе адзінае месца доступу да інфармацыі аб закупках;

«заказчык» – дзяржаўны орган, орган мясцовага самакіравання, бюджэтная арганізацыя (у тым ліку дзяржаўныя (муніцыпальныя) установы), а таксама іншыя асобы ў выпадках, вызначаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, якія ажыццяўляюць закупкі ў адпаведнасці з гэтым заканадаўствам. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжана стварэнне (функцыянаванне) арганізатара закупак, дзейнасць якога ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым заканадаўствам. Пры гэтым не дапускаецца перадача арганізатару закупак функцый заказчыка па заключэнню дагавора (кантракта) аб закупцы;

«закупкі» – дзяржаўныя (муніцыпальныя) закупкі, пад якімі маецца на ўвазе набыццё заказчыкамі тавараў, работ, паслуг, і іншыя

закупкі за кошт бюджэтных і іншых сродкаў у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, а таксама адносіны, звязаныя з выкананнем дагавораў (кантрактаў) аб закупках;

«інфармацыя аб закупках» – паведамленне аб правядзенні закупкі, дакументацыя аб закупцы (у тым ліку праект дагавора (кантракта) аб закупцы), змены, што ўносяцца ў такія паведамленні, дакументацыю, тлумачэнні дакументацыі аб закупцы, пратаколы, складзеныя ў працэсе закупкі, звесткі пра вынік працэдуры закупкі, звесткі аб дагаворах (кантрактах) аб закупках і дадатковых пагадненнях да такіх дагавораў (кантрактаў), звесткі аб выніку выканання дагавора (кантракта) аб закупцы, звесткі пра паступленне скаргаў ва ўпаўнаважаныя рэгулюючыя і (або) кантралюючыя органы ўлады дзяржавы-члена ў сферы закупак, пра іх змест і аб рашэннях, прынятых па выніках разгляду такіх скаргаў, аб прадпісаннях, выдадзеных такімі органамі. Інфармацыя аб закупках падлягае абавязковаму размяшчэнню на вэб-партале;

«нацыянальны рэжым» – рэжым, які прадугледжвае, што кожная дзяржава-член для мэтаў закупак забяспечвае таварам, работам і паслугам, якія паходзяць з тэрыторый дзяржаў-членаў, патэнцыяльным пастаўшчыкам дзяржаў-членаў і пастаўшчыкам дзяржаў-членаў, якія прапануюць такія тавары, выконваюць работы і аказваюць паслугі, рэжым не менш спрыяльны, чым прадстаўляемы таварам, работам і паслугам, якія паходзяць з тэрыторыі сваей дзяржавы, а таксама патэнцыяльным пастаўшчыкам і пастаўшчыкам сваёй дзяржавы, якія прапануюць такія тавары, выконваюць работы і аказваюць паслугі. Краіна паходжання тавараў вызначаецца ў адпаведнасці з правіламі вызначэння краіны паходжання тавараў, якія дзейнічаюць на мытнай тэрыторыі Саюза;

«аператар электроннай гандлёвай пляцоўкі (электроннай пляцоўкі)» – юрыдычная асоба або фізічная асоба, якая ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена валодаюць электроннай гандлёвай пляцоўкай (электроннай пляцоўкай), неабходнымі для яе функцыянавання праграмна-апаратнымі сродкамі і (або) забяспечваюць яе функцыянаванне;

«пастаўшчык» – асоба, якая з'яўляецца пастаўшчыком, выканаўцам альбо падрадчыкам, з якой заключаны дагавор (кантракт) аб закупцы;

«патэнцыяльны пастаўшчык» – любая юрыдычная асоба або любая фізічная асоба (у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік);

«электронная гандлёвая пляцоўка (электронная пляцоўка)» – сайт у сетцы Інтэрнэт, вызначаны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках для правядзення закупак у электронным фармаце. Пры гэтым заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць ўстаноўлена, што электроннай гандлёвай пляцоўкай (электроннай пляцоўкай) з'яўляецца вэб-партал, а таксама павінна быць вызначана абмежаваная колькасць электронных гандлёвых пляцовак (электронных пляцовак);

«электронны фармат закупак» – працэдура арганізацыі і правядзення закупак, якая ажыццяўляецца з выкарыстаннем сеткі Інтэрнэт, вэб-партала і (або) электроннай гандлёвай пляцоўкі (электроннай пляцоўкі), а таксама праграмна-апаратных сродкаў.

3. Пры прымяненні гэтага Пратакола, калі з палажэнняў заканадаўства дзяржавы-члена не вынікае іншы сэнс, чым вызначана гэтым Пратаколам, прывядзенне заканадаўства дзяржавы-члена ў адпаведнасць з гэтым Пратаколам не патрабуецца.

II. Патрабаванні ў сферы закупак

4. Закупкі ў дзяржавах-членах ажыццяўляюцца наступнымі спосабамі:

адкрыты конкурс, які ў тым ліку можа прадугледжваць двухэтапныя працэдуры і папярэдні кваліфікацыйны адбор (далей – конкурс);

запыт цэнавых прапаноў (запыт катыровак);

запыт прапаноў (калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы- члена аб закупках);

адкрыты электронны аўкцыён (далей – аўкцыён);

біржавыя таргі (калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена);

закупкі з адной крыніцы альбо ў адзінага пастаўшчыка (выканаўцы, падрадчыка).

Дзяржавы-члены забяспечваюць правядзенне конкурсу і аўкцыёну толькі ў электронным фармаце і імкнуцца да пераходу на электронны фармат пры ажыццяўленні іншых спосабаў закупак.

5. Закупкі шляхам правядзення конкурсу ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў, прадугледжаных пунктамі 1 – 4 дадатка № 1 да гэтага Пратакола.

6. Закупкі шляхам правядзення запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак) ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 5 дадаткам № 1 да гэтага Пратакола.

7. Закупкі шляхам правядзення запыту прапаноў ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў, прадугледжаных пунктам 6 дадаткам № 1 да гэтага Пратакола, у выпадках, прадугледжаных дадаткам № 2 да гэтага Пратакола, а таксама ў выпадках, прадугледжаных пунктамі 10, 42, 44, 47, 59 і 63 дадатка № 3 да гэтага

Пратакола, калі гэта ўстаноўлена заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

8. Закупкі шляхам правядзення аўкцыёну ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў, прадугледжаных пунктамі 7 і 8 дадаткам № 1 да гэтага Пратакола, у адпаведнасці з дадаткам № 4 да гэтага Пратакола.

Дзяржава-член мае права ўстанавіць у сваім заканадаўстве аб закупках больш шырокі пералік тавараў, работ і паслуг, закупкі якіх ажыццяўляюцца шляхам правядзення аўкцыёну.

9. На таварнай біржы могуць ажыццяўляцца закупкі біржавых тавараў (у тым ліку тавараў, прадугледжаных дадаткам № 4 да гэтага Пратакола).

Дзяржава-член мае права ў сваім заканадаўстве вызначаць таварныя біржы, на якіх могуць ажыццяўляцца закупкі.

10. Закупкі з адной крыніцы альбо ў адзінага пастаўшчыка (выканаўцы, падрадчыка) ажыццяўляюцца з улікам патрабаванняў, названых у пункце 10 дадатку № 1 да гэтага Пратакола, у выпадках, прадугледжаных дадаткам № 3 да гэтага Пратакола.

Дзяржава-член мае права скараціць у сваім заканадаўстве аб закупках пералік тавараў, работ і паслуг, прадугледжаны дадаткам № 3 да сапраўднага Пратакола

11. Дзяржава-член мае права ў сваім заканадаўстве аб закупках устанавіць асаблівасці ажыццяўлення закупак, звязаныя з неабходнасцю захавання канфідэнцыйнасці інфармацыі аб патэнцыяльных пастаўшчыках да заканчэння правядзення закупкі, а таксама ў выключных выпадках на тэрмін не больш за 2 гады – асаблівасці ажыццяўлення закупак асобных відаў тавараў, работ і паслуг.

Рашэнні і дзеянні ў адносінах да ўстанаўлення такіх асаблівасцяў прымаюцца ў парадку, які прадугледжаны пунктамі 32 – 33 гэтага Пратакола.

12. Закупкі ажыццяўляюцца заказчыкам самастойна або з удзелам арганізатара закупак (у выпадку калі заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках прадугледжана функцыянаванне арганізатара закупак).

13. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках павінна быць прадугледжана фарміраванне і вядзенне рэестра нядобрасумленных пастаўшчыкоў, у які ўключаюцца звесткі:

аб патэнцыяльных пастаўшчыках, якія ўхіліліся ад заключэння дагавораў (кантрактаў) аб закупках;

аб пастаўшчыках, не выканаўшых або неналежным чынам выканаўшых свае абавязацельствы па заключаных з імі дагаворах (кантрактах) аб закупках;

аб пастаўшчыках, з якімі заказчыкі ў аднабаковым парадку скасавалі дагаворы (кантракты) аб закупках, у ходзе выканання якіх ўстаноўлена, што пастаўшчык не адпавядае ўстаноўленым дакументацыяй аб закупцы патрабаванням да патэнцыяльных пастаўшчыкоў, пастаўшчыкоў або падаў недакладную інфармацыю аб сваёй адпаведнасці такім патрабаванням, што дазволіла яму стаць пераможцам працэдуры закупкі, па выніках якой заключаны такі дагавор.

Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжана ўключэнне ў рэестр нядобрасумленных пастаўшчыкоў звестак аб заснавальніках, членах калегіяльных выканаўчых органаў, асобах, якія выконваюць функцыі аднаасобнага выканаўчага органа асобы, якая ўключана у такі рэестр.

Уключэнне ў рэестр нядобрасумленных пастаўшчыкоў ажыццяўляецца на 2 гады пры пацверджанні звестак (устанаўленні фактаў), прадугледжаных абзацамі другім – чацвёртым гэтага пункта, на падставе рашэння суда і (або) упаўнаважаных рэгулюючага і кантралюючага органа ўлады дзяржавы-члена ў сферы закупак.

Асоба, звесткі аб якой уключаны ў рэестр нядобрасумленных пастаўшчыкоў, мае права абскардзіць уключэнне ў гэты рэестр у судовым парадку.

Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках могуць быць прадугледжаны выключэнні ў частцы, што датычыцца ўключэння ў рэестр нядобрасумленных пастаўшчыкоў патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў, вызначаных згодна з пунктамі 1 і 6 дадатка № 3 да гэтага Пратакола.

14. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжана права ці абавязак заказчыка ажыццяўляць допуск да ўдзелу ў закупцы зыходзячы са звестак, якія змяшчаюцца ў рэестры нядобрасумленных пастаўшчыкоў гэтай дзяржавы-члена і (або) у рэестрах нядобрасумленных пастаўшчыкоў іншых дзяржаў-членаў.

15. Дзяржавы-члены абмяжоўваюць допуск да ўдзелу ў закупках:

1) шляхам устанаўлення ў адпаведнасці са сваім заканадаўствам аб закупках дадатковых кваліфікацыйных патрабаванняў да патэнцыяльных пастаўшчыкоў пры закупцы асобных відаў тавараў, работ і паслуг;

2) у іншых выпадках, устаноўленых гэтым Пратаколам.

16. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках устанаўліваецца забарона:

1) на ўключэнне ва ўмовы закупак любых невымяраемых колькасна і (або) не ўстаноўленых адміністратыўна патрабаванняў да патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў;

2) на допуск да ўдзелу ў закупках патэнцыяльных пастаўшчыкоў, якія не адпавядаюць патрабаванням дакументацыі аб закупках;

3) на адмову патэнцыяльным пастаўшчыкам у допуску да ўдзелу ў закупцы па падставах, не прадугледжаных паведамленнем аб правядзенні закупкі і (або) дакументацыяй аб закупцы.

17. Не дапускаецца спагнанне з патэнцыяльных пастаўшчыкоў платы за ўдзел у закупках, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

18. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках могуць устанаўлівацца патрабаванні да патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў аб забеспячэнні заяўкі на ўдзел у закупках, а таксама аб забеспячэнні выканання дагавора (кантракта) аб закупцы.

Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках вызначаецца памер і формы забеспячэння заяўкі на ўдзел у закупцы, а таксама забеспячэння выканання дагавора (кантракта) аб закупцы. Пры гэтым памер забеспячэння заяўкі на ўдзел у закупцы не павінен перавышаць 5 працэнтаў пачатковай (максімальнай) цаны дагавора (кантракта) аб закупцы (арыенціровачнай цаны закупкі), а забеспячэнне выканання дагавора (кантракта) аб закупцы – 30 працэнтаў пачатковай (максімальнай) цаны дагавора (кантракта) аб закупцы (арыенціровачнай цаны закупкі), за выключэннем выпадку, калі дагаворам (кантрактам) аб закупцы прадугледжана выплата аванса. У гэтым выпадку памер забеспячэння выканання дагавора (кантракта) аб закупцы павінен складаць не менш за 50 працэнтаў памеру аванса.

У выпадку, калі дагавор (кантракт) аб закупцы змяшчае патрабаванне аб прадастаўленні пастаўшчыку авансу, пастаўшчык мае права ад яго адмовіцца.

Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках павінна быць устаноўлена не менш за 2 віды забеспячэння заяўкі на ўдзел у закупцы і забеспячэння выканання дагавора (кантракта) аб закупцы.

Пры гэтым у якасці забеспячэння заяўкі на ўдзел у закупцы і забеспячэння выканання дагавора (кантракта) аб закупцы прымаюцца у тым ліку:

гарантыйны грашовы ўзнос, які ўносіцца на банкаўскі рахунак заказчыка, або, у выпадку калі гэта вызначана заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, арганізатара закупак, аператара электроннай гандлёвай пляцоўкі (электроннай пляцоўкі);

банкаўская гарантыя.

Патрабаванні да банкаўскіх гарантый для мэт закупак устанаўліваюцца заканадаўствам дзяржавы-члена.

Заканадаўства дзяржавы-члена аб закупках павінна забяспечваць своечасовы зварот забеспячэння заяўкі на ўдзел у закупцы і забеспячэння выканання дагавора (кантракта) аб закупцы патэнцыяльным пастаўшчыкам і пастаўшчыкам ў выпадках, прадугледжаных такім заканадаўствам.

19. У дакументацыю аб закупцы і іншыя дакументы пры правядзенні закупак не ўключаюцца патрабаванні ці ўказанні на таварныя знакі, знакі абслугоўвання, фірменныя назвы, патэнты, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, назвы месца паходжання тавару, вытворцы або пастаўшчыка, за выключэннем выпадкаў, калі няма іншага дастаткова дакладнага спосабу апісання характарыстык прадмета закупкі (у такіх выпадках заказчык уключае ў дакументацыю аб закупцы словы «або эквівалент (аналаг)»).

Выключэннем з'яўляецца несумяшчальнасць набываемага тавару з таварам, выкарыстоўваемым заказчыкам пры неабходнасці забеспячэння сумяшчальнасці такіх тавараў (у тым ліку для даўкамплектавання, мадэрнізацыі і дааснашчэння асноўнага (устаноўленага) абсталявання).

Заказчык мае права вызначаць стандартныя паказчыкі, патрабаванні, умоўныя абазначэнні і тэрміналогію, якія тычацца тэхнічных і якасных характарыстык прадмета закупкі, у адпаведнасці з тэхнічнымі рэгламентамі, стандартамі і іншымі патрабаваннямі, прадугледжанымі міжнароднымі дамовамі і актамі, якія складаюць права Саюза, і (або) заканадаўствам дзяржавы-члена.

20. Членамі камісіі (у тым ліку конкурснай, аўкцыённай і катыровачнай) не могуць быць фізічныя асобы, асабіста зацікаўленыя ў выніках закупак (у тым ліку фізічныя асобы, якія падалі заяўкі на ўдзел у конкурсе, аўкцыёне, запыце цэнавых прапаноў (запыце катыровак) або запыце прапаноў), работнікі патэнцыяльных пастаўшчыкоў, якія падалі заяўкі на ўдзел у конкурсе, аўкцыёне, запыце цэнавых прапаноў (запыце катыровак) або запыце прапаноў, альбо фізічныя асобы, на якіх здольныя аказваць уплыў патэнцыяльныя пастаўшчыкі (у тым ліку фізічныя асобы, якія з`яўляюцца ўдзельнікамі (акцыянерамі) патэнцыяльных пастаўшчыкоў, работнікамі іх органаў кіравання і крэдыторамі патэнцыяльных пастаўшчыкоў), а таксама непасрэдна ажыццяўляючыя кантроль у сферы закупак службовыя асобы ўпаўнаважаных рэгулюючых і (або) кантралюючых органаў улады дзяржавы-члена ў сферы закупак.

21. Дагавор (кантракт) аб закупцы павінен змяшчаць наступныя абавязковыя ўмовы:

1) адказнасць бакоў за невыкананне або неналежнае выкананне прадугледжаных такім дагаворам (кантрактам) аб закупцы абавязацельстваў;

2) парадак аплаты, а таксама ажыццяўлення заказчыкам прыёмкі выніку закупкі для ацэнкі яго адпаведнасці (у тым ліку па колькасці (аб'ёму), камплектнасці, якасці) патрабаванням, устаноўленым дагаворам (кантрактам) аб закупцы.

22. У заканадаўстве дзяржавы-члена аб закупках павінна быць прадугледжана забарона:

1) на ўстанаўленне ўмоў дагавора (кантракта) аб закупцы, якія цягнуць за сабой абмежаванне колькасці патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў у выпадках, якія не прадугледжаны заканадаўствам дзяржавы-члена;

2) на аднабаковую адмову заказчыкаў і пастаўшчыкоў ад выканання дагаварных абавязацельстваў у выпадку належнага выканання іншым бокам абавязацельстваў па дагавору (кантракту) аб закупцы і ў выпадках, якія не прадугледжаны такім заканадаўствам;

3) на змяненне ўмоў выканання дагаварных абавязацельстваў, у тым ліку змяненне цаны дагавора (кантракта) аб закупцы, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных такім заканадаўствам. Не дапускаецца змяншэнне колькасці тавараў, аб'ёму работ і паслуг без прапарцыянальнага зніжэння цаны дагавора (кантракта) аб закупцы.

23. Дапускаецца заключэнне дагавора (кантракта) аб закупцы з некалькімі пастаўшчыкамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена.

24. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць ўстаноўлена патрабаванне аб заключэнні дагавора (кантракта) аб закупцы, які прадугледжвае закупку тавару або работы, наступныя абслугоўванне, эксплуатацыю на працягу тэрміну службы, рамонт і

ўтылізацыю пастаўленага тавару ці створанага ў выніку выканання работы аб'екта (дагавор (кантракт) жыццёвага цыклу).

25. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках у дачыненні да канкрэтных закупак можа быць прадугледжана неабходнасць уключэння ў праект дагавора (кантракта) аб закупцы, які з`яўляецца неад`емнай часткай дакументацыі аб закупцы, дадатковых умоў яго выканання (у тым ліку не звязаных з прадметам закупкі).

26. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжаны абавязак патэнцыяльнага пастаўшчыка і (або) пастаўшчыка прадаставіць заказчыку інфармацыю аб усіх сувыканаўцах і субпадрадчыках па дагавору (кантракту) аб закупцы.

27. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжана банкаўскае суправаджэнне дагавора (кантракта) аб закупцы.

28. Дзяржавы-члены імкнуцца да перахода да 2016 года да заключэння дагавораў (кантрактаў) аб закупках у электронным фармаце.

29. Дзяржавы-члены забяспечваюць інфармацыйную адкрытасць і празрыстасць закупак, у тым ліку праз:

1) стварэнне кожнай дзяржавай-членам вэб-партала;

2) публікацыю (размяшчэнне) на вэб-партале інфармацыі аб закупках, рэестра нядобрасумленных пастаўшчыкоў (у тым ліку на рускай мове);

3) публікацыю (размяшчэнне) на вэб-партале нарматыўных прававых актаў дзяржавы-члена ў сферы закупак (у тым ліку на рускай мове);

4) вызначэнне абмежаванай колькасці электронных гандлёвых пляцовак (электронных пляцовак) і (або) вэб-партала ў якасці адзінага месца доступу да інфармацыі аб закупках у электронным фармаце і да

электронных паслуг, звязаных з такімі закупкамі, у выпадку калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках;

5) арганізацыю бесперашкоднага і бясплатнага доступу да інфармацыі аб закупках, рэестру нядобрасумленных пастаўшчыкоў і нарматыўных прававых актаў дзяржавы-члена ў сферы закупак, якія публікуюцца (размяшчаюцца) на вэб-партале, а таксама забеспячэнне максімальна шырокага пошуку звестак па такой інфармацыі, рэестру і актам.

III. Нацыянальны рэжым і асаблівасці яго забеспячэння

30. Кожная з дзяржаў-членаў забяспечвае ў адносінах да тавараў, работ і паслуг, якія паходзяць з тэрыторый іншых дзяржаў-членаў, а таксама ў дачыненні да патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў іншых дзяржаў-членаў, якія прапануюць такія тавары, работы і паслугі, нацыянальны рэжым у сферы закупак.

31. Дзяржава-член мае права ў аднабаковым парадку, устаноўленым сваім заканадаўствам аб закупках, устанавіць у выключных выпадках выключэнні з нацыянальнага рэжыму на тэрмін не больш за 2 гады.

32. Упаўнаважаны рэгулюючы і (або) кантралюючы орган улады дзяржавы-члена ў сферы закупак загадзя, але не пазней за 15 каляндарных дзён да даты прыняцця акта аб устанаўленні выключэнняў у адпаведнасці з пунктам 31 гэтага Пратакола, у пісьмовай форме накіроўвае паведамленне ў Камісію і кожную з дзяржаў-членаў аб намеры прыняцця такога акту з абгрунтаваннем неабходнасці яго прыняцця.

Дзяржава-член, якая атрымала такое паведамленне, можа звярнуцца ў орган, які яго накіраваў, з прапановай аб правядзенні адпаведных кансультацый.

Дзяржава-член, якая накіроўвала прызначанае паведамленне, не можа адмовіць у правядзенні кансультацый.

33. Камісія мае права прыняць рашэнне аб неабходнасці адмены акта аб устанаўленні выключэнняў, прынятага дзяржавай-членам у адпаведнасці з пунктам 31 гэтага Пратакола, на працягу 1 года з даты яго прыняцця.

У выпадку прыняцця Камісіяй рашэння аб неабходнасці адмены названага акту прыняўшая яго дзяржава-член забяспечвае ў 2 месячны тэрмін унясенне адпаведных змяненняў у такі акт (прызнанне яго страціўшым сілу).

Разгляд Камісіяй паведамленняў аб намеры прыняцця актаў у адпаведнасці з пунктам 31 гэтага Пратакола і зваротаў дзяржаў-членаў па пытаннях іх адмены, а таксама прыняцце Камісіяй рашэнняў аб неабходнасці адмены такіх актаў ажыццяўляецца ў парадку, які вызначаецца Камісіяй.

У выпадку калі па заканчэнні 2 месяцаў з даты ўступлення ў сілу рашэння Камісіі аб неабходнасці адмены акта, прынятага ў адпаведнасці з пунктам 31 гэтага Пратакола, дзяржава-член, у дачыненні да якой вынесена такое рашэнне, не выканае яго, кожная з іншых дзяржаў-членаў у аднабаковым парадку мае права не распаўсюджваць нацыянальны рэжым на такую дзяржаву-члена. Паведамленне аб гэтым неадкладна накіроўваецца ў Камісію і кожнай з дзяржаў-членаў.

34. У выпадку, калі дзяржава-член не выканае абавязацельствы, прадугледжаныя раздзелам XXII Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і гэтым Пратаколам, іншыя дзяржавы-члены

маюць права звярнуцца ў Камісію. Па выніках разгляду звароту Камісія прымае адно з наступных рашэнняў:

аб адсутнасці факту парушэння;

аб прызнанні факта парушэння і неабходнасці ліквідавання дзяржавай-членам выяўленага парушэння.

У выпадку калі па заканчэнні 2 месяцаў з дня прыняцця рашэння аб неабходнасці ліквідавання выяўленага парушэння, дзяржава-член, у дачыненні да якой вынесена такое рашэнне, не выканае яго, кожная з іншых дзяржаў-членаў у аднабаковым парадку мае права не распаўсюджваць нацыянальны рэжым на такую дзяржаву-члена.

Паведамленне аб гэтым неадкладна накіроўваецца ў Камісію і кожнай з дзяржаў-членаў.

IV. Забеспячэнне правоў і законных інтарэсаў асоб пры ўдзеле ў закупках

35. Кожная з дзяржаў-членаў прымае меры па папярэджванню, выяўленню і спыненню парушэнняў свайго заканадаўства аб закупках.

36. Аб'ём забяспечваемых правоў і законных інтарэсаў асоб у сферы закупак вызначаецца раздзелам XXII Дагавора, гэтым Пратаколам і заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

37. У мэтах забеспячэння правоў і законных інтарэсаў асоб у сферы закупак, а таксама ажыццяўлення кантролю за выкананнем заканадаўства дзяржавы-члена аб закупках кожная з дзяржаў-членаў у адпаведнасці са сваім заканадаўствам забяспечвае наяўнасць упаўнаважаных рэгулюючых і (або) кантралюючых органаў улады ў сферы закупак. Пры гэтым дапускаецца выкананне гэтых функцый адным органам, да кампетэнцыі якога адносіцца ў тым ліку:

1) ажыццяўленне кантролю ў сферы закупак (у тым ліку шляхам правядзення праверак);

2) разгляд скаргаў і зваротаў у дачыненні да рашэнняў і дзеянняў (бяздзейнасці) заказчыкаў, арганізатараў закупак, аператараў электронных гандлёвых пляцовак (электронных пляцовак), аператараў вэб-парталаў, таварных біржаў, камісій і іншых асоб пры ажыццяўленні закупак, якія парушаюць заканадаўства дзяржавы-члена аб закупках. Пры гэтым дзеянні (бяздзейнасць) заказчыкаў, арганізатараў закупак, аператараў электронных гандлёвых пляцовак (электронных пляцовак), аператараў вэб-парталаў, таварных біржаў, камісій і іншых асоб пры ажыццяўленні закупак, прынятыя (учыненыя) да заканчэння тэрміну падачы заявак на ўдзел у закупцы, мае права абскардзіць не толькі любы патэнцыяльны пастаўшчык, але і іншая асоба ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках;

3) папярэджванне і выяўленне парушэнняў заканадаўства дзяржавы-члена аб закупках, а таксама прыняцце мер па ліквідацыі такіх парушэнняў (у тым ліку шляхам выдачы абавязковага для выканання прадпісання аб ліквідацыі такіх парушэнняў і прыцягнення вінаватых асоб да адказнасці за такія парушэнні);

4) фарміраванне і вядзенне рэестра нядобрасумленных пастаўшчыкоў.

V. Забеспячэнне мер, якія павышаюць эфектыўнасць закупак і накіраваны на рэалізацыю сацыяльных функцый

38. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках устанаўліваецца патрабаванне аб планаванні закупак.

39. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках могуць быць прадугледжаны наступныя нормы, якія павышаюць эфектыўнасць закупак:

1) нарміраванне закупак шляхам ўстанаўлення патрабаванняў да закупаемых тавараў, работ і паслуг (у тым ліку да гранічнай цаны тавараў, работ і паслуг) і (або) нарматыўных выдаткаў на забеспячэнне функцый заказчыкаў;

2) ажыццяўленне грамадскага кантролю і грамадскага абмеркавання закупак;

3) прымяненне антыдэмпінгавых мер;

4) прыцягненне экспертаў, экспертных арганізацый.

40. У выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, могуць устанаўлівацца перавагі для ўстаноў і прадпрыемстваў крымінальна-выканаўчай сістэмы, арганізацый інвалідаў, суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, а таксама сацыяльна арыентаваных некамерцыйных арганізацый.

Інфармацыя аб такіх перавагах указваецца заказчыкам у паведамленні аб правядзенні закупкі і дакументацыі аб закупцы.

41. Для абмеркавання найбольш актуальных пытанняў правапрымяняльнай практыкі, абмену інфармацыяй, удасканалення і гарманізацыі заканадаўства, сумеснай распрацоўкі метадычных матэрыялаў у сферы закупак Камісія сумесна з упаўнаважанымі рэгулюючымі і (або) кантралюючымі органамі ўлады дзяржаў-членаў у сферы закупак праводзіць не меньш 3 раз у год нарады на ўзроўні кіраўнікоў і экспертаў.

Дадатак № 1
да Пратакола аб парадку
рэгулявання закупак

Патрабаванні
да арганізацыі і правядзення
конкурсу, запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак),
запыту прапаноў, аўкцыёну і закупкі з адной крыніцы альбо ў
адзінага пастаўшчыка (выканаўцы, падрадчыка)

1. Конкурс праводзіцца ў электронным фармаце, які прадугледжвае ў тым ліку падачу заявак на ўдзел у конкурсе ў форме электроннага дакумента.

Пераможцам конкурсу прызнаецца патэнцыяльны пастаўшчык, які прапанаваў лепшыя ўмовы выканання дагавора (кантракта) аб закупцы.

Не дапускаецца ўстанаўленне крытэрыяў ацэнкі, а таксама парадку ацэнкі і супастаўлення заявак на ўдзел у конкурсе, што цягнуць за сабой неаб`ектыўнае і (або) неадміністраванае вызначэнне пастаўшчыка, якое не адпавядае заканадаўству дзяржавы-члена аб закупках.

2. Конкурс праводзіцца з улікам наступных патрабаванняў:

1) зацвярджэнне конкурснай дакументацыі;

2) зацвярджэнне складу конкурснай камісіі;

3) публікацыя (размяшчэнне) на вэб-партале паведамлення аб правядзенні конкурсу і конкурснай дакументацыі ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, але не менш чым за 15 каляндарных дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у конкурсе. У выпадку ўнясення змяненняў у паведамленне

аб правядзенні конкурсу і (або) конкурсную дакументацыю тэрмін падачы заявак на ўдзел у конкурсе падаўжаецца такім чынам, каб з даты публікацыі (размяшчэння) на вэб-партале ўнесеных змяненняў да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у конкурсе гэты тэрмін складаў не менш за 10 каляндарных дзён. Пры гэтым не дапускаецца змяненне прадмета дагавора (кантракта) аб закупцы;

4) тлумачэнне палажэнняў конкурснай дакументацыі і публікацыя (размяшчэнне) такіх тлумачэнняў на вэб-партале не пазней чым за 3 каляндарныя дні да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у конкурсе. Тлумачэнне палажэнняў конкурснай дакументацыі па запыце ажыццяўляецца ў выпадку яго атрымання не пазней чым за 5 каляндарных дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у конкурсе;

5) падача заявак на ўдзел у конкурсе ў форме электроннага дакумента на электронную гандлёвую пляцоўку (электронную пляцоўку) і (або) вэб-партал;

6) адкрыццё, разгляд конкурснай камісіяй заявак на ўдзел у конкурсе для вызначэння заявак, якія адпавядаюць патрабаванням конкурснай дакументацыі, у мэтах допуску патэнцыяльных пастаўшчыкоў да ўдзелу ў конкурсе;

7) публікацыя (размяшчэнне) на вэб-партале пратаколаў адкрыцця, разгляду заявак на ўдзел у конкурсе і допуску патэнцыяльных пастаўшчыкоў да ўдзелу ў конкурсе і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках такіх адкрыцця, разгляду і допуску не пазней за дзень, які ідзе за днём прыняцця конкурснай камісіяй адпаведных рашэнняў;

8) ацэнка, супастаўленне заявак на ўдзел у конкурсе, прадстаўленых патэнцыяльнымі пастаўшчыкамі, лапушчанымі ла

ўдзелу ў конкурсе, а таксама вызначэнне пераможцы конкурсу і публікацыя (размяшчэнне) на вэб-партале адпаведнага пратакола, інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках такіх ацэнак, супастаўлення і вызначэння пераможцы конкурсу не пазней за дзень, які ідзе за днём прыняцця конкурснай камісіяй адпаведных рашэнняў;

9) заключэнне дагавора (кантракта) аб закупцы на ўмовах, указаных у заяўцы на ўдзел у конкурсе патэнцыяльнага пастаўшчыка, вызначанага пераможцам конкурсу, і ў конкурснай дакументацыі не раней за 10 каляндарных або рабочых дзён і не пазней 30 каляндарных дзён з даты прыняцця рашэння аб вызначэнні пераможцы конкурсу або прызнання конкурсу не адбыўшымся ў выпадках, вызначаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках таксама ўстанаўліваюцца парадак і чарговасць заключэння дагавора (кантракта) аб закупцы паміж заказчыкам і патэнцыяльным пастаўшчыком зыходзячы з неабходнасці заключэння дагавора (кантракта) аб закупцы з патэнцыяльным пастаўшчыком, які прапанаваў лепшыя ўмовы выканання дагавора (кантракта) аб закупцы, а таксама парадак дзеянняў заказчыка ў выпадку прызнання конкурсу не адбыўшымся;

10) публікацыя (размяшчэнне) звестак пра вынік конкурсу на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках конкурсу не пазней за дзень, які ідзе за днём прыняцця конкурснай камісіяй адпаведных рашэнняў.

3. Пры правядзенні конкурсу, які прадугледжвае папярэдні кваліфікацыйны адбор, прымяняюцца патрабаванні, названыя ў пунктах 1 і 2 гэтага Дадатку з улікам наступных асаблівасцяў:

1) пераможца конкурсу вызначаецца з ліку патэнцыяльных пастаўшчыкоў, якія прайшлі папярэдні кваліфікацыйны адбор;

2) дадатковыя патрабаванні прымяняюцца да патэнцыяльных пастаўшчыкоў і пастаўшчыкоў для ажыццяўлення папярэдняга кваліфікацыйнага адбору і не могуць выкарыстоўвацца ў якасці крытэрыю ацэнкі і параўнання заявак на ўдзел у конкурсе.

4. У выпадках і парадку, вызначаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, конкурс можа правадзіцца з выкарыстаннем двухэтапных працэдур.

На першым этапе конкурсу з выкарыстаннем двухэтапных працэдур праводзяцца мерапрыемствы па фарміраванню экспертам (экспертнай камісіяй) тэхнічнай спецыфікацыі тавараў, работ і паслуг, якія закупляюцца на аснове тэхнічных прапаноў патэнцыяльных пастаўшчыкоў, распрацаваных у адпаведнасці з тэхнічным заданнем заказчыка.

На другім этапе конкурсу з выкарыстаннем двухэтапных працэдур праводзяцца мерапрыемствы, прадугледжаныя для правядзення конкурсу з улікам патрабаванняў, прызначаных у пунктах 1 і 2 гэтага Дадатку.

5. Для правядзення запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак) заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках вызначаецца гранічная пачатковая (максімальная) цана дагавора (кантракта) аб закупцы (арыенціровачная цана закупкі), у тым ліку пры закупцы тавараў, работ і паслуг па пераліку згодна з дадаткамі № 2 і 4 да Пратакола аб парадку рэгулявання закупак (дадатак № 25 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе).

Пераможцам запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак) прызнаецца патэнцыяльны пастаўшчык, які прапанаваў найменшую цану дагавора (кантракта) аб закупцы.

Любая з дзяржаў-членаў імкнецца да пераходу ад правядзення запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак) пераважна да правядзення аўкцыёнаў.

Пры правядзенні закупкі спосабам запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак) на вэб-партале публікуецца (размяшчаецца) паведамленне аб яго правядзенні ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, але не менш чым за 4 рабочыя дні да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у запыце цэнавых прапаноў (запыце катыровак).

Пратаколы камісіі, складзеныя ў ходзе правядзення запыту цэнавых прапаноў (запыту катыровак), публікуюцца (размяшчаюцца) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале, і паведамленні аб прынятых каціровачнай камісіяй рашэннях накіроўваюцца кожнаму патэнцыяльнаму пастаўшчыку не пазней дня, наступнага за днём іх прыняцця.

6. Закупкі шляхам правядзення запыту прапаноў могуць ажыццяўляцца ў адносінах да тавараў, работ і паслуг, прадугледжаных дадаткам № 2 да Пратакола аб парадку рэгулявання закупак (дадатак № 25 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе).

Пераможцам запыту прапаноў прызнаецца патэнцыяльны пастаўшчык, які прапанаваў лепшыя ўмовы выканання дагавора (кантракта) аб закупцы ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

Пры правядзенні закупкі шляхам правядзення запыту прапаноў на вэб-партале публікуецца (размяшчаецца) паведамленне аб яго правядзенні ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, але не менш чым за 5 рабочых дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у запыце прапаноў.

Пратаколы камісіі, складзеныя ў ходзе правядзення запыту прапаноў, публікуюцца (размяшчаюцца) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале, і паведамленні аб прынятых камісіяй рашэннях накіроўваюцца кожнаму патэнцыяльнаму пастаўшчыку не пазней дня, які ідзе за днём іх прыняцця.

7. У мэтах удзелу ў аўкцыёнах патэнцыяльныя пастаўшчыкі падлягаюць абавязковай акрэдытацыі не менш чым на 3 гады на вэб-партале і (або) электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы), калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

Пераможцам аўкцыёну прызнаецца патэнцыяльны пастаўшчык, які прапанаваў найменшую цану дагавора (кантракта) аб закупцы і адпавядае патрабаванням дакументацыі аб аўкцыёне.

8. Аўкцыён праводзіцца з улікам наступных патрабаванняў:

1) зацвярджэнне дакументацыі аб аўкцыёне;

2) зацвярджэнне складу аўкцыённай камісіі;

3) публікацыя (размяшчэнне) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале паведамлення аб правядзенні аўкцыёну і дакументацыі аб аўкцыёне ў тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, але не менш чым за 15 каляндарных дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне. У выпадку ўнясення змяненняў у паведамленне аб правядзенні аўкцыёну і (або) дакументацыю аб аўкцыёне тэрмін падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне падаўжаецца такім чынам, каб з даты публікацыі (размяшчэння) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале ўнесеных змен да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне гэты тэрмін складаў не менш як 7 каляндарных дзён. Пры гэтым не дапускаецца змяненне

прадмета дагавора (кантракта) аб закупцы. У выпадку, калі заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках прадугледжана пачатковая (максімальная) цана дагавора (кантракта) аб закупцы (арыенціровачная цана закупкі), пры якім магчыма правядзенне аўкцыёну ў скарочаныя тэрміны, заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках могуць быць устаноўлены больш кароткія тэрміны для падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне, чым прадугледжаныя гэтым падпунктам, але не менш чым 7 каляндарных дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне, а ў выпадку ўнясення змяненняў у дакументацыю аб аўкцыёне-не менш чым 3 каляндарныя дні да даты заканчэння падачы заявак на удзел у аўкцыёне з даты апублікавання (размяшчэння) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале такіх змен;

4) тлумачэнне палажэнняў дакументацыі аб аўкцыёне і публікацыя (размяшчэнне) такіх тлумачэнняў на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале не пазней чым за 3 каляндарныя дні да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне. Тлумачэнне палажэнняў дакументацыі аб аўкцыёне па запыце ажыццяўляецца ў выпадку яго атрымання не пазней чым за 5 каляндарных дзён да даты заканчэння падачы заявак на ўдзел у аўкцыёне;

5) падача заявак на ўдзел у аўкцыёне ў форме электроннага дакумента на электронную гандлёвую пляцоўку (электронную пляцоўку) або вэб-партал;

6) адкрыццё і разгляд аўкцыённай камісіяй заявак на ўдзел у аўкцыёне для вызначэння заявак, якія адпавядаюць патрабаванням дакументацыі аб аўкцыёне ў частцы допуску прадставіўшых іх патэнцыяльных пастаўшчыкоў да працэдуры, названай у падпункце 8 гэтага пункта;

7) публікацыя (размяшчэнне) на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале пратаколаў адкрыцця, разгляду заявак на ўдзел у аўкцыёне і допуску патэнцыяльных пастаўшчыкоў да працэдуры, названай у падпункце 8 гэтага пункта, і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках такіх адкрыцця, разгляду і допуску не пазней дня, які ідзе за днём прыняцця аукцыённай камісіяй адпаведных рашэнняў;

8) правядзенне працэдуры зніжэння пачатковай (максімальнай) цаны дагавора (кантракта) аб закупцы (арыентыровачнай цаны закупкі) шляхам аўкцыёну на паніжэнне цаны. Пры гэтым заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках можа быць прадугледжана, што ў выпадку зніжэння цаны дагавора (кантракта) аб закупцы да 0,5 працэнта (пачатковай (максімальнай) цаны дагавора (кантракта) аб закупцы (арыентыровачнагй цаны закупкі) і ніжэй, аўкцыён працягваецца шляхам павышэння цаны дагавора (кантракта) аб закупцы, якую ў такім выпадку аплачвае заказчыку пастаўшчык;

9) публікацыя (размяшчэнне) пратакола аб выніках працэдуры, названай у падпункце 8 гэтага пункта, на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках такой працэдуры ў дзень яе заканчэння;

10) разгляд аўкцыённай камісіяй заявак на ўдзел у аўкцыёне патэнцыяльных пастаўшчыкоў, якія прынялі ўдзел у працэдуры, названай у падпункце 8 гэтага пункта, для вызначэння патэнцыяльных пастаўшчыкоў, якія адпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным дакументацыяй аб аўкцыёне, і вызначэнне пераможцы аўкцыёну, а таксама публікацыя (размяшчэнне) пратакола пра гэта на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках

разгляду і вызначэння пераможцы аўкцыёну не пазней дня, які ідзе за днём прыняцця аўкцыённай камісіяй адпаведных рашэнняў;

11) заключэнне дагавора (кантракта) аб закупцы на ўмовах, указаных у заяўцы на ўдзел у аўкцыёне патэнцыяльнага пастаўшчыка, вызначанага пераможцам, і ў дакументацыі аб аўкцыёне, па цане дагавора (кантракта) аб закупцы такога патэнцыяльнага пастаўшчыка згодна з пратаколам аб выніках працэдуры, названай у падпункце 8 гэтага пункта, не раней 10 каляндарных або рабочых дзён і не пазней 30 каляндарных дзён з даты прыняцця рашэння аб вызначэнні пераможцы аўкцыёну або прызнання аўкцыёну не адбыўшымся ў выпадках, вызначаных заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках. Заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках устанаўліваюцца парадак і чарговасць заключэння дагавора (кантракта) аб закупцы паміж заказчыкам і патэнцыяльным пастаўшчыком зыходзячы з неабходнасці заключэння дагавора (кантракта) аб закупцы з патэнцыяльным пастаўшчыком, які прапанаваў найменшую цану дагавора (кантракта) аб закупцы, а таксама парадак дзеянняў заказчыка ў выпадку прызнання аўкцыёну не адбыўшымся;

12) публікацыя (размяшчэнне) звестак пра вынік аўкцыёну на электроннай гандлёвай пляцоўцы (электроннай пляцоўцы) і (або) вэб-партале і інфармаванне кожнага патэнцыяльнага пастаўшчыка аб выніках аўкцыёну не пазней дня, які ідзе за днём прыняцця аўкцыённай камісіяй адпаведных рашэнняў.

9. У выпадку, калі гэта прадугледжана заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках, дапускаецца ажыццяўленне закупак без прымянення норм, якія рэгламентуюць выбар пастаўшчыка і заключэнне з ім дагавора (кантракта) аб закупцы. Пры гэтым такія закупкі ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам дзяржавы-члена, у выпадках, прадугледжаных

дадаткам № 3 да Пратакола аб парадку рэгулявання закупак (дадатак № 25 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе).

10. Закупка з адной крыніцы альбо ў адзінага пастаўшчыка (падрадчыка, выканаўцы) ажыццяўляецца пры наяўнасці разліку і абгрунтавання цаны дагавора (кантракта) аб закупцы.

Патрабаванні да размяшчэння інфармацыі аб закупцы з адной крыніцы альбо ў адзінага пастаўшчыка (падрадчыка, выканаўцы) вызначаюцца заканадаўствам дзяржавы-члена аб закупках.

Дадатак № 2
да Пратакола аб парадку
рэгулявання закупак

Пералік
выпадкаў ажыццяўлення закупак шляхам
правядзення запыту прапаноў

1. Ажыццяўленне закупак тавараў, работ або паслуг, якія з'яўляюцца прадметам дагавора (кантракта) аб закупцы, скасаванне якога здзейснена заказчыкам з улікам патрабаванняў пункта 22 Пратакола аб парадку рэгулявання закупак (дадатак № 25 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе). Пры гэтым у выпадку, калі да скасавання дагавора (кантракта) аб закупцы пастаўшчык часткова выканаў абавязацельствы, прадугледжаныя дагаворам (кантрактам) аб закупцы, пры заключэнні новага дагавора (кантракта) аб закупцы на падставе сапраўднага пункта колькасць пастаўляемага тавару, аб'ём выкананай работы або аказваемай паслугі павінны быць зменшаны з улікам колькасці пастаўленага тавару, аб'ёму выкананай работы або аказанай паслугі па скасаванаму дагавору (кантракту) аб закупцы, а цана дагавора (кантракта) аб закупцы павінна быць зменшана прапарцыянальна колькасці пастаўленага тавару, аб'ёму выкананай работы або аказанай паслугі.

2. Ажыццяўленне закупак лекавых прэпаратаў, неабходных для прызначэння пацыенту пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў (індывідуальнае непрыманне, па жыццёвых паказаннях) па рашэнні ўрачэбнай камісіі, якое фіксуецца ў медыцынскіх дакументах пацыента і журнале ўрачэбнай камісіі. Пры гэтым аб'ём закупляемых лекавых прэпаратаў не павінен перавышаць аб'ём лекавых прэпаратаў,

неабходных пацыенту на працягу тэрміну лячэння. Акрамя таго, пры ажыццяўленні закупак у адпаведнасці з сапраўдным пунктам прадметам аднаго кантракта не могуць з`яўляцца лекавыя прэпараты, неабходныя для прызначэння двум і болей пацыентам.

Дадатак № 3
да Пратакола аб парадку
рэгулявання закупак

Пералік
выпадкаў ажыццяўлення закупак з адной крыніцы
альбо ў адзінага пастаўшчыка (выканаўцы, падрадчыка)

1. Закупкі паслуг, якія адносяцца да сферы дзейнасці натуральных манаполій, за выключэннем паслуг па рэалізацыі звадкаванага газу, а таксама падключэнне (далучэнне) да сетак інжынерна-тэхнічнага забеспячэння па рэгулюемых у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена цэнам (тарыфам), паслуг энергазабеспячэння або куплі-продажу электрычнай энергіі з гарантуючым пастаўшчыком электрычнай энергіі.

2. Закупкі паслуг па захоўванню і ўвозу (вывазу) наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.

3. Набыццё тавараў, работ і паслуг па цэнах (тарыфах), устаноўленых заканадаўствам дзяржавы-члена.

4. Пастаўка культурных каштоўнасцяў (у тым ліку музейных прадметаў і музейных калекцый, а таксама рэдкіх і каштоўных выданняў, рукапісаў, архіўных дакументаў, уключаючы копіі, якія маюць гістарычнае, мастацкае ці іншае культурнае значэнне), прызначаных для папаўнення дзяржаўных музейнага, бібліятэчнага, архіўнага фондаў , кіна-, фотафонда і іншых аналагічных фондаў.

5. Выкананне работы па мабілізацыйнай падрыхтоўцы.

6. Набыццё тавараў, работ і паслуг у канкрэтнай асобы, якая вызначана заканадаўчымі актамі дзяржавы-члена, а таксама набыццё тавараў, работ і паслуг, пастаўка, выкананне або аказанне якіх можа ажыццяўляцца выключна органамі выканаўчай улады ў адпаведнасці з

іх паўнамоцтвамі ці падведамнымі ім дзяржаўнымі ўстановамі, дзяржаўнымі (унітарнымі) прадпрыемствамі, юрыдычнымі асобамі, 100 працэнтаў галасуючых акцый (доляй ўдзелу) якіх належыць дзяржаве, адпаведныя паўнамоцтвы якіх устанаўліваюцца заканадаўчымі актамі дзяржавы-члена.

7. Набыццё пэўных тавараў, работ і паслуг з прычыны ўзнікнення абставін непераадольнай сілы, у тым ліку надзвычайнай сітуацыі (лакалізацыі і (або) ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый), аварыі, неабходнасці тэрміновага медыцынскага ўмяшання, у сувязі з чым ажыццяўленне закупак іншымі спосабамі, якія патрабуюць выдаткаў часу, немэтазгодна.

8. Набыццё тавараў, работ і паслуг у установ і прадпрыемстваў крымінальна-выканаўчай сістэмы, лячэбна-вытворчых (працоўных) прафілакторыяў і лячэбна-вытворчых (працоўных) майстэрняў, а таксама ў арганізацый, што ствараюцца грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў, у якіх колькасць інвалідаў складае не менш за 50 працэнтаў спісачнай колькасці працаўнікоў.

9. Набыццё установай, выконваючай пакаранні, сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых вырабаў для вытворчасці тавараў, работ і паслуг у мэтах працаўладкавання асуджаных на падставе дагавораў, заключаных з юрыдычнымі асобамі, пры ўмове, што набыццё названай установай такіх сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў, прадугледжаных гэтымі дамовамі.

10. Закупкі, якія па выніках працэдур закупак прызнаныя не адбыўшыміся (у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена).

11. Паслугі сувязі для патрэб нацыянальнай абароны і нацыянальнай бяспекі, а таксама забеспячэння правапарадку.

12. Вызначэнне гранічнай сумы здзелак (альбо гранічнага квартальнага ці гадавога аб'ёму), якая можа быць устаноўлена заканадаўствам дзяржавы-члена і пры якой дазваляецца ажыццяўляць закупкі з адной крыніцы альбо ў адзінага пастаўшчыка (выканаўцы, падрадчыка), пры гэтым названы памер не павінен насіць індывідуальны характар (дзяржавы-члены імкнуцца да мінімізацыі названага парога ў мэтах максімальнага пашырэння доступу патэнцыяльных пастаўшчыкоў да закупак).

13. Размяшчэнне заказу на пастаўку ўзбраення і ваеннай тэхнікі ў адзінага пастаўшчыка ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, а таксама набыццё работ, паслуг па рамонце (мадэрнізацыі) узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

14. Канкрэтная закупка ў патэнцыяльнага пастаўшчыка, вызначанага указам ці распараджэннем прэзідэнта дзяржавы-члена, распараджэннем вышэйшага органа выканаўчай улады дзяржавы-члена па рашэнні або даручэнні прэзідэнта дзяржавы-члена. Рашэнні і дзеянні ў дачыненні да прыняцця такіх актаў ажыццяўляюцца ў парадку, які прадугледжаны пунктамі 32 – 33 Пратакола аб парадку рэгулявання закупак (дадатак № 25 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе).

15. Набыццё твораў літаратуры і мастацтва пэўных аўтараў (за выключэннем набыцця кінапраектаў ў мэтах пракату), выкананняў канкрэтных выканаўцаў, фанаграм канкрэтных вытворцаў у выпадку калі адзінай асобе належаць выключныя правы на такія творы, выкананні і фанаграмы.

16. Падпіска на пэўныя перыядычныя друкаваныя і электронныя выданні, а таксама закупка друкаваных і электронных выданняў пэўных аўтараў, аказанне паслуг па прадастаўленні доступу да электронных выданняў для забеспячэння дзейнасці дзяржаўных і

муніцыпальных адукацыйных устаноў, дзяржаўных і муніцыпальных бібліятэк, дзяржаўных навуковых арганізацый у выдаўцоў такіх друкаваных і электронных выданняў у выпадку, калі названым выдаўцам належаць выключныя правы на выкарыстанне такіх выданняў.

17. Размяшчэнне заказу на наведванне заапарка, тэатра, кінатэатра, канцэрта, цырка, музея, выставы і спартыўнага мерапрыемства, а таксама заключэнне кантракту на аказанне паслуг па рэалізацыі ўваходных білетаў і абанементаў на наведванне тэатральна-відовішчных, культурна-асветных і відовішчна-забаўляльных мерапрыемстваў, экскурсійных білетаў і экскурсійных пуцёвак.

18. Набыццё матэрыялаў выстаў, семінараў, канферэнцый, нарад, форумаў, сімпозіумаў, трэнінгаў і аплата за ўдзел у названых мерапрыемствах, а таксама заключэнне кантракту на аказанне паслуг па ўдзелу ў мерапрыемстве, якое праводзіцца для патрэб некалькіх заказчыкаў, з пастаўшчыком (падрадчыкам, выканаўцам), вызначаным заказчыкам, які з'яўляецца арганізатарам такога мерапрыемства, у парадку, вызначаным заканадаўствам дзяржавы-члена.

19. Закупка выкладчыцкіх паслуг, а таксама паслуг экскурсавода (гіда) у фізічных асоб.

20. Размяшчэнне заказу тэатральна-відовішчнай арганізацыяй, музеем, клубнай установай, арганізацыяй кінематаграфіі, іншай арганізацыяй культуры, установай адукацыі ў сферы культуры, тэлерадыёвяшчальнай арганізацыяй у канкрэтнай фізічнай асобы або канкрэтных фізічных асоб – аўтара сцэнарыя, артыста-выканаўцы, балетмайстра, вядучага тэле- або радыёпраграмы, дызайнера, дырыжора, драматурга, дрэсіроўшчыка, кампазітара, канцэртмайстра, аўтара лібрэта, аператара кіна-, відэа-, гуказапісу, пісьменніка, паэта,

рэжысёра, рэпетытара, скульптара, харэографа, хормайстра, мастака і іншага творчага работніка на стварэнне або выкананне твораў літаратуры або мастацтва, а таксама ў канкрэтнай фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, альбо юрыдычнай асобы на выраб і пастаўку дэкарацый, сцэнічнай мэблі, сцэнічных касцюмаў (у тым ліку галаўных убораў і абутку) і неабходных для стварэння дэкарацый і касцюмаў матэрыялаў, а таксама тэатральнага рэквізіту, бутафорыі, грыму, вырабаў з валасоў, тэатральных лялек, неабходных для стварэння і (або) выканання твораў арганізацыямі, названымі ў гэтым пункце.

21. Закупка паслуг па аўтарскаму кантролю за распрацоўкай праектнай дакументацыі аб`ектаў капітальнага будаўніцтва, аўтарскаму нагляду за будаўніцтвам, рэканструкцыяй і капітальным рамонтам аб`ектаў капітальнага будаўніцтва адпаведнымі аўтарамі.

22. Размяшчэнне заказу на правядзенне тэхнічнага і аўтарскага нагляду за правядзеннем работ па захаванні аб`екта культурнай спадчыны (помніка гісторыі і культуры) народаў дзяржаў-членаў.

23. Закупка паслуг, звязаных з накіраваннем працаўніка ў службовую камандзіроўку, твараў, работ і паслуг, звязаных з прадстаўніцкімі выдаткамі, а таксама набыццё паслуг, звязаных з накіраваннем навучэнцаў, студэнтаў, аспірантаў для ўдзелу ў творчых спаборніцтвах (конкурсах, алімпіядах, фестывалях, гульнях), выставах, пленэрах, канферэнцыях, форумах, майстар-класах, стажыроўках, выканання вучэбных практычных заданняў, уключаючы праезд да месца правядзення названых мерапрыемстваў і назад, наём жылога памяшкання, транспартнае абслугоўванне, забеспячэнне харчаваннем.

24. Размяшчэнне заказу на аказанне паслуг, звязаных з забеспячэннем візітаў кіраўнікоў замежных дзяржаў, кіраўнікоў

урадаў замежных дзяржаў, кіраўнікоў міжнародных арганізацый, парламенцкіх дэлегацый, урадавых дэлегацый, дэлегацый замежных дзяржаў (гасцінічная, транспартнае абслугоўванне, эксплуатацыя камп`ютэрнага абсталявання, забеспячэнне харчаваннем).

25. Набыццё тавараў, работ і паслуг, неабходных для забеспячэння аховы і бяспекі прэзідэнта дзяржавы-члена, іншых ахоўных асоб і аб`ектаў, прызначаных для знаходжання ахоўных асоб (бытавое, гасцінічнае, транспартнае абслугоўванне, эксплуатацыя камп`ютэрнага абсталявання, забеспячэнне санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту, прадастаўленне бяспечнага харчавання), а таксама паслуг па фарміраванню відэаархіва і інфармацыйнаму абслугоўванню дзейнасці прэзідэнта дзяржавы-члена.

26. Закупка матэрыяльных каштоўнасцяў, што рэалізуюцца з дзяржаўнага і мабілізацыйнага матэрыяльных рэзерваў.

27. Узнікненне ў заказчыка, які ажыццявіў закупку ў пэўнага пастаўшчыка, патрэбы ў дадатковай колькасці адпаведных тавараў, пры гэтым колькасць дадаткова закупляемага тавару не можа перавышаць 10 працэнтаў колькасці тавараў, прадугледжанай кантрактам (цана адзінкі дадаткова пастаўляемага тавару павіненна вызначацца як дзель ад дзялення першапачатковай цаны кантракту на прадугледжаную ў кантракце колькасць такога тавару).

28. Ажыццяўленне закупкі паслуг па кіраванню шматкватэрным домам на падставе выбару ўласнікамі памяшканняў у шматкватэрным доме або органам мясцовага самакіравання ў адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам кіруючай арганізацыі, калі памяшканні ў шматкватэрным доме знаходзяцца ў прыватнай, дзяржаўнай або муніцыпальнай уласнасці.

29. Заключэнне кантракта дагавора (кантракта) аб закупцы, прадметам якога з`яўляецца набыццё будынка, пабудовы, збудавання,

памяшкання, якія маюць нежылое прызначэнне, вызначаных актам у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, а таксама арэнда будынка, пабудовы, памяшкання, якія маюць нежылое прызначэнне, закупкі паслуг па тэхнічнаму ўтрыманню, ахове і абслугоўванню арандаванага памяшкання, закупкі паслуг па тэхнічнаму ўтрыманню, ахове і абслугоўванню аднаго або некалькіх нежылых памяшканняў, перададзеных у бязвыплатнае карыстанне дзяржаўнаму або муніцыпальнаму заказчыку, у выпадку калі гэтыя паслугі аказваюцца іншай асобе ці асобам, якія карыстаюцца нежылымі памяшканнямі, якія знаходзяцца ў будынку, у якім размешчаны памяшканні, перададзеныя ў бязвыплатнае карыстанне і (або) у аператыўнае кіраванне.

30. Неабходнасць у ажыццяўленні закупак штодзённай і (або) штотыднёвай патрэбы на перыяд да падвядзення вынікаў закупак і ўступлення ў сілу дагавора (кантракта) аб закупцы, у выпадку калі такая закупка ажыццяўляецца на працягу першага месяца года па пераліку, устаноўленаму заканадаўствам дзяржавы-члена. У гэтым выпадку аб`ём закупкі не можа перавышаць колькасць тавараў, аб`ём работ і паслуг, неабходных для забеспячэння патрэбы заказчыка на працягу тэрміну правядзення закупкі, але не больш чым на 2 месяцы.

31. Набыццё тавараў, работ, паслуг для ажыццяўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці, следчых дзеянняў, органамі, упаўнаважанымі іх ажыццяўляць, для забеспячэння бяспекі асоб, якія падлягаюць дзяржаўнай абароне, у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, а таксама паслуг службовых асоб і спецыялістаў, якія валодаюць неабходнымі навукова-тэхнічнымі ці іншымі адмысловымі ведамі.

32. Набыццё права прыродакарыстання.

33. Набыццё паслуг па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі работнікаў за мяжой.

34. Набыццё паслуг рэйтынгавых агенцтваў, фінансавых паслуг.

35. Набыццё паслуг спецыялізаваных бібліятэк для сляпых і грамадзян са слабым зрокам.

36. Набыццё каштоўных папер і далей у статутным капітале (статутным фондзе) юрыдычных асоб.

37. Набыццё неабходных для правядзення ў дзяржаве-члене выбараў і рэферэндумаў тавараў, работ і паслуг па пераліку, які прадугледжаны заканадаўствам дзяржавы-члена.

38. Набыццё тавараў, работ і паслуг, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі дзяржавы-члена, па пераліку, які зацвярджаецца вышэйшым органам выканаўчай улады дзяржавы-члена, а таксама ў рамках рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, што фінансуюцца міжнароднымі арганізацыямі, членам якіх з'яўляецца дзяржава-член.

39. Заключэнне дагавора (кантракта) на закупку геадэзічнага, картаграфічнага, тапаграфічнага і гідраграфічнага забеспячэння дэлімітацыі, дэмаркацыі і праверкі праходжання лініі дзяржаўнай мяжы, а таксама дэлімітацыі марскіх прастор ў мэтах выканання міжнародных абавязацельстваў дзяржавы-члена.

40. Набыццё тавараў, работ і паслуг, звязаных з выкарыстаннем грашовых сродкаў грантаў, якія прадстаўляюцца вышэйшым органам выканаўчай улады дзяржавы-члена на бязвыплатнай аснове дзяржавамі, урадамі дзяржаў, міжнароднымі і дзяржаўнымі арганізацыямі, замежнымі няўрадавымі грамадскімі арганізацыямі і фондамі, дзейнасць якіх носіць дабрачынны і міжнародны характар, а таксама грашовых сродкаў, што выдзяляюцца на сафінансаванне

гэтых грантаў у выпадках, калі ў пагадненнях аб іх прадастаўленні прадугледжаны іншыя працэдуры набыцця тавараў, работ і паслуг.

41. Набыццё паслуг, звязаных з дзяржаўным адукацыйным заказам для фізічных асоб (у выпадку калі фізічная асоба самастойна выбрала адукацыйную арганізацыю).

42. Набыццё паслуг па лячэнню грамадзян дзяржаў-членаў за мяжой, а таксама паслуг па іх транспарціроўцы і суправаджэнню.

43. Набыццё тавараў і паслуг, якія з'яўляюцца аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці, у асобы, якая валодае выключнымі правамі ў дачыненні да набываемых тавараў і паслуг.

44. Набыццё тавараў, работ і паслуг замежнымі ўстановамі дзяржаў-членаў, адасобленымі падраздзяленнямі заказчыкаў, якія дзейнічаюць ад іх імя, для забеспячэння сваёй дзейнасці на тэрыторыі замежнай дзяржавы, а таксама для мэтаў міратворчых аперацый.

45. Набыццё паслуг па прадастаўленню інфармацыі міжнароднымі інфармацыйнымі арганізацыямі.

46. Набыццё тавараў, работ і паслуг, неабходных для ажыццяўлення манетарнай дзейнасці, а таксама дзейнасці па кіраванні нацыянальным фондам дзяржавы-члена і пенсійнымі актывамі.

47. Набыццё кансультацыйных і юрыдычных паслуг па абароне і прадстаўленню інтарэсаў дзяржавы або заказчыкаў у міжнародным арбітражы, міжнародным камерцыйным арбітражы і замежных судовых органах.

48. Набыццё паслуг па давернаму кіраванню маёмасцю ў асобы, вызначанай заканадаўствам дзяржавы-члена.

49. Набыццё паслуг па апрацоўцы дадзеных статыстычных назіранняў.

50. Набыццё маёмасці (актываў), што рэалізуецца на таргах (аўкцыёнах) судовымі выканаўцамі ў адпаведнасці з заканадаўствам

дзяржавы-члена аб выканаўчым вядзенні, якія праводзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена аб банкруцтве, зямельным заканадаўствам і пры прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці.

51. Набыццё паслуг, што аказваюцца адвакатамі асобам, вызваленым ад іх аплаты ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена.

52. Набыццё тавараў у дзяржаўны матэрыяльны рэзерв для аказання рэгулючага ўздзеяння на рынак у выпадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена.

53. Набыццё паслуг па захоўванню матэрыяльных каштоўнасцяў дзяржаўнага матэрыяльнага рэзерву.

54. Набыццё паслуг па падрыхтоўцы касманаўтаў і арганізацыі палётаў касманаўтаў у космас у выпадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, а таксама паслуг па праектаванню, зборцы і выпрабаваннях касмічных апаратаў.

55. Набыццё паслуг па рамонту авіяцыйнай тэхнікі на спецыялізаваных авіярамонтных прадпрыемствах.

56. Набыццё паслуг па вырабу дзяржаўных і ведамасных узнагарод і дакументаў да іх, нагруднага знака дэпутата заканадаўчага органа дзяржавы-члена і дакумента да яго, дзяржаўных клеймаў для паверкі, пашпартоў (у тым ліку службовых і дыпламатычных), пасведчання асобы грамадзяніна дзяржавы-члена, пасведчанне на права жыхарства іншаземца ў дзяржаве-члене, пасведчання асобы без грамадзянства, пасведчанняў аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, а таксама набыццё у пастаўшчыкоў, вызначаных вышэйшым органам выканаўчай улады дзяржавы-члена, друкаванай прадукцыі, якая патрабуе спецыяльнай ступені абароны, па пераліку, зацверджанаму вышэйшым органам выканаўчай ўлады дзяржавы-члена.

57. Закупка каштоўных металаў і каштоўных камянёў для папаўнення дзяржаўных фондаў каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

58. Набыццё паслуг па абавязковаму медыцынскаму агляду работнікаў, занятых на цяжкіх работах, работах са шкоднымі (асабліва шкоднымі) і (або) небяспечнымі ўмовамі працы, а таксама на работах, звязаных з павышанай небяспекай, машынамі і механізмамі.

59. Набыццё спартыўнага інвентара і абсталявання (забеспячэння), спартыўнай экіпіроўкі, неабходных для ўдзелу і (або) падрыхтоўкі спартыўных нацыянальных і зборных каманд дзяржавы-члена ў алімпійскіх, паралімпійскіх, Дэфлімпійскіх і іншых міжнародных спартыўных мерапрыемствах на падставе каляндарнага плана, зацверджанага органам дзяржаўнага кіравання, які ажыццяўляе рэгуляванне ў гэтай сферы.

60. Набыццё тавараў, работ і паслуг за кошт сродкаў, вылучаных з рэзерву прэзідэнта дзяржавы-члена або ўрада дзяржавы-члена на неадкладныя выдаткі, у выпадку ўзнікнення сітуацый, якія пагражаюць палітычнай, эканамічнай або сацыяльнай стабільнасці дзяржавы-члена або яго адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

61. Набыццё тавараў, работ і паслуг, неабходных для забеспячэння дзейнасці падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння праваахоўных і спецыяльных дзяржаўных органаў, звязаных з выяўленнем і абясшкоджваннем выбуховых рэчываў і выбуховых прылад, правядзеннем антытэрарыстычных аперацый, а таксама спецыяльных аперацый па вызваленні заложнікаў, затрыманню і абясшкоджванню ўзброеных злачынцаў, экстрэмістаў, тэрарыстаў, членаў арганізаваных злачынных груп, асоб, якія ўчынілі цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы.

62. Набыццё спецыяльных сацыяльных паслуг, прадугледжаных гарантаваным аб`ёмам спецыяльных сацыяльных паслуг, якія прадстаўляюцца асобам (сем`ям, якія складаюцца з асоб) з устойлівымі парушэннямі функцый арганізма, абумоўленымі фізічнымі і (або) разумовымі магчымасцямі, і (або) асобам без пэўнага месца жыхарства, а таксама асобам (сем`ям, якія складаюцца з асоб), няздольных да самаабслугоўвання ў сувязі з старым узростам, а таксама паслуг па ацэнцы і вызначэнню патрэбы ў спецыяльных сацыяльных паслугах.

63. Набыццё вырабаў народных мастацкіх промыслаў, у выпадках, вызначаных заканадаўствам дзяржавы-члена.

Дадатак № 4
да Пратакола аб парадку
рэгулявання закупак

Пералік
тавараў, работ і паслуг, па якіх закупкі ажыццяўляюцца
шляхам правядзення аўкцыёну

1. Прадукцыя сельскай гаспадаркі, прадукцыя паляўнічай здабычы, паслугі ў сельскай гаспадарцы і паляванні, акрамя жывых жывёл, прадукцыі і паслуг, звязаных з паляваннем, здабычай і развядзеннем дзічыны, а таксама прадукцыі палявання і здабычы дзічыны. *

2. Прадукцыя лясной гаспадаркі і лесанарыхтовак, паслугі для лесаводства і лесанарыхтовак.

3. Прадукцыя рыбалоўства, рыбагадавальнікаў і рыбных ферм, паслугі, звязаныя з рыбалоўствам. *

4. Вугаль каменны і лігніт, торф.

5. Нафта сырая і газ прыродны, паслугі па іх здабычы, акрамя вышукальных работ.

6. Руды металічныя.

7. Камень, гліна, пясок і іншыя віды мінеральнай сыравіны.

8. Харчовыя прадукты і напоі. *

9. Тэкстыль і тэкстыльныя вырабы.

10. Адзенне, мех і вырабы з футра, за выключэннем дзіцячага адзення.

11. Скура і вырабы са скуры, шорна-седлавыя вырабы, абутак.

12. Драўніна, вырабы з драўніны, коркі, саломкі і пляцёнкі, акрамя мэблі.

13. Цэлюлоза, папера, кардон і вырабы з іх.

14. Паліграфічная і друкаваная прадукцыя, акрамя рэкламных матэрыялаў, малюнкаў, чарцяжоў, фотаздымкаў надрукаваных, набораў сувенірных і падарункавых (нататнікаў і запісных кніжак), бюлетэняў для галасавання на выбарах і рэферэндумах.

15. Прадукцыя коксавых печаў.

16. Прадукцыя арганічнага і неарганічнага сінтэзу.

17. Гумавыя і палімерныя вырабы.

18. Неметалічныя мінеральныя прадукты іншыя, акрамя вырабаў шкляных гаспадарча-бытавых, вырабаў для інтэр`ераў, а таксама вырабаў керамічных небудаўнічых невогнетрывалых.

19. Прадукцыя металургічнай прамысловасці.

20. Прадукцыя металаапрацоўкі, акрамя машын, абсталявання, ядзерных рэактараў і частак ядзерных рэактараў, паскаральнікаў зараджаных часціц.

21. Машыны і абсталяванне, не ўключаныя ў іншыя групоўкі, акрамя зброі, боепрыпасаў і іх дэталяў, выбуховых прылад і выбуховых рэчываў народна-гаспадарчага прызначэння.

22. Офісная і вылічальная тэхніка.

23. Электрарухавікі і апаратура электратэхнічная (у тым ліку электраабсталяванне), не ўключаныя ў іншыя групоўкі.

24. Абсталяванне і апаратура для радыё, тэлебачання і сувязі.

25. Абсталяванне і апаратура медыцынская, сродкі вымярэння, фота- і кінаапаратура (за выключэннем медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння, вызначаных заканадаўствам дзяржавы - члена аб закупках).

26. Аўтамабілі, прычэпы і паўпрычэпы, кузавы для аўтамабіляў, дэталі і прыналежнасці да аўтамабіляў, гаражнае абсталяванне.

27. Транспартныя сродкі іншыя, акрамя суднаў гандлёвых і пасажырскіх, ваенных караблёў, паветраных і касмічных лятальных апаратаў, абсталявання і дэталяў лятальных.

28. Гатовыя вырабы, акрамя ювелірных вырабаў і сумежных з імі тавараў, інструментаў музычных, гульняў і цацак, абсталявання для навучання працоўным працэсам, навучальных дапаможнікаў і абсталявання школьнага, вырабаў мастацкіх промыслаў, твораў мастацтва і прадметаў калекцыяніравання, кінастужкі экспанаванай, воласа чалавека, жывёл, з сінтэтычных матэрыялаў і вырабаў з яго.

29. Адходы і лом ў форме, прыдатнай для выкарыстання ў якасці новай сыравіны.

30. Паслугі па гандлю, тэхнічнаму абслугоўванню і рамонту аўтамабіляў і матацыклаў.

31. Паслугі аптовага і камісійнага гандлю, акрамя паслуг па гандлю аўтамабілямі і матацыкламі.

32. Паслугі сухапутнага транспарту, акрамя паслуг чыгуначнага транспарту, паслуг метрапалітэна, паслуг транспарціроўкі па трубаправодах.

33. Паслугі воднага транспарту.

34 Паслугі транспартныя дапаможныя і дадатковыя, паслугі ў галіне турызму і экскурсій, акрамя паслуг бюро падарожжаў і турыстычных агенцтваў, іншых паслуг па аказанні дапамогі турыстам.

35. Сувязь, акрамя паслуг кур`ерскіх, за выключэннем паслуг нацыянальнай пошты, паслуг электрычнай сувязі.

36. Паслугі па фінансаваму пасрэдніцтву, акрамя страхавання і пенсійнага забеспячэння, паслуг па арганізацыі выпуску аблігацыйных пазык.

37. Паслугі, якія з`яўляюцца дапаможнымі ў адносінах да фінансавага пасрэдніцтва, за выключэннем ацэначных паслуг.

38. Паслугі па тэхнічнаму абслугоўванню і рамонту аргтэхнікі для офісаў, электронных вылічальных машын і выкарыстоўваецца сумесна з імі перыферыйнага абсталявання.

39. Паслугі па ўборцы будынкаў.

40. Паслугі па ўпакоўванню.

41. Паслугі па выдаленню адходаў, санітарнай апрацоўцы і аналагічныя паслугі.

---

* Акрамя закупак у арганізацыях, якія ажыццяўляюць выхаваўчы, адукацыйны працэс для дзяцей, медыцынскіх арганізацыях, установах сацыяльнага абслугоўвання і арганізацыях адпачынку дзяцей, паслуг грамадскага харчавання для названых устаноў і арганізацый.

ДАДАТАК № 26

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб ахове і абароне правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

I. Агульныя палажэнні

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з радзелам XXIII Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і рэгулюе адносіны ў сферы аховы і абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці.

2. Пад аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці разумеюцца творы навукі, літаратуры і мастацтва, праграмы для электронных вылічальных машын (камп'ютарныя праграмы), фанаграмы, выкананні, таварныя знакі і знакі абслугоўвання, геаграфічныя ўказанні, найменні месцаў паходжання тавараў, вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, селекцыйныя дасягненні, тапалогіі інтэгральных мікрасхем, сакрэты вытворчасці (ноу-хау), а таксама другія аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, якім даецца прававая ахова ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі, міжнароднымі дагаворамі і актамі, якія складаюць права Саюза, і заканадаўствам дзяржаў-членаў.

II. Аўтарскае права і сумежныя правы

3. Аўтарскае права распаўсюджваецца на творы навукі, літаратуры і мастацтва. Аўтару твора належаць, у прыватнасці, наступныя правы:

1) выключнае права на твор;

2) права аўтарства;

3) права на імя;

4) права на недатыкальнасць твора;

5) права на абнародаванне твора;

6) іншыя правы, устаноўленыя заканадаўствам дзяржаў-членаў.

4. Дзяржавы-члены забяспечваюць выкананне тэрмінаў аховы выключнага права на твор аўтара, выключнага права на твор, створаны ў сааўтарстве, выключнага права на твор, абнародаваны пасля смерці аўтара, якія будуць не ніжэй за тэрміны, устаноўленыя Бернскай канвенцыяй па ахове літаратурных і мастацкіх твораў ад 9 верасня 1886 года (у рэдакцыі 1971 года), Пагадненнем Сусветнай гандлёвай арганізацыі па гандлёвых аспектах правоў інтэлектуальнай уласнасці ад 15 красавіка 1994 года. У заканадаўстве дзяржаў-членаў могуць быць замацаваны большыя тэрміны аховы названых правоў.

Праграмы для электронна-вылічальных машын (камп'ютарныя праграмы), уключаючы зыходны тэкст і аб'ектны код, ахоўваюцца як літаратурныя творы ў адпаведнасці з Бернскай канвенцыяй аб ахове літаратурных і мастацкіх твораў ад 9 верасня 1886 года (у рэдакцыі 1971 года).

Састаўныя творы (энцыклапедыі, зборнікі і іншыя творы), якія з'яўляюцца па падборы або размяшчэнню матэрыялаў вынікам творчасці, ахоўваюцца без шкоды правам аўтараў кожнага з твораў, які састаўляе частку састаўнога твора. Аўтару састаўнога твора належыць аўтарскае права на складальніцтва (падбор і размяшчэнне матэрыялу). Пры гэтым састаўныя творы ахоўваюцца аўтарскім правам незалежна ад таго, ці з'яўляюцца аб'ектамі аўтарскага права творы, на якіх яны аснаваны ці якія яны ўключаюць.

Вытворныя творы (пераклады, адаптацыі, музычныя аранжыроўкі і другія перапрацоўкі літаратурнага ці мастацкага твора)

ахоўваюцца нараўне з арыгінальнымі творамі без шкоды правам аўтара арыгінальнага твора. Аўтару вытворнага твора належыць аўтарскае права на ажыццёўлены пераклад і іншую апрацоўку другога (арыгінальнага) твора.

5. Дзяржавы-члены даюць праваўладальнікам у дачыненні да кінематаграфічных твораў права дазваляць або забараняць публічны камерцыйны пракат арыгіналаў або копій іх твораў, якія ахоўваюцца аўтарскім правам, на тэрыторыях другіх дзяржаў-членаў.

6. Маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы на вынікі выканальніцкай дзейнасці (выкананні), на фанаграмы і іншыя правы, устаноўленыя заканадаўствам дзяржаў-членаў, з'яўляюцца сумежнымі з аўтарскім правам (сумежнымі правамі).

Выканаўцам прызнаецца фізічная асоба, творчай працай якой створана выкананне, – артыст-выканаўца (акцёр, спявак, музыкант, танцор або другая асоба, якая іграе ролю, чытае, дэкламуе, спявае, іграе на музычным інструменце або іншым чынам удзельнічае ў выкананні твора літаратуры, мастацтва або народнай творчасці, у тым ліку эстраднага, цыркавога або лялечнага нумара), а таксама рэжысёр-пастаноўшчык спектакля (асоба, якая ажыццявіла пастаноўку тэатральнага, цыркавога, лялечнага, эстраднага ці іншага тэатральна-відовішчнага прадстаўлення) і дырыжор.

Дзяржавы-члены даюць на ўзаемнай аснове выканаўцам дзяржаў-членаў наступныя правы:

выключнае права на выкананне;

права на імя – права на называнне свайго імя або псеўданіма на экзэмплярах фанаграмы і ў іншых выпадках выкарыстання выканання, права на называнне назвы калектыву выканаўцаў, акрамя выпадкаў, калі характар выкарыстання выканання выключае магчымасць называння імя выканаўцы або назвы калектыву выканаўцаў;

іншыя правы, устаноўленыя заканадаўствам дзяржаў-членаў.

7. Выканаўцы ажыццяўляюць свае правы з выконваннем правоў аўтараў твораў, якія выконваюцца. Правы выканаўцы прызнаюцца і дзейнічаюць незалежна ад наяўнасці і дзеяння аўтарскіх правоў на твор, які выконваецца.

8. Вырабляльнікам (вытворцам) фанаграмы прызнаецца асоба, якая ўзяла на сябе ініцыятыву і адказнасць за першы запіс гукаў выканання або другіх гукаў ці адлюстраванняў гэтых гукаў. Пры адсутнасці доказаў іншага вырабляльнікам (вытворцам) фанаграмы прызнаецца асоба, імя або найменне якой указана звычайным чынам на экзэмпляры фанаграмы і (або) на яго ўпакоўцы.

Дзяржавы - члены даюць вырабляльнікам (вытворцам) фанаграм дзяржаў - членаў наступныя правы:

выключнае права на фанаграму;

іншыя правы, устаноўленыя заканадаўствам дзяржаў - членаў.

9. Дзяржавы - члены забяспечваюць выкананне тэрмінаў аховы выключнага права на выкананне, выключнага права на фанаграму, якія будуць не ніжэй за тэрміны, устаноўленыя Пагадненнем Сусветнай гандлёвай арганізацыі па гандлёвых аспектах правоў інтэлектуальнай уласнасці ад 15 красавіка 1994 года і Міжнароднай канвенцыяй аб ахове правоў выканаўцаў, вырабляльнікаў фанаграм і вяшчальных арганізацый ад 26 кастрычніка 1961 года. У заканадаўстве дзяржаў-членаў могуць быць замацаваны большыя тэрміны аховы названых правоў.

10. Арганізацыяй па калектыўным кіраванні правамі з'яўляецца арганізацыя, якая дзейнічае на аснове паўнамоцтваў, атрыманых ад аўтараў, выканаўцаў, вырабляльнікаў (вытворцаў) фанаграм і другіх уладальнікаў аўтарскага права і сумежных правоў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам дзяржаў-членаў, а таксама

паўнамоцтваў, атрыманых ад другіх арганізацый па калектыўнаму кіраванню правамі, у сферы кіравання адпаведнымі правамі на калектыўнай аснове ў мэтах забеспячэння атрымання аўтарамі і іншымі праваўладальнікамі ўзнагароджання за выкарыстанне аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў.

Адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з дзейнасцю арганізацый па калектыўнаму кіраванню правамі ў мэтах забеспячэння магчымасці правамернага выкарыстання аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў, рэгулююцца міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

III. Таварныя знакі і знакі абслугоўвання

11. Таварным знакам і знакам абслугоўвання (далей – таварны знак) з'яўляецца абазначэнне, якое ахоўваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена і міжнароднымі дагаворамі, удзельнікамі якіх з'яўляюцца дзяржавы-члены, і якое служыць для індывідуалізацыі тавараў і (або) паслуг адных удзельнікаў грамадзянскага абароту ад тавараў і (або) паслуг другіх удзельнікаў грамадзянскага абароту.

У якасці таварнага знака ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дзяржаў-членаў могуць быць зарэгістраваныя славесныя, выяўленчыя, аб'ёмныя і другія абазначэнні або іх камбінацыі. Таварны знак можа быць зарэгістраваны ў любым колеры або колеравым спалучэнні.

12. Праваўладальнік таварнага знака мае выключныя права выкарыстоўваць таварны знак у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена і распараджацца гэтым выключным правам, а таксама права забараняць другім асобам выкарыстанне таварнага знака або абазначэння, падобнага да яго да ступені змешвання, у дачыненні да аднародных тавараў і (або) паслуг.

13. Тэрмін дзеяння першапачатковай рэгістрацыі таварнага знака складае 10 гадоў. Указаны тэрмін можа быць прадоўжаны неабмежаваную колькасць разоў па звароце праваўладальніка таварнага знака кожны раз на тэрмін не менш за 10 гадоў.

Прававая ахова таварнага знака можа быць спынена датэрмінова на тэрыторыі дзяржавы-члена ў дачыненні да ўсіх тавараў і (або) паслуг або часткі тавараў і (або) паслуг, для індывідуалізацыі якіх таварны знак зарэгістраваны на тэрыторыі дадзенай дзяржавы-члена, з прычыны невыкарыстання таварнага знака бесперапынна на працягу любых 3 гадоў пасля яго рэгістрацыі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам дадзенай дзяржавы-члена, за выключэннем выпадкаў невыкарыстання таварнага знака па незалежных ад праваўладальніка абставінах.

Даванне прававой аховы таварнаму знаку можа быць аспрэчана і прызнана несапраўдным у парадку і на падставах, якія прадугледжаны заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой дадзены таварны знак зарэгістраваны.

IV. Таварныя знакі Еўразійскага эканамічнага саюза і знакі абслугоўвання Еўразійскага эканамічнага саюза

14. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць рэгістрацыю таварнага знака Еўразійскага эканамічнага саюза і знака абслугоўвання Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – таварны знак Саюза). Таварнаму знаку Саюза даецца прававая ахова адначасова на тэрыторыях усіх дзяржаў-членаў.

У якасці таварнага знака Саюза можа быць зарэгістравана абазначэнне, прадстаўленае толькі ў графічным выглядзе.

Праваўладальнік таварнага знака Саюза мае выключнае права выкарыстоўваць таварны знак Саюза ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў і распараджацца гэтым выключным правам, а таксама права забараняць другім асобам выкарыстанне таварнага знака Саюза або абазначэння, падобнага да яго да ступені змешвання, у дачыненні да аднародных тавараў і (або) паслуг.

15. Адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з рэгістрацыяй, прававой аховай і выкарыстаннем таварнага знака Саюза на тэрыторыях дзяржаў-членаў, рэгулююцца міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

V. Прынцып вычарпання выключнага права на таварны знак, таварны знак Саюза

16. На тэрыторыях дзяржаў-членаў прымяняецца прынцып вычарпання выключнага права на таварны знак, таварны знак Саюза, у адпаведнасці з якім не з'яўляецца парушэннем выключнага права на таварны знак, таварны знак Саюза выкарыстанне гэтага таварнага знака, таварнага знака Саюза ў дачыненні да тавараў, якія былі правамерна ўведзены ў грамадзянскі абарот на тэрыторыі любой з дзяржаў-членаў непасрэдна праваўладальнікам таварнага знака і (або) таварнага знака Саюза або другімі асобамі з яго згоды.

VI . Геаграфічныя ўказанні

17. Пад геаграфічным указаннем разумеецца абазначэнне, якое ідэнтыфікуе тавар як той, што паходзіць з тэрыторыі дзяржавы-члена, рэгіёна або мясцовасці на гэтай тэрыторыі, калі якасць,

рэпутацыя або іншыя характарыстыкі тавару ў значнай ступені абумоўленыя яго геаграфічным паходжаннем.

18. Геаграфічнаму ўказанню можа давацца прававая ахова на тэрыторыі дзяржавы-члена, калі такая прававая ахова прадугледжана заканадаўствам гэтай дзяржавы-члена або міжнароднымі дагаворамі, удзельнікам якіх яна з'яўляецца.

VII . Найменне месца паходжання тавару

19. Найменнем месца паходжання тавару, якому даецца прававая ахова, з'яўляецца абазначэнне, якое ўяўляе сабой ці якое змяшчае сучаснае або гістарычнае, афіцыйнае або неафіцыйнае, поўнае або скарочанае найменне краіны, гарадскога або сельскага паселішча, мясцовасці або другога геаграфічнага аб'екта, а таксама абазначэнне, вытворнае ад такога наймення і якое стала вядомым у выніку яго выкарыстання ў дачыненні да тавару, асаблівыя ўласцівасці якога выключна або галоўным чынам вызначаюцца характэрнымі для дадзенага геаграфічнага аб'екта прыроднымі ўмовамі і (або) людскімі фактарамі.

Названыя палажэнні прымяняюцца да абазначэння, якое дазваляе ідэнтыфікаваць тавар як той, што паходзіць з тэрыторыі пэўнага геаграфічнага аб'екта і, хоць не змяшчае найменне гэтага аб'екта, стала вядомым у выніку выкарыстання дадзенага абазначэння ў дачыненні да тавару, асаблівыя ўласцівасці якога адказваюць патрабаванням, названым у абзацы першым гэтага пункта.

20. Не прызнаецца найменнем месца паходжання тавару абазначэнне, якое хоць і ўяўляе сабой або змяшчае найменне геаграфічнага аб'екта, але ўвайшло ва ўсеагульны ўжытак як

абазначэнне тавару пэўнага віду, не звязанае з месцам яго вытворчасці.

Даванне прававой аховы найменню месца паходжання тавару можа быць аспрэчана і прызнана несапраўдным у парадку і на падставах, якія прадугледжаны заканадаўствам дзяржаў - членаў.

21. У дачыненні да наймення месца паходжання тавару дзяржавы-члены прадугледжваюць прававыя меры, якія дазваляюць зацікаўленым бакам прадухіляць:

1) выкарыстанне любых сродкаў пры абазначэнні або прэзентацыі тавару, якія паказваюць або выклікаюць асацыяцыю, што дадзены тавар паходзіць з геаграфічнага раёна, які адменны ад гэтага месца паходжання, такім чынам, што гэта здольна ўводзіць спажыўца ў зман адносна месца паходжання і асаблівых уласцівасцяў тавару;

2) любое выкарыстанне, якое ўяўляе сабой акт нядобрасумленнай канкурэнцыі па сэнсу артыкула 10-bis Парыжскай канвенцыі па ахове прамысловай уласнасці ад 20 сакавіка 1883 года.

VIII. Найменне месца паходжання тавару Еўразійскага эканамічнага саюза

22. Дзяржавы-члены ажыццяўляюць рэгістрацыю наймення месца паходжання тавару Еўразійскага эканамічнага саюза (далей – найменне месца паходжання тавару Саюза). Найменню месца паходжання тавару Саюза даецца прававая ахова адначасова на тэрыторыях усіх дзяржаў-членаў.

23. Адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з рэгістрацыяй, прававой аховай і выкарыстаннем наймення месца паходжання тавару Саюза на тэрыторыях дзяржаў-членаў, рэгулююцца міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

IX. Патэнтавыя правы

24. Права на вынаходства, карысную мадэль і прамысловы ўзор ахоўваецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржаў-членаў, і пацвярджаецца патэнтам, які сведчыць прыярытэт, аўтарства і выключнае права на вынаходства, карысную мадэль і прамысловы ўзор.

25. Аўтару вынаходства, карыснай мадэлі або прамысловага ўзору належаць наступныя правы:

1) выключнае права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор;

2) права аўтарства.

26. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам дзяржаў-членаў, аўтару вынаходства, карыснай мадэлі або прамысловага ўзору належаць таксама другія правы, у тым ліку права на атрыманне патэнта, права на ўзнагароджанне за выкарыстанне службовага вынаходства, карыснай мадэлі або прамысловага ўзору.

27. Тэрмін дзеяння выключнага права на вынаходства, карысную мадэль, прамысловы ўзор складае:

1) не менш за 20 гадоў – для вынаходстваў;

2) не менш за 5 гадоў – для карысных мадэляў;

3) не менш за 5 гадоў – для прамысловых узораў.

28. Патэнт на вынаходства, карысную мадэль або прамысловы ўзор дае патэнтаўладальніку выключнае права выкарыстоўваць вынаходства, карысную мадэль або прамысловы ўзор любым спосабам, які не супярэчыць заканадаўству дзяржаў-членаў, а таксама права забараняць выкарыстанне названых аб'ектаў іншым асобам.

29. Дзяржавы-члены маюць права прадугледжваць абмежаванне правоў, якія даюцца патэнтам, пры ўмове, што такія выключэнні не

наносяць неапраўданую шкоду звычайнаму выкарыстанню вынаходстваў, карысных мадэляў або прамысловых узораў і не ўшчамляюць неабгрунтаваным чынам законныя інтарэсы патэнтаўладальніка, улічваючы законныя інтарэсы трэціх асоб.

X. Селекцыйныя дасягненні

30. Ахова правоў на сарты раслін і пароды жывёл (селекцыйныя дасягненні) ажыццяўляецца ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам дзяржаў-членаў.

31. Аўтару селекцыйнага дасягнення належаць наступныя правы:

1) выключнае права на селекцыйнае дасягненне;

2) права аўтарства.

32. У выпадках, якія прадугледжаны заканадаўствам дзяржаў-членаў, аўтару селекцыйнага дасягнення належаць таксама другія правы, у тым ліку права на атрыманне патэнта, права на найменне селекцыйнага дасягнення, права на ўзнагароджанне за выкарыстанне службовага селекцыйнага дасягнення.

33. Тэрмін дзеяння выключнага права на селекцыйнае дасягненне складае не менш за 25 гадоў для сартоў раслін, пародаў жывёл.

XI . Тапалогіі інтэгральных мікрасхем

34. Тапалогіяй інтэгральнай мікрасхемы з'яўляецца зафіксаванае на матэрыяльным носьбіце прасторава-геаметрычнае размяшчэнне сукупнасці элементаў інтэгральнай мікрасхемы і сувязяў паміж імі.

35. Правы інтэлектуальнай уласнасці на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы ахоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

36. Аўтару тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы належаць наступныя правы:

1) выключнае права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы;

2) права аўтарства.

37. У выпадках, якія прадугледжаны заканадаўствам дзяржаў-членаў, аўтару тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы належаць таксама другія правы, у тым ліку права на ўзнагароджанне за выкарыстанне службовай тапалогіі.

38. Тэрмін дзеяння выключнага права на тапалогію інтэгральнай мікрасхемы складае 10 гадоў.

XII. Сакрэты вытворчасці (ноу-хау)

39. Сакрэтам вытворчасці (ноу-хау) прызнаюцца звесткі любога характару (вытворчыя, тэхнічныя, эканамічныя, арганізацыйныя і другія), у тым ліку звесткі аб вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці ў навукова-тэхнічнай сферы, а таксама звесткі аб спосабах ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці, якія маюць сапраўдную або патэнцыяльную камерцыйную каштоўнасць з прычыны невядомасці іх трэцім асобам, да якіх у трэціх асоб няма свабоднага доступу на законнай падставе і ў дачыненні да якіх уладальнікам такіх звестак уведзены рэжым камерцыйнай тайны.

40. Прававая ахова сакрэту вытворчасці (ноу-хау) даецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў.

XIII. Правапрымяняльныя меры па абароне правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

41. Каардынацыя дзеянняў дзяржаў-членаў па абароне правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў рамках Саюза ажыццяўляецца ў адпаведнасці з міжнародным дагаворам у рамках Саюза.

ДАДАТАК № 27

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

пра прамысловае супрацоўніцтва

1. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«прыярытэтныя віды эканамічнай дзейнасці» – віды дзейнасці, вызначаныя ўсімі дзяржавамі-членамі ў якасці прыярытэтаў для рэалізацыі асноўных накірункаў прамысловага супрацоўніцтва;

«прамысловая кааперацыя» – устойлівае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва гаспадарчых суб'ектаў дзяржаў-членаў у галіне прамысловасці;

«прамысловая палітыка ў рамках Саюза» – дзейнасць дзяржаў-членаў па асноўных накірунках прамысловага супрацоўніцтва, якая здзяйсняецца дзяржавамі-членамі як самастойна, так і пры кансультатыўнай падтрымцы і каардынацыі Камісіі;

«прамысловасць» – сукупнасць эканамічных відаў і дзейнасці, што адносяцца да здабыўной і апрацоўчай прамысловасці, за выключэннем харчовай перапрацоўкі, у адпаведнасці з нацыянальнымі класіфікатарамі відаў эканамічнай дзейнасці. Іншыя віды прамысловай дзейнасці рэгулююцца адпаведнымі часткамі Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе;

«прамысловы кластар» – група ўзаемазлучаных прамысловых і злучаных з імі арганізацый, якія ўзаемадапаўняюць адзін аднаго і за кошт гэтага якія ўзмацняюць свае канкурэнтныя перавагі;

«тэхналагічная платформа» – аб'ект інавацыйнай інфраструктуры, што дазваляе забяспечыць эфектыўную камунікацыю і стварэнне перспектыўных камерцыйных тэхналогій, высокатэхналагічнай, інавацыйнай і канкурэнтаздольнай прадукцыі на аснове ўдзелу ўсіх зацікаўленых бакоў (бізнэсу, навукі, дзяржавы, грамадскіх арганізацый).

2. Паўнамоцтвы Камісіі ў рамках кансультатыўнай падтрымкі і каардынацыі дзейнасці дзяржаў-членаў па асноўных накірунках прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Саюза складаюцца ў:

1) садзейнічанні:

абмену інфармацыяй, правядзенню кансультацый, фарміраванню сумесных пляцовак для абмеркавання пытанняў, якія датычацца выпрацоўкі асноўных накірункаў прамысловага супрацоўніцтва, у тым ліку перспектыўных накірункаў інавацыйнай дзейнасці;

распрацоўцы прапаноў, накіраваных на паглыбленне ўзаемадзеяння дзяржаў-членаў пры рэалізацыі прамысловай палітыкі ў рамках Саюза;

абмену вопытам па пытаннях, злучаных з правядзеннем рэформ і структурных пераўтварэнняў у прамысловасці, стымуляваннем інавацыйнай дзейнасці, развіццём прамысловасці;

распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праграм і праектаў;

распрацоўцы праграм абмену досведам для прамысловых комплексаў дзяржаў-членаў;

уцягванню ў прамысловую кааперацыю суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва дзяржаў-членаў;

інфармацыйнаму ўзаемадзеянню;

выпрацоўцы і рэалізацыі дзяржавамі-членамі сумесных мер па процідзеянню наступствам глабальных эканамічных крызісаў у сферы прамысловасці;

выпрацоўцы рэкамендацый па фарміраванню еўразійскіх тэхналагічных платформ.

2) ажыццяўленні:

вынясення на разгляд дзяржаў-членаў рэкамендацый па далейшаму развіццю прамысловага супрацоўніцтва з улікам інтарэсаў кожнага з яго ўдзельнікаў;

маніторынгу і аналізу рэалізацыі Асноўных накірункаў прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Саюза;

вывучэнні сусветнага вопыту развіцця прамысловасці з мэтай выяўлення актуальных для дзяржаў-членаў метадаў развіцця прамысловасці;

3) ажыццяўленні па рашэнні Міжурадавага савета:

падрыхтоўкі праектаў палажэнняў па распрацоўцы, фінансаванню і рэалізацыі сумесных праграм і праектаў;

выяўленні адміністрацыйных і іншых бар'ераў на шляху развіцця прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Саюза і распрацоўцы прапаноў па іх наступным устараненні;

падрыхтоўкі прапаноў па фарміраванню кааперацыйных ланцужкоў вытворчасці сумеснай прадукцыі;

маніторынгу рынка прамысловай прадукцыі ў рамках Саюза, а таксама экспартных рынкаў трэціх краін;

аналізу развіцця прамысловасці дзяржаў-членаў;

распрацоўкі сумесна з дзяржавамі-членамі іншых (дадатковых) дакументаў, такіх як правілы, парадкі, і механізмаў рэалізацыі прамысловай палітыкі ў рамках Саюза па асноўных накірунках

прамысловага супрацоўніцтва, а таксама рамачных дамоў па супрацоўніцтву.

Названы пералік функцый не з'яўляецца вычарпальным і можа пашырацца па рашэнню Міжурадавага савета.

ДАДАТАК № 28

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ
аб адзіных правілах прадастаўлення
прамысловых субсідый

I. Агульныя палажэнні

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з артыкулам 93 Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) і ўстанаўлівае адзіныя правілы, якія рэгулююць прадастаўленне субсідый у адносінах да прамысловых тавараў, у тым ліку пры прадастаўленні або атрыманні паслуг, якія непасрэдна звязаны з вытворчасцю, збытам (уключаючы захоўванне, вываз з тэрыторыі дзяржавы-члена і транспартаванне) і (або) спажываннем прамысловых тавараў.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі» – суб'екты Расійскай Федэрацыі (уключаючы органы мясцовага самакіравання) і вобласці Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Казахстан (уключаючы гарады Мінск, Астану і Алматы);

«аналагічны тавар» – тавар, цалкам ідэнтычны тавару, пры вытворчасці, вывазе з тэрыторыі дзяржавы-члена ці транспартаванні якога выкарыстоўвалася спецыфічная субсідыя, або ў адсутнасць такога тавара – іншы тавар, які мае характарыстыкі, блізкія да характарыстык тавара, пры вытворчасці, вывазе з тэрыторыі

дзяржавы-члена ці транспартаванні якога выкарыстоўвалася спецыфічная субсідыя;

«кампенсавальная мера» – мера па нейтралізацыі негатыўнага ўздзеяння спецыфічнай субсідыі дзяржавы-члена, якая субсідзіруе, на галіну эканомікі дзяржавы-члена, што падала заяву на ўвядзенне дадзенай меры;

«кампетэнтны орган» – орган дзяржаўнай улады дзяржавы-члена, адказны за правядзенне расследаванняў;

«матэрыяльная шкода галіне нацыянальнай эканомікі» – пацверджанае доказамі пагаршэнне становішча галіны нацыянальнай эканомікі, якое наступіла з прычыны ўвозу прамысловага тавара з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая прадаставіла субсідыю пры вытворчасці, транспартаванні, захоўванні гэтага тавара, і выяўляецца ў скарачэнні аб'ёму вытворчасці і рэалізацыі аналагічнага тавара на тэрыторыі дзяржавы-члена, у зніжэнні рэнтабельнасці вытворчасці такога тавара, у негатыўным уздзеянні на таварныя запасы, занятасць, узровень заработнай платы і ўзровень інвестыцый у дадзеную галіну;

«нацыянальныя вытворцы аналагічнага тавара» – вытворцы аналагічнага тавара ў дзяржаве-члене, якая праводзіць расследаванне;

«галіна нацыянальнай эканомікі» – усе вытворцы аналагічнага тавара ў дзяржаве-члене або тыя з іх, доля якіх у агульным аб'ёме вытворчасці аналагічнага тавара ў дзяржаве-члене складае не меней 25 працэнтаў;

«атрымальнік субсідыі» – вытворца прамысловага тавара, які з'яўляецца выгаданабытчыкам ад субсідыі;

«вытворцы тавара, які субсідзіруецца» – вытворцы тавара, які субсідзіруецца дзяржавай-членам, якая прадаставіла спецыфічную субсідыю;

«прамысловыя тавары» – тавары, класіфікавальныя ў групах 25 – 97 ТН ЗЭД ЕАЭС, а таксама рыба і рыбапрадукты, за выключэннем тавараў, класіфікаваных у адпаведнасці з ТН ЗЭД ЕАЭС у субпазіцыях ТН ЗЭД ЕАЭС 2905 43 000 0 і 2905 44, пазіцыях 3301, 3501 – 3505, субпазіцыях 3809 10 і 3824 60, пазіцыях 4101 – 4103, 4301, 5001 00 000 0 – 5003 00 000 0, 5101 – 5103, 5201 00 – 5203 00 000 0, 5301 і 5302 (субпазіцыя 2905 43 000 0 – маніт, субпазіцыя 2905 44 – сарбіт, пазіцыя 3301 – эфірныя масла, пазіцыі 3501 – 3505 – альбуміноідныя рэчывы, мадыфікаваныя крахмалы, клеі, субпазіцыя 3809 10 – рэчывы для апрацоўкі паверхняў, субпазіцыя 3824 60 – сарбітол, іншыя прадукты, пазіцыі 4101 – 4103 – шкуры і гарбарная сыравіна, пазіцыя 4301 – невыдзеланая пушніна, пазіцыі 5001 00 000 0 – 5003 00 000 0 – шоўк-сырэц і адыходы шоўка, пазіцыі 5101 – 5103 – поўсць і волас жывёл, субпазіцыі 5201 00 – 5203 00 000 0 – бавоўна-сырэц, адыходы бавоўны, валакно баваўнянае чэсанае, пазіцыя 5301 – лён-сырэц, пазіцыя 5302 – пянька волкая). Прыводзімае апісанне тавараў неабавязкова з'яўляецца вычарпальным.

Змяненні ў пералік паказаных кодаў ТН ЗЭД ЕАЭС уносяцца Саветам Камісіі;

«субсідзіруемы тавар» – прамысловы тавар, пры вытворчасці, транспартаванні, захоўванні ці вывазе якога з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая субсідзіруе, выкарыстоўвалася спецыфічная субсідыя;

« дзяржава-член, якая субсідзіруе » – дзяржава-член, орган якой, які субсідзіруе, прадастаўляе субсідыю;

« орган, які субсідзіруе» – адзін ці некалькі дзяржаўных органаў або органаў мясцовага самакіравання дзяржаў-членаў, якія прымаюць рашэнні ў вобласці прадастаўлення субсідый;

«субсідыя»:

а) фінансавае садзейнічанне, якое аказваецца органам, які субсідзіруе, (ці ўпаўнаважанай дзяржавай-членам структурай), у выніку якога ствараюцца (забяспечваюцца) перавагі і якое ажыццяўляецца пасродкам:

прамога перавода грашовых сродкаў (напрыклад, у выглядзе незваротных пазык, крэдытаў), ці набыцця долі ва ўстаўным капітале, ці яго павелічэння, ці абавязацельства па пераводу такіх сродкаў (напрыклад, гарантыі па крэдытах);

поўнай ці частковай адмовы ад збірання плацяжоў, якія павінны былі б паступаць у прыбытак дзяржавы-члена (напрыклад, падатковыя ільготы, спісанне абавязку). Пры гэтым вызваленне экспартуемага прамысловага тавара ад мыт і падаткаў, спаганяемых з аналагічнага тавара, прызначанага для ўнутранага спажывання, або памяншэнне такіх мыт і падаткаў, або зварот такіх мыт і падаткаў у памеры, які не перавышае фактычна налічанай сумы, не разглядаецца як субсідыя;

прадастаўлення тавараў ці паслуг (за выключэннем прамысловых тавараў ці паслуг, прызначаных для падтрымання і развіцця агульнай інфраструктуры);

набыцця прамысловых тавараў;

б) любая іншая форма падтрымкі прыбыткаў ці цэн, якая дзейнічае (прама ці ўскосна) на скарачэнне ўвозу прамысловага тавара з тэрыторыі любой дзяржавы-члена або на павелічэнне вывазу прамысловага тавара на тэрыторыю любой дзяржавы-члена, у выніку чаго прадастаўляецца перавага;

«пагроза прычынення матэрыяльнай шкоды галіне нацыянальнай эканомікі» – пацверджаная доказамі непазбежнасць прычынення матэрыяльнай шкоды галіне нацыянальнай эканомікі;

«шкода галіне нацыянальнай эканомікі» – матэрыяльная шкода галіне нацыянальнай эканомікі, пагроза прычынення матэрыяльнай шкоды галіне нацыянальнай эканомікі ці істотнае запаволенне стварэння галіны нацыянальнай эканомікі.

II. Спецыфічныя субсідыі

3. Для таго каб вызначыць, ці з'яўляецца субсідыя спецыфічнай для прамысловага прадпрыемства ці галіны прамысловасці або групы прамысловых прадпрыемстваў ці галін прамысловасці (далей – вызначаныя прадпрыемствы) у межах тэрыторыі, на якой распаўсюджваюцца паўнамоцтвы органа, які субсідзіруе, ужываюцца наступныя прынцыпы:

1) калі органам, які субсідзіруе, ці прававым актам, у адпаведнасці з якім дзейнічае орган, які субсідзіруе, абмяжоўваецца доступ да субсідыі толькі для вызначаных прадпрыемстваў, такая субсідыя разглядаецца як спецыфічная пры ўмове, што ў групу прамысловых прадпрыемстваў ці групу галін прамысловасці ўваходзяць не ўсе прамысловыя прадпрыемствы ці галіны прамысловасці на тэрыторыі дзяржавы-члена, якая субсідзіруе;

2) калі органам, які субсідзіруе, ці прававым актам, у адпаведнасці з якім дзейнічае орган, які субсідзіруе, устанаўліваюцца аб'ектыўныя крытэрыі ці ўмовы (крытэрыі, якія з'яўляюцца нейтральнымі, не ствараюць пераваг для некаторых прадпрыемстваў у параўнанні з іншымі, з'яўляюцца эканамічнымі па характары і гарызантальнымі па спосабе ўжывання, як, напрыклад, лік занятых ці памер прадпрыемстваў), якія вызначаюць права на атрыманне субсідыі і яе памер, такая субсідыя не разглядаецца як спецыфічная

пры ўмове, што права на яе атрыманне з'яўляецца аўтаматычным і што такія крытэрыі і ўмовы строга выконваюцца. Крытэрыі і ўмовы павінны быць вызначаны ў законе, інструкцыі, прававым акце ці іншых афіцыйных дакументах такім чынам, каб іх можна было праверыць;

3) калі, нягледзячы на бачнасць неспецыфічнасці, якая вынікае з ужывання прынцыпаў, паказаных у падпунктах 1 і 2 гэтага пункта, маюцца падставы меркаваць, што субсідыя ў рэчаіснасці можа быць спецыфічнай, то могуць быць прыняты да ўвагі наступныя фактары (пры гэтым варта ўлічваць ступень дыверсіфікавання эканамічнай дзейнасці ў межах тэрыторыі, на якой распаўсюджваюцца паўнамоцтвы органа, які субсідзіруе, а таксама працягласць часу, на працягу якога дзейнічае такая субсідыя):

выкарыстанне субсідыі абмежаваным лікам вызначаных прадпрыемстваў;

пераважнае выкарыстанне субсідыі вызначанымі прадпрыемствамі;

прадастаўленне непрапарцыйна вялікіх сум субсідый некаторым прадпрыемствам;

спосаб выкарыстання дыскрэтнасці, якой валодае орган, які субсідзіруе, пры прыняцці рашэння аб прадастаўленні субсідыі (у гэтым стаўленні, у прыватнасці, прымаюцца да ўвагі інфармацыя пра частату адмоў ці адабрэнняў заявак на субсідзіраванне і матывы адпаведных рашэнняў).

4. Субсідыя, выкарыстанне якой абмежавана вызначанымі прадпрыемствамі, размешчанымі ў азначаным геаграфічным рэгіёне, які з'яўляецца часткай тэрыторыі, на якой распаўсюджваюцца паўнамоцтвы органа, які субсідзіруе, з'яўляецца спецыфічнай.

Уводзіны ці змяненне дзяржаўным органам дзяржавы-члена ставак падаткаў, якія дзейнічаюць у межах усёй тэрыторыі, на якой распаўсюджваюцца яго паўнамоцтвы, не разглядаецца як спецыфічная субсідыя.

5. Любая субсідыя, якая падпадае пад палажэнні часткі III гэтага Пратакола, разглядаецца як спецыфічная.

Устанаўленне таго факту, што субсідыя з'яўляецца спецыфічнай у адпаведнасці з гэтай часткай, засноўваецца на доказах наяўнасці спецыфічнасці субсідыі.

6. Дзяржава-член мае права звярнуцца ў Камісію ў мэтах узгаднення прадастаулення ім спецыфічнай субсідыі.

Дзяржавы-члены не ўжываюць кампенсавальныя меры да субсідый, якія прадастаўляюцца на тэрмін, на ўмовах і ў аб'ёмах, якія ўзгоднены Камісіяй.

Дзяржавы-члены накіроўваюць у Камісію нарматыўныя прававыя акты, якія прадугледжваюць прадастаўленне спецыфічных субсідый, у парадку абавязковага інфармавання ў тэрмін, устаноўлены міжнародным дагаворам у рамках Саюза, прадугледжаным пунктам 7 гэтага Пратакола.

У выпадку калі адна з дзяржаў-членаў мае падставы меркаваць, што прадастаўленне спецыфічнай субсідыі іншай дзяржавай-членам можа выракіць шкоду галіне нацыянальнай эканомікі, то такая дзяржава-член мае права ініцыяваць правядзенне Камісіяй адпаведнага разгляду.

Калі па выніках разгляду пацвярджаецца наяўнасць шкоды галіне нацыянальнай эканомікі, то Камісія прымае рашэнне пра тое, што дзяржава-член, якая прадастаўляе такую спецыфічную субсідыю, абавязана ліквідаваць умовы, што прыводзяць да шкоды, калі

ўцягнутыя ў разгляд дзяржавы-члены не дамовіліся пра іншае на працягу тэрміна, устаноўленага міжнародным дагаворам у рамках Саюза, прадугледжаным пунктам 7 гэтага Пратакола.

Камісія ўстанаўлівае разумны тэрмін для выканання такога рашэння.

Калі дзяржава-член, у адносінах якой прынята паказанае рашэнне, не выконвае гэта рашэнне Камісіі ва ўстаноўлены тэрмін, то іншыя дзяржавы-члены могуць звярнуцца ў Суд Саюза.

Ужыванне палажэнняў гэтага пункта ажыццяўляецца з улікам пераходных палажэнняў, прадугледжаных пунктам 1 артыкула 105 Дагавора.

7. Дзяржавы-члены вызначаюць міжнародным дагаворам у рамках Саюза:

парадак добраахвотнага ўзгаднення з Камісіяй спецыфічных субсідый і прыняцця Камісіяй адпаведных рашэнняў;

парадак правядзення Камісіяй разглядаў (у тым ліку па фактах парушэння ўмоў, парадку прадастаўлення і выкарыстання спецыфічных субсідый, устаноўленых гэтым Пратаколам);

крытэрыі, на аснове якіх Камісія будзе прымаць рашэнне пра дапушчальнасць ці недапушчальнасці спецыфічных субсідый (у тым ліку з улікам развіцця якія склаліся і новых кааперацыйных сувязяў паміж вытворцамі дзяржаў-членаў);

парадак і ўмовы запыту Камісіяй інфармацыі пра субсідыі, якія прадастаўляюцца.

Тэрмін уступлення ў сілу паказанага міжнароднага дагавора прадугледжаны пунктам 1 артыкула 105 Дагавора.

8. У выпадку калі дзяржавай-членам для атрымання спецыфічнай субсідыі ўстаноўлена патрабаванне ў адносінах да

атрымальніка субсідыі (вытворцы) пра неабходнасць ажыццяўлення тэхналагічных аперацый пры вытворчасці вызначанага тавара, то ажыццяўленне вытворцам іншай дзяржавы-члена такіх аперацый у іншых дзяржавах-членах прызнаецца належным выкананнем такога патрабавання, ў адпаведнасці з парадкам, вызначаным Вышэйшым саветам.

III. Забароненыя субсідыі

9. Забаронены наступныя віды субсідый:

вывазная субсідыя – субсідыя, прадастаўленне якой увязана ў якасці адзінай ці адной з некалькіх умоў з вынікамі вывазу прамысловага тавара з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая прадастаўляе гэту субсідыю, на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена;

замяшчаючая субсідыя – субсідыя, прадастаўленне якой увязана ў якасці адзінай ці адной з некалькіх умоў з выкарыстаннем прамысловага тавара, які паходзіць з тэрыторыі дзяржавы-члена, што прадстаўляе гэту субсідыю.

Пад увязваннем разумеецца ў тым ліку наяўнасць фактаў, якія сведчаць пра тое, што прадастаўленне субсідыі, якое юрыдычна не абумоўлена вынікамі вывазу прамысловага тавара з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая субсідзіруе, або выкарыстаннем прамысловага тавара, які паходзіць з тэрыторыі такой дзяржавы-члена, у рэчаіснасці звязана з фактычным ці чаканым экспартам (вывазам), ці з экспартнай выручкай (выручкай пры вывазе), ці з патрабаваннем па выкарыстанню прамысловых тавараў, што паходзяць з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая субсідзіруе.

Сам па сабе факт, што субсідыя прадастаўляецца гаспадарчаму суб'екту, які здзяйсняе вываз, не можа служыць падставай для таго, каб лічыць яе вывазной субсідыяй.

10. У выпадку калі вынікам прадастаўлсння адной дзяржавай-членам спецыфічнай субсідыі з'яўляецца прычыненне шкоды галіне нацыянальнай эканомікі іншай дзяржавы-члена, то такая субсідыя з'яўляецца забароненай.

Прычыненне шкоды галіне нацыянальнай эканомікі павінна быць даказана ў адпаведнасці з часткай V гэтага Пратакола.

11. Дзяржавы-члены не захоўваюць і не ўводзяць меры, якія ўжываюцца на падставе нарматыўнага прававога акта ці прававога акта органа, які субсідзіруе, выкананне якіх неабходна для атрымання спецыфічных субсідый і якія адпавядаюць адной з наступных умоў:

1) змяшчаюць патрабаванні аб:

правядзенні закупак або выкарыстанні гаспадарчым суб'ектам прамысловых тавараў, што паходзяць з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая ўводзіць меру, або з любой паказанай органам, які субсідзіруе, мясцовай крыніцы (незалежна ад таго, ці вызначаюцца пэўныя тавары, іх аб'ём ці кошт або долі ад аб'ёму ці кошту іх мясцовай вытворчасці);

абмежаванні закупак ці выкарыстанні гаспадарчым суб'ектам увазных з тэрыторыі любой дзяржавы-члена прамысловых тавараў у колькасці, звязанай з аб'ёмамі ці коштам вывозных гэтым гаспадарчым суб'ектам прамысловых тавараў, што паходзяць з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая ўводзіць меру;

2) абмяжоўваюць:

увоз гаспадарчым суб'ектам з тэрыторыі любой дзяржавы-члена прамысловых тавараў, якія выкарыстоўваюцца ў мясцовай вытворчасці ці маючых адносіны да такой вытворчасці (у тым ліку ў

залежнасці ад аб'ёму ці кошту тавараў, якія паходзяць з тэрыторыі дзяржавы-члена, якая ўводзіць меру, і вывозных гэтым гаспадарчым суб'ектам на тэрыторыю іншай дзяржавы-члена);

увоз гаспадарчым суб'ектам з тэрыторыі любой дзяржавы-члена прамысловых тавараў, якія выкарыстоўваюцца ў мясцовай вытворчасці ці маючых адносіны да такой вытворчасці, шляхам абмежавання доступу гаспадарчага суб'екта да валюты любой дзяржавы-члена ў аб'ёме паступленняў гэтай валюты, належным прадпрыемству;

вываз гаспадарчым суб'ектам прамысловых тавараў на тэрыторыю любой дзяржавы-члена ці продаж гаспадарчым суб'ектам прамысловых тавараў на тэрыторыі любой дзяржавы-члена (у залежнасці ад канкрэтызацыі тавараў, іх аб'ёму ці кошту або часткі ад аб'ёму ці кошту іх мясцовай вытворчасці, што ажыццяўляецца гэтым гаспадарчым суб'ектам).

35. Дзяржавы-члены паведамляюць у пісьмовай форме адзін адну і Камісію аб усіх, якія плануюцца ў цяперашнім годзе праграмах давання дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі, якія ажыццяўляюцца на федэральным або рэспубліканскім узроўнях, а таксама на ўзроўні адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, уключаючы інфармацыю аб аб'ёмах і парадку давання дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі. Паведамленне павінна змяшчаць дастаткова інфармацыі для таго, каб упаўнаважаныя органы дзяржавы-члена і Камісія маглі ацаніць памер дзяржаўнай падтрымкі, якая даецца дзяржавамі-членамі сельскай гаспадаркі і яго адпаведнасць гэтаму Пратаколу.

Дзяржавы-члены не пераводзяць у катэгорыю інфармацыі абмежаванага распаўсюджвання інфармацыю аб дзяржаўнай падтрымцы, якая даецца сельскай гаспадарцы. Дзяржавы-члены накіроўваюць адзін адной і ў Камісію паведамленне штогод, не пазней 1 мая.

36. Дзяржавы-члены накіроўваюць адзін адной і ў Камісію паведамленні, пазначаныя ў пункце 35 гэтага Пратакола, якія змяшчаюць звесткі аб расходнай частцы федэральнага або рэспубліканскага бюджэтаў, даваемыя па раздзелах, падраздзелах і відах функцыянальнай і ведамаснай класіфікацый расходаў, а таксама нормы аб парадку і аб'ёмах давання дзяржаўнай падтрымкі сельскай

гаспадаркі. Расходы бюджэтаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак дзяржаў-членаў адлюстроўваюцца ў паведамленнях любым іншым спосабам.

37. Пералік крыніц інфармацыі аб аб'ёмах і напрамках дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі на федэральным або рэспубліканскім узроўнях, а таксама на ўзроўні адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак даецца дзяржавай-членам або ўпаўнаважаным органам дзяржавы-члена па запыце другой дзяржавы-члена або Камісіі.

38. Упаўнаважаныя органы дзяржаў-членаў накіроўваюць адзін аднаму і ў Камісію паведамленні аб дадзенай у справаздачным годзе на тэрыторыі сваёй дзяржавы дзяржаўнай падтрымцы сельскай гаспадаркі да 1 снежня года, наступнага за справаздачным.

39. Форма паведамленняў аб праграмах дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі, якія плануюцца ў цяперашнім годзе, і аб дадзенай дзяржаўнай падтрымцы сельскай гаспадаркі ў справаздачным годзе распрацоўваецца Камісіяй сумесна з дзяржавамі-членамі і зацвярджаецца Камісіяй.

VII. Адказнасць дзяржаў-членаў

40. У выпадку парушэння дзяржавай-членам палажэнняў пунктаў 6 і 8 гэтага Пратакола такая дзяржава-член у разумныя тэрміны спыняе даванне мер, якія ў найбольшай ступені аказваюць скажаючае ўздзеянне на гандаль, або мер, якія аказваюць скажаючае ўздзеянне на гандаль і дадзеных звыш дазволенага аб'ёму, і выплачвае іншым дзяржавам-членам кампенсацыю ў памеры, роўным аб'ёму мер, якія ў найбольшай ступені аказваюць скажаючае ўздзеянне на

гандаль, або аб'ёму мер, якія аказваюць скажаючае ўздзеянне на гандаль, перавышаючаму дазволены аб'ём. Парадак выплаты кампенсацый устанаўліваецца Саветам Камісіі. У выпадку нявыплаты дзяржавай-членам прызначанай кампенсацыі іншыя дзяржавы-члены маюць права ўвесці зваротныя меры.

ДАДАТАК № 30

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб аказанні медыцынскай дапамогі працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў

1. Гэты Пратакол распрацаваны ў адпаведнасці з раздзелам XXVI Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і рэгулюе пытанні аказання медыцынскай дапамогі працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў.

2. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Пратаколе, азначаюць наступнае:

«дзяржава пастаяннага пражывання» – дзяржава, грамадзянінам якога з'яўляецца пацыент;

«медыцынская арганізацыя (установа аховы здароўя)» – юрыдычная асоба незалежна ад арганізацыйна-прававой формы, якая ажыццяўляе ў якасці асноўнага (устаўнага) віду дзейнасці медыцынскую дзейнасць на падставе ліцэнзіі, выдадзенай у парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы-члена, іншая юрыдычная асоба незалежна ад арганізацыйна-прававой формы, якая ажыццяўляе разам з асноўным (устаўным) відам дзейнасці медыцынскую дзейнасць, або фізічная асоба, зарэгістраваная ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, якая ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена;

«медыцынская эвакуацыя» – транспарціроўка пацыента ў мэтах выратавання жыцця і захавання здароўя (у тым ліку пацыентаў, якім немагчыма аказанне неабходнай медыцынскай дапамогі пры станах,

якія пагражаюць жыццю, у медыцынскіх арганізацыях (установах аховы здароўя), у якіх яны знаходзяцца, і пацыентаў, якія пацярпелі ў выніку надзвычайных сітуацый і стыхійных бедстваў, а таксама якія хварэюць захворваннямі, якія прадстаўляюць небяспеку для навакольных);

«пацыент» – працаўнік дзяржавы-члена або член сям'і, якім аказваецца медыцынская дапамога або якія звярнуліся за аказаннем медыцынскай дапамогі незалежна ад наяўнасці ў іх захворванняў і ад іх стану;

«хуткая медыцынская дапамога (у неадкладнай форме)» – комплекс медыцынскіх паслуг, што аказваюцца пры раптоўных вострых захворваннях, станах, абвастрэнні хранічных захворванняў без відавочных прыкмет пагрозы жыццю пацыента;

«хуткая медыцынская дапамога (у экстранай форме)» – комплекс медыцынскіх паслуг, што аказваюцца пры вострых захворваннях, няшчасных выпадках, траўмах, атручваннях і іншых станах, якія прадстаўляюць пагрозу жыццю пацыента.

3. Дзяржава працаўладкавання забяспечвае аказанне медыцынскай дапамогі працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў у парадку і на ўмовах, якія вызначаны заканадаўствам дзяржавы працаўладкавання і міжнароднымі дамовамі.

4. Дзяржавы-члены на сваёй тэрыторыі прадастаўляюць працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў права на атрыманне бясплатнай хуткай медыцынскай дапамогі (у экстраннай і неадкладнай формах) у тым жа парадку і на тых жа ўмовах, што і грамадзянам дзяржавы працаўладкавання.

Хуткая медыцынская дапамога (у экстраннай і неадкладнай формах) аказваецца працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў медыцынскімі арганізацыямі (установамі аховы здароўя) дзяржаўнай і

муніцыпальнай сістэм аховы здароўя дзяржавы працаўладкавання бязвыплатна, незалежна ад наяўнасці медыцынскага страхавога поліса.

Пакрыццё выдаткаў медыцынскай арганізацыі (установе аховы здароўя) на аказанне хуткай медыцынскай дапамогі (у экстраннай і неадкладнай формах) працаўнікам дзяржаў-членаў і членам сем'яў ажыццяўляецца за кошт адпаведных бюджэтаў бюджэтнай сістэмы дзяржавы працаўладкавання ў адпаведнасці з дзеючай сістэмай фінансавання аховы здароўя.

5. У выпадку працягу лячэння пацыента ў медыцынскай арганізацыі (установе аховы здароўя) дзяржавы працаўладкавання пасля ліквідацыі непасрэднай пагрозы яго жыццю або здароўю навакольных аплата фактычнага кошту аказаных паслуг ажыццяўляецца непасрэдна пацыентам або з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам дзяржавы працаўладкавання, па тарыфах або дагаворных цэнах.

6. Пры неабходнасці ажыццяўлення медыцынскай эвакуацыі пацыента ў дзяржаву пастаяннага пражывання інфармацыя аб стане здароўя накіроўваецца медыцынскай арганізацыяй (установай аховы здароўя) у пасольства і (або) ўпаўнаважаны орган (арганізацыю) дзяржавы пастаяннага пражывання.

Магчымасць медыцынскай эвакуацыі пацыента, а таксама парадак медыцынскай эвакуацыі вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржаў-членаў. Медыцынская эвакуацыя ажыццяўляецца выязнымі брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі з правядзеннем падчас транспарціроўкі мерапрыемстваў па аказанню медыцынскай дапамогі, у тым ліку з прымяненнем медыцынскага абсталявання.

Пакрыццё расходаў, звязаных з медыцынскай эвакуацыяй пацыента, ажыццяўляецца за кошт адпаведнага бюджэту бюджэтнай сістэмы дзяржавы пастаяннага пражывання ў адпаведнасці з дзеючай сістэмай фінансавання аховы здароўя ці іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам дзяржавы пастаяннага пражывання.

ДАДАТАК № 31

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб функцыянаванні Еўразійскага эканамічнага саюза ў рамках шматбаковай гандлёвай сістэмы

У рамках Саюза да адпаведных адносін прымяняецца Дагавор аб функцыянаванні Мытнага саюза ў рамках шматбаковай гандлёвай сістэмы ад 19 мая 2011 года.

ДАДАТАК № 32

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПАЛАЖЭННЕ

аб сацыяльных гарантыях, прывілеях і імунітэтах у Еўразійскім эканамічным саюзе

I.Агульныя палажэнні

1. Паняцці, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Палажэнні, абазначаюць наступнае:

"дзяржава знаходжання" – дзяржава-член, на тэрыторыі якой размяшчаецца орган Саюза;

"памяшканні органаў Саюза" – будынкі або часткі будынкаў, якія выкарыстоўваюцца для афіцыйных мэт, а таксама для пражывання членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў;

"прадстаўнікі дзяржаў-членаў" – кіраўнікі і члены дэлегацый, якія накіроўваюцца дзяржавамі-членамі на пасяджэнні органаў Саюза і на мерапрыемствы, якія праводзяцца ў рамках Саюза;

"сацыяльнае забеспячэнне (сацыяльнае страхаванне)" – абавязковае страхаванне на выпадак часовай непрацаздольнасці ў сувязі з мацярынствам, абавязковае страхаванне ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, абавязковае медыцынскае страхаванне;

"члены сям'і членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб" – муж (жонка), непаўналетнія дзеці і асобы, якія

знаходзяцца на ўтрыманні, якія пастаянна пражываюць разам з членамі Калегіі Камісіі, суддзямі Суда Саюза, службовымі асобамі;

"члены сям'і супрацоўнікаў" – муж (жонка) і непаўналетнія дзеці, якія пастаянна пражываюць разам з супрацоўнікамі.

2. Члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы і супрацоўнікі з'яўляюцца міжнароднымі служачымі. Пры выкананні сваіх паўнамоцтваў (выкананні службовых абавязкаў) яны не павінны запытваць або атрымліваць указанні ад органаў дзяржаўнай улады або афіцыйных асоб дзяржаў-членаў, а таксама ўлад дзяржаў, якія не з'яўляюцца членамі Саюза. Яны павінны ўстрымлівацца ад усялякіх дзеянняў, несумяшчальных з іх статусам міжнародных служачых.

3. Кожная дзяржава-член абавязваецца няўхільна паважаць міжнародны характар паўнамоцтваў членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў і не ўплываць на іх пры выкананні імі службовых абавязкаў.

II.Прывілеі і імунітэты Саюза

4. Маёмасць і актывы органаў Саюза карыстаюцца імунітэтам ад любой формы адміністрацыйнага або судовага ўмяшання, за выключэннем выпадкаў, калі Саюз сам адмаўляецца ад імунітэту.

5. Памяшканні органаў Саюза, а таксама іх архівы і дакументы, у тым ліку службовая карэспандэнцыя, незалежна ад месца знаходжання, не падлягаюць вобыску, рэквізіцыі, канфіскацыі або любой іншай форме ўмяшання, якое перашкаджае нармальнай дзейнасці гэтых органаў.

6. Прадстаўнікі адпаведных органаў дзяржаўнай улады і кіравання дзяржавы знаходжання не могуць уступаць у памяшканні органаў

Саюза інакш як са згоды Старшыні Калегіі Камісіі, Старшыні Суда або асоб, якія іх замяшчаюць, на ўмовах, імі адобраных, за выключэннем выпадкаў пажару або іншых абставін, якія патрабуюць неадкладных мер абароны.

7. Выкананне любых дзеянняў па рашэнні адпаведных органаў дзяржаўнай улады і кіравання дзяржавы знаходжання можа мець месца ў памяшканнях органаў Саюза толькі са згоды Старшыні Калегіі Камісіі, Старшыні Суда Саюза або асоб, якія іх замяшчаюць.

8. Памяшканні органаў Саюза не могуць з'яўляцца прыстанішчам для асоб, якія праследуюцца па законах любой з дзяржаў-членаў або падлягаюць выдачы дзяржаве-члену ці дзяржаве, якая не з'яўляецца членам Саюза.

9. Недатыкальнасць памяшканняў органаў Саюза не дае права выкарыстоўваць іх у мэтах, якія не сумяшчаюцца з функцыямі або задачамі Саюза або якія наносяць шкоду бяспецы, інтарэсам фізічных ці юрыдычных асоб дзяржаў-членаў.

10. Дзяржава знаходжання прымае належныя меры для абароны памяшканняў Саюза ад усякага ўварвання або нанясення шкоды.

11. Органы Саюза вызваляюцца ад падаткаў, збораў, пошлін і іншых плацяжоў, якія збіраюцца ў дзяржаве знаходжання, за выключэннем плацяжоў, якія ўяўляюць сабой плату за канкрэтныя віды абслугоўвання (паслуг), і плацяжоў (адлічэнняў і ўзносаў), якія плацяцца ў адпаведнасці з пунктамі 44 і 45 гэтага Палажэння.

12. Прадметы і іншая маёмасць, прызначаныя для афіцыйнага выкарыстання органамі Саюза, вызваляюцца на тэрыторыях дзяржаў-членаў ад абкладання мытнымі пошлінамі, налогамі і мытнымі зборамі.

13. У дачыненні да сваіх афіцыйных сродкаў сувязі органы Саюза карыстаюцца не менш спрыяльнымі ўмовамі, чым тыя, якія даюцца дзяржавай знаходжання дыпламатычным прадстаўніцтвам.

14. Органы Саюза могуць размяшчаць флаг, эмблему ці іншую сімволіку Саюза на займаемых імі памяшканнях і на аўтатранспартных сродках, якія ім належаць.

15. Органы Саюза пры выкананіі заканадаўства дзяржаў-членаў могуць у адпаведнасці са сваімі мэтамі і функцыямі выдаваць і распаўсюджваць друкаваную прадукцыю, публікацыя якой прадугледжана міжнароднымі дагаворамі і актамі, якія складаюць права Саюза.

16. Дзяржава знаходжання аказвае Саюзу садзейнічанне ў набыцці або атрыманні памяшканняў, неабходных для ажыццяўлення органамі Саюза сваіх функцый.

17. Саюз ажыццяўляе супрацоўніцтва з адпаведнымі органамі дзяржаўнай улады і кіравання дзяржаў-членаў у мэтах забеспячэння належнага адпраўлення правасуддзя і выканання прадпісанняў праваахоўных органаў, а таксама папярэджвання любых злоўжыванняў у сувязі з прывілеямі і імунітэтамі, прадугледжанымі гэтым Палажэннем.

III.Прывілеі і імунітэты членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў

18. Члены Калегіі Камісіі і суддзі Суда Саюза, калі яны не з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання, карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі ў аб'ёме, прадугледжаным Венскай

канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах ад 18 красавіка 1961 года для дыпламатычнага агента.

Такія імунітэты не распаўсюджваюцца на выпадкі:

рэчавых іскаў, якія адносяцца да асабістай нерухомай маёмасці, якая знаходзіцца на тэрыторыі дзяржавы знаходжання;

іскаў, якія датычацца атрымання ў спадчыну, у дачыненні да якіх член Калегіі Камісіі, суддзя Суда Саюза або член сям'і выступае ў якасці выканаўцы завяшчання, апякуна над атрыманай у спадчыну маёмасцю, наследніка або адмоваатрымальніка як прыватная асоба, а не ад імя органа Саюза;

іскаў, якія датычацца прафесійнай дзейнасці, якая выходзіць за межы паўнамоцтваў, прадугледжаных Дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе

На членаў Калегіі Камісіі і суддзяў Суда Саюза, якія з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання, распаўсюджваецца дзеянне палажэнняў падпункта 1 пункта 19 гэтага Палажэння.

На членаў сямей членаў Калегіі Камісіі і суддзяў Суда Саюза, якія пражываюць разам з імі, калі гэтыя члены сямей не з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання, распаўсюджваецца дзеянне палажэнняў падпунктаў 3 – 5 пункта 19 гэтага Палажэння.

На членаў сямей членаў Калегіі Камісіі і суддзяў Суда Саюза, калі яны з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання і (або) пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі, не распаўсюджваецца імунітэт ад грамадзянскай юрысдыкцыі дзяржавы знаходжання ў дачыненні да іскаў аб кампенсаванні шкоды ў сувязі з дарожна-транспартным здарэннем, выкліканым транспартным сродкам, які належыць такому члену сям'і або якім кіраваў такі член сям'і.

19. Службовыя асобы:

1) не падлягаюць крымінальнай, грамадзянскай і адміністрацыйнай адказнасці за сказанае або напісанае імі і за ўсе дзеянні, учыненыя імі ў якасці службовых асоб;

2) вызваляюцца ад падаткаабкладання заработнай платы і іншых узнагароджванняў, якія выплачваюцца органамі Саюза;

3) вызваляюцца ад дзяржаўных павіннасцей;

4) вызваляюцца ад абмежаванняў па ўездзе ў дзяржаву знаходжання і выездзе з яе, ад рэгістрацыі ў якасці іншаземцаў і атрымання дазволу на часовае пражыванне;

5) карыстаюцца такімі ж ільготамі па рэпатрыяцыі, якімі карыстаюцца дыпламатычныя прадстаўнікі ў час міжнародных крызісаў.

20. На службовых асоб, калі яны з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання і (або) пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі, не распаўсюджваецца дзеянне палажэнняў падпунктаў 2 – 5 пункта 19 гэтага Палажэння.

21. На членаў сямей службовых асоб, якія пражываюць разам з імі, калі гэтыя члены сямей не з'яўляюцца грамадзянамі дзяржавы знаходжання і (або) пастаянна не пражываюць на яе тэрыторыі, распаўсюджваецца дзеянне палажэнняў падпунктаў 3 – 5 пункта 19 гэтага Палажэння.

22. Пытанні акрэдытацыі членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў рэгулююцца міжнароднымі дагаворамі аб умовах знаходжання органаў Саюза на тэрыторыі дзяржавы знаходжання.

23. Члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы і супрацоўнікі не маюць права займацца прадпрымальніцкай і

любой іншай дзейнасцю ў інтарэсах асабістай выгады або выгады іншых асоб, за выключэннем навуковай, творчай і выкладчыцкай дзейнасці.

Даходы, атрыманыя ад навуковай, творчай і выкладчыцкай дзейнасці, падлягаюць падаткаабкладанню ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі і заканадаўствам дзяржавы знаходжання.

24. Члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы і члены іх сямей павінны выконваць патрабаванні заканадаўства дзяржавы знаходжання ў дачыненні да страхавання ад шкоды, якая можа быць нанесена трэцім асобам у сувязі з выкарыстаннем любога транспартнага сродку.

25. Супрацоўнікі не падлягаюць юрысдыкцыі судовых або адміністрацыйных органаў дзяржавы знаходжання ў дачыненні да дзеянняў, якія здзяйсняюцца пры непасрэдным выкананні імі службовых абавязкаў, акрамя выпадкаў прад'яўлення:

1) іскаў аб кампенсацыі шкоды ў сувязі з дарожна-транспартным здарэннем, выкліканым транспартным сродкам, які належыць супрацоўніку або якім кіраваў супрацоўнік;

2) іскаў у сувязі са смерцю або цялесным пашкоджаннем, выкліканым дзеяннямі супрацоўнікаў.

26. Супрацоўнікі вызваляюцца ад абмежаванняў па ўездзе ў дзяржаву знаходжання і выездзе з яе, ад рэгістрацыі ў якасці іншаземцаў і атрымання дазволу на часовае пражыванне.

27. Палажэнні пунктаў 25 і 26 гэтага Палажэння не прымяняюцца да ўзаемаадносін паміж супрацоўнікамі і органамі дзяржаўнай улады і кіравання дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца.

28. Прывілеі і імунітэты, якімі карыстаюцца члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы і супрацоўнікі, даюцца ім не для асабістай выгады, а для эфектыўнага, незалежнага выканання імі сваіх паўнамоцтваў (выканання службовых абавязкаў) у інтарэсах Саюза.

29. Члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы, супрацоўнікі і члены іх сямей карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі, прадугледжанымі гэтым Палажэннем, з моманту іх уступлення на тэрыторыю дзяржавы знаходжання пры накіраванні да месца прызначэння або, калі яны ўжо знаходзяцца на гэтай тэрыторыі, з моманту, калі члены Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовыя асобы, супрацоўнікі прыступілі да выканання сваіх паўнамоцтваў (службовых абавязкаў).

30. Пры спыненні паўнамоцтваў (выканання службовых абавязкаў) члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы або супрацоўніка іх прывілеі і імунітэты, а таксама прывілеі і імунітэты членаў іх сямей, якія пражываюць разам з імі, звычайна спыняюцца ў той момант, калі гэта асоба пакідае дзяржаву знаходжання або па заканчэнні разумнага тэрміну, каб пакінуць дзяржаву знаходжання, у залежнасці ад таго, які з названых момантаў настане раней. Прывілеі і імунітэты членаў сям'і спыняюцца, калі яны перастаюць быць членамі сям'і члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы або супрацоўніка. Пры гэтым, калі такія асобы маюць намер пакінуць дзяржаву знаходжання на працягу разумнага тэрміну, то іх прывілеі і імунітэты захоўваюцца да моманту іх ад'езду.

31. У выпадку смерці члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы або супрацоўніка члены іх сямей, якія

пражывалі разам з імі, працягваюць карыстацца дадзенымі ім прывілеямі і імунітэтамі да моманту, калі яны пакінуць дзяржаву знаходжання або да заканчэння разумнага тэрміну, каб пакінуць дзяржаву знаходжання, у залежнасці ад таго, які з гэтых момантаў настане раней.

32. Імунітэты ад адміністрацыйнай, грамадзянскай і крымінальнай юрысдыкцыі члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы ў дачыненні да ўсяго сказанага або напісанага ў рамках рэалізацыі ім сваіх функцый і ўсіх дзеянняў, выкананых у якасці члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы, захоўваюцца за ім і пасля заканчэння паўнамоцтваў. Гэты пункт дзейнічае без шкоды для выпадкаў узнікнення адказнасці членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб, прадугледжаных Дагаворам або міжнароднымі дагаворамі ў рамках Саюза.

33. Усе асобы, якія карыстаюцца прывілеямі і імунітэтамі ў адпаведнасці з гэтым Палажэннем, абавязаны без шкоды для іх прывілей і імунітэтаў паважаць заканадаўства дзяржавы знаходжання. Яны таксама абавязаны не ўмешвацца ва ўнутраныя справы гэтай дзяржавы.

34. Член Калегіі Камісіі, суддзя Суда Саюза, службовая асоба, супрацоўнік можа быць пазбаўлены імунітэту, калі імунітэт перашкаджае ажыццяўленню правасуддзя і зняцце імунітэту не наносіць шкоды мэтам, у сувязі з якімі ён быў дадзены.

35. Зняцце імунітэту ажыццяўляецца:

1) у адносінах да члена Калегіі Камісіі і суддзі Суда Саюза – Вышэйшым саветам;

2) у адносінах да службовай асобы і супрацоўніка Камісіі – Саветам Камісіі;

3) у адносінах да службовай асобы або супрацоўніка Суда Саюза – Старшынёй Суда Саюза.

36. Адмова ад імунітэту ажыццяўляецца ў пісьмовай форме і павінна быць пэўна адлюстраванай.

IV.Прывілеі і імунітэты прадстаўнікоў дзяржаў-членаў

37. Прадстаўнікі дзяржаў-членаў пры выкананні афіцыяльных функцый і падчас руху да месца правядзення мерапрыемстваў, якія арганізуюцца органамі Саюза на тэрыторыях дзяржаў-членаў, карыстаюцца наступнымі прывілеямі і імунітэтамі:

1) імунітэт ад асабістага арышту або затрымання, а таксама ад юрысдыкцыі судовых і адміністрацыйных улад у дачыненні да ўсіх дзеянняў, якія могуць быць здзейснены імі ў гэтай якасці;

2) недатыкальнасць жылля;

3) вызваленне суправаджаемага багажу і ручной паклажы ад мытнага агляду, калі няма сур'ёзных падстаў меркаваць, што яны змяшчаюць прадметы і іншую маёмасць, якія не прызначаюцца для афіцыяльнага ці асабістага карыстання, або прадметы і іншую маёмасць, увоз і вываз якіх забаронены ці абмежаваны заканадаўствам дзяржавы-члена, на тэрыторыі якой праводзіцца мерапрыемства;

4) вызваленне ад абмежаванняў па ўездзе ў дзяржаву знаходжання і выездзе з яе, ад рэгістрацыі ў якасці іншаземцаў і атрымання дазволу на часовае пражыванне.

38. Палажэнні пункта 37 гэтага Палажэння не прымяняюцца да ўзаемаадносін паміж прадстаўніком дзяржавы-члена і ўладамі

дзяржавы-члена, грамадзянінам ці прадстаўніком якой ён з'яўляецца ці з'яўляўся.

39. Прывілеі і імунітэты, якімі карыстаюцца прадстаўнікі дзяржаў-членаў, даюцца ім не для асабістай выгады, а для эфектыўнага, незалежнага выканання імі сваіх афіцыяльных функцый у інтарэсах сваёй дзяржавы-члена.

40. Памяшканні, якія займаюць прадстаўнікі дзяржаў-членаў, прадметы абсталявання і іншая маёмасць, а таксама транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца імі для службовай неабходнасці, карыстаюцца імунітэтам ад вобыску, рэквізіцыі, арышту і выканаўчых дзеянняў.

41. Архівы і дакументы дзяржаў-членаў недатыкальныя ў любы час і незалежна ад носьбітаў інфармацыі і месца іх знаходжання.

42. У выпадку калі гэта не супярэчыць закону і правілам аб зонах, уезд у якія забараняецца або рэгулюецца па меркаваннях дзяржаўнай бяспекі, дзяржава знаходжання забяспечвае ўсім прадстаўнікам дзяржаў-членаў свабоду перамяшчэння і паездак па яе тэрыторыі ў той меры, у якой гэта неабходна для выканання афіцыяльных функцый.

V.Працоўныя адносіны і сацыяльныя гарантыі ў органах Саюза

43. Працоўныя адносіны членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў рэгулююцца заканадаўствам дзяржавы знаходжання з улікам норм гэтага Палажэння.

44. Пенсённае забеспячэнне членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца.

Абавязковыя адлічэнні на пенсіённае забеспячэнне членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў ажыццяўляюцца органамі Саюза без утрымання з заработнай платы за кошт сродкаў бюджэту Саюза ў пенсіённыя фонды дзяржаў-членаў, грамадзянамі якіх названыя асобы з'яўляюцца, у парадку і памерах, устаноўленых заканадаўствам адпаведнай дзяржавы-члена. Расходы па выплаце пенсій членам Калегіі Камісіі, суддзям Суда Саюза, службовым асобам і супрацоўнікам нясе дзяржава-член, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца.

45. Сацыяльнае забеспячэнне (сацыяльнае страхаванне), акрамя пенсіённага страхавання, і забеспячэнне дапамогамі па сацыяльным страхаванні членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання на тых жа ўмовах і ў тым жа парадку, што і ў адносінах да грамадзян дзяржавы знаходжання.

Выплата страхавых узносаў на сацыяльнае забеспячэнне (сацыяльнае страхаванне), акрамя пенсіённага страхавання, з выплат на карысць членаў Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту Саюза ў парадку, устаноўленым заканадаўствам дзяржавы знаходжання.

Расходы па выплаце дапамог па сацыяльным забеспячэнні (сацыяльным страхаванні) нясе дзяржава знаходжання без узаемных разлікаў з іншымі дзяржавамі-членамі.

46. Пры назначэнні пенсій або дапамог па сацыяльным забеспячэнні (сацыяльным страхаванні) у страхавы або працоўны стаж залічваецца перыяд працы ў якасці члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы або супрацоўніка ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца.

Перыяд працы ў якасці члена Калегіі Камісіі, суддзі Суда Саюза, службовай асобы або супрацоўніка залічваецца ў страхавы ці працоўны стаж пры назначэнні пенсіі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца, а пры назначэнні дапамогі па сацыяльным забеспячэнні (сацыяльным страхаванні) – у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання.

47. Заробак, атрыманы членамі Калегіі Камісіі, суддзямі Суда Саюза, службовымі асобамі і супрацоўнікамі ў перыяд выканання імі сваіх паўнамоцтваў, улічваецца пры вызначэнні памеру пенсіі ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца, а пры вызначэнні памеру дапамогі па сацыяльным забеспячэнні (сацыяльным страхаванні) – у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання.

48. У перыяд выканання сваіх паўнамоцтваў членам Калегіі Камісіі, суддзям Суда Саюза даюцца наступныя сацыяльныя гарантыі:

1) штогадовы адпачынак , які аплачваецца, працягласцю 45 каляндарных дзён;

2) медыцынскае абслугоўванне, у тым ліку членам іх сямей, а таксама транспартнае абслугоўванне, якое ажыццяўляецца за кошт бюджэту Саюза;

3) даванне за кошт бюджэту Саюза службовага жылога памяшкання членам Калегіі Камісіі, суддзям Суда Саюза (з улікам

членаў іх сямей), якія не маюць жылой плошчы на тэрыторыі горада, у якім размешчаны адпаведны орган Саюза;

4) уключэнне перыяду выканання паўнамоцтваў члена Калегіі Камісіі ў стаж дзяржаўнай (дзяржаўнай грамадзянскай) службы пры даванні сацыяльных гарантый, прадугледжаных заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянінам якой ён з'яўляецца, для дзяржаўных служачых (федэральных дзяржаўных грамадзянскіх служачых), а таксама ў працягласць выканання паўнамоцтваў міністра (федэральнага мінсітра) пры вызначэнні памеру (права) пенсіённага (сацыяльнага) забеспячэння (штомесячнай даплаты да пенсіі), прадугледжанага заканадаўствам дзяржавы-члена, грамадзянінам якой з'яўляецца член Калегіі Камісіі, для міністра (федэральнага мінсітра);

5) уключэнне перыяду выканання паўнамоцтваў суддзі Суда Саюза ў судзейскі стаж у дзяржаве-члене, грамадзянінам якой з'яўляецца суддзя Суда Саюза.

49. Пытанні, звязаныя з забеспячэннем дадзеных членам Калегіі Камісіі і суддзям Суда Саюза сацыяльных гарантый (у тым ліку з медыцынскім і транспартным абслугоўваннем), вырашаюцца кампетэнтным органам дзяржавы знаходжання.

50. Члены Калегіі Камісіі, якія з'яўляюцца грамадзянамі Расійскай Федэрацыі і якія склалі свае паўнамоцтвы (за выключэннем выпадкаў датэрміновага спынення паўнамоцтваў, прадугледжаных Палажэннем аб Еўразійскай эканамічнай камісіі (дадатак № 1 да Дагавора)), маюць права на ўстанаўленне штомесячнай даплаты да страхавой пенсіі па старасці (інваліднасці). Штомесячная даплата да пенсіі ўстанаўліваецца ў памерах, парадку і на ўмовах, якія прадугледжаны заканадаўствам Расійскай Федэрацыі для федэральнага міністра. Рашэнне аб устанаўленні штомесячнай

даплаты да пенсіі прымаецца кіраўніком федэральнага органа выканаўчай улады, які ажыццяўляе функцыі па выпрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі і нарматыўна-прававым рэгуляванні ў сферы пенсіённага забеспячэння. Штомесячная даплата да пенсіі ўстанаўліваецца за кошт сродкаў федэральнага бюджэту.

На суддзю Суда Саюза пры заканчэнні яго паўнамоцтваў пры выхадзе ў адстаўку распаўсюджваюцца гарантыі і яму даюцца грашовыя выплаты, якія прадугледжваюцца заканадаўствам дзяржавы-члена для старшыні вярхоўнага суда дзяржвы-члена, ад якой назначаны суддзя Суда Саюза. Гэтыя гарантыі і грашовыя выплаты ўстанаўліваюцца суддзі Суда Саюза ў парадку, які вызначаецца заканадаўствам дзяржавы-члена, ад якой назначаны суддзя.

51. У перыяд выканання сваіх службовых абавязкаў службовым асобам, супрацоўнікам і членам іх сямей за кошт сродкаў бюджэту Саюза даецца медыцынскае абслугоўванне, дырэктарам дэпартаментаў Камісіі і кіраўніку Сакратарыята Суда Саюза за кошт сродкаў бюджэту Саюза даецца таксама транспартнае абслугоўванне.

52. У перыяд выканання сваіх службовых абавязкаў службовым асобам, супрацоўнікам, якія не маюць жылой плошчы на тэрыторыі горада, дзе размяшчаецца адпаведны орган Саюза, за кошт сродкаў бюджэту Саюза даюцца службовыя жылыя памяшканні (з улікам членаў іх сямей).

53. Службовыя асобы і супрацоўнікі Камісіі і Суда Саюза, якія з'яўляюцца грамадзянамі Расійскай Федэрацыі і замяшчалі да працы ў Камісіі і Судзе Саюза пасады федэральнай дзяржаўнай (дзяржаўнай грамадзянскай) службы, вызваленыя ад пасад, якія замяшчалі ў Камісіі і Судзе Саюза (за выключэннем выпадкаў

вызвалення, звязаных з вінаватымі дзеяннямі), і якія маюць стаж дзяржаўнай грамадзянскай службы не менш за 15 гадоў, маюць права на пенсію за выслугу гадоў, якая назначаецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Расійскай Федэрацыі для федэральных дзяржаўных грамадзянскіх служачых, калі непасрэдна перад звальненнем з Камісіі і Суда Саюза яны замяшчалі ў іх пасады не менш за 12 месяцаў. Прадстаўленне (рашэнне) аб устанаўленні пенсіі за выслугу гадоў прымаецца кіраўніком федэральнага органа выканаўчай улады, які ажыццяўляе функцыі па выпрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі і нарматыўна-прававым рэгуляванні ў сферы пенсіённага забеспячэння па прадстаўленні Старшыні Калегіі Камісіі і Старшыні Суда Саюза.

Памер пенсіі за выслугу гадоў вылічваецца зыходзячы з сярэднямесячнай заработнай платы службовай асобы або супрацоўніка, гранічны памер якой вызначаецца ў прымяненні да службовых акладаў (грашовага ўзнагароджання), якія ўстанаўліваюцца па прыраўнаных пасадах дзяржаўнай грамадзянскай службы згодна з пералікам адпаведнасці пасад службовых асоб і супрацоўнікаў Камісіі і Суда Саюза пасадам федэральнай дзяржаўнай грамадзянскай службы ў Апараце Урада Расійскай Федэрацыі і Апараце Вярхоўнага Суда Расійскай Федэрацыі, які зацвярджаецца Урадам Расійскай Федэрацыі.

Пенсія за выслугу гадоў па заканадаўстве Расійскай Федэрацыі прызначаецца за кошт сродкаў федэральнага бюджэту.

54. Перыяд працы службовых асоб і супрацоўнікаў Камісіі і Суда Саюза ўключаецца ў стаж дзяржаўнай (дзяржаўнай грамадзянскай) службы дзяржавы-члена, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца, для ўстанаўлення сацыяльных гарантый у перыяд

праходжання дзяржаўнай (дзяржаўнай грамадзянскай) службы і для назначэння пенсіі за выслугу гадоў дзяржаўных служачых (федэральных дзяржаўных грамадзянскіх служачых).

55. Парадак медыцынскага і транспартнага абслугоўвання Калегіі Камісіі, суддзяў Суда Саюза, службовых асоб і супрацоўнікаў, а таксама членаў іх сямей вызначаецца Міжурадавым саветам.

ДАДАТАК № 33

да Дагавора аб Еўразійскім
эканамічным саюзе

ПРАТАКОЛ

аб спыненні дзеяння міжнародных дагавораў, заключаных у рамках фарміравання Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, у сувязі з уступленнем у сілу Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе

У сувязі з уступленнем у сілу Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (далей – Дагавор) спыняецца дзеянне наступных міжнародных дагавораў, заключаных у рамках фарміравання Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

I.Міжнародныя дагаворы, якія спыняюць дзеянне
з даты ўступлення ў сілу Дагавора

1. Дагавор аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фарміраванні Мытнага саюза ад 6 кастрычніка 2007 года.

2. Пратакол аб парадку ўступлення ў сілу міжнародных дагавораў, накіраваных на фарміраванне дагаворна-прававой базы Мытнага саюза, выхаду з іх і далучэння да іх ад 6 кастрычніка 2007 года.

3. Пагадненне аб вядзенні мытнай статыстыкі знешняга і ўзаемнага гандлю таварамі Мытнага саюза ад 25 студзеня 2008 года.

4. Пагадненне аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні ад 25 студзеня 2008 года.

5. Пагадненне аб адзіных мерах нетарыфнага рэгулявання ў дачыненні да трэціх краін ад 25 студзеня 2008 года.

6. Пагадненне аб прымяненні спецыяльных абаронных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін ад 25 студзеня 2008 года.

7. Пагадненне аб прынцыпах збірання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у Мытным саюзе ад 25 студзеня 2008 года.

8. Пратакол аб прадастаўленні тарыфных ільгот ад 12 снежня 2008 года.

9. Пратакол аб забеспячэнні аднолькавага прымянення правілаў вызначэння мытнага кошту тавараў, якія перамяшчаюцца праз мытную мяжу Мытнага саюза, ад 12 снежня 2008 года.

10. Пратакол аб абмене інфармацыяй, неабходнай для вызначэння і кантролю мытнага кошту тавараў, паміж мытнымі органамі Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі ад 12 снежня 2008 года.

11. Пратакол аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак уразных мытных пошлін, якія адрозніваюцца ад ставак Адзінага мытнага тарыфу, ад 12 снежня 2008 года.

12. Пагадненне аб відах мытных працэдур і мытных рэжымаў ад 12 снежня 2008 года.

13. Пагадненне аб парадку дэкларавання мытнага кошту тавараў, якія перамяшчаюцца праз мытную мяжу Мытнага саюза, ад 12 снежня 2008 года.

14. Пагадненне аб парадку дэкларавання тавараў ад 12 снежня 2008 года.

15. Пагадненне аб парадку вылічэння і выплаты мытных плацяжоў у дзяржавах-удзельніцах Мытнага саюза ад 12 студзеня 2008 года.

16. Пагадненне аб парадку ажыццяўлення кантролю правільнасці вызначэння мытнага кошту тавараў, якія перамяшчаюцца праз мытную мяжу Мытнага саюза, ад 12 снежня 2008 года.

17. Пагадненне аб парадку мытнага афармлення і мытнага кантролю ў дзяржавах-удзельніцах Мытнага саюза ад 12 снежня 2008 года.

18. Пагадненне аб Сакратарыяце Камісіі Мытнага саюза ад 12 снежня 2008 года.

19. Пагадненне аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот ад 12 снежня 2008 года.

20. Пагадненне аб парадку ўвядзення і прымянення мер, якія закранаюць знешні гандаль таварамі, на адзінай мытнай тэрыторыі ў дачыненні да трэціх краін ад 9 чэрвеня 2009 года.

21. Пагадненне аб правілах ліцэнзавання ў сферы знешняга гандлю таварамі ад 9 чэрвеня 2009 года.

22. Пратакол аб парадку збірання ўскосных падаткаў і механізме кантролю за іх выплатай пры экспарце і імпарце тавараў у Мытным саюзе ад 11 снежня 2009 года.

23. Пратакол аб парадку збірання ўскосных падаткаў пры выкананні работ, аказанні паслуг у Мытным Саюзе ад 11 снежня 2009 года.

24. Пратакол аб парадку перадачы даных статыстыкі знешняга гандлю і статыстыкі ўзаемнага гандлю ад 11 снежня 2009 года.

25. Пратакол аб статусе Цэнтра мытнай статыстыкі Камісіі Мытнага саюза ад 11 снежня 2009 года.

26. Пагадненне аб узаемным прызнанні акрэдытацыі органаў па сертыфікацыі (ацэнцы (пацвярджэнні) адпаведнасці) і

выпрабавальных лабараторый (цэнтраў), якія выконваюць работы па ацэнцы (пацвярджэнні) адпаведнасці, ад 11 снежня 2009 года.

27. Пагадненне аб абарачэнні прадукцыі, якая падлягае абавязковай ацэнцы (пацвярджэнню) адпаведнасці, на мытнай тэрыторыі Мытнага саюза ад 11 снежня 2009 года.

28. Пагадненне Мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года.

29. Пагадненне Мытнага саюза аб каранціне раслін ад 11 снежня 2009 года.

30. Пагадненне Мытнага саюза па санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года.

31. Пратакол ад 11 снежня 2009 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб прынцыпах збірання ўскосных падаткаў пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг у Мытным саюзе ад 25 студзеня 2008 года.

32. Пагадненне аб устанаўленні і прымяненні ў Мытным саюзе парадку залічэння і размеркавання ўвазных мытных пошлін (іншых пошлін, падаткаў і збораў, якія маюць эквівалентнае дзеянне) ад 20 мая 2010 года.

33. Пратакол ад 21 мая 2010 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне Мытнага саюза аб каранціне раслін ад 11 снежня 2009 года.

34. Пратакол ад 21 мая 2010 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне Мытнага саюза па ветэрынарна-санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года.

35. Пратакол ад 21 мая 2010 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне Мытнага саюза па санітарных мерах ад 11 снежня 2009 года.

36. Пратакол аб асобных часовых выключэннях з рэжыму функцыянавання адзінай мытнай тэрыторыі Мытнага саюза ад 5 ліпеня 2010 года.

37. Пагадненне аб прымяненні інфармацыйных тэхналогій пры абмене электроннымі дакументамі ў знешнім і ўзаемным гандлі на адзінай мытнай тэрыторыі Мытнага саюза ад 21 верасня 2010 года.

38. Пагадненне аб стварэнні, функцыянаванні і развіцці інтэграванай інфармацыйнай сістэмы знешняга і ўзаемнага гандлю Мытнага саюза ад 21 верасня 2010 года.

39. Пагадненне аб адзіных прынцыпах і правілах тэхнічнага рэгулявання ў Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліцы Казахстан і Расійскай Федэрацыі ад 18 лістапада 2010 года.

40. Пратакол аб парадку прадастаўлення органу, які праводзіць расследаванне, звестак, якія змяшчаюць у тым ліку і канфідэнцыяльную інфармацыю, для мэт расследавання, якія папярэднічаюць увядзенню спецыяльных абаронных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін, ад 19 лістапада 2010 года.

41. Пагадненне аб парадку прымянення спецыяльных абаронных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер на працягу пераходнага перыяду ад 19 лістапада 2010 года.

42. Пагадненне аб прававым статусе працоўных-мігрантаў і членаў іх сямей ад 19 лістапада 2010 года.

43. Пагадненне аб забеспячэнні доступу да паслуг натуральных манаполій у сферы электраэнергетыкі, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі, ад 19 лістапада 2010 года.

44. Пагадненне аб дзяржаўных (муніцыпальных) закупках ад 9 снежня 2010 года.

45. Пагадненне аб адзіных правілах дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі ад 9 снежня 2010 года.

46. Пагадненне аб адзіных правілах прадастаўлення прамысловых субсідый ад 9 снежня 2010 года.

47. Пагадненне аб адзіных прынцыпах і правілах канкурэнцыі ад 9 снежня 2010 года.

48. Пагадненне аб адзіных прынцыпах і правілах рэгулявання дзейнасці суб'ектаў натуральных манаполій ад 9 снежня 2010 года.

49. Пагадненне аб адзіных прынцыпах рэгулявання ў сферы аховы і абароны правоў інтэлектуальнай уласнасці ад 9 снежня 2009 года.

50. Пагадненне аб парадку арганізацыі, кіравання, функцыянавання і развіцця агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі ад 9 снежня 2010 года.

51. Пагадненне аб правілах доступу да паслуг суб'ектаў натуральных манаполій у сферы транспарціроўкі газу па газатранспартных сістэмах, уключаючы асновы цэнаўтварэння і тарыфнай палітыкі, ад 9 снежня 2010 года.

52. Пагадненне аб рэгуляванні доступу да паслуг чыгуначнага транспарту, уключаючы асновы тарыфнай палітыкі, ад 9 снежня 2010 года.

53. Пагадненне аб узгодненай макраэканамічнай палітыцы ад 9 снежня 2010 года.

54. Пагадненне аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі ад 9 снежня 2010 года.

55. Пагадненне аб стварэнні ўмоў на фінансавых рынках для забеспячэння свабоднага руху капіталу ад 9 снежня 2010 года.

56. Пагадненне аб гандлі паслугамі і інвестыцыях у дзяржавах-удзельніцах Адзінай эканамічнай прасторы ад 9 снежня 2010 года.

57. Пагадненне аб ажыццяўленні транспартнага (аўтамабільнага) кантролю на знешняй мяжы Мытнага саюза ад 22 чэрвеня 2011 года.

58. Пратакол ад 18 кастрычніка 2011 года аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пагадненне аб прымяненні спецыяльных абаронных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у дачыненні да трэціх краін ад 25 студзеня 2008 года.

59. Пратакол аб парадку абмену інфармацыяй, якая звязана з выплатай увазных мытных пошлін, ад 19 кастрычніка 2011 года.

60. Дагавор аб Еўразійскай эканамічнай камісіі ад 18 лістапада 2011 года.

61. Дагавор аб узаемадзеянні ўпаўнаважаных органаў дзяржаў-удзельніц Пагаднення аб узгодненых прынцыпах валютнай палітыкі ад 9 снежня 2010 года, якія ажыццяўляюць валютны кантроль, ад 15 снежня 2011 года.

62. Пагадненне аб інфармацыйным узаемадзеянні ў сферы статыстыкі ад 29 мая 2013 года.

63. Пратакол ад 24 жніўня 2012 года аб унясенні змяненняў у Пратакол аб умовах і парадку прымянення ў выключных выпадках ставак увазных мытных пошлін, якія адрозніваюцца ад ставак Адзінага мытнага тарыфу, ад 12 снежня 2008 года.

64. Пратакол ад 21 чэрвеня 2013 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб умовах і механізме прымянення тарыфных квот ад 12 снежня 2008 года.

65. Пратакол ад 25 верасня 2013 года аб унясенні змяненняў у Пагадненне аб адзіным мытна-тарыфным рэгуляванні ад 25 студзеня 2008 года.

II.Міжнародныя дагаворы, якія спыняюць дзеянне
з даты ўступлення ў сілу адпаведнага рашэння Камісіі
згодна з артыкулам 102 Дагавора

1. Пагадненне аб адзіных правілах вызначэння краіны паходжання тавараў ад 25 студзеня 2008 года.

2. Пратакол аб адзінай сістэме тарыфных прэферэнцый Мытнага саюза ад 12 снежня 2008 года.

3. Пагадненне аб Правілах вызначэння паходжання тавараў з краін, якія развіваюцца, і з найменш развітых краін ад 12 снежня 2008 года.

ISBN 978-92-1-910024-4



22-00413

UNITED

NATIONS

TREATY

SERIES

Volume
3043

2015

I. No.
52764

RECUEIL

DES

TRAITÉS

NATIONS

UNIES